# ПАМЯЦЬ

## БРАСЛАЎСКІ РАЁН

МІНСК
«ПАЛІГРАФАФАРМЛЕННЕ»
1998

# 1941

# 1945

## БРАСЛАЎШЧЫНА Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

### Так гэта пачыналася

Вайна... Яна па-рознаму ўварвалася страшнай бядой у жыццё браслаўчан. У тыя спякотныя дні чэрвеня 1941 людзі яшчэ не адразу змаглі асэнсаваць, праз якія пакуты, выпрабаванні давядзецца ім прайсці.

22 чэрвеня, у хуткім часе пасля выступлення на радыё Молатава, на беразе воз. Дрывяты адбыўся мітынг жыхароў Браслава. На ім з гнеўнымі словамі асуджэння агрэсара і палымянымі патрыятычнымі заклікамі — разграміць фашысцкую Германію — выступалі прадстаўнікі райкама партыі, райвыканкома, актывісты з мясцовых жыхароў. Усе яны запэўнівалі прысутных, што вораг хутка будзе разгромлены на яго ж тэрыторыі непераможнай Чырвонай Арміяй і насельніцтву не трэба ні аб чым непакоіцца.

23 і 24 чэрвеня праз Браслаў у заходнім напрамку прайшлі пяхотныя часці Чырвонай Арміі, артылерыя, танкі. Жыхары райцэнтра з надзеяй глядзелі на іх. Але ўжо на наступны дзень становішча рэзка змянілася. Цяпер ужо ў зваротным напрамку — на ўсход у беспарадку спешна адступалі савецкія войскі. Па гораду папоўзлі трывожныя чуткі, што немцы разбілі Чырвоную Армію на граніцы і хутка прасоўваюцца наперад. Людзей ахапіла паніка. Служачыя партыйных і савецкіх устаноў з сем'ямі паспешліва пакідалі райцэнтр. Людзі з жахам чакалі разгортвання далейшых падзей, асабліва яўрэйскае насельніцтва, якое складала большасць жыхароў Браслава.

Галоўныя напрамкі наступлення нямецкіх войск мінулі Браслаўшчыну, таму значных баёў тут не адбывалася. Праз тэрыторыю раёна адступалі часці і падраздзяленні 11-й і 22-й армій Заходняга фронту. Напярэдадні вайны гэтыя арміі дыслацыраваліся ў Літве, непадалёку ад дзяржаўнай граніцы і ў ліку першых прынялі на сябе удары гітлераўскіх войск. У выніку жорсткіх баёў яны панеслі вялікія страты, шэраг часцей былі амаль поўнасцю знішчаны або дэмаралізаваны. Рэшткі армій адступалі ў напрамку на Дзвінск, Полацк, уступаючы ў жорсткія схваткі з наступаючым праціўнікам.

*У. І. Лемяшонак*

### З журнала баявых дзеянняў 126-й сд за 28 чэрвеня — 7 ліпеня 1941 г.

«Адыходзім пад няспыннымі налётамі штурмавой і бамбардзіровачнай авіяцыі і ўздзеяннем наземнага праціўніка пры адсутнасці харчавання і фуражу, гаручага і сувязі з вышэйстаячымі штабамі...».

## З нарыса «Баявы шлях 126-й сд у чэрвені—жніўні 1941 г.»

«...Раніцай 28 чэрвеня дывізія пераправілася праз р. Вілію ў раёне населеных пунктаў Муснікі, Чабішкі. 690-ы сп пераправіўся ў 15—18 км на поўнач ад в. Чабішкі. На пераправе нашы часці падвергліся налёту варожых самалётаў і артабстрэлу з боку праціўніка. У выніку адсутнасці гаручага на пераправе пакінута шмат аўтамышын і трактараў», затоплена ў рацэ некалькі гармат. Пасля пераправы дывізія адыходзіла па маршруту: Чабішкі, Свіненай, Малетай, ст. Ігналіна, м. Тверач, Казяны. 2 ліпеня ў раёне м. Казяны часці дывізіі фарсіравалі раку Дзісна. Першым пераправіўся 690-ы сп, які ішоў ў авангардзе дывізіі. Полк заняў абарону на супрацьлеглым беразе і забяспечваў пераправу астатніх часцей дывізіі. На пераправе нашы падраздзяленні падвяргаліся налёту варожай авіяцыі, артылерыйскаму і мінамётнаму абстрэлу. 690-ы сп выслаў за р. Дзісну разведку пад камандаваннем лейтэнанта Паўленкі, якая сутыкнулася з атрадам матацыклістаў. Лейтэнант Паўленка арганізаваў засаду і кулямётным агнём знішчыў 30—35 матацыклістаў праціўніка. Разведка выявіла вялікую колькасць фашысцкіх аўтаматчыкаў і паведаміла аб гэтым нашай артылерыі. Лейтэнант Бегаўлёў трапным агнём палкавой артылерыі знішчаў каля 10 аўтамашын з нямецкай пяхотай.

3 ліпеня праціўнік пачаў пераправу праз раку ўброд. Наша артылерыя адкрыла агонь, знішчаючы зарваўшыхся фашыстаў. Завяршылі разгром часцей праціўніка на пераправе камандзір мінамётнай роты 690-га сп лейтэнант ардэнаносец Дарашэнка і камандзір кулямётнай роты гэтага ж палка ст. лейтэнант Сіянаў. Рака пакрылася фашысцкімі трупамі. Знішчана звыш 100 гітлераўцаў. Вораг адступіў і пачаў шукаць пераправу ў іншым месцы.

4 ліпеня ўвесь дзень вялася моцная артылерыйская дуэль. На зыходзе дня сталі канчацца снарады ў нашых артылерыстаў (сувязі з базамі забеспячэння не было з самага пачатку баявых дзеянняў). Праціўнік кідаў у бой усё новыя і новыя сілы, ствараючы вялікую перавагу ў тэхніцы і жывой сіле. Часці нашай дывізіі былі вымушаны адступіць на новыя рубяжы ў раёне ракі Заходняя Дзвіна»*

ЦАМА РФ, ф. 126 сп, воп. 1, спр. 9, л. 9.

## Спіс страт асабовага складу 28-га асобнага разведбатальёна 5-й стралковай дывізіі з 22.6.1941 па 24.7.1941 г.

**МАКАРАЎ**, чырвонаармеец, шавец, нарадзіўся ў 1920 г., прапаў без вестак у раёне м. Відзы.

**СЯРЭБРАНІКАЎ**, чырвонаармеец, камандзір машыны, нарадзіўся ў 1920 г., прапаў без вестак ў раёне м. Відзы.

**ВЛАСАЎ**, чырвонаармеец, вежавы стралок, нарадзіўся ў 1920 г., прапаў без вестак у раёне м. Відзы.

**ЗАЙЦАЎ**, чырвонаармеец, механік-вадзіцель, нарадзіўся ў 1920 г., прапаў без вестак у раёне м. Відзы.

**ПАШЫН**, чырвонаармеец, механік-вадзіцель, нарадзіўся ў 1919 г., прапаў без вестак у раёне м. Відзы.

**БУРАЧАНКОЎ**, чырвонаармеец, стралок, нарадзіўся ў 1919 г., прапаў без вестак у раёне м. Відзы.

*ЦАМА РФ, ф. 5 сд, воп. 2, спр. 4, л. 35—37.*

* Тут і далей усе дакументы з Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі перакладзены з рускай мовы.

## З імянных спісаў беззваротных страт ваенна-паветраных сіл Заходняга фронту

...Са страт 46-й авіядывізіі з 30.6 па 10.7.1941 г.

**НОВІЧКАЎ Георгій Сямёнавіч**, капітан, камандзір эскадрыллі, нарадзіўся ў 1907 г. ў Ленінградзе. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**СЫСОЕЎ Іван Рыгоравіч**, капітан, начальнік сувязі палка, нарадзіўся ў 1913 г. ў Арлоўскай вобласці. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**МІРАШНІЧЭНКА Сяргей Іванавіч**, старшы сяржант, паветраны стралок-радыст, нарадзіўся ў 1916 г. ў Палтаве. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**СІНІЦЫН Яўген Мікалаевіч**, старшы сяржант, паветраны стралок-радыст, нарадзіўся ў 1918 г. ў г. Волхаве. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ЗУБЧАНКА Фёдар Макаравіч**,малодшы лейтэнант, пілот, нарадзіўся ў 1912 г. ў г. Дзяржынску.

**КУДРАКОЎ Леанід Сцяпанавіч**,лейтэнант, стралок-штурман, нарадзіўся ў 1912 г. ў г. Вічуге. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**САЛДАТАЎ Павел Аляксандравіч**, малодшы сяржант, стралок-радыст, нарадзіўся ў г. Юр'еве-Польскім. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ЗІНЯКІН Віктар Сяргеевіч**, лейтэнант, начальнік сувязі эскадрыллі, нарадзіўся ў 1914 г. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ЧАРАПОЎСКІ Пётр Андрэевіч**,малодшы сяржант, стралок-радыст, нарадзіўся ў 1921 г. ў Кіргізіі, 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ІВАНЧАНКА Іван Уласавіч**, малодшы лейтэнант, нарадзіўся ў 1918 г. ў Азоўскім р-не Растоўскай вобласці. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ГУБІН Іван Мікалаевіч**, лейтэнант, стралок-бамбардзіроўшчык, нарадзіўся ў 1916 г. ў Варонежскай вобласці. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

**ФІЛІПАЎ Павел Аляксеевіч**, малодшы сяржант, стралок-радыст, нарадзіўся ў 1920 г. ў Казахстане. 3.7.1941 г. не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава.

*ЦАМА РФ, ф. ВВС, воп. 2580, спр. 374.*

## З кнігі ўліку страт асабовага складу 7-га авіяцыйнага палка дальніх бамбардзіроўшчыкаў

**ГАЛАКЦІЁНАЎ Рыгор Васілевіч**, нарадзіўся ў 1914 г. ў Арэнбургскай вобласці, лейтэнант, штурман звяна, збіты ў паветраным баі 30.6.1941 г. ў раёне Браслава.

**САЗОНЕНКА Леанід Рыгоравіч**, нарадзіўся ў 1917 г. ў г. Харкаў, сяржант, стралок-радыст, збіты ў паветраным баі 30.6.1941 г. ў раёне Браслава.

*ЦАМА РФ, ф. ВВС, воп, 704166, спр. 2.*

Па сведчаннях старажылаў высветлены абставіны двух паветраных баёў непадалёку ад Браслава ў канцы чэрвеня – пачатку ліпеня 1941 г. Аб паветраным баі над возерам Дрывяты расказвае тагачасны жыхар в. Пузыры І. Крыжаноўскі: «У той дзень мы з бацькам лавілі рыбу на лодцы непадалёку ад Рацкага маста. Потым з-за леса з'явіліся самалёты. Два нямецкія самалёты круціліся вакол вялізнага самалёта з зоркамі на крылах. Напэўна гэта быў бамбардзіроўшчык. Чуліся стрэлы. Савецкі самалёт хутка задыміўся і пачаў падаць на возера Дрывяты. Мы бачылі як ён коламі ледзве не зачапіў востраў, працягнуў яшчэ трохі, упаў на ваду і выбухнуў. Мы хуценька паграблі да гэтага месца, але нямецкія самалёты зрабілі яшчэ адзін заход і абстралялі лодку. Праз некалькі дзён целы двух лётчыкаў хвалямі прыбіла да берага возера каля в. Шалтэні. Пахаваць іх вырашылі на востра-

ве. Нехта прапанаваў пасадзіць над магіламі сасну, каб пасля вайны лягчэй знайсці месца пахавання. Дакументы, знойдзеныя пры лётчыках, захоўвалі пакуль не прагналі немцаў, потым адправілі іх некуды ў Маскву. Пазней ў вёсцы казалі, што ў самалёце быў трэці лётчык. Хвалямі яго аднесла аж да в. Вязкі пад Браславам».

Жыхарцы в. Шалтэні Ю. Міхневіч, якая таксама бачыла гэты бой, запомнілася, што лётчыкі над возерам выкінуліся з самалёта на парашутах, але было нізка і іх накрыла палаючымі рэшткамі самалёта.

Яшчэ адзін паветраны бой адбыўся непадалёку ад в. Злота. Пілоту ўдалося пасадзіць палаючую машыну на полі каля вёскі. Калі прыбеглі людзі, то ўбачылі каля самалёта скрываўленага, знявечанага, але жывога пілота. Два яго таварышы засталіся ў кабіне, яны былі мёртвыя. Іх хуценька выцягнулі з самалёта і аднеслі ўбок. У той жа дзень лётчыкаў пахавалі побач з рэшткамі самалёта, над насыпам паставілі авіяцыйны кулямёт. Параненага лётчыка адвялі ў вёску, пакармілі, далі цывільную вопратку. Не затрымліваючыся ён пайшоў у бок фронту.

У канцы 80-х гг. супрацоўнікамі Браслаўскага музея былі зроблены спробы знайсці месцы пахавання лётчыкаў, якія, аднак, скончыліся безвынікова. Не ўдалося ўстанавіць і прозвішчы загінуўшых. Сярод дакументаў Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі за 1941 г. адшуканы спіс лётчыкаў ваенна-паветраных сіл Заходняга фронту, якія загінулі ў першыя месяцы вайны. Насупраць васьмі прозвішчаў адзначана: «не вярнуўся з баявога задання ў раёне Браслава». Ёсць падстава лічыць, што сярод гэтых васьмі лётчыкаў знаходзяцца і тыя, што загінулі ў апісаных паветраных баях.

Пачатак вайны быў нечаканы, раптоўны для жыхароў Браслаўшчыны, для мясцовага кіраўніцтва. У спешцы праходзіла эвакуацыя некаторых устаноў, савецкіх, партыйных работнікаў, іх сем'яў. Не адбылося і без недарэчнасцей. Так, напрыклад, на волю лёсу былі кінуты выхаванцы Браслаўскага дома груднога дзіцяці, якія засталіся ў акупіраваным горадзе і выжылі дзякуючы самаахвярнай працы супрацоўнікаў, дапамозе мясцовых жыхароў. Былі і іншыя прыклады. Служачыя Браслаўскага аддзялення дзяржбанка А. Ханяк, М. Ліленкоў, старшы міліцыянер С. Мандрык перад самым прыходам гітлераўцаў у Браслаў здолелі вывезці з банка ўсе наяўныя грошы. Звыш месяца, пад бамбёжкамі, абстрэламі дабіраліся яны да Масквы, дзе 1.8.1941 г. здалі грошы прадстаўнікам дзяржбанка. Аб гэтай падзеі быў складзены наступны акт: «Мы, што ніжэй падпісаліся, з аднаго боку — галоўны касір Маскоўскай гарадской канторы дзяржбанка Трошын П.Ф., касіры Ліфецаў А.С., Марозаў С.М., Дубараў В.В. і намеснік галоўнага бухгалтара Лазарава С.І., з другога боку — часова выконваючы абавязкі упраўляючага Браслаўскай канторы дзяржбанка Ханяк А.С., галоўны бухгалтар таго ж аддзялення Ліленкоў М.П. і старшы міліцыянер Мандрык С.І. склалі сапраўдны акт аб тым, што ў сувязі з эвакуацыяй вышэйназванага аддзялення сённяшнім днём першымі прынята, а другімі здадзена грошай у суме 1 052 390 рублёў 95 капеек...».

## Акупацыя

27 чэрвеня 1941 г. нямецкія войскі ўступілі ў Браслаў. Асаблівасцю раёна было тое, што на яго тэрыторыі не адбывалася значных баёў. Галоўныя напрамкі наступлення часцей вермахта мінулі яго.

Успамінае жыхарка райцэнтра В. Баладэ: «Немцы ўвайшлі, неяк уцягнуліся ў горад вялізнай шэра-зялёнай калонай, абкутанай клубамі шэрага пылу. Мы, дзеці, збегліся паглядзець на чужынцаў. Побач з калонай рухалася тэхніка, было шмат фурманак. Потым наляцелі савецкія самалёты, іх было каля 6—7. Немцы рассыпаліся па абочынах. Мы пачулі свіст бомб, недзе ў горадзе выбухнула, потым яшчэ і яшчэ. Неяк раптоўна Браслаў стаў шэрым і смярдзючым ад выбухаў. Пасля налёту немцы хуценька ўскочылі на фурманкі і рушылі далей. Мы яшчэ доўга корпаліся на тым месцы, дзе хаваліся салдаты, знаходзілі там сапраўдныя каштоўнасці — шакаладку, губны гармонік, цукерку ці яшчэ што. Як вярнуліся дадому, пачулі аб першых ахвярах. У нашых суседзяў Сяліцкіх загінула маленькая дачка Маня, бомбай ёй адарвала галаву, ногі, рукі. Былі і яшчэ забітыя».

Аб тых першых ахвярах вайны памятаюць многія браслаўскія старажылы. Па іх сведчаннях, у той дзень загінулі 14 чалавек. Іх пахавалі ў адной магіле — першай брацкай магіле на Браслаўшчыне, якіх шмат з'явіцца за гады вайны. Сярод загінуўшых былі: настаўніца Чарняўская, чатыры малалетнія дзяўчынкі Ядзэвіч, сяляне з в. Лапкі Васіль Апячонак і Аляксей Александровіч, якія ў той дзень прыехалі ў Браслаў па сваіх справах.

А вось як тыя падзеі адкладаліся ў памяці былога жыхара Браслава М. Мілюціна: «На чацвёрты дзень вайны, у чацвер, з'явіліся нямецкія разведчыкі на матацыклах, агледзелі ўсё навакол і з'ехалі. У начы праз горад прайшлі нямецкія войскі, танкі, артылерыя, пакінуўшы ў Браславе невялікі гарнізон. Нямецкія салдаты пры садзейнічанні часткі мясцовых жыхароў пачалі уводзіць новыя, нечалавечыя парадкі».

З моманту заняцця нямецкімі войскамі тэрыторыі Браслаўшчыны пачаўся самы трагічны перыяд ва ўсёй яе шматвяковай гісторыі — перыяд фашысцкай акупацыі.

...Акупацыйная палітыка нямецка-фашысцкіх захопнікаў у адносінах да народаў Усходняй Еўропы была старанна распрацавана яшчэ да нападу на Савецкі Саюз. Найбольш поўна яна была выкладзена ў генеральным плане «Ост», які быў пыдрахтаваны ўжо ў 1940 г. Гэты план прадугледжваў знішчэнне, высяленне, анямечванне насельніцтва Беларусі, як і іншых рэспублік Савецкага Саюза, для канчатковага рашэння так званага «славянскага пытання».

Генеральны план «Ост» прадугледжваў знішчэнне 75 працэнтаў беларускага насельніцтва, якое не адпавядае з пункту гледжання гітлераўцаў па расавых і палітычных прыкметах, астатнія 25 працэнтаў падлягалі анямечванню і выкарыстанню ў якасці сельскагаспадарчых рабоў.

З самага пачатку вайны гітлераўцы прымалі актыўныя меры для ажыццяўлення сваіх злавесных планаў. З мэтай масавага знішчэння і падаўлення жыхароў Беларусі яны накіравалі сюды, у тым ліку і на Браслаўшчыну, шматлікія карныя, паліцэйскія часці, войскі СС, чыноўнікаў і інш.

Адміністратыўна Беларусь разам з Літвой, Латвіяй і Эстоніяй увайшла ў

склад рэйхскамісарыята «Остланд». Браслаўскі і большая частка Відзаўскага раёнаў былі ўключаны у генеральны камісарыят «Беларусь», заходняя частка Відзаўскага раёна — у генеральную акругу Літвы.

Уся паўната ўлады ў раёне належыла фашыскай ваеннай акупацыйнай адміністрацыі ў асобе ордскамендзнта Браслаўскай ортскамендатуры, якая размяшчалася па вуліцы Лібкнехта, дзе зараз знаходзіцца райаддзел міліцыі. Насельніцтва было пазбаўлена элементарных грамадзянскіх правоў і чалавечых свабод. Галоўным сродкам насаджэння і падтрымання «новага парадку» быў масавы крывавы тэрор, які ажыццяўлялі акупацыйныя ўлады.

Каб замаскіраваць тэрарыстычную, грабежніцкую палітыку, зрабіць выгляд самакіравання і такім чынам узмацніць уплыў на насельніцтва, акупанты стварылі мясцовыя дапаможныя ўстановы: у раёне — раённая або уездная ўправа на чале з прызначаным гітлераўцамі бургамістрам, якая знаходзілася ў будынку цяперашняга райвыканкама, у былых сельскіх саветах — валасныя ўправы на чале з валаснымі старшынямі, у вёсках — старастамі.

Эканамічная палітыка акупантаў у раёне была накіравана на рабаванне і каланізацыю яго тэрыторыі. Гэтай мэце была падпарадкавана і іх аграрная палітыка. Сяляне пазбаўляліся правоў на зямлю. Лепшыя землі акупанты раздавалі нямецкім каланістам, былым памешчыкам і сваім памагатым. Яны вярнулі былым памешчыкам маёнткі і хутары памерам да 60 гектараў. Сяляне, якія працавалі на гэтых землях выганяліся.

Пад шырмай «новага парадку землекарыстання» на базе буйных панскіх гаспадарак, у якіх пры савецкай уладзе былі створаны саўгасы і калгасы, гітлераўцы стварылі так званыя «дзяржаўныя маёнткі». На пасады кіраўнікоў «дзяржаўных маёнткаў» прызначаліся нямецкія «аграномы», якія накіроўваліся з Германіі і нават з Галандыі. Сяляне ў якасці батракоў практычна бясплатна павінны былі апрацоўваць землі маёнткаў.Яны пад страхам пакарання павінны былі вярнуць у такія маёнткі ўсю маёмасць і жывёлу, якую атрымалі пры савецкай уладзе.

| | |
|---|---|
| Браслаўская<br>ўездная ўправа<br>Зямельны<br>рэферэнт | Валасному<br>старшыні<br>ў Браславе |

*16.10.1941 г. № 325/345*

Згодна загада агранома нямецкіх войскаў г-на Блянке трэба праз солтысаў грамад давесці да ведама асоб, у якіх знаходзіцца жывы інвентар з маёнтка Бяльмонты, каб да 20 кастрычніка 1941 г. яны адвялі разам з цапамі і аброцямі ўзятую жывёлу ў той маёнтак, дзе яна раней утрымлівалася.

Прозвішчы асоб, якія не падпарадкуюцца загаду паведаміць уезднаму кіраўніцтву для прыцягнення да адказнасці. Папярэдні спіс дадаецца.

Начальнік уезднай управы
Кавальскі
Зямельны рэферэнт Трабша

Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2848, воп. 1, спр. 52, л. 37.

Каб выкачаць для сябе як мага больш харчу і сыравіны, гітлераўцы шляхам канфіскацый і кантрыбуцый забіралі ўсё, што толькі маглі: збожжа, жывёлу, хатнюю птушку, рыбу, гародніну і г.д. Зімой 1941—1942 гг. нямецкімі ўладамі быў выдадзены загад грамадзянам раёна здаць усю воўну, скуры, ільняное семя, гарох і іншыя прадукты. На працягу трох дзён прадпісавалася здаць кажухі, валёнкі і іншыя цёплыя рэчы.

Сельскае насельніцтва абкладалася вялікімі падаткамі, паборамі, пастаўкамі, працоўнымі павіннасцямі. З кожнага гектара зямлі, незалежна ад яе якасці і памера пасяўной плошчы, сяляне павінны былі здаць 100 кг зерня, 200 кг бульбы, 30 кг мяса. Калі ўлічыць якасць ворнай зямлі Браслаўшчыны і нізкі ўзровень яе апрацоўкі і сельскагаспадарчай тэхнікі, то стане зразумела, што выканаць такія пастаўкі было амаль немагчыма. Акрамя таго сяляне павінны былі здаваць ад кожнай каровы па 250 літраў малака, а ад кожнай другой — 500 літраў, ад кожнай курыцы па 30 яек.

Падатковая палітыка акупантаў была накіравана і на рабунак грашовых сродкаў мясцовага насельніцтва. Яно павінна было плаціць безліч падаткаў.

Аднак пастаўкі сельскагаспадарчых прадуктаў і грашовыя падаткі былі не адзіным цяжарам, які ўскладаўся акупантамі на жыхароў раёна. У час пасяўной і ўборачнай кампаній сяляне зганяліся ў дзяржаўныя маёнткі для адбыцця працоўнай павіннасці. За невыкананне такой павіннасці яны жорстка караліся. У адной з лістовак Вілейскага падпольнага абкома партыі паведамлялася: «У вёсцы Няфёдаўка Браслаўскага раёна нямецкія бандыты расстралялі сям'ю селяніна з 9 чалавек толькі за тое, што яны з-за хваробы у час жніва некалькі дзён не выйшлі на працу ў маёнтак».

За самыя нязначныя праступкі шырока ўжываліся цялесныя пакаранні — біццё палкамі. Гэта называлася «класці на бочку».

Для адбывання працоўнай павіннасці ўсе вёскі былі замацаваны за вызначанымі маёнткамі. У зімовы перыяд сялян выганялі на расчыстку ад снежных заносаў дарог. Такім жа чынам у прымусовым парадку яны павінны былі адбываць павіннасці на розных грамадскіх работах: лесанарыхтоўках, рамонце дарог, лесапасадках і г.д.

Значную ўвагу акупанты ўдзялялі ідэалагічнай апрацоўцы насельніцтва. У сваіх газетах і часопісах, якія сяляне выкарыстоўвалі галоўным чынам на курава, яны крывадушна разглагольствавалі аб развіцці беларускай мовы, культуры. І ў той жа час у сакавіку 1942 г. па загаду акупацыйных улад жандармерыя і паліцыя праводзілі канфіскацыю у школах, бібліятэках і прыватных дамах усіх кніг, падручнікаў, старых газет і часопісаў, тапаграфічных карт, якія потым адвозіліся ў Глыбокае і там знішчаліся.

З канца 1941 г. ў раёне былі адкрыты пачатковыя і няпоўныя сярэднія школы.

Для кантролю за дзейнасцю школ у раённай управе ўводзілася пасада школьнага інспектара, у абавязкі якога ўваходзіла і выкананне іншых дробязных спраў. Інспектары таксама распараджаліся і настаўніцкімі кадрамі. Настаўнікаў не хапала, таму што пэўная колькасць іх не жадала працаваць у арганізаваных акупантамі школах. Гэта акалічнасць прымусіла адкрыць у Браславе паскораныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў.

Свабоднае перамяшчэнне па тэрыторыі раёна забаранялася. На праезд фурманкі за межы воласці патрабаваліся спецыяльныя пропускі — «аусвайсы». Усе грамадскія арганізацыі былі забаронены.

Трэба адзначыць, што на кіруючых пасадах фашысцкай адміністрацыі ў раёне аказаліся патрыёты, якія з самага пачатку павялі актыўную барацьбу з захопнікамі, шмат чаго рабілі для выратавання савецкіх людзей. Гэта асабліва тычыцца намесніка раённага бургамістра А.А. Васілеўскага — арганізатара і кіраўніка Браслаўскага падполля. Нічога кепскага жыхары Браслава не гаварылі і пра бургамістра раёна Кавальскага.

Кантроль над акупіраванай тэрыторыяй раёна забяспечвала сістэма нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Найбольш буйным з іх быў гарнізон у Браславе, які летам 1943 г. налічваў 125 чалавек, з іх 20 немцаў, астатнія паліцэйскія з мясцовых здраднікаў; у Опсе — 96 чалавек, з іх 6 немцаў; у Слабодцы — 45 чалавек, з іх 5 немцаў. Буйныя гарнізоны размяшчаліся таксама ў Відзах, Друі і іншых населеных пунктах. Меншыя па

колькасці былі паліцэйскія ўчасткі ў іншых вёсках.

Нягледзячы на жорсткі фашысцкі прыгнёт, жыхары раёна аказвалі супраціўленне, падымаліся на барацьбу з акупантамі. Супраціўленне гітлераўцам насіла рознабаковы характар. Самай першай і найбольш масавай яго формай быў сабатаж, невыкананне распараджэнняў акупацыйных улад. Аб гэтым сведчыць наступны дакумент:

| | |
|---|---|
| Браслаўская валасная ўправа | Браслаўская раённая ўправа |
| *22.8.1942 г. № 596* | Аддзел адміністрацыйны |

Браслаўская валасная ўправа гэтым просіць аштрафаваць гр. Далецкага Станіслава, Крывушонка Вітольда, жыхароў в. Дзегцяры Браслаўскай воласці і гр. Арцёма Міхаіла і Арцёма Франца, жыхароў в. Лейшышкі і гр. Вашкеля Іосіфа, Папакуля Сцяпана, Талочка Дзеанізія, жыхароў в. Дукелі Браслаўскай воласці за ўпартую адмову выехаць у Богіна для перавозкі дроў у Опсу для нямецкіх улад.



Малюнак партызанскага разведчыка П. Касцюкевіча «На пажарышчы».

За адмову выйсці на работу ў маёнтак Бяльмонты, просім аштрафаваць гр. Вашкеля Іосіфа, Лабанарскага Станіслава, Папакуля Андрэя і Талочка Дзенізія, жыхароў в. Дукелі Браслаўскай воласці.

Старшыня Сакратар

*Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2848, воп. 1, спр. 21, л. 30.*

Аб масавай форме пасіўнага супраціўлення жыхароў Браслаўшчыны фашысцкім акупантам сведчыць невыкананне імі падаткаў. Так, падаткі на 1942 г. па Браслаўскаму раёну былі выкананы толькі на 20 працэнтаў. Нягледзячы на прынятыя гітлераўцамі жорсткія рэпрэсіўныя меры падаткі па раёну да мая 1943 г. былі выкананы на 50 працэнтаў. Тады акупанты павялічылі план паставак збожжа на 10 працэнтаў, малака з кожнай каровы на 400 літраў замест папярэдніх 250. Аднак гэта не дапамагло. На працягу мая 1943 г. партызаны знішчылі большую частку малочных заводаў і сепаратарных пунктаў, у выніку чаго план здачы малака ў першай палавіне лета 1943 г. ўпаў да 20 працэнтаў.

Абапіраючыся на сістэму ваенных і паліцэйскіх гарнізонаў, акупанты праводзілі ўсе акцыі, звязаныя з адабраннем у насельніцтва жывёлы, збожжа, рыбы і г.д. Ужо праз некалькі дзён пасля захопу тэрыторыі раёна жыхары адчулі «новы нямецкі парадак». Перш за ўсё гітлераўцы пачалі выяўляць і расстрэльваць камуністаў, камсамольцаў, савецкіх актывістаў. Быў расстраляны старшыня Каштальскага сельсавета Скавырка. У вёсцы Мацешы немцы без усякіх прычын па зверску забілі дзевяць сялян. Палітыка генацыду і «выпаленай зямлі» ўступала ў дзеянне.

Адным з асноўных прыёмаў і спосабаў ажыццяўлення нацысцкай палітыкі генацыду супраць беларускага народу, у тым ліку і Браслаўшчыны, з'яўлялася масавае знішчэнне населеных пунктаў разам з жыхарамі.

*У. І. Лемяшонак*

# Дакументы сведчаць

**Пералік разрабаваных племянных кароў
з маёнтка Бяльмонты**

| Мясцовасць | Імя і прозвішча ў каго знаходзіцца жывёла | Колькасць кароў | Колькасць цёлак | |
|---|---|---|---|---|
| Бяльмонты | Будрэвіч Мікалай | 1 | | |
| | Мароз Мікалай | 1 | | |
| Альгердова | Баргдановіч Франц | 1 | | |
| | Багдановіч Мікалай | 1 | | |
| Ахрэмаўцы | Жоўдзін Барыс | 1 | | |
| | Саковіч Іосіф | 1 | | |
| | Жук Фёдар | | 1 | |
| Азяраўцы | Пяткун Станіслаў | 1 | | |
| Марозаўшчына | Сапун Франц | 1 | | |
| Разета | Мацешава Ганна | 1 | | |
| Укольск | Ермашыха | | 1 | |
| Мацешы | Осіпава Таццяна | 1 | | Ёдскай вол. |
| | Ягорава Васта | 1 | | Ёдскай вол. |
| Браслаў | Радзевіч Іосіф | 1 | | Мае пасведч. ад 5.XI.41 — дазвол павятовай управы |
| Турка | Бондар Іосіф | 1 | | |
| | Тамко Ігнат | 1 | | |
| | Лейша Тэафіля | 1 | | |

Упраўляючы маёнткам Бяльмонт
1941 г. 20 верасня.

*Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, ф. 2848, воп. 1 спр. 52, л. 38. Пераклад з рускай мовы.*

## З ЛІСТОЎКІ ВІЛЕЙСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б

*Снежань 1942 г.*

«...Гітлераўскія банды ўварваліся на савецкую зямлю з адзінай мэтай: знішчыць народы нашай краіны... Яны ўвялі катаржна-прыгонную працу і прымушаюць вас пад пагрозай расстрэлу працаваць на іх дзень і ноч. У маёнтку Мікалаева Браслаўскага раёна гаспадарыць фашысцкі ўблюдак Верда, які прыехаў з Галандыі. На ўсю акругу гэты сабака з гітлераўскай псарні праславіўся жорсткімі пабоямі сялян навакольных вёсак. Сяляне вёсак Купчэлі, Баркунішкі, Янулі, Саўлішкі, Заставішкі, Пабяржы, Жураvoўшчына, Станаўка і іншых літаральна замучаны гэтым крывасмокам, катаржна-рабскай працай у маёнтках Некрашэўскім, Дрысвяты.

Такі парадак гітлераўскія захопнікі ўвялі на ўсёй акупаванай тэрыторыі Беларусі. Усюды па спінах сялян гуляе бізун, пануе свавольства і зверскае збіванне нявінных жыхароў.

Акупанты адбіраюць у працоўных сялян апошні хлеб, жывёлу, фураж. Сяляне Вілейшчыны разораны, абрабаваны немцамі. Моладзь адпраўляецца на катаргу ў Германію, дзе яе чакае смерць і толькі смерць...»

*Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1952. С. 132–133.*

**Населеныя пункты Браслаўскага раёна, знішчаныя разам з жыхарамі ў перыяд фашысцкай акупацыі і не адноўленыя ў пасляваенны час**

| Назва паселішча | Колькасць жыхароў напярэдадні вайны | | Колькасць знішчаных жыхароў | | Заўвагі |
|---|---|---|---|---|---|
| | двароў | насельн. | двароў | насельн. | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Лабэцкія | 11 | 42 | | 34 | лістапад 1943 г. |
| Рэпаўшчына | 20 | 96 | 20 | 92 | снежань 1942 г. |

**Населеныя пункты Браслаўскага раёна, знішчаныя разам з жыхарамі ў перыяд фашысцкай акупацыі і адноўленыя ў пасляваенны час**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Баравыя | 48 | 198 | 46 | 196 | лістапад 1942 г. |
| Плятарова | 19 | 180 | 19 | 90 | лістапад 1942 г. |
| Пруднікі | 12 | 48 | 12 | 46 | лістапад 1942 г. |
| Стайкі | | | 43 | 127 | лістапад 1942 г. |

**Населеныя пункты Браслаўскага раёна, знішчаныя з часткай насельніцтва ў перыяд фашысцкай акупацыі і адноўленыя ў пасляваенны час**

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Азярава | 85 | 230 | 85 | 72 | снежань 1942 г. |
| Азяраўка | 6 | 24 | 6 | 7 | снежань 1942 г. |
| Аколіца | 35 | 115 | 35 | 12 | кастрычнік 1943 г. |
| Альбенаўка | 9 | 35 | 9 | 9 | кастрычнік 1943 г. |
| Альбінова | 6 | 28 | 6 | | кастрычнік 1943 г. |
| Ахрэмаўцы | 93 | 296 | 84 | | кастрычнік 1943 г. |
| Барсукі | 8 | 24 | 8 | 6 | люты 1943 г. |
| Бабылі | 40 | 198 | 40 | 25 | кастрычнік 1943 г. |
| Богінка | 16 | 54 | 16 | 11 | снежань 1942 г. |
| Браслаўская Лука | 16 | 80 | 16 | 17 | кастрычнік 1943 г. |
| Быкаўшчына | 11 | 67 | 11 | 29 | кастрычнік 1943 г. |
| Ваўкі | 32 | 101 | 32 | 19 | люты 1943 г. |
| Гайдукоўшчына | 10 | 38 | 10 | 8 | кастрычнік 1943 г. |

*Працяг табліцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Гайлешы | 80 | 320 | 78 | 24 | кастрычнік 1943 г. |
| Гірдзюшы | 18 | 98 | 18 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Гаравыя | 5 | 27 | 5 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Гарохаўка | 9 | 38 | 9 | 7 | люты 1942 г. |
| Грыгароўшчына | 28 | 92 | 28 | 11 | люты 1943 г. |
| Гродзішкі | 12 | 63 | 12 | 11 | кастрычнік 1943 г. |
| Дзегцяры | 50 | 234 | 49 | 12 | кастрычнік 1943 г. |
| Дзямідава | 4 | 23 | 4 | 3 | кастрычнік 1943 г. |
| Даўяты Вялікія | 18 | 98 | 18 | 6 | кастрычнік 1943 г. |
| Даўяты Малыя | 17 | 89 | 17 | 7 | кастрычнік 1943 г. |
| Дрысвяты | 108 | 970 | 30 | 15 | чэрвень 1944 г. |
| Дубраўка | 86 | 296 | 86 | 48 | люты 1943 г. |
| Дундаўшчына | 8 | 38 | 8 | | кастрычнік 1943 г. |
| Жвірблі | 8 | 33 | 8 | | кастрычнік 1943 г. |
| Жэрдзішкі | 9 | 38 | 9 | 3 | кастрычнік 1943 г. |
| Жырнелішкі | 17 | 83 | 16 | | кастрычнік 1943 г. |
| Забор'е | 30 | 125 | 30 | 12 | кастрычнік 1943 г. |
| Задворцы | 8 | 25 | 8 | | кастрычнік 1943 г. |
| Золава | 4 | 12 | 4 | 5 | кастрычнік 1943 г. |
| Ідолінава | 5 | 21 | 5 | | кастрычнік 1943 г. |
| Ісаі | 10 | 45 | 10 | 1 | кастрычнік 1943 г. |
| Карасіна | 40 | 182 | 38 | 12 | кастрычнік 1943 г. |
| Казяны | 190 | 640 | 190 | 156 | люты 1943 г. |
| Какоўшчына | 11 | 28 | 9 | | чэрвень 1944 г. |
| Калеснікі | 30 | 101 | 30 | 4 | чэрвень 1944 г. |
| Камарова | 4 | 16 | 4 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Карчы | 6 | 31 | 6 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Кострыўка | 8 | 45 | 8 | 3 | кастрычнік 1943 г. |
| Кумша | 6 | 31 | 6 | | кастрычнік 1943 г. |

*Працяг таблiцы*

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|
| Лінкаўшчына | 6 | 15 | 6 | | кастрычнік 1943 г. |
| Маёраўцы | 6 | 23 | 6 | | кастрычнік 1943 г. |
| Мацешы | 80 | 436 | 80 | 9 | кастрычнік 1943 г. |
| Мілашы | 35 | 165 | 35 | 15 | кастрычнік 1943 г. |
| Марозаўшчына | 8 | 35 | 8 | | кастрычнік 1943 г. |
| Новая Лука | 36 | 180 | 36 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Пастарнакі | 30 | 79 | 30 | 22 | снежань 1942 г. |
| Пабяржы | 6 | 21 | 6 | 3 | кастрычнік 1943 г. |
| Падгайцы | 41 | 121 | 40 | 1 | кастрычнік 1943 г. |
| Падзісеннікі | 13 | 41 | 13 | 16 | снежань 1942 г. |
| Палессе | 5 | 15 | 5 | | кастрычнік 1943 г. |
| П'еўцы | 13 | 75 | 13 | 5 | кастрычнік 1943 г. |
| Рымуці | 31 | 124 | 31 | 2 | кастрычнік 1943 г. |
| Разета | 30 | 123 | 30 | | кастрычнік 1943 г. |
| Рудава | 40 | 235 | 40 | 12 | кастрычнік 1943 г. |
| Рукшы | 29 | 116 | 29 | 7 | кастрычнік 1943 г. |
| Скварцішкі | 12 | 48 | 12 | 5 | кастрычнік 1943 г. |
| Скурцішкі | 6 | 20 | 6 | | кастрычнік 1943 г. |
| Скур'яты | 22 | 68 | 22 | 10 | кастрычнік 1943 г. |
| Стайкі | 32 | 167 | 32 | 59 | кастрычнік 1943 г. |
| Станіслаўград | 16 | 58 | 16 | 11 | снежань 1942 г. |
| Сутуроўшчына | 18 | 53 | 16 | | красавік 1944 г. |
| Тоўшчына | 21 | 98 | 21 | 4 | кастрычнік 1943 г. |
| Шульеўшчына | 7 | 26 | 7 | 9 | люты 1942 г. |
| Якшты | 30 | 88 | 30 | 36 | снежань 1942 г. |
| Янова | 8 | 145 | 8 | 5 | кастрычнік 1943 г. |

*Друкуецца паводле дадзеных зводных табліц па кн.: Нямецка-фашысцкі генацыд на Беларусі (1941—1944). Мн., 1995.*

## Кроў людская — не вадзіца

**У час барацьбы з фашысцкімі акупантамі партызанскія фарміраванні ў сваіх справаздачах адлюстроўвалі і злачынствы гітлераўцаў над мірнымі жыхарамі. У дадзеным выпадку выкарыстаны дакументы ў сведчанні, якія былі складзены партызанамі брыгады «Спартак» у час вайны па слядах тых трагічных падзей.**

...У Відзаўскім раёне... расстраляна 600 мірных грамадзян, спалена ў хатах і хлявах болей 450 чалавек. Вось што ўчынілі звяры ў в. Прудзінкі Дубраўскага сельсавета Відзаўскага раёна. У ёй было 13 двароў, але ў яе прыходзілі жыхары з іншых навакольных вёсак, бо вёска размяшчалася ў лесе і лічылася паселішчам больш падрыхтаваным і бяспечным у выпадку з'яўлення немцаў. У той момант, калі фашысты акружылі вёску, у ёй налічвалася болей 300 чалавек. Усе, хто быў у вёсцы, былі загнаны ў хату і спалены жывымі. Вось што расказаў жыхар вёскі Мікалай Ждан, адзін з усіх, хто ўратаваўся з гэтага пекла:

— Гэта было 24 лістапада 1942 г. Нас было 300 чалавек. Сярод іх старыя, жанчыны дзеці. Усіх нас сагналі ў 10 хат. Дзверы забілі, абапал паставілі кулямёты. У 10 гадзін раніцы па загаду афіцэра салдаты пачалі кідаць гранаты ў вокны, страляць з кулямётаў. Адначасова падпалілі хаты. Жах ахапіў людзей. Параненыя паўзлі праз забітых, прасілі паратунку. Але дапамога не прыходзіла. Хутка абвалілася столь і енк скончыўся. Я не быў паранены, толькі калі абвалілася столь, мне абпаліла рукі. Я зняў з сябе палаючую вопратку, закрыў ёй твар і галаву і скокнуў праз вакно, кінуўся бегчы да лесу. Па мне пачалі страляць і куля трапіла ў нагу, але я быў даўно ў лесе. Я падаўся ў гушчар і тым самым выратаваўся. Адзін з 300...

Таксама лютавалі немцы ў в. Дубраўка, дзе жывымі спалілі ў хлеве 15 чалавек, а двух двухгадовых хлопчыкаў Аўсюка Грышу Умпіровіча Шуру пракалолі штыкамі і таксама кінулі ў палаючы хлеў. Трохгадовы Вася Ліпскі быў забіты ў бацькі на руках пісталетным стрэлам у галаву.

У в. Стаўрова расстралялі і спалілі 77 чалавек, сярод іх старых за 60 гадоў — 9, жанчын — 37, дзяцей ад 1 да 5 гадоў — 18, ад 5 да 10 гадоў — 6, больш за 10 гадоў — 7. Дзяцей расстрэльвалі прама на руках бацькоў. Сям'я Цыўнеля Вячаслава Міхайлавіча была спалена ў сваёй хаце.

У в. Якшты гітлераўцы расстралялі 65 чалавек, у тым ліку 65-гадовага Цішаловіча Пётра Канстанцінавіча. Фашысцкія палачы абрабавалі 20 вёсак Відзаўскага раёна, вывезлі ўсю жывёлу, хлеб і іншыя прадукты, вопратку.

Такія ж расстрэлы правялі немцы таксама ў Браслаўскім раёне, дзе спалілі 5 вёсак і знішчылі 530 мірных жыхароў.

*НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 63, л. 293—295.*

## Мірныя жыхары,спаленыя ў вёсцы Прудзінкі

З ВЁСКІ КАЗЯНЫ

ГАМУЛЬЧЫК Алена Вацлаваўна.
ГАМУЛЬЧЫК Вацлаў Вацлавіч.
ГАМУЛЬЧЫК Антон Вацлавіч.

З ВЁСКІ ПРУДЗІНКІ

ЖДАН Антон Вікенцьевіч.
ЖДАН Саламея.
ЖДАН Алена Антонаўна.
ЖДАН Марыя Антонаўна.
ЖДАН Уладзімір Вікенцьевіч.
ЖДАН Стэфанія Міхайлаўна.
ЖДАН Станіслаў Вікенцьевіч.
ЖДАН Анеля.
ЖДАН Канстанцін Станіслававіч.
ЖДАН Валянціна Станіславаўна.
ЖДАН Фаіна Станіславаўна.
ЖДАН Віктар Станіслававіч.
ЖДАН Часлаў Станіслававіч.
ЖДАН Франц Станіслававіч.
ЖДАН Іосіф Вікенцьевіч.
ЖДАН Еўфрасінья Уладзіміраўна.
ЖДАН Леаніда Іосіфаўна.
ЖДАН Іосіф Іосіфавіч.
ЖДАН Юлія Іосіфаўна.
ЖДАН Мікалай Пятровіч.
ЖДАН Марыя Якубаўна.
ЖДАН Ананій Мікалаевіч.
ЖДАН Іван Мікалаевіч.
ЖДАН Сямён Мікалаевіч.
ЖДАН Сяргей Мікалаевіч.
ЖДАН Любоў Мікалаеўна.
ЖДАН Фаіна Мікалаеўна.
ЖДАН Міхаіл Іванавіч.
ЖДАН Марыя.
ЖДАН Петр Міхайлавіч.
ЖДАН Валянціна Міхайлаўна.
КАЦЯЛОВІЧ Яўген.
КАЦЯЛОВІЧ Соф'я Іосіфаўна.
КАЦЯЛОВІЧ Марыя.
ПАЛІНСКІ Аляксандр Іванавіч.
ПАЛІНСКІ Мечыслаў Аляксандравіч.
ПАЛІНСКАЯ Уладзіслава Аляксандраўна.
ПАЛІНСКАЯ Рэгіна Аляксандраўна.
ПАЛІНСКАЯ Вінцуся.
ПАЛІНСКІ Іван Іванавіч.



Курган на месцы гібелі в. Прудзінкі.



Асобная магіла ў в. Прудзінкі.

**ПАЛІНСКАЯ Браніслава.**
**ПАЛІНСКІ Браніслаў Іванавіч.**
**ПАЛІНСКІ Яўген Іванавіч.**
**ПАЛІНСКАЯ Станіслава Іванаўна.**
**РУДЗЬ Алена.**
**СКУР'ЯТ Іосіф Вікенцьевіч.**
**СКУР'ЯТ Іосіф Іосіфавіч.**
**СКУР'ЯТ Вераніка Іосіфаўна.**
**СКУР'ЯТ Стэфанія Іосіфаўна.**
**СКУР'ЯТ Іван Іосіфавіч.**
**СКУР'ЯТ Казімір Іосіфавіч.**
**СКУР'ЯТ Ядзвіга Іосіфаўна.**
**СКУР'ЯТ Петр Іосіфавіч.**
**СКУР'ЯТ Міхаліна Іосіфаўна.**
**САРОКА Іосіф Іосіфавіч.**
**САРОКА Алена Габрыэлеўна.**
**САРОКА Васіль Іосіфавіч.**
**САРОКА Міхаіл Іосіфавіч.**
**САРОКА Міхаіл Іосіфавіч.**
**САРОКА Серафіма Іосіфаўна.**
**САРОКА Антаніна Іосіфаўна.**
**САРОКА Соф'я Іосіфаўна.**
**САРОКА Міканор Васільевіч.**
**САРОКА Соф'я Васільеўна.**
**СІДАРОВІЧ Сяргей.**
**СІДАРОВІЧ Вольга Іванаўна.**
**СІДАРОВІЧ Іван Сяргеевіч.**

### З ВЁСКІ РАЙСТАНІШКІ

**СЯЎРУК Пётр Казіміравіч**, загінуў у 1944.

**СЯЎРУК Ганна**, загінула ў 1944.

### З ВЁСКІ СТАНІСЛАЎГРАД

**ПАЗНЯКОЎ Рыгор Мацвеевіч**, загінуў у 1942.

**СЕРГІЕВІЧ Юльян Мікалаевіч**, н. у 1900, загінуў у 1942.

### З ВЁСКІ ЯКШТЫ

**ЖЫГАЛКА Мікалай Альфонсавіч**, н. у 1924, загінуў у 1942.

**КАРШАКОЎ Мікалай Паўлавіч**, н. у 1920, загінуў у 1942.

**МЯДЗЮХА Іван.**

**ЦІШАЛОВІЧ Мікалай Фёдаравіч**, н. у 1924, загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Кляменцій Міхайлавіч**, н. у 1897, загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Мікалай Кляменцьевіч**, н. у 1926, загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Міхей Міхайлавіч**, н. у 1892 загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Арсен Міхеевіч**, н. у 1912, загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Фёдар Ягоравіч**, н. у 1894, загінуў у 1942.

**ЦІШАЛОВІЧ Алена Сямёнаўна**, н. у 1924, загінула ў 1942.

**ЦІТОВІЧ Лідзія Лявонаўна**, н. у 1902, загінула ў 1943.

**ЦЫУНЕЛЬ Іван Уладзіміравіч**, н. у 1922, загінуў у 1942.

**ЦЫЎНЕЛЬ Петр Андрэевіч**, н. у 1922, загінуў у 1944.

**ШЫМАН Даніла Данілавіч**, н. у 1907, загінуў у 1942.

## З успамінаў Іосіфа Шымана аб трагедыі вёскі Баравыя

...Гэты невялічкі абеліск стаіць на развілцы дарог, у самым канцы в. Баравыя. Ён для мяне асабліва дарагі. І кожны раз, калі даводзіцца бываць тут, я доўга стаю перад ім і ўспамінаю тую страшэнную лістападаўскую ноч сорак другога. Я быў з імі, чый попел накоіцца ў гэтай брацкай магіле, быў сведкам таго жудаснага злачынства фашысцкіх катаў.

На досвітку ў Баравыя прыйшлі карнікі. Яны ўрываліся ў хаты, забіралі жанчын, старых, дзяцей і зганялі іх у гумно. Пад вечар, падыходзячы да гэтай вёскі, я не ведаў, што траплю ў пастку. І толькі перад самымі хатамі ўбачыў: Баравыя ачэплены фашыстамі, але было ўжо позна. Мяне затрымалі і кінулі ў гумно. Людзей там было так набіта, што няма дзе і сесці. Ніхто яшчэ не ведаў, што чакае нас. Тры разы адчыняліся дзверы і праз іх адно і тое ж пытанне: «Дзе нашы два салдаты? Хто ведае?».

Адказам было маўчанне. А дзесятай гадзіне вечара дзверы адчыніліся. Гарэлі вогнішчы. Наперадзе стаяла шарэнга салдат. З дулаў іх аўтаматаў на нас пазірала смерць. Групамі па 5—7 чалавек нас пачалі пераводзіць у суседняе гумно. Раз-пораз чуліся аўтаматныя чэргі. Вось-вось і мне загадаюць выходзіць. І рашыў выкарыстаць адзіны выхад — схавацца ў салому. Скінуў ватоўку, залез пад сцірту.

У гумне заставалася ўсё менш і менш людзей. Нарэшце вывелі апошнюю групу.



Помнік на месцы гібелі в. Баравыя.



Помнік ахвярам трагедыі ў в. Баравыя.

Дзверы зачыніліся. А мінут праз пяць зноў увайшлі карнікі, асвятлілі ўсё гумно ліхтарамі. На зямлі чарнела мая ватоўка. Адзін з салдат падышоў да саломы, чыркнуў запалкай.

Языкі полымя раслі. «Няўжо канец?» — мільганула ў галаве. Але разважаць было позна. Трэба было неадкладна дзейнічаць. У адным месцы ўжо запылаў дах. Перапоўз на другі бок і там заўважыў двух хлопцаў. Адзін выламваў дошку са сцяны. Толькі праціснуліся, як пачулі крык немца і стрэлы. Хлопцы ўпалі мёртвыя. А я прабег метраў сто ў дымавым заслоне. А калі выбег з дыму, адразу застракатаў аўтамат. Кулі назойліва заціўкалі каля ног. Не паспеў упасці, як куля прашыла руку і я паваліўся ў баразну.

Непадалёку гарэлі гумны. Заднаго даносіліся крыкі жанчын і дзяцей. Доўга ляжаць я не мог, трэба было далей адбегчы ад гэтага страшэннага месца.

Узняўся і пабег да лесу, але нямецкая куля зноў параніла ў нагу. Толькі цемра выратавала мне жыццё...

...І цяпер перад маімі вачыма стаіць тая жудасная ноч, чуюцца апошнія крыкі гінуўшых. Звыш ста пяцідзесяці мірных жыхароў Баравых загінулі тады ў агні. Такое нельга забыць. Гэта і аб іх лёсе тужліва звоняць сёння хатынскія званы.

*«Браслаўская звязда». 1971. 16 ліпеня.*

## Праклящце фашызму!

ахвочыя да працы людзі, любілі жыццё, займаліся спрадвечнай працай на сваёй зямлі. Але 17 лістапада 1942 г. іх напаткаў трагічны лёс. У гэты дзень фашысцкія карнікі знішчылі вёску Баравыя разам з 180 яе жыхарамі.

Пасямейны спіс загінуўшых па памяці склала былая жыхарка в. Баравыя, Раманоўская (Мацук) Галіна Аляксандраўна, якая цяпер жыве ў г. Полацку. Яна цудам не згарэла разам са сваімі бацькамі, двумя малодшымі братамі і бабуляй.

Кожная з 42 загінуўшых сем'яў пазначана згодна нумарацыі хаты. У спісе называюцца толькі прозвішчы і імёны загінуўшых. Імя па бацьку і дату нараджэння памяць Галіны Аляксандраўны не захавала.

Дом № 1: Атрахімовіч Аляксей, Атрахімовіч Софія — жонка, Атрахімовіч Марыя — дачка, Атрахімовіч Аляксандр — пляменнік.

Дом № 2: Грыгелюн Іван, Грыгелюн Анфіса — жонка, Грыгелюн Марыя — дачка, Грыгелюн Серафіма — дачка, Грыгелюн Мікалай — сын.

Дом № 3: Мацук Юлія.

Дом № 4: Атрахімовіч Ганна — маці, Атрахімовіч Пётр — сын, Атрахімовіч Мікалай — сын, Атрахімовіч Аляксандра — нявестка.

Дом № 5: Атрахімовіч Пётр, Атрахімовіч Антаніна — жонка, Атрахімовіч Ганна — маці мужа, Атрахімовіч — сын-немаўля, імя не высветлена.

Дом № 6: Мацук Фёдар, Мацук Любоў — жонка, Мацук Пётр — брат, Мацук Серафіма — жонка Пятра, Мацук Аляксандр — сын.

Дом № 7: Цыўнель Міхал, Цыўнель Марыя — жонка, Цыўнель Лізавета — маці, Цыўнель Вольга — дачка, Цыўнель Таццяна — дачка.

Дом № 8: Мачан Юрый, Мачан Кацярына — жонка, Мачан Ганна — дачка, Мачан Сяргей — сын, Мачан Ганна — нявестка, Мачан Дуня — дачкад.

Дом № 9: Мацук Нарцыз, Мацук Стэфанія — жонка, Мацук Пётр — сын, Мацук Іван — сын.

Дом № 10: Атрахімовіч Аляксандр, Атрахімовіч Капіталіна — жонка, Атрахімовіч Генадзь — сын, Атрахімовіч — маці мужа. У сям'і было трое непаўналетніх дзяцей.

Дом № 11: Атрахімовіч Васіль, Атрахімовіч Серафіма — жонка, Атрахімовіч Таццяна — маці. У сям'і было двое непаўналетніх дзяцей.

Дом № 12: Атрахімовіч Іван, Атрахімовіч Надзея — жонка.

Дом № 13: Мацук Серафім, Мацук Надзея — жонка, Мацук Іван — сын.

Дом № 14: Атрахімовіч Антон, Атрахімовіч Антаніна — жонка, Атрахімовіч Валянціна — дачка, Атрахімовіч Леанід — сын.

Дом № 15: Скур'ят Валерый, Скур'ят Вера — жонка, Сур'ят Антаніна — дачка, Скур'ят Ліна — дачка.

Дом № 16: Мацук Зміцер, Мацук Анфіса — жопка, Мацук Віктар — сын, Мацук Зоя — дачка, Мацук Ганна — дачка.

Дом № 17: Скур'ят Іван, Скур'ят Марыя — жонка.

Дом № 19: Мацук Юльян, Мацук Анісья — жонка, Мацук Міхаіл — сын, Мацук Мікалай — сын.

Дом № 21: Мачан Іван, Мачан Марыя — жонка, Мачан Сафія — дачка, Мачан Еўдакія — дачка, Мачан Антаніна — дачка.

Дом № 22: Атрахімовіч Аляксей.

Дом № 23: Атрахімовіч Пелагея, Атрахімовіч Ганна — дачка, Атрахімовіч Валянціна — дачка, Вікенцій — зяць.

Дом № 24: Цітовіч Эраст, Цітовіч Лідзія.

Дом № 25: Атрахімовіч Валерый, Атрахімовіч Валерый — сын, Атрахімовіч Вера — дачка.

Дом № 26: Озерава Настасся, Озерава Зінаіда — дачка, Озераў Іван — сын.

Дом № 27: Мацук Тамаш, Мацук Алена — жонка, Мацук Аграфена — дачка, Мацук Ліна — дачка, Мацук Мікалай — сын, Мацук Яўген — сын, Мацук Пётр — сын, Мацук Станіслава — нявестка, Мацук Ліліля — дачка Пятра, Мацук Дзіна — дачка Пятра.

Дом № 28: Умпіровіч Антон, Умпіровіч Надзея — жонка, Умпіровіч Іван — сын, Умпіровіч Мікалай — сын, Умпіровіч Лізавета — маці, Умпіровоіч Сафія — дачка, Умпіровіч Марыя — дачка.

Дом № 29: Мацук Ганна, Мацук Пётр — сын, Мацук Домна — нявестка, Мацук Еўдакія — дачка, Мацук Клеапатра — дачка.

Дом № 30: Цыўнель Міхаіл, Цыўнель Марыя — жонка, Цыўнель Вольга — дачка, Цыўнель Таццяна — дачка, Цыўнель Лізавета — маці.

Дом № 31: Воўк Мікалай, Воўк Марыя — жонка. У сям'і было двое непаўналетніх дзяцей.

Дом № 32: Атрахімовіч Лізавета.

Дом № 33: Мацук Іосіф, Мацук Сцепаніда — жонка, Мацук Іосіф — сын, Мацук Леанід — сын.

Дом № 34: Озераў Рыгор, Озерава Надзея — жонка, Озераў Мікалай — сын, Озераў Аркадзь — сын, Озераў Пётр — сын.

Дом № 35: Жыгалка Мікалай, Жыгалка Васіліса — жонка, Жыгалка Еўдакія — маці, Жыгалка Віктар — сын, Жыгалка Зінаіда — дачка.

Дом № 36: Скур'ят Меланння.

Дом № 37: Мацук Аляксандр, Мацук Антаніна — жонка, Мацук Аляксандра — маці, Мацук Павел — сын, Мацук Веньямін — сын.

Дом № 38: Цыўнель Еўдакія, Цыўнель Аграфена — нявестка. У сям'і было чацвёра малалетніх дзяцей.

Дом № 39: Мацук Міхей, Мацук Марыя — жонка, Мацук Зінаіда — маці, Мацук Раіса — дачка, Мацук Аляксандр — сын, Мацук Рыгор — сын, Мацук Алена — сястра.

Дом № 40: Атрахімовіч Іосіф, Атрахімовіч Надзея — жонка, Атрахімовіч Пётр — сын.

Дом № 41: Атрахімовіч Міхаіл, Атрахімовіч Марыя, Атрахімовіч Капіталіна — дачка, Атрахімовіч Еўдакія — дачка Капіталіны, Атрахімовіч Глафіра — дачка Капіталіны.

Дом № 42: Атрахімовіч Пётр, Атрахімовіч Марыя — жонка.

Дом № 43: Гэтай хаты яшчэ не было, але яна была б, як і многія іншыя, таму што ў вёсцы было шмат падрастаючай моладзі, у іх было б будучае, яны б будавалі свае сем'і і свае хаты, калі б у іх не аднялі жыццё.

Нашыя бараўцы — наш вечны боль і смутак. Атрахімовічы, Мацукі... Тут кожны другі быў радней. Праклящце фашызму! Няхай памяць аб зверску закатаваных заўсёды нагадвае НАМ, якая каштоўнасць МІР, і няхай перасцерагае будучае, каб гэтага ніколі не паўтарылася на Зямлі.

Сшытак прысвечаны міжнароднаму году Міра. 1986 год. Яго падрыхтавала да друку Шыкалава (Мацук) Раіса Аляксееўна, чые родные таксама былі спалены у гэтай вёсцы.

*(Гл. таксама спіс мірных жыхароў, якія былі спалены ў в. Баравыя).*

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

# Трагедыя вёскі Стайкі

Ішоў другі год вайны. У лясах Браслаўшчыны з'явіліся першыя партызанскія атрады і групы. Яны началі непакоіць акупантаў, і тыя, напэўна, вырашылі ў зародку задушыць вызваленчы рух. Позняй восенню, калі ўжо стаялі маразы, пачалася першая карная экспедыцыя. Маршрут яе пралёг ад Браслава на Замошша, Рэпаўшчыну, Стайкі, Журавоўшчыну і далей па тэрыторыі суседняга Шаркаўшчынскага раёна. Усюды на яе шляху заставаліся спаленыя вёскі, сотні расстраляных і спаленых жыўцом мірных жыхароў. Такі лёс напаткаў жыхароў Рэпаўшчыны, Стаек і Журавоўшчыны. Большасць іх была спалена жыўцом.

Першай запалыхала Рэпаўшчына. Стрэлы, крыкі людзей былі чуваць далёка. І нехта з мясцовых людзей прыбег у Стайкі з крыкам: «Ратуйцеся!»

Вяскоўцаў не трэба было ўгаворваць. Схапіўшы на рукі дзяцей, тое-сёе з рэчаў, яны кінуліся ў лес. У адной з хат засталася толькі сямідзесяцігадовая жанчына. Яна сказала, што прыйшоў ёй час паміраць, таму, маўляў, няма патрэбы туліцца па лесе. Старая падалася на могілкі, дзе яе і знайшлі немцы. Нехта з карнікаў націснуў на курок. Так было абарвана першае жыццё ў Стайках.

Потым у рукі немцам трапіў вясковы стараста. Яму загадалі ісці ў лес і збіраць людзей. Абяцалі, што ўсіх, хто вернецца, не крануць. Затое, каго пазней знойдуць у лесе, расстраляюць.

Паверыўшы, стараста рушыў склікаць людзей. І многія вярнуліся ў вёску. Але ці можна было давяраць акупантам?!

Карнікі пераймалі людзей і зганялі ў хлявы. А потым запалілі іх і хаты. У агні загінула 120 чалавек. Уцалелі толькі тыя, хто не паверыў немцам і не вярнуўся ў вёску. У ліку іх сям'я Пятра Франткоўскага, Юля Бандарык, яшчэ адзін Бандарык з дзвюма дочкамі. У апошняга жонка, спадзеючыся, што бяда абміне іх вёску, вырашыла вярнуцца назад, каб за хатай і дабром прыглядзець. Гэта каштавала ёй жыцця.

Не паверыла немцам і Ю. Бандарык. А вось яе родная сястра з дзецьмі падалася на праваканцыю акупантаў і загінула.

Калі немцы пакінулі Стайкі, уцалелыя яе жыхары, а іх было ўсяго 22 чалавекі, вярнуліся назад. На месцы вёскі знайшлі папялішча. Уцалела толькі адна лазня, якая і сёння стаіць ля лесу маўклівай сведкай тых журботных падзей.

Людзі ля былых хат клікалі блізкіх, спадзеючыся, што нехта яшчэ ўратаваўся. Але дарэмна. Тады жывыя сабралі попел і абгарэлыя косці на месцы вогнішчаў і закапалі іх. Усе 120 чалавек ляжаць у брацкай магіле.

У 1943 годзе па гэтых мясцінах пракацілася другая хваля карных экспедыцый. У Стайках паліць больш не было чаго. Запалыхалі суседнія вёскі.

*Т. Пашкевіч.* «Браслаўская звязда». 1944. 5 лютага.



Асобная магіла ў в. Стайкі.

**З успамінаў Лізаветы Ігнатаўны Бутар**

Наша вёска Стайкі была спалена немцамі 22 лістапада 1942 г., у панядзелак. З таго часу колькі прайшло гадоў, а ўсё, што здарылася, нібыта глыбей у памяць уразаецца. У Стайках страціла маці, сястру мужа, усяго 15 чалавек сваіх сваякоў і яшчэ 16 з боку мужа. Цяжка сказаць колькі ўсяго чалавек папалілі немцы ў вёсцы, бо там сагналі не толькі сваіх, але і з навакольных вёсак. Прыгналі колькі чалавек з Плятэрова і яшчэ тых, каго злавілі ў лесе ў час аблавы. Шмат людзей загінула.

Тыдні зы тры да знішчэння вёскі прыйшлі да нас нібыта партызаны. Прыпыніліся, папрасілі паесці. Мне адразу яны падазронымі здаліся, а потым аднаго пазнала — яўрэяў у Ёдах страляў. Каго можна папярэдзіла, каб былі асцярожнымі. Пасля гэтага паехалі ў Стайкі немцы, двух чалавек застрэлілі — аднаго свайго з вёскі і ваеннапалоннага, які жыў тут некалькі месяцаў на гаспадарцы. Больш тады нікога не чапалі.

22 лістапада вёску сталі акружаць немцы. Яны ж праводзілі аблаву ў лесе, бо чулася страляніна здалёку. Было каля 10 гадзін раніцы, мы сядзелі ў хаце. Толькі што вярнуліся з лесу мужчыны, не паспелі пераапрануцца, як з'явіліся немцы. Мы сталі выскокваць з хаты. Дзевер мой так і пабег — адна нага ў боце, мабыць, не паспеў скінуць. Я схапіла за рукі нашых дзяцей — прыёмных сыноў Валодзю і Фелікса і падалася ўздоўж хаты праз агарод да хмызняку. Далей не пабеглі, бо маглі натыкнуцца на немцаў, схаваліся ў гушчары. Мы былі не адны, побач хавалася некалькі чалавек з вёскі. Сядзелі вельмі ціха, хаця пакутвалі, асабліва дзеці, ад холаду, з хаты ж выскачылі ў чым хто быў. Гадзін каля трох пачуліся кулямётныя чэргі і амаль адразу ў чатырох месцах успыхнула полымя. Стала зразумела, што трэба некуды ісці. Пабрылі па лесе. Аднаго з хлопчыкаў па чарзе несла на плячах, хаця была цяжарная. Наперад гналі страх і адчай. Як сцямнела, страляніна заціхла, толькі недзе ўбаку пад лесам раз-пораз узляталі ракеты. Выйшлі да стагоў сена і тут зрабілі сабе прытулак. Хлопчыкі мае ўвесь час трымаліся, хаця б раз заплакалі. Толькі аднойчы ціхенька ўзгадалі: «Хаця б якую скібачку хлеба з сабой узялі».

Хаваліся ў лесе да пятніцы, потым сіл не стала. Вырашылі ісці хоць куды, хай лепей заб'юць, чым так пакутваць. Дабрылі да Лубянкі, зайшлі ў хату, а гаспадары вельмі напужаныя. Усё вакол карнікі нішчаць і паляць, з'явіліся і ў іх вёсцы. Ніхто не ведае, што далей будзе. А дзеці як зайшлі ў цёплую хату, так і паваліліся на падлогу, заснулі. З адчаю пайшла па вёсцы шукаць немцаў, каб лепей расстралялі. Сустрэла некалькі салдат, япы да афіцэра накіравалі. Была ў вёсцы настаўніца, якая троху па нямецку разумела. Яна мяне выратавала, калі я да афіцэра падыйшла, папрасіла, каб мяне не чапалі. На ноч у вёску наехала шмат немцаў. Адзін з тых, што размясціліся ў нашай хаце, быў зусім маладзенькі. Паглядзеў на дзяцей і хлеба ім адламаў.

Раніцай па вуліцы пакаціліся фурманкі, пагружаныя рознымі хатнімі рэчамі. Адна з іх была накрыта посцілкай, якую маці сваімі рукамі ткала. Як убачыла гэта, сэрца і зайшлося. У Лубянцы не трэба было заставацца, маглі людзей пад бяду падвесці. Пайшлі ў бок Стаек, але да вёскі не дайшлі. На нашых вачах запылалі ўсе хаты. Іх, значыць, немцы пасля таго, як вывезлі дабро, падпалілі.

Прыйшлося ісці ў лес. Некалькі дзён блукалі па сцяжынках. Ужо пачаў падаць снег. Калі які гаспадар у вёсцы ці на хутары пускаў, то не надоўга. Усе баяліся. Добра, калі ахвяраваў кавалачак хлеба. Не менш чым ад голаду, пакутвалі ад сцюжы. Каб у дзяцей не адмерзлі пальцы, травой завязала рукавы вопраткі.

Дабраліся да хутара Кашэль, дзе жыў стрыечны брат мужа. Там знайшлі прыту-

лак на зіму. У мяне нарадзілася дзяўчынка. Заставацца ў Кашалях было небяспечна. Летам пайшлі шукаць іншага прытулку. Побач са Стайкамі ў Быкоўскіх знайшлі ўцалелую пустую хату. Там і пасяліліся. Хутка, восенню 1943 г., пачалася новая карная экспедыцыя. Зноў давялося хавацца. Трое сутак адсядзелі ў балоце. Дзяўчынку ўвесь гэты час толькі балотнай вадой паіла, з вопраткі на ёй была толькі адна рубашка. Каб не загінуць з голаду і холаду, давялося выходзіць з лесу. Трапіла да немцаў. Спачатку думала, што расстраляюць, бо некалькі разоў назвалі бандыткай. Чаму не расстралялі не ведаю, пагналі ў Ёды, дзе збіралі людзей для адпраўкі ў Германію. Гэта дзесяць кіламетраў пехатой з дзіцем на руках. У адной з вёсак нехта з жанчын ажна загаласіў ад жалю: «Вось бандытку знайшлі».

У Германію мяне не адправілі, з-за малых дзяцей. У Ёдах удалося знайсці прытулак да канца вайны.

...Кожны год, якія б не былі клопаты, абавязкова прыязджаю ў Стайкі. Толькі ў 1993 годзе не ўдалося наведаць родныя мясціны. Цяпер жыву ў Латвіі і дабрацца ўсё цяжэй. Вельмі хацела над магілай крыж паставіць, але раней нельга было, а цяпер сіл ужо няма. Помнік там, праўда, стаіць. Некалькі гадоў таму побач пасадзіла ёлачкі. На наступны год засталася толькі адна. Дарогу побач з магілай трактары зрабілі, нібыта зямлі мала. Была неяк у Хатыні, шукала на могілках свае Стайкі і не знайшла. Цяпер у Латвіі слухаю больш перадачы з Мінска. У іх шмат расказваецца аб вайне, аб знішчаных вёсках. Толькі нашу вёску ніхто ні разу не ўзгадаў. Мне жыць засталося няшмат. Я заўсёды буду памятаць аб Стайках, аб сваіх блізкіх. Хачу каб і іншыя хаця б час ад часу згадвалі Стайкі і тых, хто ў ёй без віны загінуў.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## Мірныя жыхары вёсак Стайкі, Лубянка, Быкаўшчына і Шалаш, спаленыя фашыстамі 22 лістапада 1942 г. у вёсцы Стайкі

### З ВЁСКІ СТАЙКІ

**БАНДАРЫК Гелена.**
**БАНДАРЫК Мар'яна** з дзіцем.
**БАНДАРЫК Стэфан.**
**БОЛУНДЗЬ Станіслава.**
**БУТАР Данііл.**
**БУТАР Міхаіл**, жонка, дзіцё.
**БУТАР Наталля.**
**БУТАР Уладзімір.**
**БУТАР Уладзімір**, жонка, дзіцё.
**БУТАР Янка.**
**ВАНГІНА Марыя**, муж, трое дзяцей.
**СЯМ'Я ВАНГІНАЎ:** муж, жонка, дзіцё.
**ГРЫЖЫНОЎСКІ:** жонка, дзіця.
**КРАСЮКЕВІЧЫ Яська, Анюта**, дзіцё.
**МЫШКО Аркадзь, Ганна**, дзіцё.
**МЫШКО Георгій.**
**МЫШКО Мікалай, Ядвіга.**
**ПУПІН Раман**, жонка, дзіцё.
**ПУПІНЫ:** дзве жанчыны.
**ПЯТУШКІ:** муж, жонка, дзіцё.
**РЫДЗІКА Пётр, Марыя**, маці, двое дзяцей.
**СТАНКЕВІЧЫ:** муж, жонка, дзіцё.
**ФРАНТКОЎСКІЯ: Ігналій, Марыя**, маці, двое дзяцей.
**ФРАНТКОЎСКІ Янка, Стэфа**, дзіцё.
**ФРАНТКОЎСКІ Віпцук**, жонка, дзіцё.
**ЦІТОВІЧ Аляксей, Гелена**, трое дзяцей.
**ЯНУЛЕВІЧЫ: Юзік, Юзэфа**, дзіцё.
**ЯНУЛЕВІЧЫ: Аркадзь, Анеля**, дзіцё.
**ЯНУЛЕВІЧЫ: Мікалай, Леаніда**, двое дзяцей.
**ЯНУЛЕВІЧЫ: Антон, Марыя, Надзея**, сын.
**БАНДАРЫК Аўгуст Сцяпанавіч** — расстраляны летам 1942 г.
**ФРАНТОЎСКІ Зіновій Пятровіч** — загінуў у партызанах.
**ФРАНТОЎСКІ Дзімітрый Ігнатавіч** — загінуў на фронце.
**ЯНУЛЕВІЧ Часлаў Язэпавіч** — загінуў на фронце.

### З ВЁСКІ БЫКАЎШЧЫНА

**АЛЯШКЕВІЧ І.**, жонка, трое дзяцей.
**ПУПІНЫ:** муж, жонка, двое дзяцей.
**ПУПІН В.**, жонка, маці, двое дзяцей.
**СЕДЗЮКЕВІЧЫ:** Генадзь, Ганна.
**СЕДЗЮКЕВІЧЫ:** муж, жонка, трое дзяцей.
**СЕДЗЮКЕВІЧ П.**, жонка, двое дзяцей.

**СЕДЗЮКЕВІЧЫ**: муж, жонка.
**ТУЗІК І.**, жонка, дзіцё.
**ЯНУЛЕВІЧ С.**, жонка, двое дзяцей.

**З ВЁСКІ ЛУБЯНКА**

**КАЛОДКА П.**
**КОНДРАТ В.**

**З ВЁСКІ ШАЛАШ**

**БЕЙНАРОВІЧ В.**, жонка, трое дзяцей.
**РУТКОЎСКІ І.**, жонка, двое дзяцей.

*«Браслаўская звязда». 1994. 16 лютага*.*

**З успамінаў Канстанціна Іванавіча Пупіна аб трагедыі в. Рэпаўшчына, знішчанай разам з жыхарамі ў лістападзе 1942 г.**

Было гэта лістападаўскім надвячоркам 1942 года. Сабралася сям'я ў хаце. Яшчэ днём маці, якая была на служэнні ў царкве в. Замошша, вярнуўшыся казала, што ў мястэчку шмат немцаў. Але факту гэтаму, на бяду, значнасці не надалі. Трывога з'явілася толькі пад вечар. У баку, дзе знаходзіўся засценак Пераходы, заўважылі зарыва пажару. Брат падаўся з хаты, каб лепш разгледзець, што там робіцца. Але як толькі ён выйшаў на поле, з бока засценка па ім пачалі страляць з аўтаматаў. Здарэнне не паспелі абмеркаваць. Раптоўна вёска была абкружана паліцаямі. Праўда, страху ці прадчування бяды не было. Меркавалі, што фашысты вырашылі папалохаць людзей.

Нямецкія салдаты заходзілі ў кожную хату, выганялі ўсіх і пад канвоем гналі да дома Івана Шчогалева. 88 чалавек у ёй і заперлі. Вось тады людзі і адчулі нядобрае. Я кажу брату: «Трэба нешта рабіць. Уцякаць!». А брат: «У мяне ж дзеці, куды я ўцяку». Маці ціха кажа: «Так Бог павялеў, так яно і будзе».

Неўзабаве дзверы адчыніліся і прагучаў на польскай мове загад: «Шэсць чалавек выходзь». Не бачна было, што робіцца на вуліцы. Малая дзяўчынка, якая сядзела на печы, імкнулася праз шчыліну разгледзець, што робіцца на двары. Раптам яна закрычала: «Дзяцька Вінцэсь ляжыць на зямлі ў лужы крыві». (Вінцэсь Кабак — солтыс вёскі.) Стрэлаў не было чутна.




Мемарыяльная пліта на месцы гібелі в. Рэпаўшчына.

* Спіс складзены па памяці Віктарам Лаўрэнцьевічам Цітовічам. У яго ўключаны таксама чатыры жыхары в. Стайкі,якія загінулі пры іншых абставінах.

Так стала вядома, які лёс чакае вяскоўцаў. Запомнілася, як выводзілі жанчыну — госцю з Вільні. Яе дачка 7—8 гадоў, апранутая лепей за ўсіх дзяцей, надта моцна крычала. Адзін хлопец, Міхаіл Пупін, кажа: «Усё роўна смерць. Дам немцу па галаве». Намацаў шкляную бутэльку з вадкасцю і схаваў.

Яшчэ адна «шасцёрка» — два браты Кабакі Іван і Мікалай, браты Слабадзейкі, Міша Пупін і я. Выйшлі на вуліцу і нас павялі. Ужо не бачыў ці ўдарыў каго Міша Пупін, але я адразу пабег. Ірвануўся і Міхаіл. Астатнія — ні туды, ні сюды. Іх на гародзе і застрэлілі.

Раздаліся стрэлы. Я ўжо пералазіў праз плот з дротам, што ішоў па версе, зачапіўся палітом за калючкі. На нейкае імгненне павіс. Карнікі думалі забіты і перапынілі стральбу. Спачатку было адчуванне смерці, але зразумеў — жывы. Адшчапіў гузік паліто і зваліўся ўніз. Падняўся і пабег. Побач цягнуўся «шнур» зямлі, які належыў гаспадару, не апрацаваўшаму гэту зямлю. Высокі быльнік і выратаваў. Ціўкалі кулі. Я скіраваўся у бок абоза і карнікі пабаяліся перабіць сваіх жа коней. Дабег да лесу, далей да балота (яшчэ не замёрзла), убачыў яліну і залез на дрэва, каб паглядзець на вёску. Над хатай І. Шчогалева ўзвіўся слуп чорнага дыму. Загарэліся і гаспадарчыя пабудовы. Пачаў спаўзаць з дрэва — бачу, на снезе кроў. Аказваецца параніла. Аднак ісці рана не замінала. Стала нясцерпна холадна і як ні было страшна, вырашыў схадзіць у хату, якую адзежу знайсці. Хаты стаялі цэлыя, толькі з павыбітымі шыбамі ды расчыненымі дзвярыма. Спалены быў дом І. Шчогалева разам з вяскоўцамі і дом Г. Шчогалевай — хворай жанчыны. Яна не магла ісці і немцы забілі яе, а хату спалілі.

З вяскоўцаў уцалелі некалькі чалавек. Іосіф Жвірблінскі разам з усімі знаходзіўся ў хаце Шчогалева. Пад самы канец расправы яму ўдалося схавацца ў падпечак. Правяраць хату зайшоў немец, паглядзеў — нікога няма. Узяў гармонік, які ляжаў на лаўцы, расцягнуў мяхі. Заўважыў курыцу і пачаў лавіць. Ратуючыся, тая кінулася ў падпечак. Жвірблінскаму ледзьве ўдалося без лішняга шуму выпіхнуць яе назад. Хату падпалілі, пайшоў дым, аднак вылезці было нельга. І толькі тады, калі карнікі ад'ехалі, Іосіфу ўдалося выскачыць з палаючай хаты.

Ніхто з тых, хто ўцалеў, не вярнуўся жыць у Рэпаўшчыну. Усю зіму 1942—43 гадоў Перабіваліся як маглі ў лесе. Летам 1943 года ў вёсцы размясціўся атрад імя Пархоменкі партызанскай брыгады імя Жукава. Хаты ў Рэпаўшчыне прастаялі нядоўга. Восенню 1943 года ў час карнай экспедыцыі супраць партызан і насельніцтва фашысты дашчэнту спалілі паселішча. Зараз на яго месцы — поле, акружанае лесам.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## Мірныя жыхары вёскі Рэпаўшчына, спаленыя 7 снежня 1942 г.

**БУЛЫГ А.**, н. у 1911.
**БУЛЫГ А. П.** н. у 1911.
**БУЛЫГ В. М.**, н. у 1937.
**БУЛЫГ І. М.**, н. у 1940.
**БУЛЫГ М. В.**, н. у 1886.
**БУЛЫГ М. П.**, н. у 1908.
**БУЛЫГ Ф. Р.**, н. у 1887.
**ГАСЮЛЬ І. І.**, н. у 1881.
**ГЛУШЫН М. С.**, н. у 1891.
**ГЛУШЫН Н. І.**, н. у 1928.
**ГЛУШЫН Н. М.**, н. у 1928.
**ЖВІРБЛІНСКАЯ Е.**, н. у 1915.
**ЖВІРБЛІНСКІ Е. І.**, н. у 1936.
**КАБАК В. В.**, н. у 1912.
**КАБАК Г. В.**, н. у 1940.
**КАБАК І. В.**, н. у 1914.
**КАБАК І. І.**, н. у 1942.
**КАБАК Л.**, н. у 1913.
**КАБАК Л.**, н. у 1918.
**КАБАК Н. І.**, н. у 1912.
**КАБАК О.**, н. у 1909.
**КАБАК С. В.**, н. у 1937.

**КАБАК Ю.**, н. у 1910.
**КЛЯМЕНЦЬЕВА А. П.**, н. у 1940.
**КЛЯМЕНЦЬЕЎ М. П.**, н. у 1938.
**КЛЯМЕНЦЬЕЎ П.**, н. у 1905.
**КЛЯМЕНЦЬЕЎ П.** Ў 1907.
**КЛЯМЕНЦЬЕЎ П. П.**, н. у 1935.
**ЛАЎРЫНОВІЧ У. С.**, н. у 1880.
**МАНДРЫК А. Д.**, н. у 1937.
**МАНДРЫК Д. М.**, н. у 1908.
**МАНКЕВІЧ А. З.**, н. у 1894.
**НАРУШЭВІЧ М. І.**, н. у 1916.
**НАРУНЭВІЧ Н.**, н. у 1916.
**ПУШН А. І.**, н. у 1932.
**ПУШН М. І.**, н. у 1935.
**ПУШН Н. І.**, н. у 1903.
**ПУШНА А. В.**, н. у 1888.
**ПУШНА Г. П.**, н. у 1940.
**ПУШНА Е.**, н. у 1918.
**ПУШНА Е. І.**, н. у 1940.
**ПУШНА Л. Г.**, н. у 1919.
**ПУШНА М.**, н. у 1880.
**ПУШНА Н.**, н. у 188.
**ПУШНА Н. Г.**, н. у 1908.
**ПУШНА Ф. К.**, н. у 1908.
**СЛАБАДЗЁНАК Б. С.**, н. у 1941.
**СЛАБАДЗЁНАК В.**, н. у 1921.
**СЛАБАДЗЁНАК Л.**, н. у 1908.
**СЛАБАДЗЁНАК Л.**, н. у 1886.
**СЛАБАДЗЁНАК Н. Г.**, н. у 1909.
**СЛАБАДЗЁНАК С.**, н. у 1917.
**СЛАБАДЗЁНАК Ф. С.**, н. у 1940.
**ШЧОГАЛЕВА А. А.**, н. у 1921.
**ШЧОГАЛЕВА А.**, н. у 1881.
**ШЧОГАЛЕВА А.**, н. у 1916.
**ШЧОГАЛЕВА В. І.**, н. у 1936.
**ШЧОГАЛЕВА В. І.**, н. у 1911.
**ШЧОГАЛЕВА І.**, н. у 1902.
**ШЧОГАЛЕВА Л. А.**, н. у 1941.
**ШЧОГАЛЕВА М.**, н. у 1890.
**ШЧОГАЛЕВА Н. А.**, н. у 1910.
**ШЧОГАЛЕВА Н.**, н. у 1880.
**ШЧОГАЛЕВА П. А.**, н. у 1913.
**ШЧОГАЛЕВА Р. І.**, н. у 1930.
**ШЧОГАЛЕВА Р. І.**, н. у 1932.
**ШЧОГАЛЕВА С. К.**, н. у 1921.
**ШЧОГАЛЕВА Х. І.**, н. у 1934.
**ШЧОГАЛЕЎ А.**, н. у 1880.
**ШЧОГАЛЕЎ В. А.**, н. у 1940.
**ШЧОГАЛЕЎ А. І.**, н. у 1930.
**ШЧОГАЛЕЎ А. А.**, н. у 1915.
**ШЧОГАЛЕЎ Е. І.**, н. у 1940.
**ШЧОГАЛЕЎ І. П.**, н. у 1936.
**ШЧОГАЛЕЎ І. А.**, н. у 1900.
**ШЧОГАЛЕЎ І. А.**, н. у 1938.
**ШЧОГАЛЕЎ І.**, н. у 1918.
**ШЧОГАЛЕЎ К. Ш.**, н. у 1941.
**ШЧОГАЛЕЎ Л. І.**, н. у 1928.
**ШЧОГАЛЕЎ Л. І.**, н. у 1938.
**ШЧОГАЛЕЎ М. І.**, н. у 1934.
**ШЧОГАЛЕЎ Ф. І.**, н. у 1926.

## Трагедыя вёскі Лабэцкія

Вёска Лабэцкія знішчана 22 лютага 1943 г. атрадам паліцыі Опсаўскага гарнізона пасля таго, як гітлераўцам стала вядома, што жыхары вёскі па чарзе хавалі ў сябе старога яўрэя. У дзень трагедыі мужчыны вёскі ездзілі здаваць харчовы падатак у Браслаў і таму засталіся ў жывых. Доўгі час яны хаваліся па павакольных вёсках у сваякоў і знаёмых. У в. Лабэцкія карнікі знішчылі 28 чалавек — дзяцей, жанчын, старых. У іх ліку і жыхарка Відзаў Марыя Радзевіч, якая прыехала ў госці да сваякоў. Пасля вайны вёска не аднавілася, хаты былі разабраны жыхарамі суседніх вёсак. На брацкай магіле жыхароў вёскі за сродкі калгаса «Маяк» устаноўлены помнік.

## З альбома «Сястра Хатыні» — вёска Лабэцкія», складзенага вучнямі Канстанлінскай школы

...22 лютага 1943 года. Зімовая раніца. Ужо з начы пачалася завіруха. Сцюдзёны вецер гнаў снег, замятаў любы след. Зіма лютавала. І вось гэтай сцюдзёнай раніцай пад'ехалі да Лабэцкіх з Опсы падводы. На іх у чорных шынялях, з аўтаматамі ехалі карнікі — сто чалавек. Гэтая раніца была апошняй для жыхароў вёскі. Лабэцкія напаткаў лёс Хатыні. Людзі яшчэ не ведалі аб той бядзе, якая насоўвалася на іх...



Мемарыяльная пліта помніка ў в. Лабэцкія.

А праз гадзіну над вёскай запанавала вечная смяротная цішыня. Не стала ўсіх яе 28 жыхароў. Сумна назіралі ў лютаўскую смугу пустымі вокнамі ўсе 6 хат вёскі. Зараз яны наводзілі жах на ўсіх, хто праходзіў па дарозе ў Опсу.

У жывых засталіся тры хлапчукі, якія ўцалелі толькі цудам.

Вось як успамінае пра той страшны дзень Казімір Вацлававіч Станкевіч, якому тады было 11 гадоў...: «Марозная лютаўская раніца... У пячы патрэскваюць дровы, маці пячэ бліны, а мы, васьмёра малых, сядзім на печы, чакаючы снеданку. З грукатам адчыніліся дзверы, на парозе — фашысты з аўтаматамі. Мы спалохаліся, але не адчулі, што здарыцца нешта страшнае. Загад быў кароткі. Усіх павыганялі на двор. У суталацы маці паспела схаваць пад нейкую адзежу дзевяцімесячнага браціка Войцеха. На нас пазіралі дулы кулямётаў. Дзвюх маленькіх сястрычак і старэйшага брата скасілі кулі. Утраіх кінуліся да бліжэйшага хмызняка. Найздагон секанула кулямётная чарга. Параніла малодшага брата, але ён здолеў дабегчы з намі да вёскі Таўкіні. Там нас схавалі. Старэнькая добрая Алена Ядзяла перавязала сямігадоваму Януку рану. Так засталіся мы ў жывых».

Гояцца з часам раны цела, але раны сэрца, раны душы не могуць загаіць ні гады, ні дзесяцігоддзі, яны крываточаць. Чалавек не можа забыць тых зверстваў, якія ўчынілі на нашай зямлі фашысты, таго гора, тых нечалавечых пакут, якія давялося перажыць людзям.

...А лютаўская завіруха некалькі дзён сваволіла над скачанелымі трупамі. Толькі праз тыдзень іх дазволілі пахаваць. Басякірская Браніслава Станіславаўна, цётка забітага Казіміра Станкевіча, сястра Ядвігі Станкевіч. Цяжка ўспамінаць ёй аб трагічным лёсе сваіх родных, усіх жыхароў вёскі Лабэцкія. Родная яе сястра Ядвіся бегла з дзевяцімесячным хлопчыкам да леса, у той бок, дзе жыла Браніслава Станіславаўна. Але фашысцкая куля дагнала яе. Ядзя паспела пасадзіць хлопчыка на снег і ўпала — рана ў галаву была смяротнай. Праз момант абарвалася жыццё і малога сына.

Карнікі забілі ўсіх, хто быў у гэты час у вёсцы, а гэта былі дзеці, жанчыны і старыя. Усяго 28 чалавек. Дваццаць восем чалавечых сэрцаў перасталі біцца у гэты халодны лютаўскі дзень.

Шукае сярод забітых сваю дачку Маню селянін Пятровіч, шукае ў суседніх вёсках — можа ў жывых засталася. Не можа знайсці. Ужо далі дазвол на пахаванне забітых. Ужо выкапалі вялікую і глыбокую яму і пахавалі забітых.

— Прайшло два тыдні, — працягвае расказ Браніслава Станіславаўна, — пачаў таяць снег і ўбачылі людзі шмат крумкачоў на пожні. Пайшлі туды, а там — труп Мані Пятровіч, увесь птушкамі падзяўбаны. Доўга плакаў бацька і пахаваў дачку побач з агульнай магілай.

Друкуецца паводле арыгінала, які захоўваецца у Канстлінскай няпоўнай сярэдняй школе.

## Мірныя жыхары вёскі Лабэцкія, расстраляныя фашыстамі 18 лютага 1943 г.

**КАСІНСКАЯ Эмілія**, н. у 1924.
**КАСІНСКАЯ Рэгіна Альфонсаўна**, н. у 1922.
**КАСІНСКАЯ Феліцыя Альфонсаўна**, н. у 1922.
**КАСІНСКАЯ Ганна Альфонсаўна**, н. у 1936.
**ПЯТРОВІЧ Уладзіслаў Юльянавіч**, н. у 1924.
**ПЯТРОВІЧ Екацярына**, н. у 1908.
**ПЯТРОВІЧ Іпсіф Юльянавіч**, н. у 1922.
**ПЯТРОВІЧ Марыя Юльянаўна**, н. у 1928.
**РАДЗЕВІЧ Ганна**, н. у 1903.
**РАДЗЕВІЧ Марыя**, н. у 1936.
**СТАНКЕВІЧ Уладзіслава**, н. у 1908.
**СТАНКЕВІЧ Войцех Вацлававіч**, н. у 1934.
**СТАНКЕВІЧ Вера Вацлаваўна**, н. у 1938.
**СТАНКЕВІЧ Стэфанія**, н. у 1903.
**СТАНКЕВІЧ Станіслаў**, н. у 1932.
**СТАНКЕВІЧ Раман Станіслававіч**, н. у 1936.
**СТАНКЕВІЧ Марыя**, н. у 1936.
**СТАНКЕВІЧ Войцех Станіслававіч**, н. у 1938.
**СТАНКЕВІЧ Тэрэза Вацлаваўна**, н. у 1924.
**СТАНКЕВІЧ Часлаў Станіслававіч**, н. у 1934.
**СТАНКЕВІЧ Эдуард Вацлававіч**, н. у 1931.
**СТАНКЕВІЧ Яніна Станіславаўна**, н. у 1924.
**СТАНКЕВІЧ Ядвіга**, н. у 1910.
**СТОМА Браніслава**, н. у 1926.
**СТОМА Іосіф**, н. у 1935.
**СТОМА Станіслаў**, н. у 1873.
**СТОМА Станіслава**, н. у 1888.
**СТОМА Станіслаў Іосіфавіч.**

### З успамінаў Іосіфа Аляксандравіча Раманцэвіча

У час вайны наша сям'я жыла на хутары Таропаўка. Бацькі Аляксандр і Зінаіда Раманцэвічы мелі сямёра дзяцей. Старэйшы брат Мікалай быў у польскай арміі і трапіў у нямецкі палон, сястра Анюта выйшла замуж у в. Барок, астатнія дзеці жылі з бацькамі.

Аднойчы восенню 1942 года раніцай, у хату зайшлі два ваеннапалонных. Немцы трымалі іх у браслаўскім лагеры, а потым адпусцілі, як і многіх у першыя месяцы вайны. Калі ў лясах з'явіліся партызаны, былых ваеннапалонных сталі забіраць у лагеры. Гэтыя двое папрасілі есці. Бацька запрасіў іх да стала. Раптам прыехалі паліцаі і немцы. Палонныя хуценька выскачылі ў сенцы і праз дзяннік схаваліся ў гумне. Некалькі немцаў увайшлі ў хату, сярод іх быў камендант са Слабодкі. Мілер спытаў ці бачылі чырвонаармейцаў. Бацька адказаў, што не бачылі. Яму не паверылі і сталі ўсюды шукаць. Мілер з пісталетам увайшоў у гумно і крыкнуў: «Рус, рукі ўгору!». Адзін з байцоў спалохаўся і адразу падняўся. Мілер застрэліў яго на месцы і вярнуўся ў хату. Бацька сядзеў на кухні. Там Мілер і застрэліў старога.

Другога чырвонаармейца не знайшлі. Яму ўдалося надзейна схавацца ў хляве. Пакуль ішоў вобыск, нехта з паліцаяў шапнуў маці, каб усе ўцякалі з хаты. Неўзабаве карнікі з'ехалі. Паехалі ў суседнюю вёску па самагонку. Вечарам маці ўбачыла, як яны п'яныя вяртаюцца назад. Я быў у маці адзін, астатнія пахаваліся ў сваякоў яшчэ днём. Маці загадала хуценька бегчы з хутара, а сама засталася каля хаты. Трохі адбег ад хутара і пачуў стрэл. Назаўтра вярнуўся ў хату і знайшоў забітымі маці з бацькам. З дапамогай сваякоў пахаваў іх у адной труне побач з хатамі. Непадалёку пахавалі чырвонаармейца, прозвішча якога ніхто не ведаў. Другому ўдалося выратавацца ў знайсці партызан. З ім у лес пайшла і сястра Леаніда. Дахаты яна больш не вярнулася, загінула недзе ў партызанах.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

### З успамінаў Мар'яна Казіміравіча Кавалёнкі

Мая родная вёска — Забалацце, што ў чатырох кіламетрах ад Замошша. Тут жыла наша сям'я да 1939 г. У 1939 г. старэйшы брат Казімір наняўся на службу да папа даглядаць лес і ўсе мы пераехалі ў леснічоўку Пазава (цяпер гэта тэрыторыя Шаркоўшчынскага раёна). Летам 1942 года памёр бацька. Неўзабаве пасля жаніцьбы я вярнуўся ў Забалацце. 25 снежня таго ж года здарылася трагедыя, сведкам якой быў мой малодшы брат Альбін, 1925 года нараджэння.

...У леснічоўцы на начлег прыпыніліся пяць партызан. Каля пяці гадзін раніцы на двары стаў брахаць сабака. Альбін выйшаў на панадворак і ўбачыў немцаў. Ён паспеў заскочыць у хату і папярэдзіць партызан. Аднак тыя замест таго, каб адразу уцякаць, пахаваліся хто куды. У хату зайшлі немцы і спыталі, ці ёсць тут бандыты. Сталі ўсюды шукаць. Адзін немец зазірнуў пад ложак, убачыў партызана і стаў яго цягнуць за нагу. Побач хаваўся яшчэ адзін партызан, ён стрэліў у немца і забіў яго. Усе партызаны пасля гэтага падхапіліся, праз вокны выскачылі з хаты. Узнялася страляніна, потым усё заціхла. У хату ўварвалася некалькі раз'юшаных карнікаў. Яны стрэлілі Альбіну ў галаву. Брат упаў на падлогу ўвесь скрываўлены. Немцы загадалі каму-небудзь з жанчын запрэгчы каня. Маці і братава жонка сказалі, што не ўмеюць. За гэта іх сталі біць. Старэйшы брат Казімір выклікаўся запрэгчы каня, але адразу быў забіты. Жанчын і дзяцей фашысты загналі на печ, прынеслі каністру з газай, аблілі ўсё, зачынілі дзверы і падпалілі. Альбін апрытомнеў, калі хата палала. Ён здолеў дабрацца да акна і выскачыць на вуліцу. Немцаў ужо не было. Альбін моцна абпаліў рукі, галаву. Яму ўдалося знайсці партызанскі лагер, дзе з ім падзяліліся адзеннем. Тым жа днём брат з'явіўся ў Забалацці, расказаў нам пра бяду. Я пачакаў, пакуль з'едуць з нашых мясцін карнікі і пайшоў на папялішча. Убачыў рэшткі хаты і абпаленыя трупы. Брата Казіміра пазнаў адразу. У яго нават рэшткі кашулі на плячах захаваліся, там дзе прыціскаліся да падлогі. Страшна абгарэлі маці і братава жонка, ад дзяцей засталіся толькі бугаркі попелу.

У той дзень з сабой забраў толькі сабаку, які з голаду пачаў ужо грызці трупы. Уначы сабраў астанкі родных, на кані перавёз іх і пахаваў на могілках у Замошшы. Увесь час баяўся, што калі вернуцца карнікі, то могуць забіць і мяне. На леснічоўцы Пазава былі спалены:

маці Кавалёнак Анастасія Гергіеўна, 1882 года нараджэння,

брат Кавалёнак Казімір Казіміравіч, 1907 года нараджэння,

яго жонка Станіслава, іх дзеці Альдона, прыблізна 1936 года нараджэння, Моніка, 1938 года нараджэння, Чэслава, 1940 года нараджэння.

Яшчэ ў хаце згарэла невядомая дзяўчынка, якая аднекуль уцякала ад карнікаў і папрасіла прытулку. Як расказваў брат, яна была не ў сваім розуме.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

### З успамінаў Е. Гарбаценка

Калі пачалася вайна мне было 10 гадоў. У дзіцячай памяці засталіся многія эпізоды змрочнага, напоўненага страхам, перажываннямі, чуткамі, жыцця ў акупаваным Браславе. Асабліва моцна адбіўся ў памяці адзін эпізод, які здарыўся на першы ці другі год акупацыі.

Адным разам я праходзіла праз рынкавую плошчу (У той час рынак знаходзіўся бліжэй да Замкавай гары, дзе цяпер дзіцячы сад-яслі № 2) і раптам убачыла як за нейкай незнаёмай жанчынай бяжыць немец з вінтоўкай. Жанчына бегла хутчэй і тады немец прыпыніўся, прыцэліўся і

стрэліў ёй наўздагон. Жанчына ўпала, некалькі разоў варухнулася і больш не паднялася. Гітлеравец падыйшоў да яе, тузануў нагой, ускінуў вінтоўку на плячо, пайшоў прэч. Было страшна, але дзіцячая цікаўнасць цягнула паглядзець на жудасную карціну зблізку. Жанчына ляжала раскінуўшы рукі пад вялізным каляровым плакатам. Выгляд забітай, а таксама малюнкі на плакаце назаўсёды урэзаліся ў памяць. На кавалку фанеры былі намаляваны сумежныя тэрыторыі Латвіі, Літвы і Беларусі, межы паміж імі, а на гэтым фоне — карыкатурныя постаці трох чалавек. Латыш збірае на сваёй зямлі зброю, патроны, гранаты. Сам ён ужо абчапляны зброяй, але не перапыняе свайго занятку, намеры ў яго рашучыя. Літовец паказаны з палаючай паходняй скіраванай у бок Беларусі. Ён шукае межы сваёй дзяржавы. Выцягнутая рука з паходняй ужо знаходзіцца над Беларуссю, але постаць чалавека усё роўна рухаецца наперад. На тэрыторыі Беларусі намаляваны хмызняк за якім бачыцца постаць беларуса. Ён схіліўся над самагонным апаратам, больш яго нічога не турбуе. Відаць гэтым плакатам немцы хацелі падкрэсліць нацыянальныя рысы народаў суседзяў і здаецца гэта ім удалося.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

**З успамінаў Уладзіміра Іванавіча Аўкштоля**

Мой стрыечны брат Прыстаўка Вячаслаў Васільевіч, 1909 года нараджэння, загінуў у снежні 1943 г. ў Браславе. Здарылася гэта наступным чынам.

Яго сям'я была беззямельнай і часта меняля месца жыхарства. У час вайны брат са сваёй маці і сястрой жылі ў леснічоўцы Бабруты, куды перабраліся з Замошша. У час карнай экспедыцыі 1943 г. сям'я пакінула леснічоўку, перад тым закапаўшы лепшыя рэчы каля хаты. Некалькі дзён брат правёў у мяне, а потым вырашыў паглядзець ці засталося што ад леснічоўкі. На месцы леснічоўкі ён убачыў папялішча. Брат вырашыў зайсці ў суседнюю вёску Прудзінкі. У вёсцы аказаліся немцы і паліцаі з Опсы. Брат быў затрыманы, адпраўлены ў Опсу, потым у Браслаў. 26 снежня 1943 г. разам з аднавяскоўцам К. Аўласам я паехаў у горад, каб даведацца аб лёсе брата. К. Аўлас меў у жандармерыі знаёмага перакладчыка. Той паглядзеў нейкія дакументы і сказаў, што мы спазніліся, перад святымі, значыць 25 снежня, брат быў расстраляны.

Расстрэльвалі ў той час каля браслаўскай леснічоўкі, у равах. Пасля вайны ніякіх падрабязнасцей аб смерці брата высветліць не ўдалося.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

**З успамінаў Саламеі Іванаўны Панцялейка**

Аднойчы сястра мне кажа, што ў Леснічоўцы, у тым месцы, дзе была зямля некаторых з местачкоўцаў, немцы накапалі шмат нейкіх ям. Магчыма падрыхтавалі бурты для бульбы. Нам, маладым, усё было цікава. Вырашылі паглядзець. Пайшлі ўдваіх. Сапраўды, убачылі доўгія свежавыкапаныя ямы, нагадваючыя ірвы. Нічога незвычайнага не прыкмецілі і раптам на дне адной ямы ўбачылі шмат трупаў людзей. Непадалёку чалавек нейкі сядзіць, увесь скорчаны, у крыві. Напужаліся да смерці, пабеглі дадому, расказалі аб усім дарослым. Хадзіць у Леснічоўку пасля таго нам забаранілі. Пазней зразумелі, што той чалавек побач з трупамі таксама мёртвы быў.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

# Браслаўшчына партызанская

Арганізаванае супраціўленне жыхароў Браслаўшчыны нямецка-фашысцкім захопнікам можна ўмоўна падзяліць на два перыяды. У першым (ліпень 1941 – сярэдзіна 1943 г.) узнік рух супраціўлення, які дзейнічаў у падполлі. Былі створаны і пачалі ўзброеную барацьбу невялікія партызанскія групы і атрады. У другі перыяд (сярэдзіна 1943 – 1944 г.) на Браслаўшчыне былі створаны і дзейнічалі буйныя партызанскія брыгады. Яны грамілі варожыя гарнізоны і асобныя вайсковыя часці, наносілі моцныя удары па камунікацыях праціўніка, ачысцілі ад акупантаў значныя тэрыторыі ў Браслаўскім, Відзаўскім і сумежных раёнах. Разам з часцямі Чырвонай Арміі ўдзельнічалі ў вызваленні краю.

Супраціўленне захопнікам пачалося ў першыя дні акупацыі. Яно выражалася ў непрыяцці іншаземных захопнікаў і навязваемых імі «парадкаў». Актыўную барацьбу пачалі патрыёты з ліку браслаўскай інтэлігенцыі і сялянскай моладзі. Патрыятычныя групы хавалі людзей, якім пагражалі арышты, дапамагалі воінам Чырвонай Арміі, што трапілі ў акружэнне. Нягледзячы на строгую забарону карысталіся радыёпрыёмнікамі і процідзейнічалі ілжывай варожай прапагандзе.

На працягу восені і першай ваеннай зімы групы аб'ядноўваліся ў антыфашысцкія і камсамольска-маладзёжныя арганізацыі, якія мелі ўжо сваё кіраўніцтва і план дзеянняў. Першую антыфашысцкую падпольную арганізацыю на Браслаўшчыне стварыў Аляксей Аляксеевіч Васілеўскі. Жыхар горада Браслава, сын праваслаўнага святара, настаяцеля царквы ў гэтым горадзе, Аляксей карыстаўся аўтарытэтам сярод мясцовага насельніцтва. Да 1939 г. ён скончыў юрыдычны факультэт Пражскага універсітэта ў Чэхаславакіі, валодаў нямецкай мовай. Захапляўся планерным спортам і быў да вайны інструктарам клуба Асаавіяхіма. Гарачы патрыёт, смелы чалавек Аляксей Аляксеевіч разумеў, што найвялікшую карысць народу можа прынесці, застаючыся ў тыле ворага. Беспартыйны, ён не выклікаў падазрэння ў акупантаў і атрымаў пасаду намесніка Браслаўскага раённага бургамістра. Сваё службовае становішча Аляксей выкарыстаў для арганізацыі падполля і абароны насельніцтва. Яго першым памочнікам у гэтым стаў брат — малады ўрач Дзмітрый Аляксеевіч Васілеўскі, які прыняў на сябе абавязкі валаснога старасты ў вёсцы Слабодка.

Неўзабаве Аляксей Аляксеевіч прыцягнуў да падпольнай работы інжынера браслаўскага лясніцтва Уладзіміра Юліанавіча Відаўскага, які ўцёк ад акупантаў з Даўгаўпілса, і былога рэдактара камсамольскай газеты ў Вільнюсе Алега Якаўлевіча Пракаповіча. Абодвух ведаў з маленства. Пазней да іх далучыўся ваеннапалонны, былы настаўнік Іван Мікалаевіч Елізараў. Сваіх людзей А.А. Васілеўскі ўладкоўваў на працу ў адміністрацыйны апарат акупантаў. А.Я.



А. Васілеўскі.

Пракаповіч працаваў ў раённай управе. Рэгіна Бараноўская — перакладчыцай у браслаўскай жандармерыі. Аляксеем былі ўстаноўлены сувязі з многімі патрыётамі ў горадзе Браславе і ў вёсках Браслаўскага і Відзаўскага раёнаў. Так склалася антыфашысцкая арганізацыя пад кіраўніцтвам А.А. Васілеўскага, якая распаўсюдзіла свой уплыў на ўсю Браслаўшчыну. Падпольшчыкі паставілі перад сабой задачу выратавання ад рэпрэсій мясцовых патрыётаў., а таксама акружэнцаў і ваенапалонных, і такім чынам захаваць кадры для ўзброенай барацьбы.

Каля 160 чалавек былі вырваны браслаўскімі антыфашыстамі з рук гітлераўскіх катаў.

Нараджэнне партызанскага руху на Браслаўшчыне звязана з імем Кіма Яўсеевіча Анціпенкі. Напярэдадні вайны Анціпенка працаваў эканамістам на адным з заводаў у Ленінградзе і вучыўся ў ВНУ. У жніўні 1941 г. — лейтэнант, камандаваў батарэяй. Паранены пад Лугай, ён разам са шпіталем апынуўся ў акружэнні і трапіў у палон. У час транспарціроўкі ў Германію выскачыў з эшалона, які накіроўваўся ў Германію. Ішоў на ўсход, каб зноў змагацца з ворагам, але быў схоплены. Другі раз уцёк з лагера ваеннапалонных. Быў затрыманы ў Дзісне і кінуты ў браслаўскую турму.

У снежні 1941 г. Аляксей Васілеўскі, якому па пасадзе было даручана займацца ваеннапалоннымі, што апынуліся на тэрыторыі раёна, дапрасіў Кіма Яўсеевіча. Пераканаўшыся ў яго адданасці Радзіме, стойкасці маладога афіцэра, вызваліў яго з турмы і накіраваў на сельскагаспадарчыя работы да сваіх добрых знаёмых, братоў Пятра і Вікенція Пятрашка ў вёску Медзюкі. Гаспадары аднесліся да Кіма дабразычліва і далі яму магчымасць свабодна сустракацца с мясцовай моладдзю, што і было выкарыстана для кантакту з аднадумцамі. Неўзабаве вакол Анціпенкі склалася група, якая праз Аляксея Кузьміча Мацука, сябраваўшага з братамі Пятрашкамі, падтрымлівала сувязь з Аляксеем Васілеўскім.

У лютым 1942 г. А.А. Васілеўскі выклікаў да сябе К.Я. Анціпенку, а таксама яшчэ пяцярых ваеннаслужачых, якіх ён раней таксама вызваліў з турмы. Па яго рэкамендацыі яны ўладкаваліся і працавалі ў лясніцтве. Там



Дом Васілеўскіх.

да іх і прыглядаліся У.Ю. Відаўскі і яго жонка Ганна Цярэнцьеўна. Пераканаўшыся ў надзейнасці былых воінаў, чацвёра з якіх былі афіцэрамі, Аляксей Аляксеевіч прапанаваў ім стварыць партызанскі атрад. Камандзірам стаў лейтэнант К.Я. Анціпенка, камісарам — старшы лейтэнант Яўген Лявонаў, начальнікам штаба лейтэнант Васіль Чыслоў. Да вясны вялася падрыхтоўка. З дапамогай мясцовых падпольшчыкаў Івана Сініцы з Клішак, Сцяпана Седзюкевіча з Быкоўскіх хутароў, Віктара Мутара з Аксютава і іншых збіралі зброю. У канцы красавіка 1942 г. па загаду Анціпенкі 15 узброеных патрыётаў сабраліся на хутары Ількаўшчына ў сялян Лазара і Пятра Грыгор'евых. У групе былі ваеннапалонныя і мясцовая моладзь: Сяргей Мацук, Пётр Дубіна, Ананій Калітончык і іншыя. Так К.Я. Анціпенка першым узняў на Браслаўшчыне сцяг узброенай барацьбы супраць гітлераўцаў.

Амаль адначасова арганізавалася і другая такая ж група. Рыгор Яфімавіч Шчарбакоў, ураджэнец вёскі Журавель Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці на дзень 22 чэрвеня 1941 г. служыў у воінскай часці, якая дыслацыравалася на тэрыторыі Літвы. Вырваўшыся з акружэння дайшоў да Браслаўшчыны, дзе яго абяссіленага прыюцілі ля Відзаў хутаране Леанід Фёдаравіч і Іосіф Іосіфавіч Віршуты. Па даносу нейкага здрадніка Рыгор быў арыштаваны Відзаўскай паліцыяй. Ноччу ён зрабіў падкоп і ўцёк. Зноў хаваўся ў тых жа сваіх сяброў. Да вясны 1942 г. сфарміраваў падпольную групу з трынаццаці чалавек, выйшаў на сувязь з А.А. Васілеўскім і хутка аб'яднаўся з групай Анціпенкі.

Цяпер Кім Яўсеевіч кіраваў невялікім атрадам з 28 чалавек і мог распачаць баявую дзейнасць. Майскай раніцай партызаны атакавалі гітлераўцаў і паліцэйскіх, што ахоўвалі абоз з дабром, нарабаваным у сялян з вёскі Эйвідавічы. Ахову часткова перабілі, часткова разагналі, жывёлу і прадукты вярнулі сялянам. Падобныя аперацыі, а таксама дыверсіі на лініях сувязі, ажыццяўлялі летам 1942 г. неаднаразова. Сярод насельніцтва Браслаўшчыны шырока разышлася вестка аб справах партызан і іх камандзіра, якога называлі па прынятаму Кімам псеўданіму «Міша Воўк».

Атрад Анціпенкі быў цесна звязаны з насельніцтвам акругі. Разведчыкі атрада, сувязныя, іншыя патрыёты аказвалі яму рознабаковую дапамогу. Так, напрыклад, настаўніца Яніна Браніславаўна Рэут хадзіла з важнымі даручэннямі ў Браслаў да Васілеўскага і ў Шаркаўшчыну. Заклікала вясковую моладзь уступаць у партызаны. Зінаіда Канстанцінаўна Вайцельская (па мужу Шчарбакова) сачыла за рухам паліцыі вакол Замошша. Акім і Ананій Калітончыкі, якія мелі на хутары Янава радыёпрыёмнік, прымалі зводкі Саўінфармбюро, якія ў сваю чаргу распаўсюджваліся партызанамі сярод насельніцтва. Карл і Лідзія Чарноцкія, гаспадары хутара Букетава, ля якога базіраваўся ў лесе атрад, дапамагалі народным мсціўцам як маглі. Лідзія Мацвееўна пякла для партызанаў хлеб і разам з дачкой-падлеткам Рэняй вяла разведку ў Опсе. Ксёндз Казеля, настаяцель касцёла ў Далёкіх, перадаваў партызанам праз Яніну Рэут медыкаменты і перавязачныя матэрыялы. Пры выпадковай сустрэчы аддаў Кіму Яўсеевічу пісталет. У час карнай экспедыцыі гітлераўцаў у лістападзе 1942 г. хаваў у сябе групу партызан, якія выходзілі з блакады.

У сярэдзіне жніўня 1942 г. Анціпенка, за якім палявалі гітлераўцы, вымушаны быў перабрацца ў Полацкі раён, дзе ўліўся ў разведвальна-дыверсійную брыгаду «Няўлоўныя». Ан-

ціпенка, Шчарбакоў і Сяргей Мацук хадзілі на чыгунку і ўзрывалі варожыя эшалоны. У верасні 1942 г. правялі паспяховую дыверсійную аперацыю на чыгунцы Вільнюс—Даўгаўпілс, пасля чаго па знаёмых сцежках Браслаўшчыны вярнуліся ў брыгаду. У тым жа месяцы Кім і Рыгор былі ўключаны ў групу з дзевяці чалавек пад камандаваннем лейтэнанта Пятра Мікалаевіча Шырокава, якую накіравалі ў Шаркаўшчынскі раён. Неўзабаве ў выніку прытоку мясцовага насельніцтва група перарасла ў значны атрад. У гэтым атрадзе Кім Яўсеевіч стаў начальнікам разведкі. Ён абапіраўся на падтрымку сваіх ранейшых разведчыкаў і прыцягваў новых.

За ўвесь гэты час, узначальваючы свой атрад, а пасля разведку ў Шырокава, Анціпенка захоўваў устойлівую сувязь з А.А. Васілеўскім. Браслаўскае падполле расло. Па ініцыятыве Аляксея Васілеўскага ў горадзе Браславе ў 1942 г. была створана яшчэ адна антыфашысцкая арганізацыя, якую ўзначаліў Эмануіл Аляксандравіч Ціранаў. Таварыш Аляксея па сумеснай працы ў клубе Асаавіяхіма, ён збег з палону і прыйшоў у Браслаў. Васілеўскі выдаў яму пашпарт, пазнаёміў з Анціпенкам. Для канспірацыі Ціранаў адчыніў абутковую майстэрню, дзе і адбываліся сустрэчы падпольшчыкаў з партызанскімі сувязнымі. Падпольшчыкі ўкараняліся ў розныя ўстановы акупантаў, вялі разведку, праводзілі дыверсійныя акты.

З антыфашысцкім падполлем і партызанамі быў звязаны ў гады вайны маладзёжны рух на Браслаўшчыне. Група камсамольцаў вёскі Азяраўцы вырасла летам 1942 г. у буйную камсамольска-маладзёжную арганізацыю. Кіраваў ёю Іосіф Ксаверавіч Пяткун, мясцовы жыхар, былы ўдзельнік камсамольскага падполля Заходняй Беларусі, да 1939 г. сакратар камсамольскай ячэйкі. Створаны быў і філіял гэтай арганізацыі ў Браславе на чале з Канстанцінам Ігнатавічам Максімовічам, якога з восені 1942 г. замяніў Віталь Віктаравіч Брылевіч. Азяраўскія падпольшчыкі прымянялі разнастайныя формы барацьбы. Яны збіралі для партызан разведданыя, разбуралі масты на дарогах і тэлефонную сувязь, вусна і размнажаючы лістоўкі вялі прапаганду супраць акупантаў, зрывалі іх мерапрыемствы. Яны ж выконвалі розныя даручэнні Васілеўскага і Анціпенкі.

Такія ж задачы выконвалі і іншыя маладзёжныя групы. У вёсцы Аксютава дзейнічала група Уладзіміра Адольфавіча Дуброўскага. Складалася яна з яго родзічаў і аднавяскоўцаў. І гэта група таксама супрацоўнічала з Анціпенкам і атрадам Шырокава.

У пачатку 1942 г. Іосіф Пяткун, Уладзімір Дуброўскі і некалькі іх таварышаў трапілі ў немцаў пад падазрэнне і былі арыштаваны. Ад расстрэлу ці адпраўкі ў Германію іх вызваляў тады Аляксей Васілеўскі, які дабіўся іх вызвалення.

Важным цэнтрам маладзёжнага руху была вёска Казяны. Тут яго арганізатарам стаў мясцовы жыхар Уладзімір Іосіфавіч Мацук. Да вайны ён працаваў інструктарам Відзаўскага райкома камсамола. Добра ведаў казянскіх камсамольцаў. Калі фронт наблізіўся да Браслаўшчыны, Уладзімір падаўся на ўсход, каб там уступіць у рады Чырвонай Арміі. Але абставіны склаліся так, што яму давялося вярнуцца дадому. Ад пагрозы расправы, якую рыхтавалі камсамольцам акупанты, яго і іншых выратаваў Алег Пракаповіч, накіраваны А. Васілеўскім з гэтай мэтай у Казяны.

Цяпер Уладзімір Іосіфавіч змог заняцца справай. У 1942 г. ён арганізаваў тры падпольныя групы. Адной у Казянах кіраваў сам. Другую — у

вёсцы Дубраўка — узначаліў Віктар Аўсюк, трэцюю — ў вёсцы Бабылі — дзяўчына Эмілія Бабуль.

Падпольшчыкі казянскай арганізацыі пісалі і расклейвалі антыфашысцкія лістоўкі, учынялі розныя дыверсіі. Галоўную ўвагу яны надавалі збору зброі. А калі ў Відзаўскім раёне з'явіўся партызанскі атрад, многія з іх падаліся да яго. Тыя ж, хто застаўся, вялі разведку для партызан, а некаторыя з іх удзельнічалі ў асобных баявых аперацыях.

У канцы жніўня 1942 г. ў Казянскія лясы прыбыў з Віцебскай вобласці невялікі партызанскі атрад, якім спачатку камандаваў І. І. Пятроў. Тут да яго адразу далучылася вялікая група добра ўзброеных казянскіх камсамольцаў і моладзі. Прывёў іх у лес Уладзімір Іосіфавіч Мацук. Уліліся ў атрад яшчэ некалькі невялікіх груп па 5—6 чалавек, у большасці ваенапалонных і да гэтага дзейнічаўшых самастойна. Дзякуючы папаўненню, атрад, які атрымаў назву «Спартак», прыкметна вырас і разгарнуў баявую дзейнасць. Базіраваўся ён у Відзаўскім раёне.

У сярэдзіне верасня калона гітлераўскіх салдат і паліцаяў накіравалася праз лес да базы атрада. Спартакаўцы, папярэджаныя падпольшчыкамі, адкрылі па ворагу нечаканы моцны агонь і прымусілі непрыяцеля адступіць з вялікімі стратамі. Аднак 10 кастрычніка 1942 г. вораг паўтарыў спробу разбіць партызанаў ля вёскі Азярава Відзаўскага раёна, але зноў пацярпеў паражэнне. У кастрычніку і лістападзе партызаны двойчы грамілі гітлераўскі гарнізон у Казянах. Адначасова з гэтымі і іншымі буйнымі аперацыямі атрад наносіў істотны ўрон дыверсіямі на чыгунцы і шасейных дарогах.

У лістападзе 1942 г. гітлераўскае камандаванне арганізавала супраць партызанаў і насельніцтва ў казянскіх і нарачанскіх лясах буйную карную аперацыю пад кодавай назвай «Нюрнберг». Партызаны не змаглі спыніць жалезную лавіну ворага і вымушаны былі прарывацца, каб выйсці на ўсход. Гітлераўцы накінуліся на мірнае насельніцтва вёсак, што размяшчаліся ў лясной зоне. Імі было забіта, спалена жывымі на Браслаўшчыне 1352 чалавекі, разбурана і спалена 574 хаты. Тэрор працягваўся ў снежні і студзені.

Цяжка перажывалі браслаўчане гэту страшную трагедыю. Многія з іх страцілі родных і блізкіх. Але народ не быў зламаны. Працягвала дзейнічаць падполле. А з вясны пачалі вяртацца ў казянскія лясы партызаны.

Два атрады — «Спартак» і П. М. Шырокава, вырваўшыся ў лістападзе з блакады, прыйшлі ў Віцебскую вобласць і там былі перафарміраваны. Аднак пазней атрад «Спартак» быў адноўлены. У значнай меры гэта былі новыя людзі. Пад кіраўніцтвам Аркадзія Мікалаевіча Панамарова ён прыйшоў летам 1943 г. ў Відзаўскі раён і разгарнуў баявую дзейнасць.

Адрадзіўся і атрад П. М. Шырокава. З брыгады «Няўлоўныя» была вылучана група з пятнаццаці чалавек і накіравана ў Шаркаўшчынскі раён.



Група каманднага складу п/б «Спартак».

Перад ёй і была пастаўлена задача адрадзіць атрад. У яе складзе знаходзіліся Анціпенка і Г. Я. Шчарбакоў. Іх даўнія сувязі з насельніцтвам садзейнічалі прыцягненню моладзі ў атрад. У маі 1943 г. атрад ужо сфарміраваўся на чале з ранейшым камандзірам. Шырокаўцы дзейнічалі не толькі ў Шаркаўшчынскім, але і ў Браслаўскім і іншых суседніх раёнах.

Дзеянні падпольшчыкаў, партызанскіх груп і атрадаў на Браслаўшчыне, як і ў іншых раёнах Беларусі, дэзарганізоўвалі адміністрацыю акупантаў, падрывалі забеспячэнне іх прадуктамі, паказвалі насельніцтву няўстойлівасць так званага «новага парадку».

Летам 1943 г. прыйшоў час узняць партызанскі рух на больш высокую ступень, стварыць у тыле ворага партызанскі фронт. Для гэтага патрабавалася ўмацаваць партызанскія падраздзяленні, ператварыўшы іх з атрадаў ў брыгады. Пры гэтым належыла ўлічваць, што партызаны Браслаўшчыны мелі асабліва вострую патрэбу ў зброі і падрыхтаваных камандных кадрах. Вырашэннем гэтых пытанняў займаўся Беларускі штаб партызанскага руху. Вілейскі і Віцебскі абкомы КП(б)Б.



Група каманднага складу п/б імя Г. К. Жукава.

У ліпені 1943 г. на базе атрадаў, імя М. І. Кутузава і К. К. Ракасоўскага, вылучаных з брыгады імя І. В. Сталіна, у Расонскім раёне была сфарміравана новая брыгада імя Г. К. Жукава і накіравана ў Браслаўскі раён. Атрады імя Кутузава і імя Ракасоўскага мелі ўжо вялікі баявы вопыт, самі былі добра ўзброены і неслі яшчэ зброю для будучага папаўнення. Брыгадай імя Жукава камандаваў Павел Якаўлевіч Сырамаха.

Брыгада імя Жукава прайшла з баямі больш за 200 кіламетраў праз Полацкі, Ветрынскі, Дзісенскі, Мёрскі і Шаркаўшчынскі раёны, разбіваючы на шляху варожыя гарнізоны. 5 жніўня 1943 г. яна прыбыла ў Браслаўскі раён і размясцілася ў вёсках непадалёку ад мястэчка Замошша.

У той жа дзень жукаўцы правялі сваю першую баявую аперацыю на Браслаўшчыне. Пастушок, які прыбег у Замошша, паведаміў, што паліцаі з жандармамі рабуюць і забіваюць жыхароў вёсак Дзегцяры і Гайлешы, падпалілі хаты. Па загаду П. Я. Сырамахі атрад імя Ракасоўскага (камандзір Уладзімір Васільевіч Чарамухін) імкліва акружыў непрыяцеля і адкрыў агонь. Многія карнікі былі забіты, астатнія ўцяклі, пакідаўшы зброю.

17 жніўня атрад імя Кутузава (камандзір Пётр Іванавіч Клімянценка) разбіў атрад гітлераўцаў ля вёскі Богіна.

Поспехі партызанаў устрывожылі акупантаў. Яны пачалі згортваць малалікія гарнізоны і сканцэнтраваліся галоўным чынам ў Браславе і Опсе. Цяпер камандаванне партызан здолела пачаць разгортванне брыгады. Прыток мясцовых жыхароў дазволіў павялічыць колькасць асабовага складу двух атрадаў, што прыбылі з Расонаў, укамплектаваць вылучаны з бры-

гады трэці атрад — імя А. Я. Пархоменкі (камандзір Пётр Дзмітрыевіч Пракоф'еў). У жніўні—верасні былі створаны ў Браслаўскім раёне пераважна з мясцовага насельніцтва два новыя атрады: імя Чапаева (камандзір Мікалай Трафімавіч Глазаў) і імя Суворава (камандзіры Іван Сямёнавіч Шэман, потым Мікалай Уладзіміравіч Кандрашчанка і Міхаіл Іосіфавіч Вяршынін). З восені 1943 г. ў складзе брыгады дзейнічалі дзве мясцовыя партызанскія групы, якія складаліся з падпольшчыкаў, узяўшых у рукі зброю. Гэта былі групы Пракофія Аўрамавіча Марозава з вёскі Фралаўшчына Мёрскага раёна, якая знаходзілася на мяжы з Браслаўшчынай, і Уладзіміра Адольфавіча Дуброўскага з вёскі Аксютава Браслаўскага раёна. На базе гэтых груп у студзені 1944 г. былі арганізаваны атрады імя В. П. Чкалава і імя Р. І. Катоўскага.

У канцы ліпеня 1943 г. на базе атрада «Спартак» была сфарміравана ў Відзаўскім раёне аднайменная брыгада, якую ўзначаліў А. Н. Панамароў. А ў верасні гэтага ж года атрады і групы партызанаў, якія дзейнічалі самастойна ў Шаркаўшчынскім раёне, былі аб'яднаны ў брыгаду «За Радзіму». Камандзірам яе стаў П. М. Шырокаў. Паміж трыма брыгадамі былі падзелены зоны дзеянняў па трох названых адміністрацыйных раёнах. Гэта ўнесла большую арганізаванасць у партызанскую барацьбу і ўпарадкавала кантакты. Асабліва часта каардынавалі свае дзеянні брыгады імя Жукава і «За Радзіму».

У жніўні—верасні тры брыгады працягвалі ўмацоўваць свае сувязі з насельніцтвам, хутка папаўнялі свае рады за кошт мясцовых жыхароў. З гэтай мэтай склікаліся па вёсках мітынгі, вялася актыўная агітацыя і прапаганда. Баявая дзейнасць мела тры напрамкі: дыверсіі на камунікацыях, напады на асобныя гарнізоны гітлераўцаў, на маёнткі, якія знаходзіліся ў іх руках. Так, удзельнічаючы ў аперацыі «рэйкавая вайна», браслаў-скія партызаны ўзрывалі рэльсы і варожыя эшалоны на чыгунках Вільнюс — Крулеўшчызна і Вільнюс — Даўгаўпілс. Неаднаразова наносіліся ўдары па вузкакалейцы Друя — Браслаў — Дукштас і ўрэшце канчаткова вывелі яе са строю. Яны падрывалі масты на шасэйных дарогах Браслаў — Опса, Браслаў — Шаркаўшчына, Відзы — Опса і іншых, па якіх адбываўся ажыўлены рух транспарту акупантаў.

Да канца жніўня — верасня 1943 г. ў некаторых буйных маёнтках накапілася шмат збожжа ад сабранага ўраджаю, а таксама адабранага гітлераўцамі ў насельніцтва. Туды ж для хутчэйшага абмалоту былі звезены малацілкі і расстаўлены невялікія гарнізоны. Камандаванне партызанскай брыгады імя І. К. Жукава вырашыла не дапусціць таго, каб хлеб дастаўся ворагу.

Камандзір брыгады П. Я. Сырамаха праз агентуру даведаўся, што акупанты назначылі на 4 верасня вываз хлеба з маёнтка Бяльмонты і рыхтуюць для гэтага вялікі абоз. Партызаны апярэдзілі гітлераўцаў. Ноччу былі выстаўлены моцныя заслоны з трох атрадаў у Ахрэмаўцах і Укольску і досвіткам усё збожжа вывезена. Частку яго назапасілі для сябе, частку раздалі насельніцтву. Раніцай да Укольска пад'ехала паліцэйская разведка, а днём на машынах гітлераўская калона з танкеткай. Завязаўся жорсткі бой. Танкетка, пашкоджаная партызанамі, завязла на забалочаным лузе, і гітлераўцы, якія панеслі вялікія страты, вымушаны былі вярнуцца ў Браслаў.

Восенню 1943 г. нямецкае камандаванне арганізавала другую карную апе-

рацыю супраць партызанаў Вілейскай вобласці пад кодавай назвай «Фрыц». У ёй ўдзельнічала каля 70 тысяч салдат і афіцэраў. Гітлераўцы акружылі Казянскія лясы і дзень за днём усё шчыльней сціскалі кола. З 28 верасня пачаліся жорсткія баі з карнікамі. Партызаны змагаліся за кожную вёску, але пад націскам перавышаючых сіл ворага вымушаны былі адступіць. Папярэджаныя партызанскім камандаваннем жыхары навакольных вёсак хаваліся на астравах у забалочанай частцы лесу.

Гітлераўцы мелі вялікую перавагу. Яны ўвялі ў дзеянне артылерыю, танкі, самалёты, якія рэгулярна бамбілі лес па кварталах. Брыгада імя Г. К. Жукава заняла кругавую абарону. У цяжкіх баях партызаны адчувалі востры недахоп боепрыпасаў. Да раніцы 7 кастрычніка, калі дыяметр кола звузіўся да некалькіх кіламетраў, а на кожнага байца заставалася ў сярэднім па 4 патроны, брыгада імя Г. К. Жукава фарсіравала раку Дзісну, выйшла праз багну з Казянскага лесу і накіравалася ва Ушацкі раён.

Вырвалася з акружэння і брыгада «Спартак», пакінуўшы ў лясах адзін атрад на чале з начальнікам брыгаднай разведкі Фёдарам Аляксеевічам Конышавым, які манеўрыраваў па лесе, уступаў у сутычкі з праціўнікам. З брыгады імя Г. К. Жукава застаўся ў лесе з групай разведчыкаў камісар брыгады і сакратар Браслаўскага падпольнага райкома КП(б)Б Платон Пятровіч Булойчык. 21 кастрычніка 1943 г. ў баі з карнікамі П. П. Булойчык загінуў.



П. Булойчык.

Брыгада «За Радзіму» раздзялілася на дробныя групы, кожная з якіх самастойна прарывалася праз варожыя ланцугі, пры гэтым несла значныя страты. У баі загінуў памочнік начальніка брыгаднай разведкі, былы браслаўскі падпольшчык Канстанцін Ігнатавіч Максімовіч.

Калі аперацыя «Фрыц» скончылася, партызанскія брыгады вярнуліся ў месцы сваёй ранейшай дыслакацыі. Для акупантаў гэта было нечаканасцю. Ужо 10 лістапада 1943 г. атрад імя К. К. Ракасоўскага нечаканым ударам разграміў варожы гарнізон у мястэчку Замошша, а праз пяць дзён атрад імя М. І. Кутузава нанёс паражэнне гітлераўцам у лесе паблізу вёскі Стацелішкі. Пры гэтым быў узяты ў палон камандаваўшы імі жандарм кат Дзітман. За свае злачынствы ён прадстаў перад народным судом.

Насельніцтва сустрэла партызан прыветліва. Адразу ж была адноўлена сувязь з падполлем. Гэтым займаўся К. Анціпенка, пераведзены з брыгады «За Радзіму» ў брыгаду імя Г. К. Жукава на пасаду намесніка камбрыга па разведцы і начальніка асобага аддзелу. Начальнікам брыгаднай разведкі стаў Г. Я. Шчарбакоў. Яшчэ з пары фарміравання брыгад у кожным раёне падполле перайшло ў падпарадкаванне брыгаднаму камандаванню. У Браславе па-ранейшаму дзейнічала антыфашысцкая група Э. А. Ціранава, але не было ўжо Аляксея Аляксеевіча Васілеўскага. 15 верасня 1943 г. перад пачаткам карнай аперацыі браты Васілеўскія былі арыштаваны і кінуты ў Глыбоцкую турму. Аляксей Аляксеевіч памёр, замучаны катаваннямі.

Дзмітрыя вывезлі ў канцлагер. Гэта была цяжкая страта для ўсіх патрыётаў.

Ва ўмовах узмацняўшагася фашысцкага тэрору падполле працягвала работу. Узнікла новая маладзёжная група ў Слабодцы. Азяраўскія камсамольцы дапамагалі партызанскай разведцы, а ў самыя цяжкія блакадныя дні парушалі тэлефонную сувязь, на дарогах разбуралі масты. І. К. Пяткун накіроўваў сваіх людзей у гарадскую арганізацыю. Падпольшчыца Савіцкая (Шыдлоўская) Валянціна Мікалаеўна актыўнай агітацыяй дабілася развалу браслаўскай прафашысцкай маладзёжнай арганізацыі Саюза Беларускай Моладзі (СБМ), яна ж падтрымлівала сувязь паміж азяраўскімі і браслаўскімі падпольшчыкамі. Іван Іванавіч Раманчык, які працаваў у Даўгаўпілсе, праз Азяраўцы забяспечваў партызан газетнай фарбай і паперай.

Партызанскае камандаванне на Браслаўшчыне ўстанавіла і падтрымлівала сувязь з падпольшчыкамі ў гарадах Латвіі: Рызе, Даўгаўпілсе, Краславе. Адтуль паступалі важныя для Чырвонай Арміі, падпольшчыкаў і партызан разведданыя. З дапамогай браслаўскіх і латышскіх сувязных і падпольшчыкаў быў створаны «мост», па якому пераводзілі ў партызанскія атрады ваеннапалонных, што ўцякалі з гітлераўскіх лагераў. Па гэтаму масту прайшлі многія афіцэры Чырвонай Арміі, у тым ліку Міхаіл Вяршынін, які пазней стаў камандзірам атрада імя А. В. Суворава ў брыгадзе імя Г. К. Жукава.

Дзесяткі былых воінаў вывела з Даўгаўпілскага лагера ваеннапалонных і прывяла да партызанаў сялянская дзяўчына з вёскі Рынгелішкі Люба Пушкарова. Зімой 1944 г. гітлераўцы схапілі і расстралялі Любу, яе бацьку Сямёна Пракопавіча і сястру Аню.

Як і ўсюды па Беларусі, на Браслаўшчыне кіраўніцтва партызанскім рухам ажыццяўляла Кампартыя Беларусі праз свае падпольныя партыйныя камітэты і арганізацыі. З ліпеня 1943 г. на Нарачы, у брыгадзе імя К. Я. Варашылава базіраваўся Вілейскі падпольны абкам партыі на чале з першым сакратаром Іванам Фролавічам Клімавым. Для пяці раёнаў паўночнай часткі вобласці («Паўночная зона») была вылучана аператыўная група, якой кіраваў Віктар Акімавіч Цітавец, былы старшыня Браслаўскага райвыканкома. Уваходзіў у склад групы і член Вілейскага абкома камсамола Прохар Мікалаевіч Альшанскі. Аператыўная група знаходзілася ў брыгадзе імя Г. К. Жукава.

Ва ўсіх раёнах былі створаны падпольныя райкомы партыі і камсамола, якія базіраваліся пры партызанскіх фарміраваннях. Сакратаром Браслаўскага падпольнага райкома партыі быў Платон Пятровіч Булойчык, а пасля яго гібелі — Павел Якаўлевіч Сырамаха. Райком партыі Відзаўскага раёна ўзначальваў камбрыг «Спартака» Аркадзь Мікалаевіч Панамароў. Сумяшчэнне партыйных і камандных функцый было невыпадковым. Партызанская вайна — фронт без тыла. На акупіраванай ворагам тэрыторыі ўсю паўнату Савецкай ўлады ажыццяўлялі падпольныя партыйныя органы і камандаванне партызанскіх фарміраванняў.

Падпольныя райкамы партыі і камсамола, камандаванне партызанскіх брыгад і атрадаў праводзілі вялікую выхаваўчую работу. Палітычная прапаганда і агітацыя вялася вусна і з дапамогай друку. Стрыжнем яе быў заклік да выканання баявога доўгу. Ставіліся і больш канкрэтныя задачы, такія, як зрыў прызыву моладзі ў «Краёвую абарону». У брыгадзе імя Г. К. Жукава праводзіліся сходы для


СМЕРТЬ ФАШИЗМУ

№ 12 МАЙ 1944 г.

Да здравствует 1-ое Мая — день смотра боевых сил трудящихся!

УСИЛИТЬ УДАРЫ ПО ВРАГУ

Действия советской авиации

ДЕЙСТВИЯ АВИАЦИИ СОЮЗНИКОВ

Газета Браслаўскага падпольнага РК КП(б)Б.

партызан і жыхароў вёсак, на якіх часта выступалі П. Я. Сырамаха, камісар брыгады М. А. Кароўкін, П. Я. Альшанскі. Яны і іншыя прапагандысты — Я. Б. Рэут, памочнік камісара брыгады па камсамолу В. М. Чачулоў (ён жа сакратар Браслаўскага падпольнага райкома камсамола) сістэматычна выступалі з дакладамі, праводзілі гутаркі ў вёсках.



П. Казлоўскі.

У гэтай брыгадзе выходзілі дзве газеты: «Смерць фашызму» — орган Браслаўскага падпольнага райкома КП(б)Б і «Моладзь у барацьбе» — орган Браслаўскага падпольнага райкома камсамола. Рэдактарам першай быў камісар атрада імя Суворава Пётр Іванавіч Федарэнка, другой — П. Я. Альшанскі. Літаратурныя аддзелы ў абедзвюх газетах вялі партызаны Ева Аляксандраўна і Павел Рыгоравіч Казлоўскія. Яны ж былі складальнікамі рукапіснага альманаха партызанскай творчасці, у якім друкаваліся аўтары з некалькіх брыгад і падпольшчыкі. Ева Аляксандраўна стварыла ансамбль песні і танца, які быў вядомы не толькі партызанам Браслаўшчыны, але і за яе межамі.

Зіма 1943—1944 гг. была цяжкай парой для браслаўскіх партызан. Жылі яны ў зямлянках, паблізу ад спаленых гітлераўцамі вёсак. Былі цяжкасці з харчамі. А самае галоўнае — не хапала зброі і боепрыпасаў. І ўсё ж партызаны ўтрымлівалі лясны масіў, дзе далі прытулак грамадзянскаму насельніцтву, пастаянна зрывалі намеры фашыстаў уварвацца ў іх зону і наносілі ім адчувальныя ўдары.

Так, 16 студзеня 1944 г. быў разгромлены буйны гарнізон у вёсцы Майшулі, які абараняў подступы да Браслава з захаду. Партызаны брыгады імя І. К. Жукава сіламі двух атрадаў пад камандаваннем П. Я. Сырамахі атакавалі гарнізон. Праціўнік быў нагалаву разбіты. Уцалеўшыя спрабавалі ўцячы ў бок Опсы, але выратавацца ўдалося нямногім. У гэтым баі смерцю героя загінуў бясстрашны партызанскі камандзір Уладзімір Васільевіч Чарамухін.

Праз тры дні брыгада «Спартак» нанесла моцны ўдар па гітлераўскаму гарнізону ў Відзах.

Цяжкім для жукаўцаў быў бой 1—2 сакавіка 1944 г. ля вёскі Спаруны.

Атрады, якія прымалі ў ім удзел, панеслі значныя страты. Затое 25 сакавіка поспех спадарожнічаў партызанам у баі ля вёскі Далёкія, дзе вялікія страты панёс праціўнік. І зноў 27 сакавіка бой з паліцыяй ля вёсак Рожава і Солакаўшчына. У ім гераічнай смерцю загінулі П. Д. Пракоф'еў — камандзір атрада імя Пархоменкі, партызаны А. Г. Гаўрылаў, В. Л. Юрэнка. Амаль штодзённа адбываліся баі ці сутычкі з ворагам, якія заканчваліся з пераменным поспехам на працягу ўсёй зімы.

З красавіка 1944 г. пачалася рэгулярная дастаўка самалётамі зброі, боепрыпасаў і медыкаментаў. Гэта станоўча адбілася на настроі партызан і іх баяздольнасці.

Праз Браслаўшчыну праходзіў найкарацейшы шлях з Беларусі ў Прыбалтыку. Фашысты добра разумелі значэнне раёна і, каб забяспечыць кантроль над ім, усілена насаджалі гарнізоны. Яны мелі мэтай аб'яднаць і ў далейшым сілы і кінуць іх супраць партызан, знішчыць іх ці ў крайнім выпадку выбіць з займаемай зоны. Да сярэдзіны красавіка 1943 г. ў Браславе, Іказні, Перабродзі, Слабодцы і Опсе гітлераўцы сканцэнтравалі больш за 2,5 тыс. сваіх салдат і афіцэраў. Камандаванне брыгады разгадала задумку праціўніка. Умела манеўруючы сваімі сіламі, яно здолела блакіраваць, а ў шэрагу выпадкаў і разграміць варожыя гарнізоны, у тым ліку ў вёсках Ферма — Вуглы, Рысевічы, Шаўляны. На працягу красавіка праціўнік быў у асноўным выбіты з партызанскай зоны. Ад акупантаў была ачышчана значная частка Браслаўшчыны. ранейшая партызанская зона расшырылася і ператварылася ў партызанскі край, дзе знайшла паратунак ад фашыстаў значная частка жыхароў раёна. Сяляне аднавілі сельгасработы. У гэтым ім дапамагалі партызаны. Пад аховай партызанаў, якія дзейнічалі ў Відзаўскім раёне, сяляне пабудавалі ў лясах 8 лагераў і вялі сеў. Партызаны забяспечылі іх цяглавай сілай і інвентаром. Для сялян было нарыхтавана і раздана каля тысячы пудоў бульбы, 150 пудоў аўса, 150 пудоў ячменю, 19 пудоў гароху. Фашысцкія карнікі неаднойчы спрабавалі сарваць сеў, але безвынікова. Толькі ў маі партызаны вытрымалі два націскі ворага: першы бой працягваўся восем гадзін, другі — чатыры. Аднак займаемыя пазіцыі партызаны не здалі. Больш таго, яны самі двойчы атакоўвалі ўмацаваныя гарнізоны гітлераўцаў, разграмілі іх апорныя пункты ў вёсках Казачкі і Галінава.

Партызаны брыгады імя Г. К. Жукава ў красавіку—маі вылучылі сялянам для вядзення сева 67 коней, а таксама раздалі сем'ям, што мелі патрэбу, 2200 кг жыта, 2500 кг аўса, 3250 пудоў бульбы, якія былі адабраны ў нямецкіх маёнтках ці захоплены ў разгромленых гарнізонах акупантаў. Атрадам брыгады давялося 15 разоў уступаць у бой, каб абараніць сялян ад вылазак карнікаў.

Разгортвалася наступленне Чырвонай Арміі і разам з гэтым узрастала стратэгічнае значэнне левабярэжжа Заходняй Дзвіны, значная частка якога кантралявалася партызанамі. Гітлераўцы кінулі спачатку супраць партызан Полацка-Лепельскай партызанскай зоны франтавыя часці, ахоўныя, эсэсаўскія, паліцэйскія падраздзяленні пры падтрымцы 137 танкаў, 235 гармат, 70 самалётаў. Пазней пачалі ўмацоўваць свае гарнізоны на захад ад яе. Меркавалася расшырыць карную аперацыю і на Браслаўшчыну.

Даведаўшыся, што 6 мая з Шаркаўшчыны ў Новы Пагост пройдзе вялікі гітлераўскі абоз са зброяй і прадуктамі, камандаванне брыгады імя Г. К. Жукава арганізавала засаду ля

вёскі Калілоўшчына. Варожы абоз быў разгромлены. Але радасць перамогі азмрочыла вялікая страта. У баі геройскі загінуў камандзір атрада імя Кутузава Пётр Іванавіч Клімянценка.

Баі супраць акупантаў ў красавіку – маі вялі партызаны і на захадзе Браслаўшчыны. Брыгада «Спартак» 22 красавіка напала на буйны гарнізон гітлераўцаў у Опсе, а ў першай палавіне мая разграміла гарнізон у вёсцы Васевічы.

16 – 17 мая праціўнік вёў наступленне франтавымі часцямі на жукаўцаў з боку Браслава. Партызаны выстаялі.

У перыяд падрыхтоўкі і правядзення Чырвонай Арміяй Беларускай наступальнай аперацыі ў чэрвені – ліпені 1944 г. актыўнасць браслаўскіх партызан значна ўзрасла, асабліва на чыгунках Даўгаўпілскага вузла. Адна за другой выходзілі на заданні групы падрыўнікоў. Яны пускалі пад адхон варожыя эшалоны на дарогах Рыга – Полацк, Вільнюс – Даўгаўпілс. Сярод жукаўцаў у гэтай справе вылучаліся майстэрствам і мужнасцю Гаўрыіл Аляксеевіч Быкаў з атрада імя Ракасоўскага, Пётр Яўгенавіч Левічаў з атрада імя Чапаева. У атрадзе імя Катоўскага ў падрыўных групах удзельнічалі і жанчыны-партызанкі: У. Ф. Каралінская (Крышталевіч), Г. У. Сяменчык (Косціна) і інш.

29 чэрвеня франтавыя гітлераўскія часці і паліцыя пачалі наступленне на пазіцыі жукаўцаў у вёсцы Ахрэмаўцы. Стала зразумела, што праціўнік імкнецца ачысціць Браслаўшчыну ад партызан і засцерагчы ад небяспекі шляхі адступлення сваёй арміі. У наступныя дні лінія баёў расцягнулася да вёскі Спаруны. Брыгада на чале з П. Я. Сырамахам стаяла насмерць і не прапусціла гітлераўцаў у партызанскі край. 1 ліпеня ў баі ля Ахрэмаўцаў быў смяротна паранены начальнік штаба брыгады Васіль Сцяпанавіч Чаромін.

З пачатку ліпеня 1944 г. пачынаецца завяршальны перыяд барацьбы партызан Браслаўшчыны з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, перыяд узаемадзеяння з часцямі Чырвонай Арміі. Партызанская брыгада імя Г. К. Жукава сумесна з брыгадай «За Радзіму» ва ўзаемадзеянні з часцямі савецкіх войск вялі цяжкія баі з адступаючымі гітлераўцамі, затрымаўшы іх калоны на дарогах Шараўшчызна – Браслаў. Толькі за адзін дзень 1 ліпеня яны знішчылі 142 фашысцкіх салдаты і афіцэры. Партызаны блакіравалі таксама буйны гарнізон праціўніка ў м. Опса, перагарадзіўшы дарогу гітлераўцам на шляху адступлення на захад. Сумеснымі намаганнямі савецкія воіны і партызаны разграмілі гарнізон, захапілі шмат палонных. 2 ліпеня брыгада «Спартак» сумесна з савецкімі воінамі выбіла гітлераўцаў з Відзаў. Да вечара гэтага ж дня перадавыя часці Чырвонай Арміі ўступілі ў Замошша, а потым разам з партызанамі прасунуліся да в. Ахрэмаўцы. 5 ліпеня пасля артылерыйскай падрыхтоўкі армейскія часці перайшлі ў наступленне на Браслаў. З савецкімі салдатамі ішлі ў бой і партызаны. Пры іх актыўнай падтрымцы 6 ліпеня горад Браслаў быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Апошняй баявой задачай партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава з'яўлялася ліквідацыя разрозненых груповак праціўніка, якія блукалі па лясах і балотах раёна. Брыгада тэрмінова была прыведзена ў баявую гатоўнасць. Начальнікам аператыўнага аддзела па барацьбе з бандамі быў прызначаны намеснік камбрыга М. Я. Палтаўскі.

На працягу двух тыдняў атрады брыгады прачэсвалі Казянскі лясны масіў, які партызаны выдатна ведалі. З 12 па 31 ліпеня 1944 г. атрадамі

брыгады было ўзята ў палон 47, забіта 13 гітлераўцаў, захоплена шмат зброі.

29 ліпеня 1944 г. брыгада ў поўным складзе прыбыла ў г. Браслаў для расфарміравання і афармлення дакументаў. 1 жніўня згодна загаду БШПР брыгада была расфарміравана. Апошні дзень жукаўцаў прайшоў ва ўрачыстых абставінах. З разгорнутым сцягам у поўным складзе брыгада прайшла ўрачыстым маршам ад будынка райкама партыі, дзе ў апошні час размяшчаўся штаб брыгады, па галоўным вуліцам горада на плошчу на Замкавай гары. Пад гукі ваеннага аркестра партызаны выйшлі на плошчу, якую запоўнілі жыхары Браслава. Пасля ўрачыстых прамоў кіраўніка Паўночнай зоны Вілейскага падпольнага абкома партыі В. А. Цітаўца, сакратара Браслаўскага РК КП(б)Б Тамковіча, камандзіра брыгады Сырамахі і камісара Кароўкіна адбылося ўрачыстае пастраенне брыгады. Партызанам былі ўручаны медалі «Партызану Айчыннай вайны».

На гэтым брыгада спыніла сваё існаванне. 343 яе байцы і камандзіры былі накіраваны ў Чырвоную Армію, 176 — у НКДБ і міліцыю, 197 — на савецкую і партыйную работу, у народную гаспадарку.

*П. Р. Казлоўскі,*
доктар гістарычных навук, прафесар,
былы палітрук узвода
партызанскай брыгады імя І. К. Жукава.

**З успамінаў былога падпольшчыка і партызана А. Я. Пракаповіча пра Аляксея Васілеўскага**

...Калісь мае бацькі сябравалі з сям'ёй браслаўскага старажыла святара Аляксея Васілеўскага. Мяне зараз цікавіў яго сын, таксама Аляксей. Я даведаўся, што Аляксей займае пасаду намесніка браслаўскага павятовага старасты, а яго брат Дзмітрый, урач — стараста Слабодскай воласці. Я даўно іх не бачыў і такія змены спачатку мяне насцярожылі... Убачыўшы мяне, Аляксей вельмі ўзрадаваўся... Аляксей ведаў людзей і здолеў трапна выкарыстоўваць іх у падпольнай барацьбе. Васілеўскі спачатку вырашыў накіраваць мяне лесніком, але меркавалася на гэту пасаду ўзяць Відаўскага, уцёкшага з Дзвінска. Затым Аляксей вызваліў з турмы некалькі ваеннапалонных (у т. л. лейтэнанта Кіма Анціпенку)... Пазней гэтыя людзі склалі ядро першай на Браслаўшчыне партызанскай групы. Шматлікія пытанні Аляксей вырашаў разам з іншымі патрыётамі... Аляксей залічыў мяне ў агульны аддзел управы. На гэтай пасадзе я ў поўнай меры выкарыстаў магчымасці для вядзення падпольнай работы — выпісваў пашпарты, вёў улік ваеннапалонных і акружэнцаў — нашых будучых партызан.

*Люди нарочанского края. Мн., 1975. С. 440—442.*
Пераклад з рускай мовы.



А. Пракаповіч.

## З успамінаў былога кіраўніка падпольнай групы ў Браславе Э. А. Ціранава

...Яшчэ ў студзені 1942 г. Васілеўскі звёў мяне з К. Анціпенкам, які прапанаваў арганізаваць у горадзе антыфашысцкую агентурную групу. Непасрэдна разведгрупай кіраваў Анціпенка («Міша Воўк»). Пасля гэтага група ўвайшла ў склад атрада Шырокава, а калі з'явілася брыгада імя Жукава — у склад брыгады...

Хутка я прыцягнуў для працы Ананіча Аляксандра, Дубінку Івана, Зінкевіча Мікалая, Лук'янца Паўла, Брылевіча Мікалая, Зайцава Міхаіла, урача Ільючонка Юльяна. Уся гэта група фарміравалася паступова... Перад групай стаялі мэты: распаўсюджанне лістовак, улік руху і намераў ворага, іх колькасць у гарнізонах, перапраўка ваеннапалонных і насельніцтва ў партызанскія атрады, выяўленне правакатараў і здраднікаў... Дубінка сярод рабочых распаўсюджваў лістоўкі, даведваўся аб намерах паліцыі. Калі азяраўскім камсамольцам патрэбна было запалучыць спісы на маючы адбыцца расстрэл патрыётаў, то ён падрабіў ключы да сейфа і падпольшчыкам удалося выкрасці каштоўныя дакументы. Зінкевіч Мікалай працаваў слесарам, ...псаваў аўтамашыны. У 1943 г. ішла аўтамашына ў Дзвінск, ехалі 20 салдат. На шляху зляцела цяга і машына ўдарылася ў дрэва, загінула некалькі салдат. У далейшым яго пачалі падазраваць, таму са згоды Васілеўскага Зінкевіч працуе на ветлячэбніцы.



Э. Ціранаў.

Лук'янцу Паўлу было даручана выявіць схільных ісці ў партызаны сярод ваеннапалонных. Ён падрыхтаваў групу, у асноўным з былых афіцэраў у колькасці 12 чалавек... Праз некалькі дзён яна была адпраўлена Мікалаем Брылевічам... Таццяна Брылевіч у асноўным выконвала ролю сувязной...

Зайцаў Міхаіл па загаду Васілеўскага быў уладкаваны ў ролі кулямётнага майстра. Займаўся разлажэннем паліцэйскіх..., неаднаразова перадаваў партызанам зброю. Аднойчы пяць чалавек ваеннапалонных накіроўваліся да партызан, а з Браслава быў адзін шлях — перайсці раку Друйку паміж мастамі чыгуначным і шасэйным, якія ахоўваліся. Для забеспячэння бяспекі кіраўніцтва падпольнай групы прапанавала Зайцаву спіліць байкі ў кулямётаў і таксама ісці да партызанаў. Зайцаў заданне выканаў, але ў лес не пайшоў, разлічваючы што і ў гэты раз усё сыйдзе. Аднак, немцы здагадаліся і мужны патрыёт быў расстраляны...

Ільючонак уладкаваўся ў Браслаўскую аптэку фармацэўтам... дапамагаў партызанам медыкаментамі...

Калі мы звязаліся з Анціпенкам, то ён мне даў сувязнога Зінькова Кузьму, які прыносіў мне літаратуру і даручэнні. У мэтах канспірацыі ён заўсёды прыносіў нейкі абутак, бо я працаваў шаўцом. У ліпені 1943 г. з'явіўся у Браслаўскай паліцыі правакатар. У размове са мной ён казаў, што два месяцы знаходзіўся ў партызанах і даведаўся, што Кузьма Зінькоў ходзіць сувязным, але да каго не ведаў... Наступны раз я Зінькова папярэдзіў, каб ён тэрмінова ішоў у брыгаду. Зінькоў адразу не пайшоў і яго арыштавалі... Цэлы тыдзень яго люта катавалі на допытах. Так загінуў мой сувязны.

Пасля гібелі Зінькова Анціпенка прыслаў сувязную Стэфу Пілярскую, якая сумленна і дакладна выконвала ўсе даручэнні...

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

# Ратуючы будучыню

Перед большим умом я склоняю голову,
перед большим сердцем — колени.

Гётэ.

Гэта жанчына здзейсніла вялікі гуманны подзвіг. Называлі яе Анастасіяй Антонаўнай Жукавай... Мамай...

Фашысты ўварваліся ў Браслаў 27 чэрвеня. Большасць устаноў не паспела эвакуіравацца і сярод іх установа асаблівая — дом груднога дзіцяці. А. А. Жукава працавала ў ім медсястрой. Ніхто не ведаў, як доўга давядзецца жыць у акупацыі. Некаторыя разважалі так:

— Не да чужых дзяцей, калі за сваіх душа баліць.

Яна думала інакш.

— Птушаняты бяскрылыя... Як жа іх кінуць, калі лятаць яшчэ не могуць? Прападуць, як піць даць, прападуць. Сэрца ж трэба мець!

І вырашыла: будзем жыць, як і жылі раней, дзяцей у бядзе не пакінула. Разам з ёй засталася нянька Марыя Васілеўская.



А. Жукава
(партрэт).

— Цяжка было, — успамінае Анастасія Антонаўна. — Неабходна было думаць, як пракарміцца. Садзілі бульбу, гародніну. Аб выхадных днях і размовы не было. Заснуць дзеці, а мы — на поле. Не лягчэй было і з адзеннем. Летам яшчэ так-сяк: трусікі, маечкі — вось і адзетыя. Цяжэй было зімой. Крыху дапамагала маці — яна прыносіла з нашага дома ўсё, што магло стаць дзіцячым адзеннем. Чым маглі дапамагалі суседзі. А неяк наогул пашанцавала — на складзе знайшла зусім выпадкова кавалак матэрыялу. Дапамагалі і браслаўскія падпольшчыкі. Па ўказанню Аляксея Аляксеевіча Васілеўскага, вопытнага падпольшчыка, намесніка павятовага старасты, дом груднога дзіцяці фінансаваўся за кошт раённай управы. Васілеўскі арганізаваў збор прадуктаў для дзяцей.

Восенню 1943 года Аляксей Аляксеевіч Васілеўскі і яго брат былі арыштаваны браслаўскай жандармерыяй. Трэба было шукаць шляхі для выратавання дзяцей-сірот. Дзякуючы настойлівасці камсамольца-падпольшчыка Івана Раманчыка дом перадалі ў распараджэнне Браслаўскай БНС («Беларуская народная самадапамога»). І. Раманчык працаваў там бухгалтарам. Ён атрымаў дазвол на ўладкаванне латарэі, даход ад якой прызначаўся на ўтрыманне дзяцей.

— Розныя былі дзеці. Старэйшым было гадоў па пяць, — успамінае Анастасія Антонаўна, — а двое самых маленькіх — сямімесячныя. Цяжка жылося. Хварэлі дзеці. Бывала, дзень і ноч сядзіш каля якога, то адварам поіш, то прыпаркі кладзеш, то самаробнымі лекамі мажаш... За ўсю вайну ні адно дзіця не памерла.

Вайна прыбавіла сірот.

— Толіка Савіцкага ў лесе знайшлі. Адзін хадзіў. Гаварыць умеў мала, свае імя і прозвішча ведаў. Бацька Эмы Лісоўскай на фронце з немцамі ваяваў і загінуў, маці пры родах памерла. Пецю

Ягорава нейкім чынам з канцлагера вырвалі, а маці яго там загінула. Колю Петрашэнку з бальніцы ў адной распашонцы прывезлі — маці ад туберкулёзу памерла. Рускія яны былі, бежанцы са Смаленшчыны. Да Васі Колганава (сапраўднае прозвішча Антонаў) з вёскі бабуля зрэдку наведвалася, шкадавала ўнука, але забраць не магла. Потым даведаліся мы: спалілі яе фашысты жывую разам з іншымі аднавяскоўцамі. У 1944 годзе праходзіў тут з савецкімі войскамі Васін дзядзька — брат маці. Знайшоў хлопчыка, цалаваў і плакаў. Прасіў вельмі:

— Схавайце, выратуйце. Даб'ю фашысцкага гада, вярнуся і забяру хлопчыка.

Не вярнуўся...

Анастасія Антонаўна прымала ўсіх. І для ўсіх гэты дом станавіўся родным, а яна — добрай ласкавай маці. Мамай, якая прыбірала, шыла, мыла бялізну, карміла, чытала казкі, нават спявала і танцавала.

Драматычным перыядам у жыцці Анастасіі Антонаўны і яе вялікай сям'і быў момант, калі гітлераўцы ўцякалі з Браслава. Яны маглі вывезці дзяцей, маглі проста забіць. Ёй дапамог, як яна думае, адзін нямецкі ваеннаслужачы.

Быў пачатак ліпеня 1944 года, чутны быў ужо франтавы гул, часам у горадзе раздаваліся страляніна і выбухі. Дзяцей схавалі ў склепе. Старэйшых засталося толькі трое: Анастасія Антонаўна, Раіса Іванаўна Лебедзева і Ніна Брылевіч — зусім яшчэ маладзенькая дзяўчына. Муж Раісы Іванаўны — Іван Рабянкоў — да вайны працаваў у Браславе следчым у пракуратуры, быў прызваны ў армію, а яна з двума малымі дзецьмі эвакуіравацца не паспела, вярнулася дзесьці з-пад Дрысы і ўсю вайну хавалася ў тым жа доме груднога дзіцяці, была за повара.

Вось ім траім і неабходна было цяпер прыняць нялёгкае рашэнне: што рабіць? Выратаванне было адно: вывесці дзяцей у небяспечнае месца, за горад. Дзесьці каля вёскі Муражы наштурхнуліся на закінуты хлеў. Стомленыя, абяссіленыя дзеці, як авечкі, збіліся ў групку на саломе, прыціхлі, разумеючы бяду. Толькі самыя маленькія прасілі есці і плакалі.

Трывожнай і страшнай была тая ноч.

Раніцай Раіса Лебедзева пайшла ў разведку. Вярнулася радаснай і ўсхваляванай:

— У Браславе нашы!

Ускочылі дзеці, ускочылі і яны, дарослыя. Той жа сцежкай вярталіся дамоў. Ніхто не загінуў, ніхто не згубіўся. Так шчасліва закончылася для іх тая апошняя ноч фашысцкай акупацыі...

Нажаль Анастасіі Антонаўны ўжо няма ў жывых, але яна пакінула насля сябе вялікую сям'ю. І не было ў яе ўзнагарод, не атрымала яна ганаровых званняў, прэмій. Але хіба ад гэтага меншым стаў подзвіг, здзейснены ёю? Мы схіляем калені перад яе вялікім сэрцам.

*«Звязда». 1972. 24 снежня.*

## З АРТЫКУЛА А. ІНДЗЮКОВА «ЁН ЗАГІНУЎ У 20 ГАДОЎ», ПРЫСВЕЧАНАГА ПОДЗВІГУ БРАСЛАЎСКАГА ПАДПОЛЬШЧЫКА МІКАЛАЯ ЛАПУЗЫ

...Ён захапляўся радыё. Яшчэ будучы сямікласнікам канструяваў дэтэктарныя прыёмнікі, з хваляваннем і радасцю лавіў з сябрамі хвалі ў эфіры, і сэрца яго пачашчана білася ад пазыўных Масквы або сталіцы роднай Беларусі.

Ён горача любіў Радзіму, і ўсёй душой ненавідзеў фашысцкіх акупантаў. З пачаткам партызанскага руху наладзіў сувязь з народнымі мсціўцамі, перапраўляў у партызанскі атрад дэталі да радыёпрыёмнікаў, батарэі да іх. А перад кастрычніцкім святам 1943 года зрабіў, можна сцвярджаць, гераічны ўчынак.

Працуючы ў той час на радыёвузле Браслава, ён, як ніхто, ведаў аб падзеях на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Уяўляў з якой прагай хочуць ведаць савецкія людзі праўду аб барацьбе Чырвонай Арміі, аб яе вялікіх перамогах над гітлераўскімі захопнікамі, якія настойліва імкнуліся пераканаць увесь свет у сваёй непераможнасці...

Перад святам Вялікага Кастрычніка сорак трэцяга рашыўся ён, хоць на невялікі час, уключыць перадачу з Масквы. І думаў напэўна: «Вось вам, праклятыя фашысты, параўнайце сваю брахню з ісцінай».

З велізарным здзіўленнем, затаіўшы дыханне, слухалі браслаўчане і жыхары сямі іншых населеных пунктаў, куды па правадах трансліраваліся перадачы, Вялікую Праўду Радзімы...

Цяпер з вялікім жалем мы вымушаны канстатаваць, што білася сэрца гэтага таленавітага юнака ў той дзень нядоўга. На радыёвузел уварваліся раз'юшаныя фашысты. Збіваючы яго чым папала, вывалаклі з памяшкання. Дзікім садызмам гітлераўцы хацелі нанесці боль сваёй ахвяры. А Коля Лапуза мужна маўчаў, з пагардай кідаючы позіркі на азвярэлых злыдняў.

Тут жа, на двары радыёвузла, абарвалася жыццё дваццацігадовага Мікалая Лапузы. Мужна і горда сустрэў ён аўтаматную чаргу, бо ведаў, што праўда на яго баку, на баку яго Вялікай Радзімы.

*«Браслаўская звязда». 1979. 17 чэрвеня.*

**З успамінаў намесніка камандзіра партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава па разведцы К. Я. Анціпенкі аб падпольнай барацьбе на Браслаўшчыне ў 1941—1944 гг.**

...У лютым 1942 года мяне і яшчэ пяць ваеннапалонных вызваў да сябе А. А. Васілеўскі. Ад яго я даведаўся, што Яўген Лявонаў — лётчык, Васіль Чыслоў — лейтэнант, Васіль Нейтмакаў — сяржант, Міхаіл Чарнавольскі — радавы, Міхаіл Бялоў — лейтэнант. Аляксей вызваліў іх з турмы і накіраваў працаваць на ільносушылку пры браслаўскай лесніцтоўцы. Пазней, праз Відаўскага была наладжана падпольная сувязь з Дзвінскам... Вырашылі сфарміраваць групы, а пасля аб'яднаць іх у атрад...



М. Лапуза.



К. Анціпенка.

Першая партызанская стаянка была ў братоў Грыгор'евых. Група складалася з 15 чалавек, а да чэрвеня яна налічвала ўжо 28 чалавек. Галоўнай для нас паўстала праблема ўзбраення. Зброю дабывалі ў насельніцтва...

Мы надавалі вялікую ўвагу рабоце падпольных арганізацый. Гэта быў нябачны для ворага фронт. Аляксей Васілеўскі быў кіраўніком першай на Браслаўшчыне падпольнай антыфашысцкай арганізацыі. Дзякуючы дзейнасці яго групы было выратавана каля 160 патрыётаў. Група забяспечыла нас зброяй, боепрыпасамі, медыкаментамі, тапакартамі. Аляксей Аляксеевіч перадаваў дадзеныя аб колькасці немцаў і паліцыі ў гарнізонах. Яго група арганізавала шырокую разведывальную сетку..., у час папярэджваў нас аб планах і намерах акупантаў. Група Васілеўскага працавала першапачаткова з маёй групай, затым, з атрадам Шырокава, пасля з брыгадамі «За Радзіму» і імя Г. К. Жукава. 15 верасня 1943 года браты Васілеўскія былі арыштаваны і кінуты ў Глыбоцкую турму...

*«Люди нарочанского края». Мн., 1975. С. 393—398.* П е р а к л а д з р у с к а й м о в ы.

## З альбома «Юные герои Витебщины»

### ОЛЯ МАКСІМОВІЧ

Першае, што зрабіла Оля Максімовіч, калі прыйшлі нямецка-фашысцкія захопнікі, — разам з іншымі сябрамі схавала сцяг піянерскай дружыны Замошскай школы, у якой яна вучылася да вайны.Як і многія жыхары, Оля дапамагала трапіўшым у акружэнне вайскоўцам, прыносіла ім ежу, двойчы хавала іх ад праследванняў у хаце сваёй бабулі.

У 1942 годзе Вольга ўстанавіла сувязь з разведчыкамі партызанскай брыгады «За Радзіму», дасціпна выконвала ўсе даручэнні. Неаднаразова накіроўвалася ў Браслаў за медыкаментамі, дастаўляла лістоўкі ў Шаркаўшчыну, Опсу, Слабодку і з дапамогай падпольшчыкаў распаўсюджвала іх сярод насельніцтва. Гэта была вельмі небяспечная праца: у любы момант фашысты маглі прапыніць яе і абшукаць, што яна нясе. Аднак юнай патрыётцы ўдавалася паспяхова выконваць заданні.

У канцы верасня 1943 года Оля з важным даручэннем накіравалася ў в. Слабодка, дзе размяшчаўся фашысцкі гарнізон. Збіраючыся ў шлях яна ўзяла з сабой піянерскі гальштук. Выканаўшы заданне Оля вярталася назад, але была схоплена. Немцы дапытвалі юную разведчыцу, патрабавалі, каб яна рассказала, дзе знаходзяцца партызаны, аднак дзяўчына нічога не сказала. Тады акупанты вырашылі яе расстраляць. Да месца казні прыгналі мясцовых жыхароў. Стоячы на краю ямы, Оля выхапіла свой гальштук і крыкнула:

— Мяне вы можаце забіць, а гальштук…

Аўтаматная чарга перарвала Олю Максімовіч. Так загінула адважная піянерка, імя якой занесена ў спісы ганаровых байцоў батальёна беларускіх арлянят.

*Альбом «Юныя герои Витебщины». Мн., 1976.*
Пераклад з рускай мовы.

### КЛАВА ШЫНКЕВІЧ

Шмат слаўных баявых спраў было на рахунку чатырнаццацігадовай піянеркі Уклянскай школы Браслаўскага раёна Клавы Шынкевіч.

У верасні 1941 года яна ўвайшла ў падпольную камсамольскую арганізацыю



В. Максімовіч.




Помнік В. Максімовіч.



К. Шынкевіч.

«За Радзіму». Як толькі ў казянскіх лясах з'явіліся партызаны, стала іх сувязной.

У лістападзе 1942 года разведчыца «Стрэлка» атрымала цяжкае і адказнае заданне: разведаць колькасць вайсковых часцей у Браславе. Пад выглядам жабрачкі прыйшла ў Браслаў, але была схоплена паліцэйскім, які здаўна падазраваў яе ў сувязі з партызанамі. Пачаліся допыты, катаванні. Піянерка маўчала, а калі згубіла прытомнасць, фашысты, лічачы яе мёртвай, кінулі ў сметнік. Тут дзяўчынку знайшла жанчына, прынесла да сябе, перавязала раны. Потым настаўнік Яблонскі пераправіў Клаву ў атрад П. М. Шырокава.

Смелая піянерка ўвайшла ў склад дыверсійнай групы, якая ўзарвала восем цягнікоў, знішчыла 5 чыгуначных і 12 шасэйных мастоў, узрывала машыны. Ва ўсіх аперацыях удзельнічала і Клава. У баі ля Новага Пагоста яна асабіста забіла 5 нямецкіх салдат і захапіла 2 кулямёты і 2 аўтаматы.

Восенню 1943 года Клава атрымала заданне схадзіць у буйны фашысцкі гарнізон у Слабодцы. Прайшла ўдала. Падыходзячы да хаты сувязнога, Клава сустрэлася з паліцэйскім, які прыкладна год таму тут яе затрымаў. Дзяўчынку дапытвалі шэсць сутак. Ёй задавалі толькі два пытанні: «Хто такая «Стрэлка»? «Дзе яна?». Клава маўчала. Збітую яе павялі на расстрэл.

Партызаны, даведаўшыся пра час і месца казні, зрабілі засаду і ў апошні момант выратавалі разведчыцу ад смерці. Як толькі загаіліся раны, Клава зноў пачала змагацца з ворагам.

Мужная падпольшчыца К. Шынкевіч залічана ў батальён беларускіх арлянят.

*Альбом «Юные герои Витебщины». Мн., 1976.*
Пераклад з рускай мовы.

**З успамінаў былога кіраўніка падпольнай камсамольскай арганізацыі в. Азяраўцы Іосіфа Ксаверавіча Пяткуна**



І. Пяткун.

...Вайна пачалася раптоўна. Браслаўскі райкам і райвыканкам эвакуіраваліся. Пайшоў на ўсход і я. Аднак па дарозе нямецкія войскі перакрылі шлях і мы вымушаны былі вярнуцца назад. У в. Самавольцы мяне арыштавалі і адправілі ў браслаўскую турму. Дапамог Аляксей Васілеўскі... У Браславе я хутка атрымаў дакументы і накіраваўся ў Азяраўцы. Тут мы, мясцовыя камсамольцы, абмяркоўвалі абставіны, дзяліліся навінамі. Паступова ў нас выспела рашэнне арганізаваць барацьбу супраць акупантаў.

У пачатку 1942 года мы пачалі пісаць лістоўкі, у якіх заклікалі насельніцтва аказваць супраціўленне ворагу... У гэты час А. А. Васілеўскі і К. Я. Анціпенка пачалі ствараць антыфашысцкія падпольныя групы. У маі 1942 года першая партызанская група Анціпенкі пайшла ў лес. Я звязаўся з ім і Г. Шчарбаковым. Сустракаўся з імі і К. Максімовічам. Перад нашай арганізацыяй адкрылася шырокае кола дзейнасці... Патрабавалася павялічыць яе колькасць.Я прыцягнуў Івана Раманчыка, а Максімовіч — Віталя Брылевіча, пазней быў прыняты Віктар Пяткун. З дапамогай Анціпенкі Васілеўскі ўладкаваў на працу ў Браславе: К. Максімовіча — у рыбную гаспадарку, В. Брылевіча — паштовым кур'ерам на дарогу Браслаў—Дзвінск, І. Раманчыка — бухгалтарам БНС («Беларуская народная самапомач»), В. Пяткуна — на прыёмны пункт збожжа. Браслаўская падпольная група на чале з К. Максімовічам была добра законспіравана...

Мы вырашылі зрабіць радыёпрыёмнік. Браслаўскія падпольшчыкі знайшлі лямпы, я дабыў дэталі. У канцы 1942 года мы ўжо слухалі перадачы з Масквы. Спачатку перадавалі іх насельніцтву ў вуснай форме, пасля распаўсюджвалі пісьмова у выглядзе лістовак, якія пісалі ад рукі, пазней — друкавалі на машынцы. Узнікла ідэя выдаваць газету. Назвалі яе «Навіны», з гумы зрабілі штамп. Паперу нам даваў І. Раманчык. Газету-лістоўку тыражом 50—70 экземпляраў распаўсюджвалі ў вёсках.



С. Пяткун.

Да студзеня 1943 года ў раёне дзейнічалі толькі дзве падпольныя групы — Браслаўская і Азяраўская. Пасля арганізацыя пашырылася...

Летам 1943 года камсамольцы пачалі выконваць заданні камандавання партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава. Іван Раманчык наладзіў сувязь з друкарскімі рабочымі ў Дзвінску, атрымліваў ад іх паперу, якая дзялілася паміж партызанамі і падпольшчыкамі, дабываў друкарскае абсталяванне...

Віктар Пяткун, які працаваў на прыёмцы збожжа, раіў сялянам не здаваць хлеб, зрываць нарыхтоўкі. Ён паведамляў партызанам брыгады імя Г. К. Жукава куды і калі павязуць збожжа. Аднойчы збожжа загрузілі ў вагоны і павінны былі адправіць у Дукшты. Пра гэта даведаліся партызаны. Замініравалі палатно. Цягнік разам са збожжам і аховай зляцеў пад адхон. Па заданню Канстанціна Максімовіча рыбакі псавалі сеткі і тым самым зніжалі ўлоў рыбы...

У час карнай экспедыцыі восенню 1943 года загінуў Стэфан Пяткун. Ён ведаў латышскую мову і трапіў перакладчыкам у карную часць, якая накіроўвалася на аперацыю па разгрому партызан. А калі карнікі запатрабавалі паказаць дарогу да партызан, Пяткун паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна і павёў іх у процілеглы бок...

У 1944 годзе ў Браславе ўзнікла прафашысцкая арганізацыя СБМ («Саюз беларускай моладзі»). Арганізацыя атрымала заданне маральна разлажыць СБМ. На працу туды ўладкавалі Валянціну Савіцкую... Паступова «саюз» пачаў распадацца, а Савіцкая стала сувязной браслаўскіх падпольшчыкаў...

Восенню 1943 года пасля карнай экспедыцыі партызанам неабходны былі соль, запалкі, тытунь. Азяраўскія камсамольцы аднойчы на некалькіх падводах пад'ехалі да крамы. Загадчыка паставілі ў кут, пагрузілі соль, махорку, запалкі на падводы і праз возера Дрывяты завезлі ўсё да партызан...

У нашу арганізацыю ўваходзіла 12-гадовая Ліля Пяткун. Яна наднаразова даставала медыкаменты, выконвала ролю сувязной...

*Люди нарочанского края. Мн., 1975. С. 384—389.*
Пераклад з рускай мовы.

## З успамінаў героя Савецкага Саюза камандзіра брыгады «Няўлоўныя» Міхаіла Сідаравіча Пруднікава

...Мая мэта сціплая — расказаць пра цесную сувязь нашых партызан з насельніцтвам Вілейшчыны, аб сумесных баявых дзеяннях, пра гераізм патрыётаў нарачанскага краю...

Сярод тых, хто змагаўся з гітлераўцамі ў нашых радах, дапамагаў і падтрымліваў з намі цесныя сувязі, было нямала жыхароў Вілейшчыны. У ліку першых прыйшлі да нас браты Іван і Пётр Мацукі з в. Бабылі Браслаўскага раёна. Пасля — юнакі з в. Скварцішкі Мікалай Мацук, Канстанцін Пупін, Антон Цяцера. Увогуле ў атрадах брыгады «Няўлоўныя» было шмат нараджэнцаў Браслаўшчыны. Так, в. Кіслаўшчыну прадстаўляў у нас Іван Клакоўскі, в. Цяцеркі — Іван Гашанкоў, в. Лабуцеўцы — Іосіф Дзямідаў, в. Плятарова — Ядзя Пузырэўская. Мы рады былі прыходу да нас мясцовых патрыётаў..., аказвалі ім дапамогу, вучылі майстэрству партызанскай барацьбы...

Былі ў нас выхадцы з іншых раёнаў Вілейшчыны. З в. Казіміраўкі Відзаўскага раёна прыбыў Фёдар Яфімаў, з в. Гатоўкі — Сяргей Мацук...

Хутка пасля прыбыцця ў варожы тыл нам стала вядома аб дзейнасці шэрагу вілейскіх партызанскіх атрадаў; з некаторымі з іх удалося ўстанавіць цесную сувязь, дапамагчы зброяй... Тады для актывізацыі і развіцця партызанскага руху ў верасні 1942 г. мы паслалі на Вілейшчыну дзве групы нашых партызан на чале з П. М. Шырокавым і М. І. Фёдаравым. Месцам іх дыслакацыі былі казянскія лясы... Да лістапада 1942 г. групы значна папоўніліся людзьмі і аб'ядналіся ў атрад, які налічваў 115 чалавек. Узначаліў яго П. Н. Шырокаў.

*Люди нарочанского края. Мн., 1975. С. 473—478.*
Пераклад з рускай мовы.

## ГЕОРГІЙ СЦЯПАНАВІЧ ГРОМАЎ

Актыўны ўдзельнік партызанскага руху. Камандзір партызанскага атрада імя Варашылава Віцебскай вобласці (кастрычнік 1942 г. — сакавік 1943 г. і атрада імя Сталіна Вілейскай вобл. (сакавік—кастрычнік 1943 г.). Нарадзіўся ў 1909 г. ў в. Навінкі Маскоўскай вобласці. Да вайны працаваў кавалём на розных прадпрыемствах г. Масквы. З пачатку вайны на Калінінскім фронце. З вясны 1942 г. ў партызанскіх фарміраваннях. Па заданню Беларускага штаба партызанскага руху ў красавіку 1943 г. на чале ініцыятыўнай групы быў накіраваны ў Вілейскую вобласць. За кошт мясцовага насельніцтва група вырасла ў атрад імя І. В. Сталіна колькасцю да 70—80 чалавек. У маі 1943 г. атрад здзейсніў налёт на маёнтак Бяльмонты: знішчыў ахову, жывёлу раздаў насельніцтву. На тэрыторыі Відзаўскага раёна зрабіў напады на варожыя гарнізоны. Усяго на Віленшчыне атрадам было знішчана 6 буйных і 8 дробных мастоў, узарвана 266 рэльсаў. Спалены льнозавод, сховішча. У час карнай экспедыцыі 14 кастрычніка Г. С. Громаў у баі з нямецкімі захопнікамі загінуў. За мужнасць і адвагу ўзнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» II ступені і ордэнам «Айчыннай вайны» II ступені (пасмяротна).

## ЛЕЎ САМУІЛАВІЧ МЯСЕЖНІКАЎ

Партызан брыгады «Няўлоўныя». Нарадзіўся ў 1908 годзе. Кадравы афіцэр. Пасля акружэння трапіў у партызанскі атрад. Загінуў у баі 4 красавіка 1943 года. Пахаваны ў в. Опса.

### З лістоў Г. С. Громава сваёй жонцы Клаўдзіі Васілеўне Громавай

...17.3.1942 г. Дарагая Клава і сынок Бора, я ў партызанскім атрадзе, наношу фашыстам сакрушальныя ўдары, каб яны не савалі сваё рыла на нашу святую зямлю. Узімку я памарозіў ворагу 750 тон бульбы, а зараз знішчаю яго жывую сілу са станкавага кулямёта. За выдатную працу ў партызанскім атрадзе камандаванне мяне ўзнагародзіла...

Але я лічу сваім святым абавязкам знішчыць як можна болей фашыстаў і ліквідаваць іх да канца. Скончыцца вайна, дарагія мае, прыеду, усё раскажу падрабязна пра мае баявыя справы...

...6.9.1942 г. ...Жадаю толькі паведаміць, што я жывы, здаровы, змагаюся ў тыле ворага ў цяжкіх умовах, але трэба змагацца, трэба абараняць сваю радзіму, сваю незалежнасць, неабходна заваёўваць шчасце для нашага малодшага пакалення, у тым ліку шчасце і свайму сыну Бору. Пакуль да пабачэння, жадаю Вам найлепшага ў жыцці, галоўнае не сумаваць, спадзявацца на нашу перамогу. Мы пераможам! Увесь народ у тыле ворага нам дапамагае. Чакаю адказу. Твой муж і тата Громаў.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

### Адзіны ліст Л. С. Мясежнікава сваёй сям'і ад *26.9.1942 г.*

Добры дзень мае дарагія і любімыя — жонка Клаўдзія, дзеці Нэля і Мілачка, Аляксандра Іванаўна, Аляксей Іванавіч і ўсе родныя. Пішу, спяшаюся, хвалююся і не ведаю — атрымае хто мой ліст? Жывыя ці не мае любімыя. Калі вы жывыя, тым больш вам будзе прыемна да слёз і вы не паверыце, што атрымалі ад мяне ліст. Вы мяне даўно аплаквалі, як загінуўшага, а я яшчэ жывы. Праўду кажучы, я сам сябе шмат разоў хаваў, але аказалася, што пражыў да сённяшняга дня. Я шмат перацярпеў, пражыў, на многае нагледзеўся. Сэрца маё наліта крывёй нянавісці і помсты, і я помшчу. Пішу Вам з далёкага тылу, там мы зараз б'ем ворага.

Калі застануся жывы і ўбачу вас, я памаладзею на дзесяткі гадоў і буду бясконца шчаслівы і пачну жыць новым шчаслівым жыццём.

Больш пісаць не магу, мяне прыспешваюць, іду ў далёкі шлях здзяйсняць слаўныя справы.

Пішыце падрабязней, як жывяце, як здароўе, што перажылі. Я паклапаціўся аб вас і калі вас знойдуць, аб вас яшчэ больш паклапоцяцца.

Паведаміце, ці не ведаеце што-небудзь пра маіх родных, маці. Моцна прыціскаю да сэрца. Ваш сын, муж, бацька Лёва.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*



Л. Мясежнікаў.



А. Панамароў.

### АРКАДЗЬ МІКАЛАЕВІЧ ПАНАМАРОЎ

Камандзір партызанскай брыгады «Спартак». Нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Інгулка Адэскай вобласці. Перад пачаткам вайны — у Чырвонай Арміі. Да 1942 г. — палітрук артылерыйскай батарэі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай Вайны I ступені, медалямі. Пасля вайны працаваў дырэктарам школы ў Стаўбцоўскім раёне. Памёр у 1974 г.

## З успамінаў А. М. Панамарова

...У жніўні 1942 г. атрад «Спартак» прыбыў у Відзаўскі раён. Мы пачалі з арганізацыі разведкі. Хутка спартакаўцы выканалі першае баявое заданне. На тэрыторыі гітлераўскага гарнізона ў в. Плятэрава знаходзілася картонная фабрыка. Жнівеньскай ноччу... вораг не далічыўся многіх сваіх салдат. З прыходам у Казянскі лес атраду спатрэбілася ўсталяваць сувязь з мясцовым падполлем. Гэтым займаліся маладзёжныя арганізацыі, што дзейнічалі тут. Каб не даць магчымасці гітлераўцам ездзіць па дарогах, партызаны спалілі ўсе масты, у многіх месцах зрабілі завалы... Восенню 1942 г. атрад «Спартак» сустрэўся з групамі літоўскіх і латышскіх партызан. Яны аказалі нам дапамогу зброяй, радыёсувяззю... Хутка пачалася блакада. Народныя мсціўцы мужна абараняпі пазіцыі. Аднак сілы былі няроўныя. З надыходам цемры спартакаўцы пайшлі на прарыў і выйшлі з акружэння. Улетку 1943 г.частка нашага атрада вярнулася ў Відзаўскі раён. На яго базе была арганізавана брыгада «Спартак». На працягу 1943 г. спартакаўцы вялі актыўныя дзеянні па знішчэнні жывой сілы і тэхнікі праціўніка на дарогах і чыгунках, разбуралі масты, лініі сувязі, праводзілі засады... Вораг для барацьбы з партызанамі пачаў выкарыстоўваць авіяцыю. Калі ў 1943 г. пачалася буйная экспедыцыя супраць партызан, брыгада на працягу месяца манеўравала, уступала ў бой з карнікамі... Пасля летніх баёў брыгада вярнулася ў сваю зону... У канцы 1943 г. мы разбілі добра ўмацаваны гарнізон у Відзах. Па заданню БШПР брыгада прыняла актыўны ўдзел у «рэйкавай» вайне. На ўчастку чыгункі Вільня—Дзвінск было ўзарвана больш за 1 тыс. рэек.

*Люди нарочанского края. Мн., 1975. С. 510—515.*
Пераклад з рускай мовы.

## З успамінаў былога партызана брыгады «Спартак» У. І. Мацука

### Урок гітлераўцам

7 лістапада 1942 г. болей за палову партызан атрада «Спартак» выйшлі на выкананне баявых заданняў. Мы не ведалі, што машыны з курсантамі Вілейскай унтэр-афіцэрскай школы і паліцэйскія падраздзяленні прыбылі ў лес. Камандаваў імі маёр. Курсанты былі добра вывучаны, узброены. Карнікі разлічвалі выкарыстаць малую колькасць партызан і знішчыць лагер. Але іх заўважыў 12-гадовы Коля Дзіковіч і прыбег з папярэджваннямі.

І. Н. Крысаў па трывозе падняў усіх, хто мог трымаць зброю. Вызначыў добрую пазіцыю для сустрэчы ворага. А. Панамароў паведаміў суседнім атрадам літоўцаў і латышоў і яны хутка прыйшлі на дапамогу. Кулямётчыкі падрыхтавалі агнявую кропку... Узброены мы былі вінтоўкамі, толькі літоўскія партызаны мелі аўтаматы. Атрымалі загад: «Заняць пазіцыю, без каманды не страляць».

Хутка з'явіўся ланцуг фашыстаў. Яны ішлі па зарослай хмызняком пашы, ішлі на нас. Вялі іх маёр і капітан. Ужо былі бачны крыжы на мундзірах, бляск зброі. Мы хваляваліся, занадта блізка падыходзіў вораг...

З камандай «агонь!» грымнуў залп. Першых «зрэзалі» ўсіх, у т. л. і афіцэраў. Але пападалі і жывыя, адкрыўшы моцны агонь у адказ. Нашы байцы не давалі праціўніку падняцца. Пагрозлівыя каманды не дзейнічалі, напэўна, ніхто не змог бы адарваць фашыстаў ад зямлі. Адстрэльваючыся, вораг адпаўзаў, пакідаючы забітых і параненых.

За намі, у лесе, пачалі рвацца міны, спераду вырастала новая хваля гітлераўцаў. Косце Машчавітаву захацелася дабыць трафейны кулямёт. Кулямётчык забіты, сам кулямёт побач. Косця спяшаўся, аднак немец, што ляжаў з перабітымі нагамі, цяжка параніў Косцю. Раз-

ведчыкі забілі кулямётчыка. Рыхтавалася наступная атака. сярод атакуючых было шмат паліцэйскіх. Іх мы хутка прыціснулі да зямлі, уцалеўшыя папаўзлі назад да шашы. Забітых было шмат, каля 76 чалавек, узята вялікая колькасць зброі. Мы страцілі Косцю Машчавітава — урачу не ўдалося яго выратаваць. Пахавалі яго на Жвірынцы, з пашанай.

*Альбом славы партизан и подпольщиков Браславщины. Мн., 1984. С. 34. Пераклад з рускай мовы.*

## СА СПРАВАЗДАЧЫ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «СПАРТАК» АБ БАЯВЫХ І ДЫВЕРСІЙНЫХ ДЗЕЯННЯХ

...У студзені 1944 г. разбілі гарнізон м. Відзы. Знішчылі да 30 фашыстаў, узяты трафеі: 2 кулямёты, станковы рускі, аблегчаны нямецкі станковы, 11 вінтовак, аўтамат нямецкі, бяльгійскі парабелум, патронаў рускіх 2450, нямецкіх — 2300, фотаапарат «Лейка». Узяты рыштунак: боты, валёнкі, шынялі, касцюмы.

...Пры разгроме м. Відзы спалена гміна, паліцэйскі пастарунак, школа, у якой размяшчалася рота літоўцаў. Узяты ўсе тавары з крамы, з аптэкі — медыкаменты. Знішчаны цягнік на дарозе Вільня—Дзвінск, спалены паравоз, 22 немцы з машынай і танкамі, 2 вагоны з рыштункам, 2 вагоны з жывой сілай. Разбіта аўтамашына ў м. Відзы.

...1.4.1944 г. Спушчаны пад адхон цягнік з ваеннымі грузамі на чыгунцы Вільня—Дзвінск у 2-х км на поўнач ад стн. Ігналіна. Знішчана — 1 паравоз, 8 вагонаў. Выканаўцы: Старадубцаў Леанід Іванавіч, Лук'янаў Генадзь Уладзіміравіч, Дзівалтоўская Зося Войнахаўна, Стрыкулёў Мікалай Іванавіч.

...15.4.1944 г. Праціўнік павёў наступ на партызанскі лагер па ўсходнім беразе р. Дрысвяціца з мэтай разагнаць і знішчыць партызанскую базу. Наступленне вялося з боку м. Відзы і в. Васевічы. Брыгада заняла абарону на ўчастку в. Вусце — в. Галоўск, уздоўж бальшака Вусце—Казяны... Бой працягваўся з 6 да 10 гадзін. Вораг страціў забітымі не менш 13 чалавек, не дабіўшыся поспеху адышоў.

...16.4.1944 г. Пушчаны пад адхон цягнік з прадуктамі харчавання на чыгунцы Вільня—Дзвінск палітруком 3-га атрада Сямёнам Пятровічам Маркавічам. Пры вяртанні таварыш Сямён загінуў.

...17.4.1944 г. Падрыўная група пад камандай Салаўёва Лаўрэнція Несцеравіча з удзелам Фейгеля Аскара Лейзеравіча, Пучынскага Андрэя Віктаравіча, Рудзіка Восіпа Адамавіча, Ліўшына Барыса Якаўлевіча, Абалевіча Віктара Міхайлавіча спусцілі пад адхон варожы эшалон на чыгунцы Вільня—Дзвінск. Знішчаны 1 цягнік і 6 вагонаў.

...22.4.1944 г. Разгром гарнізона Опса складам 2-га і 3-га атрадаў. Вынік: прарэзана дротавая агароджа, спалены тры гміны:

Опсаўская, Богінская, Замошская, тры хаты, дзе размяшчаўся гарнізон. Забіта трое немцаў і да 70 паліцэйскіх і самаахоўцаў. Нашы страты: 11 чалавек забіта, 9 паранена, з іх 3 — цяжка. Кіраваў аперацыяй — камандзір брыгады Панамароў.

*НА РБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 63, л. 55—57, 66—67, 97.*

## З успамінаў былога камандзіра 4-га атрада партызанскай брыгады «Спартак» В. Дз. Чакунова

Было гэта ў сакавіку. Я прыехаў у Сямёнавічы. Каля поўдня з боку Жукоўшчыны прымчаў на кані начальнік нашай разведкі Рыгор Ходнеў. Конь яго быў загнаны. У Ходнева прастрэлена плячо, лілася кроў. Ён паведаміў, што ў Жукоўшчыну прыбыло шмат паліцаяў і немцаў, забіраюць моладзь у Германію.

Да гэтага часу ў лазню сюды прыехала 10 чалавек з 2-га атрада. У іх быў кулямёт і аўтаматы. Не думаючы, мы прынялі баявы парадак і пайшлі на Жукоўшчыну, хоць і ведалі — няроўныя сілы. Гітлераўцы, назбіраўшы моладзі ў Жукоўшчыне, накіраваліся ў Алашкі і адтуль сустрэлі нас агнём кулямётаў. Мы таксама пачалі страляць. Немцы пачалі адыходзіць. Дзяўчаты і юнакі былі выратаваны... Мы ўвайшлі ў вёску.

Жыхары горача павіншавалі нас, сустрэлі пачастункамі. Паведамілі, што ворагаў было шмат. Многія з вёскі пачалі прасіцца ў атрад.

*Альбом славы партизан и подпольщиков Браславщины. Мн., 1984. С. 36.*

**З успамінаў былога намесніка камандзіра партызанскай брыгады «Спартак» Ф. А. Коньшава**

...28 жніўня 1942 года атрад прыбыў у Казянскі лес... Літаральна побач з намі, у кіламетрах шасці, у в. Плятэрава размясціўся нямецкі гарнізон з 50 салдат рэгулярнай арміі. У сямі кіламетрах у м. Казяны — да 50 паліцэйскіх..., у г. Браславе, у м. Ёды сканцэнтравана да дзвюх рот фашыстаў. Ворагам дапамагаюць паліцэйскія з ліку здраднікаў. Акупанты адчуваюць сябе даволі ўпэўнена і нават бяспечна, бо яшчэ не атрымалі арганізаванага супраціўлення... Мясцовае насельніцтва пазбаўлена праўдзівай інфармацыі аб становішчы на франтах. У такой абстаноўцы нам трэба было дзейнічаць...

На другі ж дзень мы пачалі рыхтавацца да першай сваёй аперацыі на новым месцы. У ноч на 30 жніўня мы выйшлі на шашу Казяны—Плятарова. Непадалёку ад в. Якшты зрабілі засаду. Чуваць як прачынаецца вёска. Далёка разносіцца скрып варот, мыканне кароў, гоман гусей, жаночыя галасы... Вайна вайной, а жыць людзям трэба: самы час сеяць азімыя...

Устае сонца. Да болю ў вачах угледаюся ў бок Казян. Нарэшце адтуль даносіцца слабы гул матора. Неўзабаве бачу: на шашы паяўляецца матацыкл з каляскай, праз паўкіламетра за ім — машына. Перадаю па ланцугу каманду: «Матацыкл прапусціць! Біць па машыне!»...Вораг канешне не падазрае аб небяспецы... Застракатаў кулямёт Івана Грыгор'ева, затрашчалі аўтаматы, забахалі вінтоўкі. Матацыкл быццам падхапіла ветрам, ён імгненна знік за паваротам. Падняўшыся ва ўвесь рост, Васіль Жуланаў кідае процітанкавую гранату. Аглушальны выбух — і машына перакульваецца набок. Мы з крыкам «ура!» высыпаем на дарогу. Партызаны выцягваюць з кабіны забітага шафёра і гаўптмана. У кузаве яшчэ восем забітых салдат.

**Разгром гарнізона ў Плятарове**

...У пачатку зімы 1941—42 гадоў немцы аднавілі работы на кардоннай фабрыцы, лесапільным заводзе і млыне. Яны прымусова зганялі сялян на рубку лесу, а драўніну, кардон і іншую прадукцыю на машынах і падводах вазілі на станцыю Паставы. Гітлераўцы размясцілі ў Плятэраве гарнізон — 50 салдат і крыху менш — паліцыі... Мы прынялі рашэнне разграміць гарнізон, вывесці са строю фабрыку, завод і млын... На заданне выйшлі трыма ўзводамі. Кіравалі аперацыяй камісар Аркадзь Панамароў і начальнік штаба Іван Крысаў. Глыбокай ноччу акружылі кардонную фабрыку... Над пасёлкам раз-пораз успыхвалі ракеты. Немцы былі занепакоены паяўленнем паблізу партызан і прынялі меры перасцярогі... Прыкладна ў палавіне першай гадзіны ночы на ўскрайку лесу ўзлятаюць у неба дзве чырвоныя ракеты. Зараз жа з трох бакоў па фабрыцы застракаталі кулямёты і аўтаматы, паляцелі міны. Грыміць «ура!», кідаемся наперад. Але з фабрыкі нечакана ўдарыў кулямёт. Мы заляглі. Камісар пасылае групу Васіля Рамнёва з заданнем: падпаўзці і закідаць гранатамі кулямётнае гняздо... Ад зыходу іхняга паядынку з кулямётам залежыць, магчыма, лёс усёй аперацыі. ...Марудна ідзе час. Нервы напружаны. Нарэшце два цяжкія выбухі. Кулямёт змаўкае. Зноў грыміць «ура!», зноў узнімаемся ў атаку. Вораг кідаецца наўцёкі. Як мы і меркавалі — у бок шашы. А там наша засада... Застракатаў кулямёт Леаніда Кляцова, дружна ўдарылі аўтаматы і вінтоўкі. Неўзабаве ў другім баку, крыху на поўдзень, таксама раздаецца страляніна... Назаўтра над Плятаровам на 50-метровай трубе кардоннай фабрыкі ўзвіўся чырвоны сцяг...

Мы атрымалі першыя, досыць лёгкія перамогі. Але гэта быў толькі пачатак...

**Салют кастрычніку**

Мінулі ўжо два месяцы баявых дзеянняў у зоне Казянскага лесу. Вораг пачаў збіраць супраць нас сілы. Гітлераўцы аднавілі гарнізоны ў Богіна, Ёдах. 2 ліста-

пада 1942 года на аўтамашынах прыбыла ў Казяны рэгулярная нямецкая часць... У ворага налічвалася да 500 салдат і афіцэраў. Зброя — кулямёты, аўтаматы, вінтоўкі, гранаты. Фашысты занялі памяшканне сямігадовай школы на заходнім канцы мястэчка, выкапалі траншэі, пабудавалі дзоты. Відаць, рыхтаваліся выступіць супраць нас. На нарадзе ў штабе атрада было вырашана не чакаць, калі на нас нападуць, самім апярэдзіць ворага. Выступаць рашылі ў ноч на 3 лістапада. Аперацыя праводзілася напярэдадні 25-й гадавіны Кастрычніка і мела вялікае не толькі ваеннае, але і палітычнае значэнне.

Апоўначы мы дзвюма групамі падышлі да Казян... Падзеі разгортваліся так. Дзесяць смельчакоў з групы Крысава былі адпраўлены да высокага дубу... Наперадзе як быццам маячаць нейкія постаці. Вартавыя. Іван Струкаў, а за ім астатнія імгненна ўсхопліваюцца з зямлі, і не паспелі фашысты крыкнуць, як аказаліся падмятымі, з заціснутымі ртамі... У той час на другім канцы мястэчка партызаны хутка здымаюць варту. Шлях свабодны і з другога боку...

Пакуль група Панамарова прачэсвае вуліцу, група Крысава набліжаецца да школы, да самага варожага логава. Іван Струкаў са сваімі смельчакамі прабіраецца на школьны двор... Рыгор Клычаў і Міхаіл Волкаў абследуюць тэрыторыю вакол школы ці няма дзе яшчэ каго. Заўважаюць дзот, імкліва ўрываюцца туды. Але ў дзоце нікога. Тырчыць з амбразуры кулямёт. Партызаны выцягваюць яго наверх і настаўляюць на вокны школы. Можна пачынаць атаку...

Загаварылі кулямёты, аўтаматы, вінтоўкі. Паляцелі ў вокны гранаты. З акон пачынаюць выскокваць ашаломленыя фашысты. І тут жа трапляюць пад нашы кулі.

Вораг, аднак, апамятаваўся. Ужо са школы пастрэльваюць у адказ, рвуцца гранаты. Раптам адзываецца кулямёт з гарышча школы. Ягонай чаргой скошаны нашы партызаны... Мабыць па камандзе фашысты раптам хлынулі ва ўсе вокны адначасова... Школа — пад нашым перакрыжавальным агнём. Урываемся ўнутр. Відаць як у класных пакоях, у калідорах хаваюцца, тыкаюцца ў куткі гітлераўцы. Пакуль будынак не разгарэўся, спяшаемся вынесці трафеі, боепрыпасы, прадукты. Палонных выводзяць на вуліцу...

Але бой не скончаны. Раптам па нас аднекуль ударыў кулямёт. Страляюць са званіцы царквы. Зараз жа, залёгшы, па званіцы дае некалькі прыцэльных чэргаў Іван Грыгор'еў. Панамароў даручае Васількову з групай партызан знішчыць тых, хто засеў у царкве. Неўзабаве заданне выканана. Казяны зноў свабодныя.

*«Віцебскі рабочы». 1980 г. 29 мая — 24 чэрвеня.*

## Спіс партызанаў брыгады «Спартак», якія загінулі і прапалі без вестак

**АТКІНСКІ Іван Антонавіч**, н. у 1900 у в. Друсевічы, загінуў 3.2.1943, пахаваны ў в. Богіна.

**АРСОБА Альбін Віктаравіч**, н. у 1912, загінуў 22.4.1944.

**АЎСЮК Віктар Ягоравіч** н. у 1915, загінуў 25.6.1944, пахаваны ў в. Васевічы.

**БЯЛОЎ Фёдар Якаўлевіч**, н. у 1927, загінуў 5.4.1944.

**БЯЛОЎ Канстанцін Якаўлевіч**, н. у 1927, загінуў 8.4.1944, пахаваны ў п. Відзы.

**БРЭСКІ Еўстафій Пятровіч**, н. у 1922, загінуў 28.3.1944.

**БАЛУДЗЬ Франц Міхайлавіч**, н. у 1920, загінуў 14.4.1944, пахаваны ў в. Плятарова.

**БЯЛЮН Пётр Антонавіч**, н. у 1925, загінуў 25.6.1944.

**БЫСТРОЎ Андрэй Пятровіч**, н, у 1924, загіну ў 16.2.1944, пахаваны ў в. Плятарова.

**БЕЛЫ Сямён Васільевіч**, н. у 1913, загінуў 23.12.1943.

**ВОРАНАЎ Аляксей Трафімавіч**, н. у 1922 у в. Пятрышкі, загінуў 25.10.1942, пахаваны ў в. Свілы.

**ВОРАНАЎ Мяфодзій Міхайлавіч**, н. у 1924 у Відзах, загінуў 28.7.1943, пахаваны ў п. Відзы.

**ВОРАНАЎ Дамітрый Міхайлавіч**, н. у 1893 у м. Відзы, памёр 15.5.1943, пахаваны ў в. Баравікі.



Брацкая магіла партызан у в. Казяны.

**ВОРАНАЎ Фёдар Аляксеевіч**, н. у 1917, загінуў 1.11.1943, пахаваны ў Лужкоўскім лесе.

**ГАСПАРОВІЧ Казімір Канстанцінавіч**, н. у 1925, загінуў 3.6.1944, пахаваны ў в. Плятарова.




Брацкая магіла партызан у в. Опса.

**ГАБЫШАЎ Ілья Інксевіч**, н. у 1917, загінуў 23.12.1943.

**ГОХМАН Броня Шлемаўна**, н. у 1926, загінуў 23.12.1943.

**ГАСПАРОВІЧ Казімір Канстанцінавіч**, н. у 1925 у в. Мурмішкі, загінуў 7.6.1944, пахаваны ў в. Васевічы.

**ГАРШАНАЎ Антон Фінагенавіч**, н. у 1911 у в. Ажубалі, загінуў 4.1944.

**ДАРОШКА Васілій Данілавіч**, н. у 1925 у в. Казяны, загінуў 20.9.1944, пахаваны ў Дубраўка.

**ДЗЕМІДОВІЧ Аляксандр Аўгуставіч**, н. у 1920, загінуў 23.12.1943.

**ЖАЎНЕРЧЫК Патап Васільевіч**, н. у 1914 у в. Гробішкі, загінуў 23.12.1943, пахаваны ў в. Плятарова.

**ЖЭЛАБОЎСКІ Эдуард Францавіч**, р. у 1922, у в. Едагалі, загінуў 13.4.1944, пахаваны ў в. Азярава.

**ЗОЙФЕРТ Альфонс Іосіфавіч**, н. у 1924, загінуў 8.3.1944, пахаваны ў в. Фурманішкі.

**ЗАКРЭЎСКІ Уладзімір Юльянавіч**, н. у 1922 у в. Опса, загінуў 3.2.1944.

**ІВАНОЎ Мікалай Анкудзінавіч**, н. у 1911 у в. Грыгароўшчына, загінуў 15.7.1944.

**ІВАНОЎ Мікалай Іванавіч**, н. у 1921 у г. Ленінград, загінуў 10.8.1943, пахаваны ў в. Дубраўка.

**ІВАНОЎ Дзмітрый Аляксандравіч**, н. у 1918, загінуў 23.12.1943.

**КУРЫЛОВІЧ Генадзій Ігнацьевіч**, н. у 1924, загінуў 28.3.1944, пахаваны ў в. Пастарнакі.

**КАГАН Генрых Якаўлевіч**, н. у 1913, загінуў 24.4.1944, пахаваны ў в. Друсевічы.

**КАРШАКОЎ Мікалай Паўлавіч**, н. у 1920, загінуў 25.6.1944.

**КУЦЬ Марк Маркавіч**, н. у 1916, загінуў 24.4.1944, пахаваны ў в. Опса.

**КУЦЬ Амій Мартынавіч**, н. у 1926, загінуў 22.4.1944, пахаваны ў в. Опса.

**КАМАРОЎ Аляксандр Нікіфаравіч**, н. у 1922, загінуў 10.8.1943, пахаваны ў в. Дубраўка.

**КАМЕНШЧЫКАЎ Нестар Ісаевіч**, н. у 1927, у в. Пятрышкі, загінуў 15.2.1944.

**КАМЕНШЧЫКАЎ Трафім Ісаевіч**, г. у 1914 у в. Пятрышкі, загінуў 25.6.1944.

**ЛАБЭЦКІ Міхаіл Восіпавіч**, н. у 1925 у в. Ісаі, загінуў 10.9.1943, пахаваны ў в. Сігінка.

**ЛЫСЁНАК Пётр Пятровіч**, н. у 1927, загінуў 16.10.1943.

**ЛЯВОНАЎ Кандрацій Кузьміч**, н. у 1923, загінуў 22.4.1944, пахаваны ў в. Опса.

**ЛЫСЁНАК Ніл Нілавіч**, н. у 1924, загінуў 4.7.1944.

**ЛАБЭЦКІ Аляксей Філімонавіч**, н. у 1920, загінуў 21.4.1943.

**МАІСЕЕЎ Сямён Васільевіч**, н. у 1921, загінуў 24.11.1942.

**МАЦУК Аляксей Іванавіч**, н. у 1924, загінуў 15.6.1944.

**МАЦУК Генадзь Іванавіч**, н. у 1921 у в. Казяны, загінуў 25.10.1942, пахаваны ў в. Свілы.

**МАЛЬЦАЎ Пётр Іванавіч**, н. у 1908, загінуў 14.4.1944, пахаваны ў в. Азярава.

**МІХАЛЕЎ Рыгор Мікалаевіч**, н. у 1912, загінуў 22.4.1944, пахаваны ў в. Опса.

**МАЖЭЙКА Адольф Восіпавіч**, н. у 1906, загінуў 22.4.1944, пахаваны у в. Плятарова.

**МАЦУК Уладзімір Пятровіч**, н. у 1925 у в. Падзісенка, загінуў 10.12.1943, пахаваны ў а. Плятарова.

**МІНАЎ Іван Акімавіч**, н. у 1923 у в. Новадварышча, загінуў 15.11.1943, пахаваны ў в. Н. Дварышча.

**НАЗАРАЎ Іосіф Лаўрэнцьевіч**, н. у 1919, загінуў 14.10.1943.



Г. Мацук.



У. Мацук.

**НАТКОВІЧ Янкель Несцеравіч**, н. у 1922, загінуў 20.1.1944.

**ПАТАРОЧЫН Мацвей Мікалаевіч**, н. у 1922, загінуў 30.6.1944.

**ПАВІНЕН Аляксандр Аляксандравіч**, н. у 1922, загінуў 10.1.1944.

**ПАДЛІПЕНСКІ Фёдар Якаўлевіч**, н. у 1912, загінуў 23.12.1943.

**ПУЧЫНСКІ Віталій Уладзіміравіч**, н. у 1924, загінуў 4.1944.

**ПАХОМАЎ Іван Іванавіч**, н. у 1925 у в. Крываселле, загінуў 15.8.1943, пахаваны ў в. Дубраўка.

**ПУЧЫНСКІ Аляксандр Аляксандравіч**, н. у 1922, загінуў 8.2.1944, пахаваны ў в. Плятарова.

**РАМАНЦЭВІЧ Восіп Восіпавіч**, н. у 1918 у в. Дубраўка, загінуў 7.12.1942, пахаваны ў в. Стаўрова.

**РЫБНІКАЎ Сямён Анкудзінавіч**, н. у 1908 у в. Астравішкі, загінуў 15.10.1943.

**РУДАК Восіп Адамавіч**, н. у 1920, загінуў 23.6.1944.

**РЫНКЕВІЧ Іван Іванавіч**, н. у 1907, загінуў 7.7.1944, пахаваны ў м. Відзы.

**РАЙЧОНАК Ананій Васільевіч**, н. у 1921, загінуў 25.6.1944, пахаваны ў м. Васевічы.

**СЯДЛЕЦКІ Васілій Якаўлевіч**, н. у 1917, загінуў 9.5.1944, пахаваны ў в. Востраў.

**САЛІЕЎ Сямён Кузьміч**, н. у 1914, загінуў 22.4.1944.

**САФРОНАЎ Андрэй Васільевіч**, н. у 1910, загінуў 8.2.1944.

**САФРОНАЎ Цімафей Васільевіч**, н. у 1916, загінуў 7.4.1944, пахаваны ў в. Фурманішкі.

**САКАЛОЎ Сідар Іванавіч**, н. у 1911, загінуў 20.12.1943, пахаваны ў в. Плятарова.

**САВІНАЎ Вінідзікт Фёдаравіч**, н. у 1918, загінуў 18.1.1944, пахаваны ў п. Відзы.

**ТАЛАКОННІКАЎ Аляксандр Панфілавіч**, н. у 1917, загінуў 23.12.1943.

**УВАРАЎ Пётр Іванавіч**, н. у 1911, загінуў 7.4.1944, пахаваны ў в. Фурманішкі.

**УМПІРОВІЧ Сямён Раманавіч**, н. у 1924, загінуў 4.9.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**УМПІРОВІЧ Міхаіл Фёдаравіч**, н. у 1925 у м. Відзы, загінуў 5.5.1944, пахаваны ў в. Азярава.

**УМПІРОВІЧ Аркадзій Мікалаевіч**, н. у 1913 у в. Дубраўка, загінуў 5.5.1944, пахаваны ў в. Буеўшчына.

**УМПІРОВІЧ Усевалад Сямёнавіч**, н. у 1922 у в. Азярава, загінуў 15.8.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**ФІШЭР Барыс Сямёнавіч**, н. у 1908 у в. Гадуцішкі, загінуў 25.9.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**ФІШКЕ Зейарэрд Іосіфавіч**, н. у 1926, загінуў 6.10.1943, пахаваны ў в. Плятарова.

**ХРОМАЎ Сяргей Фёдаравіч**, н. у 1924, загінуў 24.4.1944, пахаваны ў в. Друсевічы.

**ХОДЗЮШ Віктар Емельянавіч**, н. у 1923, загінуў 12.9.1943, пахаваны ў в. Дубраўка.

**ЦЫЎНЕЛЬ Мікалай Іванавіч**, н. у 1921 у в. Тоўшчызна, загінуў 6.12.1943, пахаваны ў в. Плятарова.

**ЦЮРЫН Іван Мікалаевіч**, н. у 1916 у в. Стаўрова, загінуў 29.5.1943, пахаваны ў в. Хвасты.

**ЦЫЎНЕЛЬ Іван Уладзміравіч**, н. у 1924, загінуў 14.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**ЦЫЎНЕЛЬ Андрэй Сямёнавіч**, н. у 1921, загінуў 22.4.1944, пахаваны ў в. Опса.

**ЦЯРЭНЦЬЕЎ Рудак Восіпавіч**, н. у 1920, загінуў 23.5.1944.

**ЦЫЎНЕЛЬ Пётр Рыгоравіч**, н. у 1927, загінуў 25.6.1944.

**ЦЫЎНЕЛЬ Пётр Андрэевіч**, н. у 1022, загінуў 28.3.1944, пахаваны ў в. Пастарнакі.

**МАКЕЕЎ Рыгор Васільевіч**, н. у 1923 у в. пятрышкі, загінуў 27.11.1942, пахаваны ў в. Пятрышкі.

**ДЗІКОВІЧ Мікалай Мікалаевіч**, н. у 1924, загінуў 1.11.1943, пахаваны ў в. Плятарова.

**ВАЛОДЗЬКО Лейба Лейбавіч**, н. у 1914, загінуў 23.12.1943.

**ТРУКШАНІН Фёдар Іванавіч**, н. у 1925, загінуў, пахаваны у в. Плятарова.

**РАМАНЦЭВІЧ Уладзімір Аўгусцінавіч**, н. 1918, загінуў 27.5.1944, пахаваны ў в. Плятарова.

**ЖВІБРА Станіслаў Барнамавіч**, н. у 1923, загінуў 22.4.1944.

**ІВАНОЎ Мікалай Трафімавіч**, н. у 1911, загінуў 25.6.1944.

## ПАВЕЛ ЯКАЎЛЕВІЧ СЫРАМАХА

Камандзір партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава, сакратар Браслаўскага падпольнага РК КП(б)Б. Нарадзіўся у 1915 г. ў в. Дварэц Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Перад вайной працаваў тэхнолагам раймаслапрама. У пачатку вайны — палітрук роты, памочнік начальніка палітаддзела 267-й сд па камсамолу. Пасля акружэння трапіў у Расонскія лясы да партызан. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. У пасляваенны час працаваў на партыйных і савецкіх пасадах, у т. л. і на Браслаўшчыне, доўгі час у апараце міністэрства мяса-малочнай прамысловасці.

### З успамінаў П. Я. Сырамахі

...Летам 1943 г. да нас у Пліскі раён прыбыў сакратар Вілейскага падпольнага абкама А. А. Манахаў. Ён спытаў, ці не супраць я, калі мяне накіруюць у заходнія вобласці ў якасці аднаго з кіраўнікоў партызанскага руху. Я згадзіўся. Хутка была сфарміравана невялічкая брыгада імя Жукава. Я стаў яе камандзірам. Напярэдзе належыла перайсці чыгунку Полацк—Дзвінск, фарсіраваць Заходнюю Дзвіну і прыйсці ў Казянскія лясы... Брыгада прыйшла ў м. Замошша і размеркавалася на адпачынак... У той жа дзень адбыўся шматлюдны мітынг. Я расказаў насельніцтву аб ваенным становішчы і звярнуўся да іх, каб уступалі ў рады партызан... Месцам дыслакацыі выбралі Казянскі лес, што за 6 км ад Замошша.


П. Сырамаха.

У в. Сёлы размясціўся штаб, вакол яе — атрады. З разгортваннем палітработы актывізаваліся нашы сувязі з насельніцтвам. Актывізаваліся падпольныя групы... Камандаванне даручыла П. А. Ма-



П. Марозаў.

розаву і В. А. Дуброўскаму сфарміраваць новыя атрады з мясцовага насельніцтва. Яны добра спрацавалі... Атрады папаўняліся і з ліку былых ваеннапалонных. Да вясны 1944 г. брыгада налічвала 820 чалавек. Наша брыгада была шматнацыянальная... Узаемаадносіны з мясцовым насельніцтвам будаваліся на ўзаемадаверы і павазе... Патрыятызм мясцовага насельніцтва асабліва ярка праяўляўся ў час карнай экспедыцыі восенню 1943 г. У снежні 1943 г. пасля гібелі П. П. Булойчыка я стаў сакратаром Браслаўскага падпольнага райкама КП (б)Б... Да 1944 г. ў брыгадзе не было сваёй друкарні. На пачатку 1944 г. нам з Вялікай зямлі скінулі на парашуце друкарную касу і з тых часоў у нас пачала выходзіць газета «Смерць фашызму» і бюллетэнь «Моладзь у барацьбе». Друкаваліся таксама адозвы і лістоўкі да насельніцтва...

Найбольш трывалую сувязь мы падтрымлівалі з брыгадамі імя Варашылава і «Спартак». Сумесна вырашалі ваенныя і палітычныя задачы, каардыніравалі дзейнасць, аказвалі адзін аднаму дапамогу. У пачатку мая 1944 г. брыгада імя Жукава, «Спартак» і «За Радзіму» правялі сумесны рэйд ва Ушацкі раён для падтрымкі партызан, якія выходзілі з блакады... Чэрвень 1944 г. Адступаючыя гітлераўскія войскі запрудзілі Браслаўшчыну. Нашыя атрады дні і ночы вялі цяжкія баі. Адначасова ўзмацнілі дыверсійную дзейнасць на чыгунцы... У ноч на 2 ліпеня я з атрадам імя П. І. Клімянценкі накіраваўся пад Опсу. Ранкам мы разбілі праціўніка і занялі Опсу... Вярнуўся ў Замошша, каб сустрэць дарагіх гасцей — камандны састаў часцей 6-й арміі. Праз некалькі дзён савецкія войскі пры ўдзеле партызан вызвалілі г. Браслаў. Райкам партыі легалізаваўся і я стаў першым сакратаром Браслаўскага райкама КП(б)Б.

*Люди нарочанского края. Мн., 1975. С. 414—422.* Пераклад з рускай мовы.

**З успамінаў былога камандзіра партызанскага атрада імя В. П. Чкалава брыгады імя Г. К. Жукава П. А. Марозава**

Сям'я наша складалася з васьмі чалавек... Калі палыхнула вайна і Чырвоная Армія адступала, я пачаў збіраць зброю. Першымі зайшлі да нас уцёкшыя ваенапалонныя — Міша Цыбульскі, Вася Ізвозчыкаў і Іван Марак. Я іх накарміў, даў вінтоўкі і яны пайшлі. Каля Шаркаўшчыны Івана забілі паліцаі, а Міхаіл з Васілём вярнуліся. Я даў ім яшчэ самазарадку СВТ і яны пайшлі ў брыгаду «За Радзіму». Заходзілі да нас і байцы з брыгады «Няўлоўныя». Са з'яўленнем брыгады імя Жукава ўсе кантакты пераключыліся на яе. Не аднойчы прыязджаў да мяне камандзір атрада П. Пракоф'еў, прывозіў лістоўкі, газеты, атрымліваў зброю. Камісар брыгады П. Булойчык прыслаў да мяне дваіх — В. Вінаградава і В. Стокава. З імі мы арганізавалі атрад імя Чкалава. Камандзірам выбралі мяне...

Частка маёй сям'і засталася на месцы, але суседзі ведалі, што я пайшоў да партызан. Аднойчы мая сям'я села снедаць. Нехта заўважыў, што ў накірунку хаты набліжаюцца немцы і паліцаі. Хто праз дзверы, хто выбіў шыбу, але ўсе кінуліся ўцякаць. Толькі сястра Насця ўскочыла на печ і схаваўшыся там слухала. Па тых, хто

бег, пачалі страляць. Маці паранілі ў руку і яе схапілі. Бацьку таксама злавілі. Малодшы брат дабег да Крукоўшчыны, дзе знаёмыя яго схавалі. Гаспадарку разрабавалі, хату падпалілі. Бацькоў павезлі ў Мёры, дзе іх жорстка збілі.

А дом не згарэў. Мой дзядзька здалёк назіраў за дзеяннямі карнікаў. Дапамагчы не мог, а як толькі яны ад'ехалі — раскідаў вогнішча і выратаваў не толькі хату, а і Настассю.

Пасля гэтага здарэння ў атрад прыйшла ўся мая сям'я! Бацька, брат Іван, Таццяна і Настасся ўзялі ў рукі зброю. Маці, Наталля і Якім працавалі па гаспадарцы...

Атрад базіраваўся ў Замошскіх лясах, налічваў болей за сотню байцоў... Памятаю адзін з баёў. У снежні 1943 г. ў в. Казінец стаяў паліцэйскі гарнізон. Мы ціха падышліда вёскі і раптоўна атакавалі. У выніку... — гарнізон перастаў існаваць. У другой аперацыі ў в. Вуглы быў забіты афіцэр, узяты ў палон нямецкі лейтэнант і радавы. Праціўнік быў разбіты...

*Альбом славы партизан и подпольщиков Браславщины. Мн., 1984. С. 17.*

**З ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЗА РАДЗІМУ»**

...Май 1943 г. Знішчаны блок сілкавання у м. Бяльмонты, разагнана ахова, спалены будынак аховы, знішчана канцылярыя з тэлефонным апаратам.

Чэрвень 1943 г. Узарвана электрастанцыя ў м. Слабодка.

Ліпень 1943 г. Узарваны мост 24 м на чыгунцы Браслаў—Друя, спалена 6 драўляных мастоў на дарогах Браслаўскага і Відзаўскага раёнаў.

Жнівень 1943 г. Узарваны паравы кацёл у м. Бяльмонты.

Снежань 1943 г. Разбіты гарнізон самааховы ў в. Біруці Браслаўскага раёна, забіта 14 самаахоўнікаў.

Люты 1944 г. Група ў складзе 4 чалавек напала на марудна ідучы варожы цягнік ля м. Пеліканы. 32 грамадзяніна, што ехалі, былі праверáны. Загадана машыністу знішчыць усе прыборы; пар і вада выпушчаны, у топку цягніка накідалі дроў.

## Бой у в. Шаўляны

....19 красавіка 1944 г. праціўнік (240 чал.) з Браслаўскага і Перабродскага гарнізонаў рухаўся ў напрамку м. Ёды. Немцы хацелі знішчыць 3 партызанскія сям'і ў в.в. Вуглы і Ферма, вёскі спаліць. 21 красавіка брыгада не даходзячы да в. Рысевічы разгорнутым ланцугом пайшла на зблiжэнне з праціўнікам. Як толькі партызаны мінулі в. Рысевічы немцы адкрылі агонь. Партызаны перабежкамі пайшлі ў наступленне. Атрад імя Кірава першым уварваўся ў абарону гітлераўцаў, расчляніўшы яе на дзве часткі, астатнія цяснілі ворага з флангаў. Асноўная маса праціўніка ў паніцы адыходзіла... У выніку немцы да самага прыходу Чырвонай Арміі не спрабавалі больш уклініцца ў раён дзеянняў брыгады.

*НА РБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 75, лл. 12—15, 79—103.*

## З ДЗЁННІКА НАЧАЛЬНІКА ШТАБА ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ В. П. ЧКАЛАВА БРЫГАДЫ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА Р. С. РАГАЛЁВА*.

Прадуктовыя запасы хаваюцца і маскіруюцца ў спецыяльных сховішчах (ямах). Яны робяцца наступным чынам: выкопваецца ўмяшчальная яма прыблізнымі памерамі 4х4х2 м. Сцены і дно гэтай ямы мацуюцца бярвеннямі невялікага дыяметру (10 – 15 см). Добра прасушанае збожжа кладзецца ў яму ў мяхах, прысыпаецца глебай і маскіруецца мохам, дзёрнам і хмызняком. Старанна знішчаюцца ўсялякія сляды і вельмі часта робіцца яшчэ зверху завал з дрэў. Сухое збожжа ў такіх сховішчах можа захоўвацца больш года.

Мяса і сала засальваецца ў бочках і апушчаецца ў падобныя ямы толькі меншых памераў.

*12 лістапада 1943 года*

Атрад прыбыў 12.11.43 г. і размясціўся ў лесе на ўчастку, выдзеленым камандаваннем брыгады. Месца было сухое, зарослае соснамі і ялінамі. Перад тым, як пачаць будаваць зямлянкі, зрабілі часовыя буданы. Пасля гэтага сталі капаць зямлянкі для першага і другога ўзводаў паасобку. Зямлянкі рабілі байцы без удзелу мірнага насельніцтва. Выкапалі катлаваны памерамі 6х6х1,5 метра, куды апусцілі зруб на 3 – 4 вянцы. Наверх быў зроблены накат з бярвенняў малога дыяметру. Усё гэта акрамя вакон і дзвярэй прысыпалі пяском і замаскіравалі ялінкамі. Сцены зямлянак унутры абабілі дошкамі, прывезенымі з разбуранай немцамі вёскі Замошша. Пры недахопе інструментаў, з якіх мелася тры пілы і некалькі тупых сякер, зямлянкі былі пабудаваны ў сціслыя тэрміны — 10 – 15 дзён. У снежні атрад узвёў і іншыя зямлянкі, неабходныя для яго размяшчэння.

26 лістапада – 14 снежня 1943 г.

За няпоўных тры дні ў атрад прыбыло папаўненне з мясцовага насельніцтва. Зараз у атрадзе налічваецца 30 чалавек (26 мужчын і 4 жанчыны). 18 чалавек папаўнення былі ўзброены. У атрад уступілі добраахвотна мясцовыя сяляне. Народ фізічна моцны, у большасці маладыя, хаця ёсць і старыя. Усе яны прыйшлі ў партызаны з пачуццём помсты за забітых і спаленых сваіх родных, многія самі пацярпелі ад рэпрэсій нямецкіх улад... Пераважная большасць партызан не была ў войску, таму ў атрадзе вядзецца ўзмоцненае навучанне прыёмам валодання зброяй.

*1 – 12 студзеня 1944 г.*

За першую палову студзеня 1944 года атрад вырас да 40 чалавек, з якіх 34 мужчыны і 6 жанчын. Па нацыянальнасці асабісты састаў размеркаваўся наступным чынам: 17 беларусаў, 17 рускіх і 6 яўрэяў. Узбраенне атрада наступнае: 1 аўтамат, 1 пісталет, 32 вінтоўкі. З боепрыпасаў 797 патронаў да рускіх вінтовак і 100 патронаў да аўтаматаў. Нягледзячы на такое параўнальна слабое ўзбраенне, атрад па-ранейшаму вёў дыверсійную работу, выязджаў на нарыхтоўкі і для прапаганды сярод насельніцтва... 4 студзеня на дарозе Мёры – Браслаў, у наваколлі вёскі Воўкаўшчына, атрад вярнуў 25 фурманак, мабілізаваных немцамі для сваіх патрэб.

10 красавіка 1944 г.

(Выпадак на Шаўлянскім хутары)

9 красавіка раніцой сюды з суседняга хутара на санях пад'ехалі Раманчык і Аляхновіч. З сабой яны мелі дзве вінтоўкі, адзін СВТ, аўтамат, некалькі гранат і дзве тысячы патронаў. Толькі яны пачалі злазіць з саней, як з хмызняку паказаўся ланцуг гітлераўцаў. Адступаць не было куды. Раманчык засеў у канаве і пачаў весці агонь па наступаючаму ворагу з аўтамата і вінтоўкі папераменна. Аляхновіч жа адразу схаваўся за пабудовы і агню не вёў. Бой працягваўся хвілін 20. Раманчык параніў некалькі гітлераўцаў. Немцы, бачачы, што партызана спераду ўзяць не ўдаецца, абыйшлі яго з тылу. У гэтым баі

* Дакументы падраздзяленняў 11-й і 22-й армій за першыя месяцы баявых дзеянняў амаль не захаваліся. Тыя, што ўцалелі, сведчаць аб цяжкіх умовах адступлення, аб пастаяннай пагрозе акружэння.

Раманчык геройскі загінуў. Аляхновіч прасядзеў увесь час за пабудовамі, ніводным выстралам не падтрымаў таварыша і пасля бою здаўся ў палон. Гітлераўцы знялі з забітага партызана паўшубак, захапілі з сабой Аляхновіча і падводчыка і з'ехалі.

11 красавіка 1944 года.

У гадзіну дня атрад выйшаў праводзіць з усімі вайсковымі ўшанаваннямі загінуўшага таварыша на Замошскія каталіцкія могілкі. На магіле паставілі драўляны помнік з надпісам: «Загінуўшы смерцю храбрых у няроўным баі з захопнікамі камсамолец чырвоны партызан Раманчык Уладзімір Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1924 годзе. Прадстаўлены да ўрадавай узнагароды».

17 красавіка 1944 г.

Дзень сонечны і цёплы. Атрад атрымаў з аэрадрома некалькі вінтовак і боепрыпасы. Дванаццаць байцоў пад камандаваннем старшыны Г. Слабодкіна выехалі ў раён на нарыхтоўку. З раніцы атрад займаўся ў асноўным прыбіраннем лагера. Пачалі будаваць гарбарную майстэрню, бо ў атрадзе маецца шмат сырых скур кароў, а абутак у байцоў вельмі дрэнны.

### З ПАРТЫЗАНСКАГА ПАДПОЛЬНАГА ДРУКУ
### ОПСА

Фашысты, атрымаўшы добры ўрок у Відзах, трывала ўмацаваліся ў гэтым гарнізоне, абнеслі мястэчка двума радамі калючага дроту, шмат бункераў з хадамі злучэння непасрэдна з хат, свае хаты і паліцэйскі ўчастак таксама абнеслі дротам вышынёй да 2 м. Усе пераходы да хат з боку вуліцы на ноч застаўляліся рагаткамі з калючага дроту. Пераадолеўшы ўсе перашкоды, партызаны імкліва напалі на гарнізон. Адзін за другім разбівалі бункеры фашыстаў. Вораг вёў агонь усімі наяўнымі сродкамі. У паветра ўздымаліся сотні ракет, клічачы дапамогу з суседніх гарнізонаў. Дапамогі не было, бо гарнізон Відзаў быў сустрэты партызанамі і ўцёк з поля бою.

У трохгадзінным баі фашысты страцілі да 100 чалавек забітымі. Партызаны разбілі і спалілі паліцэйскі ўчастак, 4 гміны, 6 бункераў, сховішча з боепрыпасамі, вялікае сховішча збожжа...

*«Красное знамя». 1944. № 23. Май.*

### РЫГОР МІКАЛАЕВІЧ МІХАЛЁЎ

У жорсткай сутычцы з ворагам паў смерцю храбрых камісар атрада нашай брыгады («Спартак») Рыгор Мікалаевіч Міхалёў...

Ішоў няроўны бой за Опсу. Фашысцкія гады імкнуліся зрабіць Опсу моцным умацаваннем — усё мястэчка было абнесена драцяной агароджай у два рады, бункеры таксама былі абнесены дротам і зроблены хады злучэнняў з дамоў ў бункеры.

Гэта не дапамагло. Партызаны парвалі агароджу і бралі адзін бункер за другім. Камісар Міхалёў з крыкам «За мной, за Радзіму!» кінуўся да трэцяга бункера, знішчаючы фашыстаў агнём свайго аўтамата. Вось ён ужо ля самага бункера... У гэты час варожая куля абарвала яго жыццё.

Памяць аб баявым таварышы Рыгору Мікалаевічу Міхалёве стагоддзямі будзе жыць у нашых сэрцах.

*«Красное знамя». 1944. № 24. Май.*

## НЯЎДАЛЫ ПАХОД ФАШЫСТАЎ

Немцы бачылі небяспеку з боку партызан, таму вырашылі іх знішчыць. Дзеля гэтай мэты яны сабралі ў гарнізонах Відзы, Васевічы, Опса да 700 чалавек латышоў з добрым узбраеннем і 15 мая павялі наступленне.

У 6 гадзін раніцы фашысты з'явіліся ля партызанскай зоны, іх раздзяляла толькі рака. Лес, дзе знаходзіліся партызаны, стаяў, як быццам там наогул нікога не было. Толькі сталі фашысты падыходзіць да ракі, як кожны куст, кожнае дрэва загаварылі кулямётнымі і аўтаматнымі чэргамі. Не маючы дзе схавацца і не чакаючы такой сустрэчы, фашысты адышлі. пакінуўшы забітых і параненых. Падганяемыя немцамі латышы ізноў спрабавалі перайсці раку і кожны раз з-за агня партызан адкатваліся назад. Яны ўвялі ў бой мінамёты. Але з гэтага нічога не атрымалася і пасля 4 гадзін бою немцы сталі адступаць. Партызаны суправаджалі іх стралянінай і выконвалі пахавальны марш на гармоніку. У гэтым баі фашысты страцілі да 40 чалавек.

*Федзя С.* (прозвішча не ўстаноўлена).

*«Красное знамя». 1944, № 25. Чэрвень.*

## РЭЙКАВАЯ ВАЙНА

У ноч на 26 чэрвеня шэсць груп партызанскай брыгады «Спартак» правялі масавы налёт на чыгунку Вільня — Дзвінск і ўзарвалі 636 рэек чыгуначнага палатна, прыпыніўшы рух цягнікоў на трое сутак... Трое сутак фашысцкія звяры не маглі падвозіць на фронт жывую сілу і тэхніку. Партызаны сваёй барацьбой садзейнічалі прарыву фронту на Беларускім напрамку.

*Леанід Л. — в.* (прозвішча не ўстаноўлена).

*«Красное знамя». 1944. № 27. Ліпень.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ Р. І. КАТОЎСКАГА БРЫГАДЫ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА

### Бой у вёсцы Майшулі ў студзені 1944 г.

У першых чыслах студзеня 1944 года атрад пад камандаваннем начальніка штаба Дуброўскага з групай колькасцю дзесяць чалавек быў акружаны паліцыяй і самаахowай у вёсцы Майшулі. Справа была ўначы. Маючы перад сабой перавышаючыя сілы праціўніка, партызаны выйшлі з акружэння мясцовымі сцяжынкамі. Паліцыя ў той жа дзень устанавіла ў Майшулях гарнізон. 5 студзеня 1944 г. камбрыг старшы лейтэнант Сырамаха даў загад разграміць гэты гарнізон. У разгроме гарнізона ўдзельнічалі атрады імя Кутузава, імя Ракасоўскага, імя Катоўскага. Камандзір атрада імя Катоўскага старшы лейтэнант Чаромухін з разведкай павінны былі ўвайсці ў гарнізон з боку Опсы. Атрад імя Кутузава заняў зыходнае становішча на могілках з усходняга боку. Атрад імя Ракасоўскага дзейнічаў з правага фланга — з паўночнага боку. З-за недакладнага разліку часу свая разведка была абстраляна, загінуў камандзір Чаромухін і начальнік асобага аддзела атрада імя Кутузава Максімаў. У выніку бою варожы гарнізон быў разгромлены.

*Друкуецца паводле арыгіналаў з архіва П. Р. Казлоўскага.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ІМЯ А. Я. ПАРХОМЕНКІ БРЫГАДЫ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА

### Бой ля в. Спаруны 1 сакавіка 1944 г.

Па дадзеным нашай разведкі было ўстаноўлена, што ў раёне дыслакацыі нашай брыгады немцы ўстанавілі гарнізоны ў Іказні, Слабодцы, Пераброддзі і іншых вёсках.

Днём і ноччу немцы выязджаюць рабаваць мірнае насельніцтва. З 29 лютага па 1 сакавіка наш атрад выходзіў на баявую аперацыю супраць аднаго з нямецкіх гарнізонаў. Мы размясціліся ў в. Спаруны. На досвітку 1 сакавіка нас нечакана акружылі і атакавалі немцы і паліцыя. Нашы байцы не разгубіліся. Камандзір атрада Пракоф'еў павёў атрад у бой. Праціўнік у дзесяць разоў быў мацнейшы за нас. Бой працягваўся тры гадзіны. У няроўнай сутычцы палі смерцю герояў сем нашых байцоў: Куруза Н. Н., Малькоўскі І. Н., Пастушкоў Г. П., Марковіч В. А., Постны П. Н. і іншыя.

*Друкуецца паводле арыгіналаў з архіва П. Р. Казлоўскага.*

## З ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА

### Бой у раёне в. Солакаўшчына 27 сакавіка 1944 г.

У 11—30 абедзве групы адкрылі агонь па ўскраінам Солакаўшчыны і потым пайшлі на штурм вёскі. Гітлераўцы замацаваліся на панадворках, гарышчах пабудоў і за кутамі хат, хутка ўстанавілі кулямётныя кропкі і адкрылі бязлітасны агонь па наступаючым партызанам. Стаяў яркі сонечны дзень, бачнасць на снезе была выключна добрай, наступаць жа даводзілася па адкрытай мясцовасці, дзе амаль немагчыма было маскіравацца. У выніку паражальнасць партызанаў агнём праціўніка была вельмі вялікай і, нягледзячы на імклівы націск, у вёску ўварвацца не ўдалося. Паблізу крайніх хат вёскі на левым фланзе быў смяротна паранены намеснік камісара атрада Юрэнка. Цяжкія страты панеслі наступаючыя на правым фланзе. Тут пад кулямі ворага смерцю героя загінуў камандзір атрада Пракоф'еў, які наперадзе ўсіх вёў сваіх байцоў у атаку, а таксама камандзір другога ўзвода Гаўрылаў. Пасля смерці камандзіра пархоменцы адыйшлі ад Солакаўшчыны ў напрамку да в. Бернаты.



В. Юрэнка.

### Аб абарончых баях партызан непадалёку ад в. Ахрэмаўцы ў ліпені 1944 г.

Гітлераўцы імкнуліся першым націскам змяць пазіцыі партызан. Яны пайшлі ў атаку і неўзабаве пад прыкрыццём свайго падаўляючага агню падыйшлі да акопаў чкалаўцаў, страляючы з кароткай дыстанцыі і закідваючы акопы ручнымі гранатамі. Атрад, якім камандавалі камандзір узвода малодшы лейтэнант Жойдзь і начальнік разведкі старшы лейтэнант Сыскоў, аказваў ворагу ўпартае супраціўленне на працягу сямі гадзін. Асобныя байцы праявілі сапраўдную мужнасць і гераізм. Кулямётчыкі Яфімаў Пафнуцій, Яфімаў Феафан і Завадзскі Іосіф аказаліся напалову акружанымі немцамі, але здолелі адбіцца ручнымі гранатамі. Агнём кулямёта яны вывелі са строю непрыяцельскі кулямётны разлік. Камандзір аддзялення першага ўзвода Яфімаў Рыгор знаходзіўся каля кулямётнага гнязда. Варожая граната ўпала ў гэта гняздо. Яфімаў схапіў гранату рукой перад тым як яна паспела узарвацца і кінуў назад. Выбухам гэтай гранаты Яфімаў вывеў са строю непрыяцельскі кулямётны разлік.

## Сумесныя дзеянні партызан і Чырвонай Арміі

Гітлераўцы на фронце каля Ахрэмаўцаў нічога не ведалі аб падзеях, што адбыліся на працягу дня на партызанскай тэрыторыі. Раніцай яны пачалі інтэнсіўны артылерыйскі абстрэл партызанскіх пазіцый. У адказ загрукацела чырвонаармейская батарэя. Праціўнік адразу ж перапыніў агонь і з таго моманту ўвесь дзень 3 ліпеня 1944 г. не праяўляў ніякай актыўнасці. Савецкая батарэя неўзабаве знялася і пайшла далей на захад. Вечарам таго ж дня да Бяльмонтаў падыйшлі наступныя артылерыйскія і невялікія пяхотныя часці Чырвонай Арміі. Артылерыя была ўстаноўлена на ўзлеску, а пяхота заняла абарону каля Ахрэмаўцаў. На лініі гэтай абароны размясціліся таксама і партызанскія падраздзяленні. На працягу дня 4 ліпеня вялася агнявая перастрэлка. Раніцай 5 ліпеня нашы батарэі з Бяльмонтаў і Ахрэмаўцаў адкрылі моцны падрыхтоўчы агонь па абароне праціўніка ў вёсках Азяраўцы, Укольск, шашы Браслаў—Іказнь, паўвостраве Дубкі. У 13-00 начальнік штаба партызанскага атрада імя Чкалава малодшы лейтэнант Рогалеў з 5 байцамі правёў разведку ў раёне в. Укольск, быў выкрыты кулямётны разлік праціўніка на могілках вёскі Укольск і артылерыйская батарэя на ўзлеску на паўночны ўсход ад вёскі. Аб выніках разведкі было неадкладна паведамлена на назіральны пункт нашых самаходных гармат, якія занімалі абарончыя пазіцыі на вышыні каля в. Ахрэмаўцы. Артылерыя адразу ж адкрыла агонь па аб'ектах праціўніка і неўзабаве ліквідавала іх. Калі агнявая падрыхтоўка была скончана, наша пяхота, танкі і самаходныя гарматы перайшлі ў наступленне. На самаходках і танках разам з чырвонаармейцамі ў атаку пайшлі добраахвотнікі з партызан. Гэтая атака Чырвонай Арміі была паспяховай. Праціўніка выбілі з вёсак Азяраўцы і Шакуры, нашы танкі авалодалі бальшаком Браслаў—Іказнь, самаходныя гарматы нанеслі ўдар па ўмацаваннях праціўніка за мастом на рацэ Друйцы. Партызаны, якія прынялі ўдзел у атацы, пры ўездзе ў в. Азяраўцы саскочылі з танкаў і самаходных гармат і аўтаматным агнём ва ўпор пачалі растрэльваць пяхоту праціўніка, якая занімала гэтую вёску. Гітлераўцы былі выбіты з Азяраўцаў. Байцы атрада імя Чкалава ў час бою забілі 36 немцаў і паранілі звыш 20. З ліку атакуючых чкалаўцаў найбольш вызначыліся Ваяводаў Федар, які забіў 8 гітлераўцаў, Маслякоў Ігнацій — знішчыў 10 гітлераўцаў і Дуброўскі Павел — 7 гітлераўцаў... Немцы 6 ліпеня 1944 г. прадпрынялі контратаку ў раёне вёскі Шакуры з мэтай вярнуць шашу Браслаў—Іказнь. Атака падтрымлівалася шалёным мінаметным, кулямётным і артылерыйскім агнём, а таксама інтэнсіўнай бамбардзіроўкай некалькімі эскадрылламі самалётаў. Нашы войскі і сумесна з імі партызаны, адбілі ўсе атакі ворага і ўтрымалі пазіцыі, якія былі захоплены напярэдадні. На наступныя суткі войскі Чырвонай Арміі штурмам авалодалі раённым цэнтрам г. Браславам. 8.7.1944 г. атрад імя Ракасоўскага быў накіраваны ў горад Браслаў для нясення гарнізоннай службы. Пазней туды ж быў накіраваны з гэтай жа мэтай і атрад імя Чапаева. У той самы час атрады імя Кліменценкі і імя Катоўскага неслі гарнізонную службу ў Опсе. 6 ліпеня 1944 г. першы ўзвод атрада імя Катоўскага хадзіў у разведку пад Дрысвяты, дзе згубіў аднаго байца забітым. 7 ліпеня праціўнік распачаў шэраг моцных контратак у раёне на захад і поўдзень ад Опсы. Усе гэтыя контратакі былі адбіты гвардзейскімі часцямі Чырвонай Арміі. Партызаны атрадаў імя Кліменценкі і Катоўскага бралі ўдзел у абароне сумесна з чырвонаармейцамі.

...У 21—30 першыя аўтамашыны ўехалі на вуліцу вёскі Замошша, што з'яўлялася геаграфічным і адміністрацыйным цэнтрам зоны, якую кантралявалі партызаны брыгады імя Г.К. Жукава. Насустрач высыпаў натоўп грамадзянскага насельніцтва, апранутага ў лепшае адзенне,

усе партызаны, якія ў дадзены момант не знаходзіліся на лініі абароны. З Опсы прыбыло брыгаднае камандаванне. Вечарам на беразе Замошскага возера ў палатцы летняга лагера брыгады адбылася ўрачыстая сустрэча і прыем камандавання перадавых часцей Чырвонай Арміі. У Замошша прыбылі: 1210-ы гаўбічна-артылерыйскі полк палкоўніка Маркачова і 1073-і гаўбічна-артылерыйскі полк маёра Майбарады са складу 6-й арміі 1-га Прыбалтыйскага фронту. Артылерысты часткова рушылі далей на захад і праз лес міма атрадных партызанскіх баз выйшлі да в. Дамашы, дзе 3 ліпеня 1944 г. іх сустрэў атрад імя Кліменценкі. Частка гармат была замаскіравана ў лесе каля в. Замошша. Адсюль уначы адна батарэя падыйшла да маёнтка Бяльмонты і заняла агнявую пазіцыю на паўночнай ускраіне лесу.

...Брыгада імя Жукава да 29 ліпеня 1944 г. размясцілася ў Браславе. Адбывалася афармленне дакументаў. 1 жніўня 1944 г. на падставе загада БШПР брыгада была расфарміравана. Апошні дзень існавання брыгады прайшоў ва ўрачыстых абставінах. З разгорнутым сцягам брыгада ў поўным складзе рушыла ад будынка Браслаўскага РК КПБ, дзе ў апошні час размяшчаўся яе штаб, па галоўных вуліцах горада на шырокую пляцоўку на Замкавай Гары. Пад гукі ваеннага аркестра ўвайшлі партызаны на плошчу, запоўненую грамадзянамі Браслава, якія з натхненнем прынялі удзел у партызанскім свяце. Пасля ўрачыстых прамоў кіраўніка паўночнай зоны Вілейскага абкома КБ(б)Б Цітаўца, сакратара Браслаўскага райкома КП(б)Б Тамковіча, камандзіра брыгады Сырамахі і камісара Кароўкіна брыгада выстраілася. Перад фронтам брыгады адбылося ўручэнне медалёў «Партызану Айчыннай вайны», байцам і камандзірам, якія вызначыліся ў баях, арганізатарам партызанскага руху. Партызанскае жыццё скончылася. Значная частка партызанаў улілася ў рады Чырвонай Арміі.

*Друкуецца паводле арыгіналу з архіва П. Р. Казлоўскага.*

## З ЗАГАДУ № 1 ПА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА АД 2.7.1944 г.

1. У сувязі з заняццем мястэчка Опса Браслаўскага раёна Вілейскай вобласці пасля выгнання нямецкіх захопнікаў партызанскімі атрадамі брыгады імя Жукава, з сённяшняга дня ўстанавіць у мястэчку Опса Савецкую ўладу.
2. Для навядзення парадку ў мястэчка Опса прызначаецца начальнікам гарнізона тав. Плюскоў Віктар, яго намеснікам — Лазарэнка Павел.

Камандзір партызанскай брыгады
імя Жукава *Сырамаха.*

## З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДЗІРА ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «СПАРТАК» А. М. ПАНАМАРОВА ПАМОЧНІКУ НАЧАЛЬНІКА БШПР І. І. РЫЖЫКАВУ АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ БРЫГАДЫ З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ.

За два дні да прыхода Чырвонай Арміі партызаны брыгады выбілі з мястэчак Відзы, Тверач і в. Васевічы батальён латышскага паліцэйскага палка і 2 ліпеня занялі населеныя пункты, перарэзаўшы рух па дарозе Браслаў—Відзы—Тверач—Гадуцішкі. Да прыходу Чырвонай Арміі будавалі масты, рамантавалі дарогі. З Чырвонай Арміяй злучыліся 4 ліпеня ў 14-00 у м. Відзы. Праціўнік 4 і 5 ліпеня кінуў у бой ля Відзаў да 20 танкаў, 10 штурмавых гармат, да 1500 чалавек пяхоты і авіяцыю. Пасля двухдзённых баёў брыгада Відзы пакінула... З 20 чэрвеня па 5 ліпеня ў баях загінула 26 партызан.

*НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 63, арк. 105—105 адв.*

## Спіс партызан брыгады імя Г. К. ЖУКАВА, якія загінулі і прапалі без вестак

**АРЛОЎ Савелій Васільевіч**, н. у 1919 у г. Львоў, загінуў 6.1.1944.

**АНТОНЕНКА Пётр Іванавіч**, н. у 1925 у Расонскім р-не, разведчык загінуў 31.3.1944, пахаваны ў в. Зімірка.

**АРСОБА Антаніна Канстанцінаўна**, н. у 1924 у в. Стрыжкі Браслаўскага р-на, загінула 1.2.1944, пахавана ў в. Бабылі.

**АЛЯХНОВІЧ Часлаў Карпавіч**, н. у 1925 у в. Пурвінішкі Браслаўскага р-на, загінуў 9.4.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**АРХІПАЎ Карп Іукавіч**, н. у 1924 у в. Рудава Браслаўскага р-на, загінуў 1.6.1944.

**БАДЗЕЛЮН Афанас Афанасьевіч**, н. у 1916 у г. Адэса, загінуў 6.1944.

**БЕРАЗНЁЎ Рыгор Рыгоравіч**, н. у 1916 у Новасібірскай вобл., загінуў 6.1944.

**БЕКІШАЎ Уладзімір Якаўлевіч**, н. у 1923 у Расонскім р-не, начальнік разведкі, загінуў 4.4.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ВІНАГРАДАЎ Уладзімір Рыгоравіч**, н. у 1922 у Расонскім р-не, загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ВАЙНАРОВІЧ Канстанцін**, н. у 1912 у в. Асташкава Браслаўскага р-на, загінуў 17.2.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ВАЛЕНЦІК Іван Васільевіч**, н. у 1923 у Полацкім р-не, загінуў 17.6.1944, пахаваны ў в. Опса.

**ГАЎРЫЛАЎ Аляксей Васільевіч**, н. у 1922 у Ніжагародскай вобл., камандзір узвода, загінуў 27.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ГАСЮЛЬ Пілін Станіслававіч**, н. у 1916 у в. Даўяты Браслаўскага р-на, загінуў 28.6.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ГЛУШЫН Зіновій Аляксандравіч**, н. у 1916 у в. Падгайцы Браслаўскага р-на, загінуў 15.12.1943.

**ДУБРОЎСКІ Эдуард Міхайлавіч**, н. у 1916, у в. Зімірка Браслаўскага р-на, загінуў 1.1.1944, пахаваны ў в. Залессе.

**ДАШКОВА Марыя Іванаўна**, н. у 1925 ў Шаркаўшчынскім р-не, загінула 2.1.1944, пахавана ў в. Мацешы.

**ЗАЙКІН Міхаіл Мікалаевіч**, н. у 1922 Расонскім р-не, камандзір узвода, загінуў 30.7.1943.

**ЗАХАРАЎ Аляксей Захаравіч**, н. у 1922, у Харкаўскай вобл., начальнік разведкі, загінуў 15.12.1943, пахаваны ў в. Замошша.

**ІВАНОЎ Пілін Маркавіч**, н. у 1925, у Шаркаўшчынскім р-не, загінуў 18.5.1944.

**ІВАНОЎ Еўстафій Іванавіч**, н. у 1920 у Шаркаўшчынскім р-не, загінуў 18.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ІВАНОЎ Васіль Дзямідавіч**, н. у 1925, у Расонскім р-не, загінуў 18.2.1944, пахаваны ў в.Опса.

**КЛІМЕНЦЕНКА Пётр Іванавіч**, н. у 1912 у Расонскім р-не, камандзір атрада, загінуў 6.5.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**КАГАНОВІЧ Эмілья Іванавіч**, н. у 1914 у Баранавіцкім р-не, камандзір аддзялення, загінуў 1.1.1944, пахаваны ў в. Мілашкі

**КАРОТКІН Арцімон Іванавіч**, н. у 1914 у в. Рымуці Браслаўскага р-на, загінуў 6.1.1944.

**КАЧУКОЎ Раман Рыгоравіч**, н. у 1914 у Тамбоўскай вобл., загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**КУРУЗА Мікалай Несцеравіч**, н. у 1920 у Міёрскім р-не, загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**КІРЫЛАЎ Вадзім Ціханавіч**, н. у 1924 у Латвіі, загінуў 6.1944.

**ЛЕБЕДЗЕЎ Хрыстафор Дарафеевіч**, н. у 1925 у в. Жакавічы Браслаўскага р-на, загінуў.

**ЛІСОЎСКІ Міхаіл Васільевіч**, н. у 1919 у г. Львоў, загінуў 6.1.1944.

**МАКСІМАЎ Іван Піліпавіч**, н. у 1922 у Расонскім р-не, начальнік асобага аддзела, загінуў 16.1.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**МАТАШ Рыгор Рыгоравіч**, н. у 1921 у Полацкім р-не, загінуў 30.7.1943, пахаваны ў в. Залессе.

**МІНАЎ Іван Акмеевіч**, н. у 1922 у в. Дварышча Браслаўскага р-на загінуў 3.9.1944, пахаваны ў в. Бароўка.

**МАКСІМОВІЧ Леў Уладзіміравіч**, н. у 1927 у в. Шышкіна Браслаўскага р-на, загінуў 15.2.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**МАЛЬКОЎСКІ Іван Мікалаевіч**, н. у 1922 у Арлоўскай вобл., загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**МАРКОВІЧ Уладзімір Андрэевіч**, н. у 1914, у Міёрскім р-не, загінуў 17.2.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**МІКШТА Вячаслаў Іосіфавіч**, н. у 1926 у в. Кіслаўшчына Браслаўскага р-на, загінуў 9.5.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**МУТАР Віктар Віктаравіч**, н. у в. Іказнь, загінуў 5.10.1943, пахаваны ў в. Замошша.

**МАГАЛІНСКІ Леанід Іванавіч**, н. у 1927 у в. Гайлешы Браслаўскага р-на, загінуў 6.5.1944.

**НАВІЦКІ Мікалай Аляксандравіч**, н. у 1925, у Расонскім р-не, загінуў 22.1.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ПЕТРАЧЭНКА Міхаіл Антонавіч**, н. у 1916, у Смаленскай вобл., загінуў 1.1.1944, пахаваны ў в. Мілашкі.

**ПАЛУМІНСКІ Аляксандр Аляксандравіч**, н. у 1906 у Расонскім р-не загінуў 2.6.1944.

**ПАРОДНЯ Станіслаў Антонавіч**, н. у 1924 у Расонскім р-не, загінуў 14.7.1943, пахаваны ў в. Залессе.

**ПЯТРОЎ Арцём Васільевіч**, н. у 1925 у Шаркаўшчынскім р-не, загінуў 10.10.1943, пахаваны ў в. Мацешы.

**ПАПЦЮШЫН Іван**, н. у 1916 у Самарскай вобл., начальнік разведкі, загінуў.

**ПРАКОП'ЕЎ Пётр Дзмітрыевіч**, н. у 1914 у Іркутскай вобл., камандзір атрада, загінуў 27.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ПОСТНЫ Пётр Міхайлавіч**, н. у 1923 у Шаркаўшчынскім р-не, загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ПАСТУШКОЎ Георгій Пятровіч**, н. у 1917 у Міёрскім р-не, загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ПУШКАРОЎ Сямён Пракоф'евіч**, н. у в. Рынгелішкі Браслаўскага р-на, загінуў 1.3.1944.

**ПУШКАРОВА Любоў Сямёнаўна**, н. у в. Рынгелішкі, загінула 1.3.1944.

**ПУШКАРОВА Ганна Сямёнаўна**, н. у в. Рынгелішкі, загінула 1.3.1944.

**РЫБІНА Галіна Аляксандраўна**, загінула 10.2.1943, пахавана ў в. Закор'е.

**РУТКОЎСКІ Кастанцін**, н. у 1923, у Латвіі, загінуў 6.1944.

**РАМАНЧЫК Уладзімір Андраевіч**, н. у 1924 на хут. Сядун Браслаўскага р-на, загінуў 9.4.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**САФРОНАЎ Арсен Максімавіч**, н. у 1921 у в. Жакавічы Браслаўскага р-на, загінуў 10.10.1943, пахаваны ў в. Мацешы.

**СУПРУНОЎ Іван**, н. у 1914 у Луганскай вобл., загінуў 11.6.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**СІМАНАЎ Мікалай Барысавіч**, н. у 1910 у Лепельскім р-не, упаўнаважаны асобага аддзелу, загінуў 1.6.1944.

**СМЫСЛОЎ Савелій Рыгоравіч**, н. у 1923 у Верхнедзвінскім р-не, загінуў 20.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**СЕМЕНС Уладзімір Лявонавіч**, н. у 1923 у Верхнедзвінскім р-не, загінуў 13.11.1943.

**СЯНЕЦКІ Пётр Іосіфавіч**, н. у 1919 у Кіраваградскай вобл., загінуў 6.1944.

**СЯНЮТ Альфонс Аўгуставіч**, н. у 1916, у Латвіі, загінуў 6.1944.

**ТАЛСТОЎ Сямён Фёдаравіч**, н. у 1920 у в. Укольск Браслаўскага р-на, загінуў 28.6.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ТРАШКОЎ Пётр Нікандравіч**, н. у 1923 у Расонскім р-не, загінуў 22.1.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ФАМІН Аляксандр Мікалаевіч**, н. у 1914 у Валагодскай вобл., загінуў 6.1.1944.

**ФЯНЧОНАК Іван Цімафеевіч**, н. у 1923 у Расонскім р-не, начальнік разведкі, загінуў 14.6.1943, пахаваны ў в. Замошша.

**ЧАРОМУХІН Уладзімір Васільевіч**, н. у 1917, у г. Санкт-Пецярбург, камандзір атрада, загінуў 16.1.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ШАРЫПА Васіль Ніканавіч**, н. у 1920, загінуў 6.5.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ШАСТАКОЎ Мікалай Васільевіч**, н. у 1918, загінуў 6.5.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ШЛАБОВІЧ Станіслаў Канстанцінавіч**, н. у 1926 у в. Шаколеўшчына Браслаўскага р-на, загінуў 1.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

**ЮРЭНКА Віктар Лазаравіч**, н. у 1922 у Расонскім р-не, камісар, загінуў 27.3.1944, пахаваны ў в. Замошша.

## Спіс партызан брыгады «За Радзіму», якія загінулі і прапалі без вестак

**АТРАХІМОВІЧ Валерый Мікалаевіч**, н. у 1893 у в. Баравыя, загінуў на чыгунцы Вільня–Дзвінск.

**АТРАХІМОВІЧ Паўліна Ягораўна**, н. у 1908 г. у в. Баравыя, загінула ў час карнай экспедыцыі.

**АТРАХІМОВІЧ Яўген Валер'янавіч**, н. у 1930 у в. Баравыя, загінуў.

**АТРАХІМОВІЧ Вера Валер'янаўна**, н. у 1925 у в. Баравыя, загінула.

**АТРАХІМОВІЧ Лявонцій Дзмітрыевіч**, н. у 1925, у в. Азярава, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**АЎТУХ Васіль Іванавіч**, н. у 1914, у в. Барскі, загінуў 15.7.1943.

**БОЛДЫРАЎ Аляксей Архіпавіч**, н. у 1913 у Варонежскай вобл., загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**БАХМАН Мікалай Сяргеевіч**, н. у 1920 у Адэскай вобл., прапаў без вестак.

**ГАЛЫГІНА Клаўдзія Мацвееўна**, н. у 1920, прапала без вестак 14.10.1943.

**ГУР'ЯН Лейба Эрзеравіч**, н. у 1915 у Баранавіцкім р-не, загінуў 27.1.1944, пахаваны ў в. Быкоўшчына.

**КРЫВЕНКА Барыс Карлавіч**, н. у 1921, загінуў 24.2.1944, пахаваны ў в. Васілішкі.

**КАЙСІН Міхаіл Аляксеевіч**, н. у 1919 у Кіраўскай вобл., загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**КАЙСІН Аляксей Паўлавіч**, н. у 1920 у Кіраўскай вобл., загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**КАЗЛОЎ Мар'ян Кірылавіч**, н. у 1903 у Ніжагародскай вобл., загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**КАЛТОНЧЫК Анатоль Піліпавіч**, н. у 1911, загінуў 13.2.1944, пахаваны ў в. Краснагорка.

**КУРЫЦЫН Мікалай Міхайлавіч**, н. у 1922 у Яраслаўскай вобл., загінуў 13.2.1944, пахаваны ў в. Краснагорка.

**КРОТ Юзэф Канстанцінавіч**, н. у 1922 у в. Мілашы, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**КАЛІНІН Жорж**, н. у 1918 у г. Масква, загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**КАСАРЭЎСКІ Іпаліт Іосіфавіч**, загінуў у лістападзе 1943.

**КАСАРЭЎСКІ Петр Іосіфавіч**, загінуў у лістападзе 1943.

**ЛАЎРЫНОВІЧ Ігнат Піліпавіч**, н. у 1923 у Міёрскім р-не, загінуў.

**МАКСІМОВІЧ Канстанцін Ігнатавіч**, н. у 1915, прапаў без вестак.

**МАРОЗАЎ Фядот Ігнатавіч**, н. у 1909 у Латвіі, загінуў 13.2.1944, пахаваны ў в. Краснагорка.

**МЕРКУЛЬЕЎ Іван Рыгоравіч**, н. у 1922 у в. Гайлешы, загінуў у 1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**МЕРКУЛЬЕЎ Міхаіл Рыгоравіч**, н. у 1920 у в. Гайлешы, загінуў 27.7.1943, пахаваны ў в. Белевічы.

**МАСКАЛЕНКА Пётр Васільевіч**, н. у 1915 у Алтайскім краі, загінуў 18.3.1944, пахаваны ў в. Быкоўшчына.

**НОВЭШ Віктар Рыгоравіч**, н. у 1907 у в. Скварцішкі, загінуў 10.1943.

**ОЗЕРАЎ Міхаіл**, н. у 1909 у г. Архангельску, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**ПАДАПРЫКІН Віктар Дзмітрыевіч**, н. у 1912 у Варонежскай вобл., загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**ПАБЯРЖЫН Мікалай Усцінавіч**, н. у 1929 у в. Дзегцяры, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**ПАПОЎ Пётр Іванавіч**, н. у 1921 у Кіеўскай вобл., загінуў 27.7.1943, пахаваны ў в. Дуброўка.

**СЯРГЕЕЎ Нікіфар Міхайлавіч**, н. у 1912 у Калінінскай вобл., загінуў, пахаваны ў в. Біейкі.

**СКВАРЦОЎ Васіль Андрэевіч**, н. у 1916 у Санкт-Пецярбургу, загінуў 15.10.1943, пахаваны ў в. Азярава.

**ТАЛСТОЎ Пётр Васільевіч**, н. у 1916, загінуў 13.10.1943, пахаваны ў в. Шашкішкі.

**ФЁДАРАЎ Якаў Фёдаравіч**, н. у 1923 у Расонскім р-не, загінуў 27.7.1943, пахаваны ў в. Дуброўка.

**ФЯДОТАЎ Іван Аляксеевіч**, н. у 1915, прапаў без вестак.

**ФЕЙГЕЛЬМАН Рубін**, н. у 1926 у Шаркаўшчынскім р-не, загінуў 28.8.1943, пахаваны ў в. Гродзішкі.

**ФРАНТКОЎСКІ Занік Ігнатавіч**, н. у 1925, у в. Быкоўшчына, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**ШАМРОВІЧ Канстанцін Аляксеевіч**, н. у 1924, прапаў без вестак.

**ШЧОГАЛЕЎ Апанас Андрэевіч**, н. у 1918 у в. Папоўшчына, загінуў 3.1.1944, пахаваны ў в. Быкоўшчына.

**ШЫМАН Міхаіл Васільевіч**, н. у 1925 у в. Азярава, загінуў 14.9.1943, пахаваны ў Казянскім лесе.

**ШЫШКІН Кузьма Сяргеевіч**, н. у 1920 у Новасібірскай вобл., загінуў 13.2.1944, пахаваны ў в. Краснагорка.

## Як жылі і аб чым марылі партызаны

Тужліва было на Браслаўшчыне ў пачатку лістапада 1943 г. пасля гітлераўскай карнай аперацыі «Фрыц». Людзі аплаквалі загінуўшых, шукалі на папялішчах уцалелыя пасля агню рэшткі хатняга посуду. А вось у лесе непадалёку ад Замошша звінелі пілы, стукалі сякеры. Гэта брыгада імя Г. К. Жукава, вярнуўшыся з месца ранейшай дыслакацыі, будавала сабе зямлянкі. Партызаны абыходзіліся ўласнымі сіламі, не прыцягвалі на дапамогу насельніцтва, якое вельмі пацярпела ад карнікаў. Працавалі старанна — не за гарамі была зіма. Капалі катлаваны, у іх апускалі зрубы з сасновых бярвенняў, унутры сцены абшывалі дошкамі. Пад лагер выбралі сухі ўчастак лесу.

Кожны атрад меў свой лагер. Размяшчаліся яны па кругу, у цэнтры якога знаходзіўся штаб брыгады. Звычайна атрадныя лагеры складаліся з жылых і гаспадарчых пабудоў. Акрамя зямлянак ладзіліся лазні, ставіліся хаткі, прывезеныя з разбураных вёсак, якія пакінулі іх жыхары. У атрадзе імя В. П. Чкалава брыгады імя Жукава меліся два памяшканні для

байцоў: вялікая зямлянка і хата. У кожным размяшчалася па ўзводу. Паблізу — штабная зямлянка. Далей кухня са сталовай, кладоўка, невялікі дом для разведчыкаў, хатка для захоўвання зброі і боепрыпасаў, млын з конным прывадам, канюшня, хлеў, кладоўка для фуражу. Мелі і свой калодзеж. Перавезлі і лазню.

Падобныя лагеры мелі і іншыя атрады як брыгады імя Жукава, так і брыгад «Спартак», «За Радзіму». Няхітрым было ўнутранае абсталяванне зямлянак — нары з саломай для адпачынку і сну, столік ля адзвярэй, маленькае акенца. Вячэрняе асвятленне — фітыль у супрацьтанкавым патроне. Камандаванне строга сачыла за захаваннем гігіены. Новапрыбыўшых адразу адпраўлялі ў лазню. Бялізну мылі прызначаныя да гэтага занятку партызанкі. Замест мыла карысталіся попелам («лугам»). Сапраўднае ж мыла траплялася зрэдку. Раніцай абавязковай была зарадка.

Апраналі хто што меў. Мундзіры насілі савецкія, нямецкія, паліцэйскую форму, звычайную цывільную вопратку. Затое на галаўных уборах — чырвоная зорачка ці лентачка. Цяжэй за ўсё было з абуткам. Таму ў атрадах былі наладжаны майстэрні па яго рамонту. А ў атрадзе імя Чкалава брыгады імя Жукава Знайшліся спецыялісты па вырабу скуры для пашыву новага абутку. Былі ў жукаўцаў і свае краўцы, швачкі.

У атрадах выпякалі хлеб. Паварыхі гатавалі для ўсяго атрада ежу: варылі суп, бульбу, кашу, да якіх дабаўлялася крыху мяса. Харчаванне нарміравалася, бо зрабіць багатым стол, разнастайнай страву не было магчымасці. Каб не пераводзіць марна патроны, забаранялася нават паляванне.

Ва ўсіх партызанскіх атрадах былі коні, павозкі да іх і санкі. Яны былі неабходны для арганізацыі баявой дзейнасці, асабліва для функцыяніравання коннай разведкі, для падтрымання хуткай сувязі паміж атрадамі і брыгадамі, падвозкі да месца бою боепрыпасаў, эвакуацыі параненых. Аб конях вельмі клапаціліся. Мелі ў атрадах і дойных кароў, малаком ад якіх паілі хворых параненых.

Харчаванне, транспартныя сродкі трэба было здабыць. Гэта рабілася ў час нападзенняў на варожыя гарнізоны і абозы. Аднак трафеяў не заўсёды хапала. Тады звярталіся да вяскоўцаў. Як правіла, людзі разумелі, што ідзе вайна і нечым трэба і ім падтрымаць партызан. Аднак сялянская гасціннасць не заўсёды ішла на карысць. Партызан, якія заходзілі ў вёскі пасля выканання задання, шчодра частавалі, у тым ліку самагонам. І здаралася, што пазней выпіўка прыводзіла да бяды — чалавек гінуў пры сустрэчы з ворагам. Таму камандаванне ўважліва сачыла за дысцыплінай і строга карала за яе парушэнні.

З лясным бытам партызаны звыкліся. Баявая дружба іх радніла.

Так жылі ўсе браслаўскія партызаны. Аб чым жа яны думалі і марылі? Вядома, перш за ўсё пра вайну. Аб падзеях на ёй, аб подзвігах паведамлялі байцам дзве газеты: «Смерць фашызму» (рэдактар Пётр Іванавіч Федарэнка) і «Моладзь у барацьбе» (рэдактар Прохар Мікалаевіч Альшанскі). У друкарні брыгады імя Жукава выйшла 5659 экземпляраў гэтых газет. Падрабязнае апісанне баявой дзейнасці жукаўцаў утрымліваецца ў рукапіснай «Гісторыі партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава», якую складаў у час вайны П. Р. Казлоўскі.

У нашай брыгадзе выходзілі таксама рукапісны мастацкі «Альманах партызанскай брыгады імя Г. К. Жукава», у якім змяшчаліся артыкулы і расказы саміх партызан. Матэрыялы для альманаха збіралі Е. А. і П. Г. Казлоўскія і ў сваёй брыгадзе і ў іншых брыгадах Паўночнай зоны Вілейскай вобласці, а таксама ў насельніцтва партызанскага краю. Яны ж рабілі і літаратурную апрацоўку партызанскай творчасці.

Сачыненні партызанскіх аўтараў раскрываюць думкі і надзеі ўсіх народных мсціўцаў. У вершах і расказах — любоў да Айчыны, вера ў перамогу, нянавісць да ворага, смутак аб паўшых таварышах,

пяшчотныя пачуцці да любімай жанчыны... Звычайна аўтары абмяжоўваліся адным з пералічаных сюжэтаў. Кім Яўсеевіч Анціпенка («Міша Воўк»), які стварыў Браслаўшчыне першы партызанскі атрад, пазней намеснік камандзіра брыгады па разведцы, чалавек эмацыянальны, моцны духам, паказаў у сваіх вершах усю сілу партызанскіх дум.

Любоў да роднай Беларусі, захапленне яе ціхай прыгажосцю ўспеты ў вершы «Балоты» Пятра Касцюкевіча, тады яшчэ юнага разведчыка брыгады «Спартак». Вершы ж «В ожидании гостей», «Деревенская быль» Ульяны Феакціставуны Каралінскай (Крышталевіч) напоўнена народным гумарам з выкарыстаннем мясцовага фальклору.

Боль і гнеў выклікалі ў партызанаў зверствы фашыстаў. Вось якімі ўбачыла партызанка Ева Аляксандраўна Казлоўская знаёмыя ёй мясціны каля Замошша пасля карнай экспедыцый «Фрыц» у 1943 г.

«...Но уже нет деревень, кое-где лишь плетень
Иль домов обгоревшие трубы,
И стоят сиротливо, грозя молчаливо
Почерневшие мрачные трубы...
...Отомстить за себя призываю»

Кранаюча гучаць і іншыя яе вершы таго часу «Белая могила» — пра дзяўчат, захопленных і расстраляных карнікамі.

...Небо чернеет, крепчает мороз
В инее лица застыли
Идут спотыкаясь, без стонов, без слёз
Две девушки к белой могиле».

Вясна 1944 г. прынесла Беларусі надзею на хуткае вызваленне. Гэты факт знайшоў водгук у вершах Е. А. Казлоўскай. А ў пачатку беларускай аперацый («Баграціён») Казянскі партызанскі край абляцеў яе новы верш «Ожидание».

Слышишь, гром гремит с востока
Эхо гул в лесу несёт.
Фронт желанный, фронт далёкий
Быстрым шагом к нам идёт.
Точно музыка родная
Всколыхнула все сердца
Эта песня фронтовая
Весть победного конца...

Была ў жукаўцаў і сатыра. Высмейваў гітлераўцаў у сваіх вершах начальнік штаба атрада імя Чапаева Мікалай Мікалаевіч Волкаў. Зло смяяўся з Гітлера і яго ваяк у сваіх выдатных карыкатурах Рыгор Сяргеевіч Рогалеў, начальнік штаба атрада імя Чкалава, які рабіў ілюстрацыі да «Альманаха» і сценгазет.

Для правядзення вольнага часу ў атрадах брыгады імя Жукава была арганізавана самадзейнасць. Аднак адпачываць партызанам удавалася не часта. Зрэдку здаралася, што цёплым вясеннім вечарам на лясную паляну ля штаба брыгады збіраліся вольныя ад спраў партызаны. І тады гучала музыка, песні, пачыналіся танцы. Наборшчык брыгаднай друкарні Н. Н. Аляксееў, які меў цудоўны мяккі голас, пеў оперныя арыі і песні. Лепш за ўсё яму ўдавалася арыя індыйскага госця з оперы «Садко» Рымскага-Корсакава.

Настрой ўдзельнікаў тых вечароў трапна перадала Е. А. Казлоўская ў сваім вершы «Партизанский бал»:

Майский вечер, звук гитары
Заливается баян
В такт ему кружатся пары —
Это бал у партизан...

...Чуть рассвет, с винтовкой снова
Как с подругой боевой
Мы опять идти готовы
На засаду или в бой.

Пакладзеныя на музыку вершы К. Е. Анціпенкі «Песня партизана» і Е. А. Казлоўскай «Партизанский бал» сталі партызанскімі песнямі. Іх сёння выконваюць у дні юбілееў вызвалення Беларусі некаторыя школьныя хоры горада Мінска.

Ева Аляксандраўна Казлоўская, якая скончыла да вайны кансерваторыю, арганізавала ў брыгадзе імя Жукава ансамбль песні і пляскі. Удзельнікамі яго былі партызаны і некаторыя жыхары грамадзянскага лагера, што знаходзіўся паблізу, пад

аховай брыгады. Лепшай салісткай была Каця Трамбіцкая (Гляк), разведчыца партызанскай брыгады «За Радзіму». Вядучыя мужчынскія партыі выконваў Мікалай Аляксееў. У харэаграфічнай групе непераўзыйдзенымі танцорамі былі двое цыганаў. Прозвішчаў іх партызаны не ведалі. Клікалі па мянушках «Іван Белы» і «Іван Чорны».

Рэпертуар ансамбля быў даволі багаты: песні пра Радзіму, аб вайне, маладзёжныя, а таксама народныя — беларускія, рускія, украінскія. Акрамя таго на матыў старых добра вядомых песен спяваліся партызанскія вершы.

Ансамбль выступаў перад партызанамі і мясцовым насельніцтвам, быў вядомы нават за межамі Браслаўшчыны. З ансамблем звязаны цікавы эпізод. У адну з цудоўных майскіх начэй літработнікі брыгады імя Жукава муж і жонка Казлоўскія вярталіся верхам з далёкай паездкі. Коні марудна ішлі па знаёмай сцежцы непадалёку ад штаба брыгады, дзе знаходзілася «рэдакцыйная зямлянка». І раптам рэзкі вокрык:

— Стой, хто едзе, пароль!

— Едуць Казлоўскія, — адказаў аўтар гэтых радкоў. — Доўга адсутнічалі, пароля таму не ведаем.

На некалькі хвілін наступіла маўчанне.

— Хай твая баба голас падасць!

Ева Аляксандраўна заспявала любімую песню «Зорку Венеру».

— Пазнаю, — радасна адгукнуўся дазорны. — Дзякуй за песню. Едзьце.

*П. Казлоўскі.*

## ПОДРЫВНИКИ

Трещит мороз в лесу глухом.
Угрюмый бор над полотном
Стоит весь в сумраке ночном.

По снегу тайною тропой,
Заросшей ельником, ольхой,
Шагает взвод наш подрывной.

Открылась неба полоса,
Сверкнули звезды, как роса.
Под ними насыпи коса.

Шагов за сто немецкий дзот
Землей прикрылся словно крот.
Пути хранит он поворот.

Но зазевался часовой,
Проворно смелою рукой
Протянут мины шнур тугой.

Стальная лента вдаль лежит,
Она стране родной грозит:
Фашистский груз по ней бежит.

Гудком протяжным знак подав,
Как будто страшный змей-удав,
Тяжелый движется состав.

Еще секунды — гром, удар...
Котел пробит, клубится пар,
Вагоны все обнял пожар.

Ракеты взвился в небо зонт,
Блестит кругом весь горизонт —
В тылу врага открылся фронт.

Лежит разбитый эшелон.
Кругом лишь трупы, крик и стон —
Последний, страшный гадов стон.

1943 г.

*Павел Казлоўскі*, партызан брыгады імя Г. Жукава.

*Друкуецца па кн.: Лясныя песні. Мн., 1969. С. 46, 47.*

## Малюнкі і вершы Пятра Касцюкевіча

Перад намі 28 вершаў і 25 малюнкаў былога партызанскага разведчыка Пятра Касцюкевіча, аб'яднаныя агульнаю назваю «Балада пра Казянскі лес». Сам па сабе гэты лес нічым асаблівым не вызначаецца. Такіх лясоў у Беларусі шмат. Ды і не Казянскім ён зваўся раней. Калісці — Плятэраўскім, потым — дзяржаўным. У гэтым куточку Браслаўшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты спалілі вёску Казяны. У Казянах загінула 211 мірных жыхароў. У брацкай магіле пахаваны 70 партызанаў. У наваколлі дзейнічала партызанская брыгада «Спартак». Штаб яе размяшчаўся недалёка ад вёскі. Таму і замацавалася за лесам назва «Казянскі». Лес стаў партызанскай крэпасцю, вогненай, непрыступнай зямлёю для ворагаў. Пра баявы шлях партызанаў-спартакаўцаў і расказаў у сваіх творах 17-гадовы партызанскі паэт і мастак.

Пятро Пятровіч Касцюкевіч нарадзіўся 27 ліпеня 1926 года ў невялікай вёсцы Шыці. Там прайшлі яго дзіцячыя гады. У 1941 годзе паспяхова скончыў Шаркоўшчынскую школу і рыхтаваўся да паступлення ў мастацкае вучылішча. Вайна перашкодзіла Пятру рэалізаваць сваю задумку. Калі на тэрыторыі Шаркоўшчынскага раёна пачалі дзейнічаць партызаны, хлопец актыўна супрацоўнічаў з імі. У 1942 годзе ён — сувязны партызанскага атрада «Спартак», у 1943 — конны разведчык пры штабе партызанскай брыгады «Спартак», у 1944 — удзельнік баявых аперацый і аўтар «Партызанскага дзённіка», у якім запісвае палымяныя вершы, частушкі, робіць замалёўкі, адзначае розныя факты, падзеі і г.д. Казянскі лес стаў для яго родным домам. Тут ён уступіў у камсамол, прайшоў жыццёвую загартоўку. Партызанскі калектыў быў вялікі і моцны. Брыгада перажыла блакаду, вытрымала націск карнай экспедыцыі, знішчала варожыя гарнізоны, вызваляла ад акупантаў мястэчкі і вёскі.


П. Касцюкевіч.

У 1944 годзе П. Касцюкевіч напісаў «Марш партызанскай брыгады «Спартак», у якім заклікаў баявых сяброў да рашучай барацьбы за вызваленне роднага краю. Але падзеі апярэдзілі песню. Праз некалькі дзён прыйшла Чырвоная Армія-вызваліцельніца. Баявы шлях «спартакаўцаў» скончыўся. Большая частка партызан улілася ў рады арміі, а астатнія засталіся аднаўляць разбураную вайною народную гаспадарку.

П. Касцюкевіч служыў у радах Савецкай Арміі да 1958 года, затым працаваў у мастацкай майстэрні ў Петразаводску і адначасова вучыўся ў мясцовай мастацкай студыі і на адзяленні выяўленчага мастацтва ў Доме народнай творчасці імя Н. К. Крупскай у Маскве.

Першыя яго вершы друкаваліся ў 1944 годзе у партызанскай раённай газеце «Краснае знамя», потым былі публікацыі ў карэльскіх рэспубліканскіх газетах «Ленінская правда» і «Комсомолец», у беларускіх раёных газетах «Кліч Радзімы» (Шаркоўшчынскі раён), «Браслаўская звязда» (Браслаўскі раён) і ў двух калектыўных зборніках. Некалькі вершаў з «Партызанскага дзённіка» П. Касцюкевіча надрукаваны ў часопісе «Север» (№ 5). Малюнкі былога партызанскага разведчыка змяшчаліся ў тыднёвіку «Литературная Россия», у часопісах «Пуналиппу» і «Рабоче-крестьянский корреспондент». Пятро Касцюкевіч застаўся, такім чынам, партызанскім паэтам і мастаком на ўсё жыццё. У прадмове да сваіх вершаў і малюнкаў ён адзначае, што ў час вайны, знаходзячыся ў Казянскім лесе, заўсёды меў пад рукой два самаробныя блакноты: адзін для вершаў, другі для малюнкаў. Такім чынам сабралася каля 40 вершаў і прыкладна столькі ж малюнкаў.

Вось адзін з іх:

В Богинское озеро
загляделся лес.
Ели лезут в прорези
облачных небес.

Поле в пашню просится
у погожих дней.
Над равниной носится
майский суховей.

Хутора Ставровские
враг испепелил.
Земли Плятеровские
в бугорках могил.

Но в бору нахмуренном
боевая жизнь:
вышли караульные
тут на рубежи...

Ідучы ў армію, Пятро Касцюкевіч пакінуў блакноты дома, у бацькі. Думалася, што так будзе лепш. Аднак атрымалася горш. Вясковыя курыльшчыкі знайшлі «Дзённік» і «спажылі» большую яго частку. Уцалела 12 вершаў і некалькі малюнкаў. Пасля вайны аўтару ўдалося некаторыя з іх аднавіць, дапоўніць і ўдакладніць. Малюнкі, зробленыя алоўкам у 1943—1944 гадах, П. Касцюкевіч у 1980—1981 гадах перанёс тушшу на планшэты і на адваротным баку кожнага змясціў той

«Партызаны ў вёсцы».



або іншы верш з партызанскага дзённіка, а на партрэтах — біяграфічныя звесткі.

Пасля таго, як страчаныя і пашкоджаныя малюнкі ваенных гадоў былі адноўлены, П. Касцюкевіч паказаў іх на выстаўцы ў Доме палітасветы ў Петразаводску. Было гэта ў 1984 годзе.

Малюнкі П. Касцюкевіча неаддзельныя ад вершаў, складаюць з імі адно цэлае. Невыпадкова ж, калі глядзіш яго малюнкі, адчуваеш у іх музыку і паэзію, а калі чытаеш вершы — разумееш, што ствараў іх мастак, настолькі відавочныя ў іх вобразы. Сама прырода, паказаная ў творах П. Касцюкевіча, дзейная, як бы выступае ў ролі мастака: зімовы вечар сцеле сувоі палатна, мароз грунтуе іх, мацуе; а калі пацяплее, з-пад леду і снегу прабіваюцца зялёныя і іншыя фарбы жыцця. Прафесія партызанскага разведчыка падказала мастаку і паэту, што той час вайны лясная прасека адыгрывала ролю прыцэльнай рамкі і кожнае дрэва, нават птушка на ім браліся смерцю на мушку. П. Касцюкевіч сваімі творчымі сцежкамі вядзе нас на Віцебшчыну. У песнях і вершах упамінаюцца вёскі Снегі, Рабекі, Плятарава, Дубавое і інш. А ў вершы, прысвечаным партызанскаму кіраўніку І. Ф. Клімаву, паэт згадвае Міншчыну, Вілейшчыну, Нарачанскі край.

Вельмі мала цяпер засталося такіх партызанскіх паэтаў і мастакоў, як П. Касцюкевіч. Выстаўка яго твораў усхвалявала гледачоў у Петразаводскім педінстытуце і ў адным з кінатэатраў горада. Асобныя малюнкі паказваліся па Карэльскім тэлебачанні. Неўзабаве пасля выстаўкі я атрымаў ліст ад П. Касцюкевіча, у якім ён паведамляў: «Выйду на пенсію, будзе больш вольнага часу, паеду ў Мінск, у Віцебск, у Шыцці. Хочацца наведаць знаёмыя мясціны, пагаварыць з землякамі пабеларуску і ўладкаваць свае партызанскія малюнкі, каб не пыліліся, не залежваліся, — няхай людзі глядзяць, успамінаюць і памятаюць. Хто-небудзь ды скажа добрае слова, а яно ж — лепшыя лекі на нашы партызанскія раны».

Ветэран здзейсніў свой намер — яго вершы і малюнкі ваенных гадоў сталі набыткам Беларускага Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

*В. Скідан.*

*«Мастацтва Беларусі». 1986. № 5. С. 63—66.*

## Камандны склад партызанскіх фарміраванняў на Браслаўшчыне

### Брыгада імя Г. К. Жукава

Камандзір брыгады — **СЫРАМАХА Павел Якаўлевіч** верасень 1943—ліпень 1944

Камісары: **СЫРАМАХА Павел Якаўлевіч** ліпень 1943—верасень 1943. **БУЛОЙЧЫК Платон Пятровіч** верасень 1943—кастрычнік 1943, загінуў. **ЗАПАРОЖАЦ Андрэй Парфір'евіч** лістапад 1943—люты 1944. **КАРОЎКІН Міхаіл Афанасьевіч** люты 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ЗАПАРОЖАЦ Андрэй Парфір'евіч** ліпень 1943—лістапад 1943. **ЧАРОМІН Васілій Сцяпанавіч** лістапад 1943—ліпень 1944.

### Атрад імя К. К. Ракасоўскага

Камандзіры атрада: **ЧАРОМУХІН Уладзімір Васільевіч** май 1943—студзень 1944. **ЦАНАВА Макар Серафімавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

Камісары: **ЦАНАВА Макар Серафімавіч** май 1943—студзень 1944. **КУЗЬМІН Сяргей Нікіфаравіч** студзень 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **КАНДРАШЧАНКА Мікалай Уладзіміравіч** май 1943—жнівень 1943. **ЧАЧУЛОЎ Васілій Міхайлавіч** верасень 1943—лістапад 1943. **КУЗЬМІН Сяргей Нікіфаравіч** лістапад 1943—студзень 1944. **КУЗЬМЕНКА Мікалай Карпавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя П. І. Кліменценкі

Камандзіры атрада: **ДЗЕРАБІН Дзмітрый Іванавіч** снежань 1942—сакавік 1943. **КЛІМЕНЦЕНКА Пётр Іванавіч** сакавік 1943—май 1944, загінуў. **ПЛЮСКОЎ Віктар Міхайлавіч** май 1944—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **ПЕРЧАТКІН Віктар Міхайлавіч** снежань 1942—жнівень 1943. **КОСЦІН Андрэй Андрэевіч** жнівень 1943—студзень 1944. **ЛАЗАРЭНКА Павел Лукіч** студзень 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і штаба: **БАЎЦЕНАК Міхаіл Рыгоравіч** снежань 1942—сакавік 1943, загінуў. **ПЛЮСКОЎ Віктар Нікіфаравіч** сакавік 1943—красавік 1944. **МАЛЫШАЎ Сяргей Канстанцінавіч** май 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя В. І. Чапаева

К а м а н д з і р атрада — **ГЛАЗАЎ Мікалай Трафімавіч** жнівень 1943—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **ПЕРЧАТКІН Віктар Міхайлавіч** жнівень 1943—сакавік 1944. **СУХАРАЎ Павел Іванавіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і ш т а б а: **ЧАРОМІН Васілій Сцяпанавіч** жнівень 1943—лістапад 1943. **ВОЛКАЎ Мікалай Мікалаевіч** лістапад 1943—чэрвень 1944. **ЕЎДАКІМАЎ Аляксандр Цімафеевіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя А. В. Суворава

К а м а н д з і р ы атрада: **ШЭМАН Іван Сямёнавіч** верасень 1943—снежань 1943. **КАНДРАШЧАНКА Мікалай Уладзіміравіч** снежань 1943—люты 1944. **ВЯРШЫНІН Міхаіл Іосіфавіч** люты 1944—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **МАЛАШЧАНКА Сяргей Ісакавіч** верасень 1943—снежань 1943. **ФЕДАРЭНКА Пётр Іванавіч** снежань 1943—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к штаба: **ШУТАЎ Павел Сяргеевіч** верасень 1943—снежань 1943. **ВЯРШЫНІН Міхаіл Іосіфавіч** снежань 1943—люты 1944. **ВАВІН Васілій Іванавіч** люты 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя Г. І. Катоўскага

К а м а н д з і р ы атрада: **ЧАРОМУХІН Уладзімір Васільевіч** студзень 1944, загінуў. **КОСЦІН Андрэй Андрэевіч** люты 1944—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **ЗАГНЕТАЎ Леанід Дзмітрыевіч** студзень 1944—красавік 1944. **ЖУРАЎЛЁЎ Аляксей Аляксеевіч** красавік 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к штаба — **ДУБРОЎСКІ Уладзімір Адольфавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя В. П. Чкалава

К а м а н д з і р атрада — **МАРОЗАЎ Пракоп Аўрамавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **ВІНАГРАДАЎ Уладзімір Прохаравіч** студзень 1944—ліпень 1944. **КУЗЬМІН Мікіта Фёдаравіч** красавік 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і штаба: **СЫСКОЎ Віктар Рыгоравіч** студзень 1944—красавік 1944. **РОГАЛЕЎ Рыгор Сяргеевіч** красавік 1944—ліпень 1944.

### Брыгада «Спартак»

К а м а н д з і р брыгады — **ПАНАМАРОЎ Аркадзій Мікалаевіч** ліпень 1943—ліпень 1944.

К а м і с а р — **ІГНАЦЬЕЎ Міхаіл Купрэевіч** ліпень 1943—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і штаба: **КРЫСАЎ Іван Міканоравіч** ліпень 1943. **САЛАЎЁЎ Фёдар Аляксеевіч** ліпень 1943—ліпень 1944.

### 1-ы атрад

К а м а н д з і р ы атрада: **САЛАЎЁЎ Фёдар Аляксеевіч** ліпень 1943. **ЦІМАФЕЕЎ Васілій Васільевіч** ліпень 1943—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **САМОЙЛЕНКА Мікалай Якаўлевіч** ліпень 1943—чэрвень 1944. **ШУКСЦІС Віктар Цеафілавіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і штаба: **КРЫЧАЛАЎ Міхаіл Раманавіч** — верасень 1943. **ВШЫЎКАЎ Павел Мікалаевіч** верасень 1943— . **МАКАРАНКА Іван Іванавіч** лістапад 1943—ліпень 1944.

### 2-гі атрад

К а м а н д з і р ы атрада: **СТРУКАЎ Іван Іванавіч** ліпень 1943—чэрвень 1944. **САМОЙЛЕНКА Мікалай Якаўлевіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

К а м і с а р ы: **ВЕЛІКАРОДНЫ Іван Андрэевіч** ліпень 1943—сакавік 1944. **МАЦУК Уладзімір Восіпавіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

Н а ч а л ь н і к і штаба: **КАПАНЁЎ Пётр Пракоф'евіч** — верасень 1943. **ЯРАШ Аляксандр Фёдаравіч** лістапад 1943—студзень 1944. **ЛОГІНАЎ Віктар Іванавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

### 3-ці атрад

К а м а н д з і р ы атрада: **ХАРЫТОНАЎ Міхаіл Раманавіч** ліпень 1943—жнівень 1943.

**УШАКОЎ Мікалай Мікалаевіч** жнівень 1943—чэрвень 1944; загінуў. **САКАЛОЎ Яфім Міхайлавіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

Камісары: **ВУШАКОЎ Мікалай Мікалаевіч** жнівень 1943. **МІХАЛЕЎ Рыгор Мікалаевіч** верасень 1943—красавік 1944, загінуў. **МУХІН** Аляксандр Васільевіч май 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ГУР'ЯНАЎ Павел Васільевіч** ліпень 1943—жнівень 1943. **САКАЛОЎ Яфім Міхайлавіч** жнівень 1943—кастрычнік 1943. **САЗОНАЎ Міхаіл Андрэевіч** кастрычнік 1943—ліпень 1944.

## 4-ы атрад

Камандзір атрада — **ЧЭКУНОЎ Васілій Дзмітрыевіч** верасень 1943—ліпень 1944.

Камісары: **ГУР'ЯНАЎ Павел Васільевіч** верасень 1943—красавік 1944. **ЛУК'ЯНАЎ Генадзь Уладзіміравіч** красавік 1944—чэрвень 1944, загінуў. **КЛІМЕНКА Васілій Васільевіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ІВАНОЎ Дзмітрый Аляксандравіч** верасень 1943—снежань 1943, загінуў. **ЛОГІНАЎ Павел Васільевіч** — красавік 1944. **НІКІЦІН Рафаіл Міхайлавіч** красавік 1944—ліпень 1944.

## 5-ы атрад

Камандзіры атрада: **КАПАНЁЎ Пётр Пракоф'евіч** сакавік 1944—ліпень 1944. **ІЎКОВІЧ Сямён Гаўрылавіч** чэрвень 1944—ліпень 1944, і.о.

Камісар — **ЛЫСЁНАК Мефодзій Антонавіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ІЎКОВІЧ Сямён Гаўрылавіч** — чэрвень 1944. **ВІШНЯКОЎ Іван Максімавіч** чэрвень 1944—ліпень 1944.

## 6-ы атрад

Камандзір атрада — **КРЫЧАЛАЎ Міхаіл Раманавіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

Камісары: **ВШЫЎКА Павел Мікалаевіч** сакавік 1944—май 1944. **КАПЕНІН Мікалай Аляксеевіч** май 1944—ліпень 1944.

Начальнік штаба — **БІРУКОЎ Васілій Георгіевіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

## Брыгада «За Радзіму»

Камандзіры брыгады: **ШЫРОКАЎ Пётр Мікалаевіч** верасень 1943—студзень 1944, чэрвень 1944—ліпень 1944. **КАНДРАШЧАНКА Мікалай Уладзіміравіч** студзень 1944—ліпень 1944.

Камісар — **АКУЛАЎ Фрол Карпавіч** верасень 1943—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ДЗЮЖЭНКА А. А. КАПЦЮГОЎ Канстанцін Ісакавіч** студзень 1944—ліпень 1944.

## Атрад імя А. А. Жданава

Камандзіры атрада: **ШЫРОКАЎ Пётр Мікалаевіч** лістапад 1942—верасень 1943. **МАРОЗАЎ Фядот Ігнатавіч** — люты 1944, загінуў. **СМІРНОЎ Мікалай Данілавіч** люты 1944—ліпень 1944.

Камісары: **СМІРНОЎ Мікалай Данілавіч** лістапад 1942— **СКВАРЦОЎ Васілій Андрэевіч** —кастрычнік 1943, загінуў. **ТРОШЧАНКОЎ Мікалай Аляксеевіч** студзень 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ТРАШЧАНКОЎ Мікалай Аляксеевіч** лістапад 1942—студзень 1944. **МАЛАЎ Сцяпан Паўлавіч** студзень 1944—сакавік 1944. **ШУМАН Васілій Нікіфаравіч** сакавік 1944—ліпень 1944.

## Атрад імя В. М. Молатава

Камандзір атрада — **БАНДАРЭНКА Іван Фёдаравіч** верасень 1943—ліпень 1944.

Камісары: **ШЭНДЗЕЛЕЎ Фёдар Дзмітрыевіч** верасень 1943—красавік 1944. **МІШКУЦЁНАК Іосіф Сцяпанавіч** красавік 1944—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ТОКАРАЎ Канстанцін Васільевіч** верасень 1943—студзень 1944. **КАБЫШ Аляксандр Іванавіч** студзень 1944—ліпень 1944.



Фрагмент экспазіцыі Браслаўскага музея, прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне.

### Атрад імя В. В. Куйбышава

Камандзір атрада — **ЯЧМЕНЕЎ Аляксандр Фаміч** красавік 1944—ліпень 1944.

Начальнік штаба — **ШПАК Міхаіл Антонавіч** красавік 1944—ліпень 1944.

Камісар — **ШЭНДАЛЕЎ Фёдар Дзімітравіч** красавік 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя К. Е. Варашылава

Камандзіры атрада: **ЯЧМЕНЕЎ Аляксандр Фаміч** май 1943—люты 1944. **МІКАЛАЕЎ Аляксандр Сяргеевіч** люты 1944—ліпень 1944, загінуў.

Камісары: **МІКАЛАЕЎ Аляксандр Сяргеевіч** май 1943—жнівень 1943. **БУРЛАКОЎ Марцін Еўсцігнеевіч** жнівень 1943—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **ШУМАН Васілій Нікіфаравіч** чэрвень 1943—студзень 1944. **МІКАЛАЕЎ Аляксандр Сяргеевіч** студзень 1944—люты 1944. **БАГДАНОВІЧ Данііл Якаўлевіч** люты 1944—ліпень 1944.

### Атрад імя С. М. Кірава

Камандзір атрада — **АНТОНАЎ Уладзімір Цімафеевіч** верасень 1943—ліпень 1944.

Камісар — **ГУСЕЎ Мікалай Сцяпанавіч** верасень 1943—ліпень 1944.

Начальнікі штаба: **БАГДАНОВІЧ Данііл Якаўлевіч** верасень 1943—люты 1944. **ДЗЕГЦЯРОЎ Міхаіл Фёдаравіч** люты 1944—ліпень 1944.

## Польскае супраціўленне на Браслаўшчыне ў гады Вялікай Айчыннай вайны

Па ідэалагічных прычынах польскае супраціўленне на Беларусі і, у прыватнасці, на Браслаўшчыне старанна выкрэслівалася з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта таму гэта старонка летапісу барацьбы з фашызмам з'яўляецца адной з найменш вядомых. Аб польскім супраціўленні на Браслаўшчыне пакуль можна меркаваць толькі па разрозненых фактах і сведчаннях.

Паводле ўспамінаў старажылаў, сведчанняў удзельнікаў ваенных падзей, на Браслаўшчыне існавала польскае патрыятычнае падполле. У ім удзельнічалі святары мясцовых касцёлаў, прадстаўнікі інтэлігенцыі, сяляне. Дзейнасць падполля мела пераважна разведвальны характар. Некаторыя з удзельнікаў падполля мелі сувязі з савецкімі партызанскімі і антыфашысцкімі групамі Браслаўшчыны, аказвалі ім дапамогу. Напрыклад, браслаўская падпольшчыца Рэгіна Бараноўская мела сувязь з А. Васілеўскім, неаднойчы перадавала каштоўныя звесткі аб намерах акупантаў. У 1942 г. ёй удалося папярэдзіць аб пагрозе арышту членаў групы К. Анціпенкі.

Дапамогу партызанам медыкаментамі, харчаваннем аказвалі ксяндзы з вёсак Далёкіх, Бяльмонтаў. За падпольную дзейнасць па даносах здраднікаў былі расстраляны каталіцкія святары ў Іказні, Пеліканах.

На тэрыторыі Браслаўшчыны дзейнічалі таксама ўзброеныя атрады Арміі Краёвай, польскіх партызанскіх фарміраванняў, якія падпарадкоўваліся эмігранцкаму польскаму ўраду ў Лондане.

Браслаўшчына адносілася да Віленскай акругі АК, у складзе якой быў вылучаны інлектарат «Б» (былыя Браслаўскі і Свянцянскі паветы). У канцы 1943 г. тут былі арганізаваны 23-я Браслаўская брыгада АК пад камандаваннем Вітольда Кіселя (псеўданім Святлодыч) і 24-я Дрысвяцкая брыгада пад камандаваннем Казіміра Краўза (псеўданім Ваўжэцкі). Члены брыгады АК праводзілі дыверсійныя акты на чыгунках, шасэйных дарогах.

У 1943 г. пасля разрыву дыпламатычных сувязяў паміж СССР і польскім эмігранцкім урадам, фарміраванні АК былі абвешчаны праціўнікамі савецкіх партызанаў. Партызанскім фарміраванням

прадпісвалася праводзіць раззбраенне ці знішчэнне груповак АК. Гэта было рашэнне, якое каштавала шматлікіх дарэмных ахвяр, прывяло да аслаблення антыфашысцкай барацьбы.

Па некаторых сведчаннях, пры вызваленні Браслаўшчыны асобныя фарміраванні АК былі сабраны ў наваколлі в. Купчэлі, а потым адпраўлены ў глыб краіны для папаўнення часцей польскага войска, якое дзейнічала сумесна з Чырвонай Арміяй.

## Разгром фашысцкай банды

На фронце і ў тыле ворага лепшыя сыны польскага народа плячо ў плячо з Чырвонай Арміяй і ў радах чырвоных партызан змагаюцца з нашым агульным ворагам — нямецкімі захопнікамі. Прадбачачы непазбежную гібель фашысцкай Германіі, польскія фашысцкія рэакцыйныя колы яшчэ не пакідаюць надзеі аднавіць старую панскую Польшу і таму вырашылі дзейнічаць на сваю карысць. Яны ствараюць з ліку сваіх прыхільнікаў быццам бы для барацьбы з немцамі так званыя польскія легіёны і са зброяй у руках нападаюць, але чамусьці не на немцаў, а на савецкіх партызан. Гэтым яны паказваюць свой сапраўдны твар.

У Міёрскім і Браслаўскім раёнах апошнія два тыдні арудавала такая банда ў колькасці 58 чалавек. Сваімі дзеяннямі яна перашкаджала партызанам у іх барацьбе з акупантамі. Цярпенню партызан прыйшоў канец і яны вырашылі правучыць гэтых бандытаў, што вялі гульню на карысць Гітлеру.

4 красавіка разведка данесла ў штаб брыгады імя Жукава, што банда размясцілася на хутары Марцыбаліна. Камандаваннем брыгады адразу былі выдзелены два атрады для знішчэння гэтай варожай групы.

У 11 гадзін раніцы атрады імя Чкалава і Кутузава былі ўжо ў 500 метрах ад месцазнаходжання ворага. Атрад Кутузава пайшоў лабавой атакай і, нягледзячы на ўраганны агонь, вельмі хутка наблізіўся да ворага. Атрад Чкалава ў гэты час абышоў хутар злева і наблізіўшыся метраў на 100, ударыў па ворагу. Праціўнік замітусіўся.

Пад прыкрыццём сваіх кулямётаў два атрады з крыкамі «Смерць фашыстам!» кінуліся ў атаку. Вораг у паніцы пабег, пакідаючы за сабой забітых. Нямногім удалося вырвацца з акружэння і схавацца ў бліжэйшых кустах.

У выніку кароткага і жорсткага рукапашнага бою, страціўшы 41 чалавека загінуўшымі, праціўнік адступіў. Партызанам дасталіся 3 палонныя, 30 вінтовак, 4 пісталеты, 1 аўтамат, 2 сумкі з медыкаментамі, 3 кані і абоз з гранатамі і патронамі.

З ліку партызан былі лёгка паранены чатыры таварышы.

*Р. Рогалеў*

*«Смерть фашизму». Орган Браслаўскага РК КП(б)Б, 1944. № 11. Красавік.*

**З успамінаў Эдварда Чаховіча.**

Наша хата ў Марцэбаліна стаяла побач з лесам. У час вайны ў ёй часта спыняліся партызанскія разведчыкі атрада імя Кутузава. Але 4 красавіка 1944 г. як раз на Вялікдзень, у хату завіталі іншыя госці — жаўнеры АК. Іх было каля 70 чалавек у цывільным адзенні. Прыстойна папрасіліся пераначаваць і размеркаваліся па хатах вёскі. Перапалоханая гаспадыня, мая маці, паспрабавала папярэдзіць іх, што сюды часцяком наязджаюць партызаны, але «акаўцы» яе словы сустрэлі смехам і адказалі, што рабаўнікоў яны не баяцца. Яны паставілі вартавых і паснулі на падлозе.

А партызаны былі побач. Якраз у гэ-

тую ноч яны збіралі прадукты харчавання ў навакольных Пагошчы вёсках. Ноч была ціхая і яны здалёк, праз возера, пачулі, што да в. Марцэбаліна на падводах пад'ехала значная група людзей. Партызаны вырашылі даведацца, хто б гэта там мог быць. Пакінулі падводы з возчыкамі ля возера. Адзін з партызан Сухаручанкаў Ігнат падабраўся да нашай хаты з боку леса, але побач з лазняй сутыкнуўся твар у твар з вартавым АК. Абодва паспрабавалі стрэліць — і ў аднаго, і ў другога асечка. Сухаручанкаў паспрабаваў уцячы, «акавец» кінуў услед гранату, але партызану асколкам толькі зрэзала рамень на паўшубку.

Яшчэ адну групу партызан варта АК сустрэла стралянінай на дарозе з Рымуцей. Партызаны пакідалі вазы з харчаваннем і спешна накіраваліся ў штаб атрада ў Дварышча за дапамогай. «Акаўцы» ж знайшлі ў лесе партызанскія падводы і прывялі іх у вёску. Пасля ўзмацнілі варту і зноў леглі спаць. Толькі адзін з іх, напэўна старэйшы, у афіцэрскай форме, высокі, прыгожы сеў за стол і пачаў распрацоўваць па карце заўтрашні маршрут. Яны меркаваліся ісці ў бок Замошша – Ёды. На чарговае папярэджанне гаспадыні ён зноў са смехам адказаў: «Не трэба нас пужаць, мы іх паб'ем»...

У гэтай начной сутычцы быў смяротна паранены ў грудзі акавец Віктар Вольскі з Дзвінска. Дзве маладзенькія дзяўчынкі-санітаркі разгубіліся. Вольскі цяжка хрыпеў і было бачна, што ён памрэ. Раніцай афіцэр загадаў яго пахаваць. Але каля 12 гадзін вёску акружылі партызаны. Яны знішчылі два пасты, але адзін з вартавых заўважыў небяспеку і з крыкам «Алярм!» пабег па вёсцы. Пачалася перастрэлка. Наша сям'я залезла ў яміну пад падлогай, але дзяўчына з АК крыкнула, каб уцякалі, бо тут могуць забіць. «Акаўцы», што былі ў нашай хаце, павыскоквалі на вуліцу і пабеглі ў бок пагорка, але трапілі пад перакрыжаваны агонь загадзя расстаўленых партызанамі кулямётаў. З іншых хат байцы АК уцякалі ўздоўж канавы ў бок балота і здолелі выратавацца. У час бою партызан па мянушцы «Марак» кінуўся даганяць адну з санітарак АК. Санітарка азірнулася і стрэліла ў яго з маленькага пісталета. Тады «Марак» у гарачцы бою размазджэрыў дзяўчыне галаву прыкладам сваёй вінтоўкі.

Скончыўся бой і з размоў партызанаў мы даведаліся, што яны лічылі, быццам біліся з опсаўскімі паліцаямі. Партызаны не маглі зразумець, чаму тыя апрануты цывільна. Усяго загінула 17 байцоў АК. Партызаны загадалі мясцовым жыхарам пагрузіць забітых на падводы і адвезці на могілкі ў Кастрыўку, што за в. Крукоўшчына, і пахаваць іх у ямах, адкуль некалі бралі жвір.

Аднак гісторыя на гэтым не скончылася. Летам 1944 г. у наш дом зайшлі дзве жанчыны, якія напэўна ведалі, што побач з хатай пахаваны баец АК. Яны папрасілі адкапаць цела для апазнання. Магіла была ў вільготнай мясціне, таму яно захавалася добра. Адна з жанчын пазнала ў забітым свайго сына і паабяцала забраць, але больш сюды не з'явілася. Пасля вайны да нас завіталі міліцыянеры, збілі крыж з магілы Вольскага і наогул забаранілі хоць неяк абазначаць месца пахавання. Таксама пасля вайны сюды прыязджалі за целам і сваякі Чарняўскай — адной з дзяўчын-санітарак АК. Яны перазахавалі яе цела на могілкі ў Опсе.

На сённяшні дзень месца пахавання байцоў АК у Кастрыўцы дакладна вядома толькі аднаму з мясцовых жыхароў — М.І. Семянчуку, які доўга займаўся яе пошукамі.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*



Помнік на месцы растрэлаў у Лесьнічоўцы. г. Браслаў.



Помнік на месцы растрэлу мірных жыхароў у в. Казяны.

**З успамінаў Алега Якаўлевіча Пракаповіча.**

... Да мяне з Казян прыйшоў Пётр Цыўнель. Перажыўшы жахлівую раніцу, ён пайшоў з вёскі і шукаў часовага паратунку. Вось што ён мне расказаў.

«Нейк маладыя хлопцы сабраліся разам, каб абмеркаваць, што рабіць? Нас непакоілі з'явіўшыеся групы так званых «літоўцаў» — атрадаў у форме СС. Агулам вырашылі ісці ў партызаны. Аднак з паяўленнем у наваколлі СС у паветры пачало вітаць слова «блакада». Таму канкрэтна нічога не зрабілі. З гэтым я і падаўся дахаты. Маці мне прапанавала хавацца на гарышчы, бо з вечара ёй кінулася ў вочы нейкая падазроная валтузня вакол Казян. Але я не паслухаўся і лёг спаць у доме. Справа ў тым, што амаль кожны дзень было неспакойна, і гэта прытупляла пільнасць.

Гадзін у шэсць у хату ўварваліся ўзброеныя салдаты ў нямецкай форме. Камандаваў імі даволі стары немец, які размаўляў на дрэннай польскай мове і больш штурхаў аўтаматам. Мяне з бацькам Сцяпанам Іванавічам падпялі з ложка і выпіхнулі на вуліцу. Я толькі паспеў нешта накінуць на сябе і схапіць старое паўпаліто.

На вуліцы было зімна, ужо занімалася раніца. Групкамі навокал стаялі суседзі,

якіх ахоўвалі салдаты. Стаялі толькі мужчыны, як старыя, так і маладыя. Усім тлумачылі, што гэта нішто іншае як збор на працу — будаваць спалены партызанамі мост на рацэ Дзісна. Паставіўшы ў калону, нас пагналі да цэнтра — царквы, і сапраўды да ракі, дзе калісьці быў мост. Ужо развіднела і мы змаглі ўбачыць, што Казяны акружаны ваеннымі. Прадчуваючы нядобрае за калонай крочыла група жанчын — мацярок і жонак. З боку вёскі набліжалася другая калона.

Мы падышлі да ракі. На другім яе беразе немцы збудавалі дзот. Нас сагналі ў кар'ер, якраз насупраць яго. Пасля загадалі рухацца ў яміну кар'ера. Справа з кожнай хвілінай станавілася ўсё падазроней — масты ў кар'ерах не будуюць. Хутчэй за ўсё нас збіраліся проста расстраляць.

Побач стаяў Юзік Воўк — стары, гадоў за семдзесят, і ягоны сын Пётр. Стары не паспеў апрануцца і я даў яму паўпаліто. Падумалася, што за лепшае трэба спрабаваць разбегчыся. Нейкую частку, канешне, заб'юць, але большасць уратуецца. Для гэтага не хапала пацвярджэння нашых падазрэнняў. Я спытаў у старога немца, які трошкі казаў па-польску, навошта нас сюды сабралі? Ён агледзеўся і непрыкметна паказаў пальцам на скроню. Гэта навіна быццам абдала кіпнем. Пачалі перадаваць па калоне, што з выкрыкам «ура» ўсе павінны разбегчыся.

Тым часам немцы скамандавалі станавіцца на калені. Тыя, што стаялі першымі, не рухаліся, марудзілі. Тады група карнікаў кінулася да іх і на нейкі момант усё перамяшалася. Склаліся спрыяльныя абставіны для пабегу. Шмат хто з крыкам «ура!» кінуўся ўздоўж ракі да Мілянчуковай лазні, што стаяла ў сутні метраў. За ёй — паварот ракі і горка.

Спачатку некаторыя, а потым і ўсе пабеглі. Загучалі рэдкія асобныя стрэлы, пазней застракатаў кулямёт. Кулі запелі ля галавы, а я ўжо мінаў лазню і бухнуўся ў ваду. Цэлы дзень праседзілі ў ёй, а ноччу падаліся ў лес. Дзе застаўся бацька, што сталася з астатнімі, не ведаў.

А здарылася ўсё так. Уцёкі былі дружнымі. Не беглі толькі старыя. Пакуль эсэсаўцы, якія перамяшаліся з ахвярамі, апамятаваліся, прайшоў час. Многія паспелі адбегчы за межы абстрэлу кулямёта. Стралялі толькі старых. Мой бацька не змог бегчы і адразу кінуўся на зямлю. Побач зваліўся забіты Юзік Воўк. Бацька падлез пад забітага і так адляжаўся, а пасля, калі ўсё сціхла, уцёк з гэтага месца.

Загінула шмат. Сярод іх кіраўнік хора Сямён Ільіч Мароз, Цыўнелі, Білінісы,Ваўкі.

Страшную гадзіну перажыла мая маці, калі яна даведалася, што ўсіх мужчын пастралялі. Прыбегшы ў кар'ер яна здалёк заўважыла маё паўпаліто. Забыўшыся, з гора яна кінулася абдымаць забітага і толькі перавярнуўшы, убачыла што гэта сусед. Яна перагледзела ўсіх, але родных не знайшла. Не ведаючы, што падумаць, яна галасіла над забітымі суседзямі».

На гэтым Пётр скончыў сваё апавяданне. Ад сябе дадам, што Казяны здаўна лічыліся «чырвонымі». Пры немцах з паселішча пайшло ў партызаны некалькі сотцен жыхароў. Таму дзеля парадку і вырашылі немцы перабіць усіх мужчын. Рашучымі і смелымі дзеяннямі жыхары Казян не далі немцам выканаць да канца задуманае.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

**АКТ**

**1943 года мая 26 дня**

Камісія ў складзе прадстаўнікоў партызанскай брыгады «Спартак» Ігнацьева М. К. і Конышава Ф. А., сялян в. Ваўкі Казянскага с/с Відзаўскага р-на Вілейскай вобласці Калітончыка Ягора Міхайлавіча, Калітончык Марыі на месцы ўстанавілі, што 25 лістапада 1942 года нямецка-фашысцкія вылюдкі, ўварваўшыся ў в. Ваўкі гэтага с/с, здзекваючыся забілі 6 бязвінных мірных жыхароў: Антонава Васта Цімафееўна 75 гадоў, Калітончык

Фядот Парфіравіч 30 гадоў, Калітончык Анісья Радзівонаўна 30 гадоў, Смяёнаў Іван Агур'янавіч 29 гадоў, Еўдакімаў Іван Пятровіч 25 гадоў, Еўдакімава Васта Ліфееўна 60 гадоў.

Адначасова нямецкія фашысты забралі 2 кані, 20 кароў, 10 авечак, 20 свіней, спалілі 2 хаты і ўсе надворныя пабудовы. Аб чым і склалі сапраўдны акт.

Прадстаўнікі партызанскай брыгады «Спартак» Ігнацьеў М. К., Конышаў Ф. А.
Прадстаўнікі вёскі Калітончык Я. М., Калітончык М.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## З МАТЭРЫЯЛАЎ АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ Г. К. ЖУКАВА ЗА СНЕЖАНЬ—ЛІПЕНЬ 1944 г.

...Нямецкія ўлады і паліцыя па-зверску адносяцца да насельніцтва. 18 сакавіка 1944 г. ў в. Дамашы ўварвалася паліцэйская банда з Опсы на чале з палачом Лютнэрам, якая ўчыніла расправу над сям'ёй Шульі Адольфа. Расстраляна жонка Шульля Анэля Станіславаўна, 1895 г. н., сястра Вартанская Юзэфа, 1891 г. н., сын Ізыдор, 1937 г. н. Выпадкова ўдалося выратавацца гаспадару і яго сыну Дзіанізу. Пасля расстрэлу Лютнэр загадаў закапаць трупы. Пасля, як даведаліся партызаны, было арганізавана пахаванне.

...28 сакавіка 1944 г. ў в. Марцэбаліна опсаўская паліцыя спаліла жывымі ў хаце: Папакуля Уладзіміра — 67 гадоў, яго жонку — 70 гадоў, Папакуля Браніслава — 34 гады, яго сына, Папакуля Карла — 3 гады, дачку Феліцыю — 2 месяцы.

*НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 74, арк. 39—40.*

## З ЛІСТОЎКІ ВІЛЕЙСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б АБ МАСАВЫМ ЗНІШЧЭННІ МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ВОБЛАСЦІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ. Люты 1943 г.

...Крывавыя сляды зверстваў і нечуваных здзекаў пакінулі нямецкія акупанты і на тэрыторыі Вілейшчыны. сотні спаленых вёсак, тысячы павешаных і расстраляных, абяздоленых і замучаных вось «новы парадак», які прынеслі гітлераўцы ў наш край.

У лістападзе 1942 г. акупанты спалілі дашчэнту вёскі Баравыя і Пруднікі Відзаўскага раёна, а ўсіх жыхароў гэтых вёсак — жанчын, старых і дзяцей фашысцкія мярзотнікі расстралялі; загінула 350 ні ў чым не вінаватых людзей...

Толькі ў лістападзе мінулага года па аднаму Відзаўскаму раёну гітлераўцы спалілі звыш 30 вёсак, 960 двароў. Сяляне гэтых вёсак расстраляны або вывезены на катаргу ў фашысцкую Германію, а тыя, што засталіся жывымі, жывуць у лясах і зямлянках. У кожным раёне Вілейскай вобласці, на кожным кроку нямецка-фашысцкія разбойнікі сеюць смерць і разбурэнне, паляць вёскі, сотнямі вешаюць і расстрэльваюць мірных савецкіх жыхароў, ні ў чым не вінаватых жанчын, старых, дзяцей...

*Зборнік лістовак усенароднай партызанскай барацьбы ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Мн., 1952 г. С. 140.*

## СА ЗВАРОТУ БРАСЛАЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА РК КП(б) ДА НАСЕЛЬНІЦТВА БРАСЛАЎСКАГА, ВІДЗАЎСКАГА, МЁРСКАГА І ДЗІСЕНСКАГА РАЁНАЎ

Таварышы! Нямецкія фашысты, распачаўшыя вайну і заспакоеныя поспехамі першых дзён, на ўвесь свет крычалі аб хуткай перамозе. Яны вялі размову аб тым, што нямецкія салдаты нясуць народам Еўропы «новую культуру, парадак і шчасце».

Так гэта ці не?... Лепшыя гітлераўскія войскі знішчаны Чырвонай Арміяй пад Масквой, Растовам у 1941 г., пад Сталінградам і на Каўказе — у 1942 г., пад Арлом, Курскам, ля сценаў Ленінграда — у 1943 г. ...1944 год нясе новыя перамогі...

З захопам тэрыторыі нашых раёнаў — Браслава, Відзаў, Шаркоўшчыны, Міёр, Дзісны нямецкія варвары на працягу 1941—1942 гадоў, па няпоўных дадзеных, павесілі,

расстралялі і загубілі больш 5000 чалавек, у большасці — старых, жанчын і дзяцей. Яны вывезлі на катаргу ў Германію 8000 юнакоў і дзяўчат.

Усе памятаюць дні восені 1943 г., калі немцы пад выглядам барацьбы з партызанамі спалілі вёскі з іх насельніцтвам: Стайкі, Жураво ўшчына, Кукшталі, Якшты, Плятарова і іншыя, а ўсяго спалена каля 40 вёсак, забіта 400 мірных жыхароў...

Злачынствам немцаў не было і няма сканчэння... 15 чэрвеня немцы арганізавалі ў Іказні, Слабодцы танцы. Моладзь нічога не заўважаючы прыйшла пагуляць. У гэты момант група немцаў забірае моладзь і некуды звозіць. Такі лёс напаткаў і моладзь Браслава, якая збіралася паглядзець кінафільм...

Сяляне і сялянкі! Прыйшоў час расплаты... Узнімайцеся на апошні рашаючы бой з ворагам...

Смерць нямецкім акупантам!

Браслаўскі РК КП(б)Б.
Штаб партызанскага злучэння.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## АБ ГЭТЫМ ПІСАЛА ПАДПОЛЬНАЯ ГАЗЕТА

### За кратамі Браслаўскай турмы

Каму ўдалося выратавацца з браслаўскай турмы, перанёсшы нечалавечыя выпрабаванні, расказваюць, як фашысцкія каты перад тым як забіць жанчыну ці дзяўчыну іх гвалцяць. Так, у лютым удалося выратавацца з браслаўскай турмы двум дзяўчынкам — П. Ю. і Б. Яны расказалі, што начальнік турмы Крыўкоў і старэйшы наглядальнік паліцэйскі Жук, ужо сталыя, маючыя жонак і дзяцей, выконваючы загады фашысцкіх варвараў, па некалькі разоў выводзілі іх у калідор турмы, пагражалі смерцю, збівалі іх і гвалтавалі. Як апавядаюць відавочцы, гэтыя звяры рабілі сваю чорную справу над кожнай жанчынай і дзяўчынай, як толькі яна трапляла ў іх крывавыя лапы.

Хутка прыйдзе канец зладзейству прадажных скур, іх чакае за свае злачынствы перад савецкім народам суровая кара — смяротная казнь.

*«Смерць фашызму». Орган Браслаўскага падпольнага РК КП(б)Б. Чэрвень. № 16, 1944.*

## АДПОМСЦІМ ФАШЫСТАМ ЗА СМЕРЦЬ КАРПАВАЙ

Насельніцтва в. Спаруны Браслаўскага раёна добра ведала Карпаву Апалінарыю як добрую настаўніцу. Аднойчы зранку ў вёску прыехаў Мюлер, усім вядомы палач і душагуб са сваімі паліцэйскімі — Шабловічам, Крывашэіным, Ляскоўскім і іншымі. Гэтыя фашысцкія ізуверы схапілі Карпаву і пачалі здзекавацца, білі шампаламі, таптылі нагамі, рвалі на галаве валасы, дапытваліся аб месцы знаходжання партызан. Карпава нічога не адказвала. Душагубы стрэлілі ёй у грудзі, выкінулі з хаты, а пасля стрэлам у галаву абарвалі яе жыццё.

Так нямецкія звяры забілі непавінную жанчыну, пакінуўшы яе дзяцей сіротамі. Адпомсцім фашыстам за смерць роднай і любімай настаўніцы Карпавай.

Ф. П.

*«Смерць фашызму». 1944. № 16. Чэрвень.*

# Мірныя жыхары Браслаўшчыны, якія загінулі ад рук фашысцкіх катаў

## АХРЭМАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА ЗАБАЛОЦЦЕ

**КАВАЛЁНАК Анастасія Георгіеўна,** н. у 1882, загінула ў 1942.
**КАВАЛЁНАК Казімір Казіміравіч,** н. у 1907, загінуў у 1942.
**КАВАЛЁНАК Станіслава Станіславаўна,** загінула ў 1942.
**КАВАЛЁНАК Альдона,** н. у 1936, загінула ў 1942.
**КАВАЛЁНАК Моніка,** н. у 1938, загінула ў 1942.
**КАВАЛЁНАК Часлава,** н. у 1940, загінула ў 1942.

### ВЁСКА ЗАБОР'Е

**КАВАЛЁНАК Станіслаў.**

### ВЁСКА ДЗЕГЦЯРЫ

**ДАЛЕЦКІ Вітольд Міхайлавіч.**

### ВЁСКА МАРЦІНАЎЦЫ

**ГРУНДА Вацлаў Браніслававіч.**
**ДЗЕМІДОВІЧ Усцін Аўгусцінавіч,** н. ў 1895.
**КАВАЛЁНАК Міхаіл Міхайлавіч.**
**СТАЦЭВІЧ Нарцыз Габердавіч.**

### ВЁСКА МІЛАШЫ

**АЛЬХОЎКА Казімір Антонавіч.**

## Жыхары вёскі Пераходы, спаленыя фашыстамі ў снежні 1942 г.

**ДАРГЕЛЬ Браніслаў,** н. у 1872.
**ЛУКША Тэкля Міхайлаўна,** н. у 1894.
**ЛУКША Ядзвіга Станіславаўна,** н. у 1921.
**ЛУКША Вераніка Станіславаўна,** н. у 1928.
**ЛУКША Юзэф Станіслававіч,** н. у 1930.
**ЛУКША Станіслаў Станіслававіч,** н. у 1931.
**ПЯТУШКА Караль,** н. у 1902.
**ПЯТУШКА Мар'яна,** н. у 1905.
**ПЯТУШКА Моніка Каралаўна,** н. у 1926.
**ПЯТУШКА Франц Каралевіч,** н. у 1928.
**ПЯТУШКА Казімір Каралевіч,** н. у 1933.
**ПЯТУШКА Аліна Каралеўна,** н. у 1935.
**ПЯТУШКА Войцех Каралевіч,** н. у 1939.

### ВЁСКА П'ЕЎЦЫ

**МІЛЕВІЧ Адам.**
**МІЛЕВІЧ Мечыслаў Адамавіч.**
**МІЛЕВІЧ Браніслава Пятроўна.**
**ПЯТКУН Анэля.**
**ПЯТКУН Іван Баляслававіч.**

### ВЁСКА РАЗЭТА

**САЛАК Вікенцій Ігнатавіч,** н. у 1903.

## ВІДЗАЎСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

### ВЁСКА АЗЯРАЎКА

**КАНДРАШОЎ Фёдар Фёдаравіч,** н. у 1924.

### ВЁСКА БЛАЖЫШКІ

**ГАРБУНОЎ Нікіфар Яфімавіч,** н. у 1897.
**ЖУКОЎСКІ Фелікс Вікенцьевіч,** н. у 1893.
**ЖУКОЎСКІ Юзеф Феліксавіч,** н. у 1920.
**МІНЧАНКАЎ Рыгор,** н. у 1900.
**ФАДЗЕЕЎ Фадзей Паўлавіч,** н. у 1884.

### ВЁСКА ЖУРАВОЎШЧЫНА

**ДАНІЛАВА Марыя Гаўрылаўна,** н. у 1916.
**ДАНІЛАВА Меланьня Клеменцьеўна,** н. у 1888.
**ДАНІЛАЎ Іван Гаўрылавіч,** н. у 1918.
**ІВАНОВА Ганна Гаўрылаўна,** н. у 1917.
**КАНДРАШОВА Марыя Гаўрылаўна,** н. у 1898.

### ВЁСКА СНЕГІШКІ

**ВОРАНАВА Афрося Васільеўна,** н. у 1892.

### ВЁСКА ФУРМАНІШКІ

**САФРОНАЎ Цімафей Аляксеевіч,** н. у. 1917.

## ДАЛЁЦКАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

### ВЁСКА АКСЮТАВА

**ДУБРОЎСКІ Адольф,** загінуў у 1943.

### ВЁСКА АЛЬБЕНАЎКА

**АЛЁХНА Мікалай Іванавіч,** н. у 1886, загінуў у 1942.

**ВОЛК Канстанцін Канстанцінавіч,** н. у 1929, загінуў у 1942.
**ВОЛК Аляксандр Канстанцінавіч,** н. у 1927, загінуў у 1942.
**ВОЛК Ганна Іванаўна, н. у 1917,** загінула ў 1942.
**РУБЛЕВІЧ Канстанцін Данілавіч,** н. у 1913, загінуў у 1942.
**РУБЛЕВІЧ Марыя Ільінічна,** н. у 1916, загінула ў 1942.
**СТАЦЭВІЧ Віталь Казіміравіч,** н. у 1936, загінуў у 1942.
**СТАЦЭВІЧ Геня Канстанцінаўна,** н. у 1926, загінула ў 1942.
**СТАЦЭВІЧ Станіслава Канстанцінаўна,** н. у 1929, загінула ў 1942.
**СТАЦЭВІЧ Саламея Андрэеўна,** н. у 1921, загінула ў 1942.
**СТАЦЭВІЧ Эдуард Канстанцінавіч,** н. у 1927, загінуў у 1942.
**СТАЦЭВІЧ Станіслаў Казіміравіч,** н. у 1926, загінуў у 1944.

## ВЁСКА БАБЫЛІ

**БАБУЛЬ Кляменцій Вікенцьевіч,** н. у 1882, загінуў у 1943.
**БАБУЛЬ Міхаліна,** н. у 1882, загінула ў 1943.
**БАБУЛЬ Паўліна,** н. у 1889, загінула ў 1943.
**БАБУЛЬ Пётр Пятровіч,** н. у 1907, загінуў у 1943.
**БАБУЛЬ Уладзімір Пятровіч,** н. у 1921, загінуў у 1943.
**БАБУЛЬ Мечыслаў Аляксеевіч,** н. у 1902, загінуў у 1943.
**БАБУЛЬ Ганна Фамінічна,** н. у 1909, загінула ў 1943.
**БАБУЛЬ Часлаў Мечыслававіч,** н. у 1932, загінуў у 1943.
**БАБУЛЬ Настасся Міхайлаўна,** н. у 1877, загінула ў 1943.
**МАЦУК Пелагея Фамінічна,** н. у 1897, загінула ў 1943.
**МАЦУК Ефрасіння Сцяпанаўна,** н. у 1902, загінула ў 1943.
**МАЦУК Канстанцін Ануфрыевіч,** н. у 1915, загінуў у 1943.
**МАЦУК Мікалай Восіпавіч,** н. у 1887, загінуў у 1943.
**МАЦУК Тэкля,** н. у 1892, загінула ў 1943.
**МАЦУК Марыя Іосіфаўна,** н. у 1897, загінула ў 1943.
**МАЦУК Стэфанія Афанасьеўна,** н. у 1939, загінула ў 1943.
**МАЦУК Ганна,** н. у 1892, загінула ў 1943.
**ПАЎЛЮКЕВІЧ Мальвіна,** н. у 1872, загінула ў 1943.

## ВЁСКА БРАСЛАЎСКАЯ ЛУКА

**АТРАХІМОВІЧ Васіль Антонавіч,** н. у 1912, загінуў у 1942.
**ВАЙКОЎСКІ Антон Андрэевіч,** н. у 1910, загінуў у 1942.
**ВАШКЕВІЧ Ніна Сямёнаўна,** н. у 1904, загінула ў 1942.
**ВАШКЕВІЧ Пётр Іпалітавіч,** н. у 1930, загінуў у 1942.
**ВАШКЕВІЧ Іпаліт Ульянавіч,** н. у 1900, загінуў у 1942.
**ВАШКЕВІЧ Таццяна Кандрацьеўна.**
**ВАШКЕВІЧ Марыя Іванаўна.**
**ВАШКЕВІЧ Канстанцін Кандрацьевіч.**
**ВАШКЕВІЧ Антаніна Васільеўна.**
**ПУЧЫНСКАЯ Ірына Юльянаўна,** н. у 1892, загінула ў 1942.
**ПУЧЫНСКАЯ Валянціна Васільеўна,** н. у 1922, загінула ў 1942.
**ПУЧЫНСКАЯ Лідзія Іванаўна,** н. у 1903, загінула ў 1942.
**ПУЧЫНСКІ Пётр Іосіфавіч,** н. у 1941, загінуў у 1942.
**ПУЧЫНСКІ Вадзім Сямёнавіч,** загінуў у 1942.
**ПУЧЫНСКІ Віктар Уладзіміравіч,** н. у 1923, загінуў у 1944.
**ПУЧЫНСКІ Іван Іванавіч,** н. у 1896, загінуў у 1942.
**СВІЛА Яўген Фаміч,** н. у 1927, загінуў у 1942.
**СВІЛА Сямён Фаміч,** н. у 1925, загінуў у 1942.
**СВІЛА Валер'ян Іванавіч,** н. у 1903, загінуў у 1942.
**СТАЛЯРОНАК Зінаіда Сямёнаўна,** н. у 1897, загінула ў 1942.
**ШЭЛЯПІНА Вольга Аляксееўна.**

## ВЁСКА БЫКОЎШЧЫНА

**СЕДЗЮКЕВІЧ Ганна Фёдараўна,** н. у 1920, загінула ў 1943.

## ВЁСКА БЯКЕШКІ

**АЛЁХНА Вольга Мікалаеўна,** н. у 1897, загінула ў 1942.
**АЛЁХНА Эдуард Андрэевіч,** н. у 1924, загінуў у 1942.
**АЛЁХНА Соф'я Андрэеўна,** н. у 1926, загінула ў 1942.
**АЛЁХНА Лідзія Аляксееўна,** н. у 1926, загінула ў 1942.
**АЛЁХНА Міхаіл андрэевіч,** н. у 1872, загінуў у 1942.
**АЛЁХНА Анатоль Андрэевіч,** н. у 1870, загінуў у 1942.

**АЛЁХНА Соф'я Міхайлаўна**, н. у 1922, загінула ў 1942.
**ЖДАН Анісся**, н. у 1914, загінула ў 1943.
**ПАЛІНСКІ Дзем'ян Адольфавіч**, н. у 1914, загінуў у 1942.
**ШЫЛІНСКАЯ Серафіма Іванаўна**, н. у 1910, загінула у 1943.

## ВЁСКА ГАТОЎКІ

**ЛЯСНІКОЎСКАЯ Марыя**, загінула ў 1943.

## ВЁСКА ГРОДЗІШКІ

**ПАЎЛЮКЕВІЧ Адольф Іванавіч**, н. у 1902, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Віктар Адамавіч**, н. у 1889, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Васіль Адамавіч**, н. у. 1912, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Іван Іванавіч**, н. у 1889, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Александрына**, н. у 1874, загінула ў 1943.
**ЦІХАН Канстанцыя**, н. у 1879, загінула ў 1943.
**ЦІХАН Леанід Віктаравіч**, н. у 1894, загінула ў 1943.
**ЦІХАН Фёдар Віктаравіч**, н. у 1894, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Анісся Андрэеўна**, н. у 1887, загінула ў 1943.
**ЦІХАН Піліп Піліпавіч**, н. у 1897, загінуў у 1943.
**ЦІХАН Анісся Піліпаўна**, н. у 1915, загінула ў 1943.
**ЯРОЦКАЯ Марыя**, н. у 1872, загінула ў 1943.
**ЯРОЦКАЯ Міхаліна**, н. у 1873, загінула ў 1943.
**ЯРОЦКІ Мікалай Фёдаравіч**, н. у 1922, загінуў у 1943.
**ЯРОЦКІ Генадзь Фёдаравіч**, н. у 1924, загінуў у 1943.

## ВЁСКА ДРУСЕВІЧЫ

**АТКІНСКІ Антон Антонавіч**, н. у 1880.
**АТКІНСКАЯ Алена**, н. у 1886.

## ВЁСКА ДУНДАЎШЧЫНА

**УМПІРОВІЧ Адольф Фдольфавіч**, н. у 1887, загінуў у 1943.
**УМПІРОВІЧ Феафанія Лявонаўна**, н. у 1897, загінула ў 1943.
**УМПІРОВІЧ Пётр Вікенцьевіч**, н. у 1921.

## ВЁСКА ЖЭРДЗІШКІ

**БАБУЛЬ Уладзіслава Канстанцінаўна**, н. у 1899, загінула ў 1943.
**БАБУЛЬ Соф'я Генрыхаўна**, н. у 1899, загінула ў 1943.
**БАБУЛЬ Ядзвіга Уладзіміраўна**, н. у 1928, загінула ў 1943.
**МАЦУК Ганна Іванаўна**, н. у 1902, загінула ў 1943.
**ПЯТКУН Іван Фаміч**, н. у 1882, загінуў у 1943.
**ЯКІМЧЫК Стэфанія Канстанцінаўна**, н. у 1897, загінула ў 1943.

## ВЁСКА ЗАБЛОЦІШКІ

**БАБУЛЬ Зофія Іванаўна**, н. у 1924, загінула ў 1942.
**БАБУЛЬ Ефрасіння Іванаўна**, н. у 1928, загінула ў 1942.
**БАБУЛЬ Яўген Іванавіч**, н. у 1929, загінуў у 1942.
**БАБУЛЬ Канстанцыя Іванаўна**, н. у 1910, загінула ў 1942.
**БАБУЛЬ Соф'я Максімаўна**, н. у 1912, загінула ў 1942.
**БАБУЛЬ Іван Іванавіч**, н. у 1882, загінуў у 1942.
**СІНІЦА Праскоўя Кузьмінічна**, н. у 1882, загінула ў 1942.
**СІНІЦА Рыгор Аляксеевіч**, н. у 1872, загінуў у 1942.

## ВЁСКА ІСАІ

**ЛАБЭЦКІ Сямён**, н. у 1882, загінуў у 1942.
**ЛАБЭЦКІ Міхаіл Сямёнавіч**, н. у 1925, загінуў у 1943.

## ВЁСКА КАЛЕНКАЎШЧЫНА

**ЦЫЎНЕЛЬ Іпаліт Рыгоравіч**, н. у 1900, загінуў у 1943.

## ВЁСКА ЛУСКАЎШЧЫНА

**ГАЛІНА Ганна**, н. у 1915, загінула ў 1942.
**ГАЛІНА Стэфан Вікенцьевіч**, н. у 1903, загінуў у 1942.
**МАЦУК Ефрасіння Іванаўна**, н. у 1888, загінула ў 1942.
**МАЦУК Мікалай Іванавіч**, н. у 1897, загінуў у 1942.
**МАЦУК Ніна Іванаўна**, н. у 1909, загінула ў 1942.
**МАЦУК Генадзь Мікалаевіч**, н. у 1938, загінуў у 1942.
**СТАЛЯРОНАК Касцігней**, н. у 1918, загінуў у 1942.

## ВЁСКА МІЛАШКІ

**ПЯТУШКА Валянціна Васільеўна**, н. у 1897, загінула ў 1943.
**ПЯТУШКА Антон Аляксандравіч**, н. у 1881, загінуў у 1943.

## ВЁСКА НОВАЯ ЛУКА

**МАЦУК Мікалай Іванавіч**, н. у 1919.
**МАЦУК Алена Мікалаеўна**, н. у 1927, загінула ў 1942.
**МАЦУК Андрэй Іванавіч**, н. у 1922, загінуў у 1942.
**МАЦУК Аляксей Іванавіч**, н. у 1928, загінуў у 1942.
**СЕКАН Фёкла Андрэеўна**, н. у 1919, загінула ў 1942.
**СЕКАН Дзмітрый Іванавіч**, н. у 1903, загінуў у 1942.
**СЁКАН Кацярына Іванаўна**, н. у 1909, загінула ў 1942.
**ЖДАН Канстанцін Уладзіміравіч.**

## ВЁСКА СІПАВІЧЫ

**БАБУЛЬ Феафанія**, н. у 1882, загінула ў 1942.
**КАЦЯЛОВІЧ Вера Міхайлаўна**, н. у 1912, загінула ў 1943.
**КАЦЯЛОВІЧ Ілля Канстанцінавіч**, н. у 1941, загінуў у 1943.
**КАЦЯЛОВІЧ Канстанцін Канстанцінавіч**, н. у 1939, загінуў у 1943.
**КАЦЯЛОВІЧ Канстанцін Ільіч**, н. у 1912, загінуў у 1943.
**НАСЫР Алена Мікалаеўна**, н. у 1883, загінула ў 1943.
**НАСЫР Аляксей**, н. у 1941, загінуў у 1943.
**НАСЫР Іван Мікалаевіч**, н. у 1912, загінуў у 1943.
**НАСЫР Кацярына Мікалаеўна**, н. у 1919, загінула ў 1943.
**НАСЫР Любоў Мікалаеўна**, н. у 1924, загінула ў 1943.
**СЕКАН Арсен Андрэевіч**, н. у 1909, загінуў у 1943.
**ШОСТАК Уладзімір Уладзіміравіч**, н. у 1926, загінуў у 1944.
**ШУМІЛА Марыя Венядзіктаўна**, н. у 1923, загінула ў 1943.
**ШУМІЛА Марыя Іосіфаўна**, н. у 1917, загінула ў 1943.
**ШУМІЛА Марыя Трафімаўна**, н. у 1883, загінула ў 1943.

## ВЁСКА СКУР'ЯТЫ

**РАМАНЦЭВІЧЫ**, загінулі ў 1942.

## ВЁСКА СТРЫХАЛІ

**ЦЫЎНЕЛЬ Уладзімір Несцеравіч**, н. у 1923, загінуў у 1943.

## ВЁСКА СТАЎРОВА

**ВАРАНЕЦКАЯ Таццяна.**
**ВАРАНЕЦКАЯ Ала Васільеўна.**
**ВАРАНЕЦКІ Мікалай Васільевіч.**
**ВОЎК Аляксей Антонавіч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Аляксей Фаміч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Вера Аляксееўна.**
**ГАРДЗЕВІЧ Аляксандр Аляксеевіч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Антаніна Міхайлаўна.**
**ГАРДЗЕВІЧ Уладзімір Аляксандравіч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Ягор Аляксеевіч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Соф'я Іванаўна.**
**ГАРДЗЕВІЧ Рэгіна Ягораўна.**
**ГАРДЗЕВІЧ Мікалай Канстанцінавіч.**
**ГАРДЗЕВІЧ Алена Людвікаўна.**
**ГАРДЗЕВІЧ Любоў Мікалаеўна.**
**ДРАБОВІЧ Канстанцін Габрыелевіч.**
**ДРАБОВІЧ Ганна Сцяпанаўна.**
**ДРАБОВІЧ Дзяніс Канстанцінавіч.**
**ЗУБАЎ Якаў Рыгоравіч.**
**ЗУБАВА Агаф'я Максімаўна.**
**ЗУБАЎ Пётр Якаўлевіч.**
**ЗУБАЎ Сяргей Якаўлевіч.**
**КУЗНЯЦОВА Анастасія Габрыелеўна.**
**ПУЧЫНСКАЯ Пелагея Фамінічна.**
**ПУЧЫНСКАЯ Марыя Сямёнаўна.**
**ПУЧЫНСКІ Міхаіл Фёдаравіч.**
**ПУЧЫНСКІ Аляксей Фёдаравіч.**
Напярэдадні Пасхі, у першыя дні красавіка 1942 г., гестапа перадало загад праз «юдэнрат» аб тым, што ўсім яўрэям Браслава перабрацца ў хаты, размешчаныя па сучаснай вуліцы Ленінскай. Больш зручнае месца для гета было цяжка ўявіць — з аднаго боку вуліцу абмяжоўвала возера, а з другога — Замкавая Гара. На тэрыторыі гета панавала жахлівая цеснata, жылі па некалькі сем'яў у адной кватэры, без медыцынскай дапамогі і элементарных санітарных умоў. Некаторыя не вытрымлівалі і паміралі ад хвароб. Гэта быў пачатак канца яўрэйскай абшчыны Браслава, пачатак яе фізічнага знішчэння. Знайшліся такія, хто няблага пажывіўся на пакутах яўрэяў, бо няшчасныя былі згодны за кавалак хлеба, за бутэльку льнянога алею аддаць любыя рэчы, мэблю, каштоўнасці, усё, што яшчэ заставалася ад разграблення.

Шмат хто дайшоў да адчаю і пакорліва чакаў непазбежнага канца. Але былі і такія, хто да апошняга супраціўляўся думцы аб гібелі, рыхтавалі сховішчы, дамаўляліся з надзейнымі знаёмымі ў вёсках аб магчымасці схавацца.

У гэтыя дні да жыхароў гета сталі даходзіць сумныя весткі аб ліквідацыі яўрэйскага насельніцтва на тэрыторыі Літвы і Латвіі, мяжуючых з Браслаўскім раёнам, дзе меліся шматлікія родзічы. Даведаліся і аб расстрэлах у бліжэйшых мястэчках. Немцы спрабавалі супакоіць членаў «юдэнрата», запэўніваючы іх, што браслаўскія яўрэі ціхія і працалюбівыя, што ім няма чаго баяцца. Далейшыя падзеі паказалі, што гэта быў манеўр акупантаў.

У аўторак, напярэдадні трагедыі, немцы загадалі паслаць сто дзяўчат прыбіраць ваенныя казармы ў Слабодцы. На наступны дзень усе яны вярнуліся ў Браслаў. Аднак іх павялі не ў гета, а да равоў, выкапаных на паўночнай ускраіне горада. Тут іх напаткаў такі ж трагічны лёс, як і астатніх жыхароў гета. Прадчуваючы развязку, некаторыя бацькі, каб выратаваць малютак, апраналі іх у лепшую вопратку і пакідалі каля хат за межамі гета. Цеплілася надзея, што іх пашкадуюць і прытуляць у сябе. Але няшчасных вярталі ў гета. Уначы з 2 на 3 ліпеня вакол гета стала збірацца вялізная колькасць паліцаяў і жандараў. З'явіліся вялікагрузныя закрытыя грузавікі — «душагубкі», якія прызначаліся для знішчэння людзей адпрацаванымі газамі.

На досвітку 3 ліпеня 1942 г. гета прачнулася ад частай стральніны і страшнага крыку — крыку п'яных забойцаў. Гітлераўцы разбівалі шыбы, выламвалі дзверы, загадвалі хутчэй выходзіць з хат, шукалі па закутках тых, хто хаваўся.

Люба Бык сведчыць: «...Напярэдадні акцыі знішчэння да горада сцягнулі дадатковыя сілы паліцаяў, каб лепей вартаваць гета. Наша хата знаходзілася ля самага ўвахода ў гета. Уначы, каля 2 гадзін, мы пачулі цяжкія крокі каваных ботаў. Зламаўшы дзверы ў хату ўварваліся два паліцаі, сталі нас біць і скінулі з прыступак.

Мне не дазволілі нават наблізіцца да ложка дачкі. Яны забілі яе спячую, на маіх вачах. Мяне білі прыкладамі і выштурхнулі на вуліцу. Маю сястру Розу з двумя дочкамі забілі каля драцяной загароджы непадалёку ад нашай хаты. Нас гналі да будынка яўрэйскай школы. Па дарозе застрэлілі слесара Мендэля Барона. Здалёку я бачыла свайго дзядзьку Рахміэля і пайшла ўслед за ім. Раптам ён штурхнуў мяне і яшчэ некалькі чалавек з нашай сям'і ў падвал пад складам мукі, які да вайны належыў Розіну. У прыцемках мы пасунуліся ўглыб падвала, натыкаючыся на целы людзей каля мураваных сцен. Былі чутны крокі і стогны, нас мог выдаць плач дзіцяці і дзяцей супакойвалі як маглі. Не было ні ежы, ні вады, патрэбу адпраўлялі пад сябе, задыхаючыся ад спёртага паветра і смуроду. Такім чынам мы пакутвалі чатыры дні. Але вось нас знайшлі, пачуліся крокі, нечый голас сказаў: «Праклятыя, смярдзючыя жыды, выходзьце». На свежым паветры я страціла прытомнасць, нехта даў глыток вады».

Сара Кац расказвае, што яна бачыла з вакна хаты, як паліцай цягнуў за ножку маленькую дзяўчынку — дачушку Любы Вайс. Галоўка дзяўчынкі білася аб брук.

Гета было перапоўнена людзьмі, нехта спрабаваў бегчы ў бок возера, на маленькія бакавыя вулачкі, але іх даганялі кулі.

Старшыня «юдэнрата» Міндэль пабег у гестапа з надзеяй, што яму ўдасца прадухіліць трагедыю, але загінуў у ліку першых. Па іншых звестках Міндэль, калі даведаўся аб намерах гітлераўцаў, папрасіў знаёмага гестапаўца забіць яго з сям'ёй.

Людзей гналі да загадзя выкапаных равоў, прымушалі распранацца і расстрэльвалі. Некаторыя падалі ў ямы жывымі. Адзінкам удавалася выбрацца з-пад трупаў і застацца ў жывых.

Знішчэнне яўрэяў працягвалася тры дні, потым карнікі пачалі адшукваць людзей у сховішчах. Дапамагаў ім у гэтым мясцовы жыхар Бурак, які добра размаўляў па яўрэйску. Ён хадзіў па хатах і выкрыкваў: «Яўрэі, выходзьце, больш не забіваюць». Некаторыя верылі правакатару, выходзілі са сховішчаў. Іх адразу забівалі. У шэрагу выпадкаў схаваўшыхся выдаваў енк напужаных дзяцей.

Былі людзі, якія аказвалі супраціўленне катам. Мацэ-Барух Банк у барацьбе з немцам адкусіў яму палец. Банка жорстка пакаралі — прывязалі да каня і цягалі па брукаваных вуліцах! да смерці. Спрабавалі аказаць супраціўленне Нафталі Фішэр, Абраша Фішэр, Абраша Ульман. Апошні нават перад смерцю здолеў забіць двух паліцаяў.

Пасля масавых расстрэлаў тры дні зямля калыхалася над забітымі, з ям праступала кроў. Гітлераўцы прымушалі сялян падвозіць пясок і засыпаць ямы.

Няшмат людзей засталося ў жывых пасля першай разні. Ратаваліся толькі тыя, хто надзейна схаваўся, а потым перабраўся ў лес да партызан, альбо тыя, каго, рызыкуючы сваім жыццём, хавалі па вёсках сяляне.

Напярэдадні яўрэйскага Новага года немцы стварылі ў Браславе другое гета ці як яго называюць Опсаўскае. Аснову яго склалі жыхары мястэчка Опса. Гэта гета існавала нядоўга. 19 сакавіка 1943 г., напярэдадні свята Пурым, немцы акружылі гета, пагналі ўсіх яго жыхароў да равоў і там пастралялі. Пры ліквідацыі Опсаўскага гета некаторыя яўрэі аказалі мужнае супраціўленне забойцам. У доме Багамольскага зачыніліся некалькі чалавек і адмовіліся выходзіць. Калі немцы наблізіліся да будынка, раздаліся стрэлы з пісталета. Але вось патроны скончыліся. Першы

з немцаў, якія ўварваліся ў дом, быў забіты. Нехта адзін паспеў апрануць яго мундзір, падхапіць вінтоўку і выбегчы на панадворак. Зноў узнялася страляніна. З адлегласці немцы закідалі дом гранатамі, усе яго абаронцы загінулі ў полымі. Трэба асабліва адзначыць мужнасць двух з асуджаных — браслаўчаніна Лейзера Беляка і жыхара Опсы Мейлаха Муніца.

Вязні Опсаўскага гета, якія засталіся ў жывых, расказвалі, што адзін шавец і яшчэ некалькі чалавек загадзя падрыхтаваліся да супраціўлення, прызапасілі жалезныя прадметы, вёдры з вапнай. Калі першы немец увайшоў у хату, у вочы яму кінулі вапну. Мейнах застрэліў гітлераўца з яго ж пісталета, апрануў яго мундзір, выйшаў з хаты і стаў страляць у немцаў. У гэтым баі Мейлах загінуў.

Аб Лейзеры Беляку відавочцы сведчаць: «Пры ліквідацыі другога гета Лейзер з пісталета, які быў у яго, застрэліў немца і двух паліцэйскіх, быў паранены, але здолеў збегчы і некаторы час хаваўся ў вёсцы. Знайшоўся аднак здраднік, які за некалькі кілаграмаў солі выдаў яго немцам».

Аднак выпадкі супраціўлення яўрэяў забойцам былі адзінкавыя. Сведка падзей у Браславе М. Фішэр задае пытанне: «Чаму асуджаныя на смерць яўрэі не аказвалі супраціўлення?» Сам жа ён і спрабуе знайсці адказ на яго: «Няма ў мяне пэўнага адказу ні сабе, ні іншым, але мне здаецца, што гэта можна растлумачыць тым, што немцы, пастаянна здзекваючыся, пагражаючы смерцю, катуючы яўрэяў, здолелі згасіць у ахвяр не толькі жаданне да супраціўлення, але і прагу да жыцця. Магчыма таксама, што інстынкт жыцця, чаканне нейкага цуда, клопат аб дзецях і старых неаднойчы гасілі жаданне супраціўляцца. Магчыма паўплывала і вера ў тое, што на ўсё есць воля Божая».

Асобнай главой у апісанні шляху пакут яўрэйскага насельніцтва Браслаўшчыны з'яўляюцца сведчанні тых, хто на працягу многіх месяцаў перабіраўся з месца на месца, у пошуку прытулку для сябе, сваіх дзяцей, каб выратавацца ад смяротнай пагрозы.

Аповяд Сары Кац-Мовшэнзон: «Гнаныя ў дождж, снег і мароз з маленькім хлопчыкам на руках, часта без ежы і вады, разам са сваім стрыечным братам, у якога загінула ўся сям'я і які потым стаў маім мужам, вандравалі з месца на месца, не ведаючы дзе прыхіліць сваё набалелае цела, дні, тыдні, месяцы на працягу некалькіх гадоў».

Трэба абавязкова адзначыць, што шмат у якіх выпадках хрысціянскае насельніцтва Браслаўшчыны — палякі, беларусы, рускія, літоўцы — рабілі ўсё, каб дапамагчы асуджаным на смерць яўрэям. Яны давалі яўрэям прытулак, дзяліліся кавалкам хлеба. Пры гэтым рызыкавалі сваім жыццём і жыццямі сваіх сем'яў. Такія выпадкі дапамогі знаходзім у расказах Славы Пінцовай, Нюты Кантар, Хаіма Дэйча, Ханы Гурэвіч і іншых. З вялікай удзячнасцю і бязмежнай павагай хацелася б узгадаць тых, хто выратоўваў яўрэяў ад немінучай смерці. Сям'я Шчарбінскіх з в. Каменка доўгі час хавала ў сябе Іҫту Фішэр і сям'ю Гравец з Дзвінска. Сям'я Кіжла з в. Шэмялькі дала прытулак Моце Кантар і сям'і Баркан з Латвіі; сям'я Кандзілеўскіх з в. Ілішкі дзялілася прытулкам і ежай з Сарай Кац-Мовшэнзон, яе сынам і мужам; сялянка Юзэфа Сівіцкая з в. Урбаны хавала ў сябе Рахіль Гурэвіч з дачкамі Ханай і Рыветкай, дапамагаў ёй ў гэтым мясцовы ксёндз; сёстры Амалія і Ядвіга Чэснавіцкія і іх брат Альфонс з в. Каханішкі выратавалі Машу і Сендэля Марон, а пазней Хану і Тэвье Фішэр, яшчэ двух Фішэраў; Станіслаў Шакель з в. Коўшанкі дапамог схавацца 17 яўрэям, у тым ліку сем'ям Любовіч і Зусмана; Васіль Іваноў з дач-

кой з в. Зачарэўе прытулілі Хану Банд.

Слава Пінцова, якая доўгі час з сям'ёй хавалася ў Васіля Брэско з в. Вязавічы, успамінае: «З-за дзейнасці партызан немцы папалілі шэраг вёсак, усё навокал палала. Васіль папярэдзіў нас аб небяспечным становішчы. Сам ён з сям'ёй падаўся з хаты. Да нас звярнуўся бацька: «Дзеці мае, вы маладыя і павінны бегчы, у мяне ўжо няма сіл, спадзяюся толькі на цуд!». Ён усклаў свае рукі на нашы галовы, як гэта ён рабіў заўсёды напярэдадні суднага дня, і благаславіў нас. Ноч была асветлена вогнішчамі пажараў. Мы беглі з астатніх сіл. Калі дабеглі да ўзлеска, то азірнуліся і ўбачылі палаючую хату, у якой засталіся бацькі. Цуд не адбыўся. У полымі палаючай хаты былі зажыва спалены Моцька Хаім Шалом і маці Гіта».

* * *

Звыш 40 гадоў прайшло з тых жудасных часоў, аднак успаміны, якія застаюцца ў памяці ўцалелых, не згаслі і ніколі не будуць выкрэслены з нашай памяці.

Жудаснымі, напоўненымі глыбокімі ўзрушаннямі з'яўляюцца расказы тых, хто прайшоў праз так званыя працоўныя лагеры, а фактычна праз лагеры знішчэння, лагеры смерці.

Немагчыма без хвалявання чытаць расказ Рыўкі Рукшын-Марон, якая простымі словамі апісвае перажытае ў чорны перыяд жыцця: «...З таго дня, калі немцы ўвайшлі ў нашу вёску Дубіна і да канца гітлераўскай Германіі я прайшла доўгім шляхам пакут, неаднойчы сустракаючыся са смерцю. Я была ў Відзаўскім і Свянцянскім гета, прайшла праз 12 канцэнтрацыйных лагераў, страціла бацькоў, братоў, сваякоў. Толькі я ды мая сястра Рэйзл засталіся ў жывых. Усе лагеры мелі адну мэту — знясіліць ахвяру катаржнай працай, зняважыць, змардаваць голадам і, нарэшце, забіць ці куляй, ці ў газавай камеры. У Мелігянскім лагеры нам пашанцавала. Мы сустрэліся з нашай сям'ёй. З Мелігян усіх разам накіравалі ў лагер Вевье, адтуль у Жэўмары. На працягу многіх месяцаў удалося назапасіць трошкі мукі. Бацька зрабіў трохі мацы да Пасхі, але за тры тыдні да свята фашысты правялі «селекцыю» — бацькоў і братоў накіравалі ў Панорскі лагер». Рыўка Рукшын успамінае таксама: «...Нас упіхнулі ў таварныя вагоны і прывезлі ў Асвенцым. Перад намі туды прайшоў іншы састаў з яўрэямі. Мы чулі крыкі і плач. Аднак Асвенцым не прыняў нашага цягніка. Упэўнена, што немцы не спужаліся плача асуджаных на смерць. Трэба меркаваць, што лагер быў перапоўнены, у яго газавых камерах і крэматорыях папросту для нас, тых, хто толькі прыехаў, не хапіла месца. Нас перавезлі ў Штутгоф. Цяжкі чорны дым ішоў з высачэнных труб крэматорыя безупынна. Па тры — чатыры разы на дзень нас пералічвалі, доўгія гадзіны мы вымушаны былі стаяць на плацу нерухомымі, у любое надвор'е. Аднойчы мяне з групай жанчын запісалі на працу. Мне ўдалося непрыкметна правесці праз вароты сястрычку Рэйзл, якой тады было толькі 13 гадоў. Нас прывезлі ў лагер непадалёку ад Данцыга (Гданьска), дзе на працягу дзесяці месяцаў давялося капаць акопы...».

Падобныя пакуты выпалі Сіме Фейгін-Марэцкай: «...З Відзаўскага гета нас перапpавілі на працу ў Мелігянскі лагер. Разам са мной было некалькі дзяўчат з в. Дубіна. У лагеры меліся баракі з трохпавярховымі нарамі ўнутры, тэрыторыя агароджвалася калючым дротам. Іта Кулак, адказная за працоўную сілу, папярэдзіла, каб пры апытанні ўзрост называлі вышэй 15 гадоў. Усіх, хто быў маладзейшы, адпраўлялі ў газавыя камеры. У лаге-

ры Алайне ў мяне адабралі двух братоў і чатырохгадовую сястрычку. Я засталася ў лагеры з маці адзінаццацігадовым братам. На працу нас везлі ў таварных вагонах. Канваірамі былі паліцэйскія шмат якіх нацыянальнасцей. Сярод іх запомніўся малады хлопец, паляк Янек. Аднойчы наш састаў прыпыніўся на нейкай станцыі і гэты Янек сказаў, што непадалёку стаіць састаў, у якім вязуць дзяцей. Мы ўбачылі мноства дзіцячых ручак, прасунутых праз краты на вокнах вагонаў. Састаў накіроўваўся ў лагер знішчэння. Мы нічым не маглі дапамагчы няшчасным. У 1944 г. нас перавезлі ў лагер Кайнрвальд непадалёку ад Рыгі. Тут нас абстрыглі дагала, выдалі паласатае адзенне, драўляныя чаравікі, трохкутную капіну на галаву і завашыўленую коўдру. Кожнаму на скуры выкалалі нумар, мой нумар быў 4757. Штодня нас пералічвалі. Часам прыходзілі немцы, сартавалі нас — каго налева, каго направа, гэта значыць, каго на жыццё, каго на смерць».

Асобна трэба апісаць так званыя «маршы смерці», па якіх прайшлі тысячы і тысячы яўрэяў у апошнія месяцы вайны. Нацысцкі звер і здыхаючы не перапыніў ажыццяўленне свайго д'ябальскага плана знішчэння яўрэйскага насельніцтва. Разам з адступаючымі войскамі немцы гналі ў Германію вялізную колькасць яўрэяў, якіх не паспелі знішчыць. Да гэтага ўжо знясіленых, знямоглых, хворых людзей па дарогах і бездарожжу, пераважна пешшу, гналі ў канцлагеры Германіі. У дождж і снег, днём і ноччу, без адпачынку, без ежы, паміраючы сотнямі паабапал дарогі, цягнулася шэрая, абыякавая да ўсяго маса людзей. Толькі нязначная частка тых, хто прайшоў гэты «паход», дайшла да Германіі.

Міра Лоц сведчыць: «У лютым 1945 г., з прыбліжэннем фронту, нас вывелі з лагера і пешшу, па глыбокім снезе, пагналі ў бок Берліна. Шмат хто памёр у дарозе. Знясіленых, не здольных рухацца проста прыстрэльвалі канваіры. Месяц нас пратрымалі ў лагеры непадалёку ад горада Лаўнберг, дзе спалі на мёрзлай зямлі. Завашыўленыя, галодныя штодня паміралі сотнямі. Калі стала набліжацца Чырвоная Армія, нас пагналі на захад. Аднойчы, у вёсцы Хінгоф, нас разам з рускімі ваеннапалоннымі загналі ў вялізны хлеў і зачынілі. Мы былі ўпэўнены, што настаў канец, што нас будуць знішчаць. Аднак здарылася неверагоднае. Палонныя салдаты па гуку вызначылі, што па дарозе праходзяць савецкія танкі. Дзверы хлява адразу былі ўзламаны і мы апынуліся на волі... Я стаяла сярод соцен падобных на мяне з цяжкасцю трымаючыхся на нагах шкілетаў, якія ледзь нагадвалі жывых істот. Мы былі ў лагернай паласатай вопратцы, з жоўтай шасціканцовай зоркай на рукаве, у драўляных чаравіках. Савецкія салдаты абкружылі нас і паглядалі спагадліва. Гэта было 10 сакавіка 1945 г., за два месяцы да заканчэння вайны.

Я вярнулася ў родныя мясціны, наведала маю вёску Дубіна. Родная вёска была спалена фашыстамі. Я наведала могілкі і ўбачыла там толькі некалькі зламаных помнікаў, раскіданых сярод пустазелля. Такі вось невясёлы мой жыццёвы расказ. Ці магчыма ўсё гэта забыць? Пакуль жыву буду захоўваць у сваім сэрцы памяць аб маіх родных і блізкіх, якія былі па-зверску знішчаны толькі за тое, што нарадзіліся яўрэямі...».

Скончыць матэрыял аб трагедыі яўрэйскага насельніцтва Браслава і яго наваколля хацелася б лістом браслаўчаніна Хаіма Муніца да сваёй сястры ў Ізраіль, які быў напісаны пасня наведвання Браслава ў першыя пасляваенныя гады. Гэты ліст, напісаны па яшчэ свежых слядах катастрофы, нібыта канцэнтрыруе нясцерпны боль і

пакуты застаўшыхся ў жывых аб тых, хто ніколі ўжо не вернецца. Х. Муніц піша: «...Знешне ў Браславе нічога не змянілася, гара не раскалолася, вада ў азёрах не памутнела, як быццам нічога і не здарылася. Але адбыліся страшныя рэчы, аб якіх цяжка расказаць і яшчэ цяжэй пісаць...

Усіх яўрэяў расстралялі 3 чэрвеня 1942 г. Увесь час ад прыходу немцаў да гэтай даты яўрэі пераносілі пакуты пекла.

...Яўрэі, якім удалося выратавацца, уцякалі ў лясы, хаваліся ў добрых людзей па вёсках. За ўкрыццё яўрэя немцы знішчалі ўсю сям'ю, спальвалі хату. За кожнага затрыманага яўрэя немцы выплочвалі 3 кг солі. У асноўным добрыя людзі давалі прытулак няшчасным бескарысліва, але былі і такія, хто за адну ноч браў па 5 рублёў золатам.

Шмат было выпадкаў, калі сяляне хавалі яўрэяў, выносілі кавалак хлеба. Маша, дачка Славы-Хаі (Марон) і Мендл сын Хаім-Айзіка (Марон) знайшлі прытулак у дзвюх маладых сялянак да прыходу Чырвонай Арміі... пазней яны схавалі яшчэ некалькіх браслаўскіх яўрэяў. Такім чынам яны выратавалі шэсць чалавек.

Браслаўскі ксёндз памёр ад сардэчнага прыступу ў дзень расстрэла яўрэяў. Былі ксяндзы, якія раілі сваім парафіянам дапамагаць яўрэям ежай і адзеннем.

Калі б у гэты час быў больш развіты партызанскі рух, колькасць выратаваных была б значна большай. Але партызаны пачалі актыўна дзейнічаць у раёне толькі ў пачатку 1943 г.

З нашых блізкіх сваякоў ніхто не выратаваўся. Тыя, хто застаўся ў жывых, вярнуліся ў Браслаў, змаглі назбіраць трохі грошай і з'ехалі ў Польшчу.

Магілы закатаваных ці ямы, як іх называюць у Браславе, абнесены некалькімі жэрдкамі і калючым дротам».

Што можна яшчэ дадаць да гэтага расказа? Толькі палымяныя словы, якія напісаў наш паэт Шленскі:

...Памятайце ўсё,
Памятайце, нічога ніколі не забывайце...».

По кнізе «Мой парушаны дом».
Ізраіль, 1986.

Матэрыял падрыхтаваны
*М. Багамольскім*

## ЛІСТ РАФАІЛА ФІШЭРА ДА ДАЧКІ ЕНТЫ, ЯКАЯ ХАВАЛАСЯ Ў СЯМ'І ШЧАРБІНСКІХ З ВЁСКІ КАМЕНКА

Дарагая Ентка!

Маці нарадзіла дзяўчынку, назвалі яе Хася, ёй толькі адзін тыдзень. Калі атрымаю ад цябе яшчэ запіску, напішу больш.

Я дасылаю табе срэбра, але не ўсё.

Рэчы, якія знаходзіліся ў Грышкі і Стася, яны не вярнулі. Мы, дзякуй Богу, здаровыя. Жыві здаровай і шчаслівай.

Мотка і Ханке перадаюць прывітанне, яны таксама ў гета. Ежы нам хапае, ёсць добрыя людзі.

Хаім і Шлосберг знаходзяцца ў Матыльке.

Прывітанне ад усіх.

*Твой бацька Рафаіл Фішэр.*

Фонды Браслаўскага гістарычна-краязнаўчага музея.
Пераклад з рускай мовы.

*Гэты ліст быў перададзены ў сакавіку 1943 г. з гета за некалькі дзён да яго знішчэння.

## З ЛІСТА ЖЫХАРКІ ВЁСКІ ДАЎЯТЫ С. С. КАПУСТЫ ДЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ІНСТЫТУТА КАТАСТРОФЫ І ГЕРАІЗМУ Ў ІЕРУСАЛІМЕ

...Побач з нашай вёскай Даўяты размясцілася вёска Кіслаўшчына, дзе да 21 чэрвеня 1941 года пражывала 16 яўрэйскіх сем'яў. Жылі дружна. Дапамагалі адзін аднаму. Яўрэі былі добрымі рамеснікамі. Наша сям'я складалася з чатырох чалавек: я, мой муж Канстанцін 1911 года нараджэння, маці мужа Насця і старэйшы брат мужа Ягор.

Першыя арышты яўрэяў немцы пачалі восенню 1941 года ў мястэчку Іоды, якое знаходзілася ў пяці кіламетрах ад нас. Мы ўсе былі ашаломлены жорсткасцю немцаў і іх мясцовых прыслужнікаў. Апошнія выдавалі яўрэяў за пуд солі ці проста так. Наша сям'я вырашыла дапамагаць сваім суседзям, выратаваць іх любой цаной. У нашым хляве, дзе знаходзілася сена, зрабілі шалаш, у якім і хаваліся суседзі-яўрэі. Зіма была вельмі суровай, мароз даходзіў да 40 градусаў. Мы далі ім цёплую вопратку, кармілі, дзяліліся апошнім кавалкам хлеба, якога і самім іншы раз не хапала. Ноччу яны прыходзілі да нас у хату, прыводзілі з сабой такіх жа абяздоленых сваякоў. Іншы раз іх збіралася да 12 чалавек.

Немцы рабілі аблавы, вобыскі. Побач з нашым домам жыў паліцай Жук. Ён падазраваў, што ў нас могуць хавацца гэтыя бедныя, загнаныя, ні ў чым не вінаватыя людзі. Месца ўкрыцця таму пастаянна мянялі: то ў хляве, то ў яме для зімовага захоўвання бульбы, то ў выкапаных намі траншэях, замаскіраваных дрэвамі і галінкамі.

...Калі ў лясах паблізу ад нашых мясцін арганізаваўся партызанскі атрад, дарослыя яўрэі падаліся да партызанаў, а ў нас засталася адна 12-гадовая Маша Рукшына. На Вялікдзень у вёску зноў прыехалі карнікі. Мой муж Канстанцін узяў кажух, прадукты, сякеру і пад выглядам, што сабраўся ў лес па дровы, рушыў з Машай у яр, які парос хмызняком. Там ён схаваў Машу ў шалашы. Дзяўчынка прасядзела ў ім трое сутак. А калі немцы паехалі, мы забралі Машу да сябе дамоў.

Але хаваць дзяўчынку было ўсё цяжэй, бо баяліся паліцая Жука. Мы выклікалі ў яго ўсё большую падазронасць. Давялося пераправіць яе ў другую вёску — Падгайцы. Аднойчы яе праз вакно ўбачыла дачка паліцая. Машы давялося ўцякаць, маскіруючыся сярод сялян, якія садзілі ў полі бульбу. Яе шукалі, але не заўважылі сярод жанчын. Потым дзяўчынка падалася ў хмызняк, там дачакалася ночы, акружнымі дарогамі, хаваючыся, дабралася да вёскі Даўяты, дзе ў полі сустрэла брата майго мужа Ягора — ён пасвіў коней. Паплакалі ўдвух: дзе Машаньку схаваць? І схаваў яе Ягор пад снапамі саломы ўжо ў пустым хляве. Накарміў. Раніцай бабка Насця напаіла цёплым малаком. Хавацца ў нас было небяспечна і Машу пераправілі да бацькі ў партызанскі атрад.

Усё ж немцы не даравалі, спалілі Кіслаўшчыну, Даўяты, іншыя блізляжачыя вёскі. Жыхары пайшлі ў лясы, там і жылі да канца вайны. Пасля вызвалення на папялішчах былых вёсак у зямлянках зноў адраджалася жыццё. А залечваць раны вайны было вельмі цяжка, загінуў жа кожны чацвёрты жыхар Беларусі. У 1945 годзе загінуў і мой муж Канстанцін.

Пастаянна падвяргаючыся небяспецы быць жывымі спаленымі, мы ўсё ж з чалавечага жалю і спагады дапамагалі выжыць у той нялёгкі час яўрэям: Рукшыну Янкелю і яго дачцэ Машы, Рукшыну Сролю і Рукшыну Алтору...

*З павагай Саламея Капуста.*

«Браслаўская звязда». 1993. 8 мая.

## З успамінаў Галіны Іванаўны Кірылавай

...Гета ў Друі немцы стварылі не адразу. Прыблізна з год яўрэі жылі па-ранейшаму ў сваіх хатах, толькі абавязкова павінны былі насіць на адзенні жоўтыя нашыўкі з літарай «і». Пад прымусам іх ганялі на розныя работы, часцей на чыгуначную станцыю. Немцы рабавалі яўрэйскае насельніцтва і адкрыта, і шляхам вымагання прыхаваных каштоўнасцей — прымушалі плаціць за жыццё. Нейк адзін са знаёмых яўрэяў сумна пажартаваў, што жыць застаецца няшмат, бо ўжо ўсе каштоўнасці выманілі. У канцы 1942 г. было створана гета. Для яўрэяў адвялі частку Друі, якая прымыкала да правага берага р. Друйкі ў раёне сінагогі. Гета, здаецца, ніхто не агарожваў, яго жахарам проста забаранялася з'яўляцца ў іншых месцах Друі. Яўрэі выконвалі гэты загад, бо за парушэнне маглі паплаціцца жыццём.



Месца растрэлу жыхароў гета ў г. п. Друя.

Аднойчы, недзе ў чэрвені 1943 г., уначы, мы пачулі роў машын, якія бліскаючы фарамі праехалі міма хаты. Машыны былі вялізныя, чорныя, з эсэсаўскімі знакамі на кузавах. Як раз у гэты момант каля нашай хаты знаходзіўся знаёмы яўрэй Афраім, які прабраўся з гета, каб здабыць чаго паесці. Бацькі сказалі, каб Афраім хутчэй уцякаў.

Праз некалькі хвілін мы пачулі з боку гета страляніну. Калі пачало віднець, над гета ўзняліся клубы чорнага дыму. Казалі, што многія яўрэі самі падпальвалі хаты, каб мець магчымасць уцячы. Днём паліцаі і эсасаўцы сталі прачэсваць мястэчка. Зайшлі і ў нашу хату. Спыталі ў бацькі, ці ёсць хто староннi ў хаце, хлявах. Пахадзілі, праверылі ўсюды і пайшлі. Праз некалькі дзён, калі ўсё сціхла, з гарышча спусціўся Афраім. Аказваецца ў тую ноч ён не пабег да гета, а забраўся на хату і схаваўся ў старых рэчах. Пражыў Афраім каля году, пасля яго нехта выдаў немцам. З гета выратавалася ўсяго некалькі чалавек. Адзін з іх — Аўсей Тойц. Ён быў паранены ў нагу, змог забрацца ў нейкую яму і перачакаць самае страшнее. Пазней хаваўся ў людзей, якія дапамаглі знайсці партызан. У партызанскім лагеры яму ампуціравалі нагу. Пасля вайны Тойц жыў у Друі.

Пры ліквідацыі гета загінула друйская сінагога — прадмет гордасці яўрэйскай абшчыны. Тут мелася багатая бібліятэка. Славіўся прагыжосцю драўляны разны алтар, аб якім казалі, што падобных у Еўропе толькі два. Сінагога загарэлася разам з дамамі, а пасля вайны разабралі муры на цэглу для печак.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

### З успамінаў Монікі Сцяпанаўны Бездзель

Да вайны Іказнь лічылася мястэчкам Перабродскай гміны. Хаты былі не так раскіданы як цяпер, а шчыльна адна за адной туліліся паміж касцёлам і царквой. У самым цэнтры жыло шмат яўрэяў. Большасць з іх займалася рамяством, некаторыя, як Самавар, Капман трымалі невялікія крамы. Калі прыйшлі немцы, то частку мясцовых яўрэяў адправілі ў Браслаў. Адтуль ніхто не вярнуўся. Некаторых пастралялі ў Іказні. Каля паўднёвай ускраіны мястэчка была мясцовасць Жвіркі, там людзі капалі ямы пад бульбу. У Жвірках немцы расстралялі 17 чалавек. Спачатку іх сагналі ў адно месца, пад краму Самавара, сталі жорстка збіваць палкамі. Амаль беспрытомных пасля гэтага расстралялі. Усіх іказненскіх яўрэяў знішчылі немцы, а Шнейдэра з жонкай нехта мясцовы забіў дзеля золата.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## Жыхары Браслаўшчыны яўрэйскай нацыянальнасці, расстраляныя фашыстамі

**ГОРАД БРАСЛАЎ**

**АБРАМСАН Бэрл, Берта,** дзеці **Бунче, Касрыэл-Шмуль.**

**АБРАМСАН Хаім-Лейб,** жонка, дзеці.

**АБРАМСАН Мэндэль і Юдзіт,** двое дзяцей.

**АБРАМСАН Шлома-Зальман** і **Рахель,** трое дзяцей.

**АВІРБАХ Бахрух і Сара.**

**АРОН Міна.**

**АРОН Соня.**

**АРОН Шнэер і Двойра.**

**АРАНОВІЧ Хая-Лея, Райкка, Блюма.**

**АРАНОВІЧ Ісраел і Соня, Лея, Абраша, Фалке.**

**АРАНОВІЧ Слава-Хая.**

**АРОНЧЫК Бецалгэл і Мэры.**

**АРЛЮК Алтэр** і **Хая, Уры, Натан.**

**АРКЛІС Нахум** і **Голда,** чацвёра дзяцей.

**АРКЛІС Рэйза.**

**АТЛАС Нахум,** жонка, дзеці.

**АЛЕКСАНДРОВІЧ** муж, жонка, трое дзяцей.

**АМДУР Эфраім.**

**АМДУР Хася.**

**АМДУР Якаў і Хая, Ханох, Ашэр, Хана, Зелда.**

**БАГАМОЛЬСКІ Зэрах і Хася-Рахэль, Сара-Лея.**

**БАСЕЛЬ Ліза, Хаім-Ошар, Шэнсель.**

**БАСНЕР Ліба-Дзіна, Іцхак.**

**БАЛОНАЎ Давід і Хана,** дзіця.

**БАЛОНАЎ Іосіф і Алта.**

**БАЛОНАЎ Манчык і Бейла, Іосіф, Мэндл.**

**БАЛОНАЎ Шалом і Ліба-Шэйна,** дзіця.

**БАГАМОЛЬСКІ Зерах і Хася-Рахель, Сара-Лея.**

**БАНК Абрам-Лейб і Хана-Хая, Шахна, Іошуа.**

**БАНК Аба,** жонка, **Алта.**

**БАНК Алтэр,** жонка, **Хаім-Наах, Хая, Мотля.**

**БАНК Залман-Эля** і **Голда-Дзіна.**

**БАНК Хая.**

**БАНК Хаім-Бер і Сара,** дзіця.

**БАНК Хлойні і тамар, Шэпсл.**

**БАНК Якаў і Бэйля,** дачка.

**БАНК Касрыэль і Люба, Рахель, Ісраэль, Міла.**

**БАНК Можа** і **Фрадл, Малка** і двое дзяцей.

**БАНК Моша-Барух іі Двойра, Іосіф.**

**БАК Барух і Міна, Зелда, Бейля.**

**БАК — бацька Баруха.**

**БАР Барыс і Слава, Цыўя,** двое дзяцей.

**БАРОН Зуся** і **Рахель, Гелда, Хана.**

**БАРОН Мендл** і **Матля, Якаў, Арэн-Іоах, Міхля, Лейзер.**

**БАРМАПАЎ Лейб-Меір** і **Двойра, Рыўка, Эстэр, Сімха, Блюма.**

**БАРМАПАЎ Моші** і **Сара-Лея,** двое дзяцей.

**БЕЙЛІН Бінямін** і **Добра, Лея, Сімха, Муля, Фрума, Мэра, Года.**

**БЕЛЯК Абрам і Рая, Вэлвл, Іта** і яшчэ дзіця.

**БЯЛЯК Іца-Перац і Эстэр.**

**БЕЛЯК Давід, Мошэ, Рахель, Тайба.**

**БЕЛЯК Давід-Шлома і Сіма-Двойра, Мошэ, Рахель, Тайба.**

**БЕЛЯК Зісля.**

**БЕЛЯК Хана і Хава, Іцэ-Шымшон, Хая-Шэйна, Двора, Тэўе, Нота.**

**БЕЛЯК Хонця, Тэўя.**

**БЕЛЯК Хая-Лея, Велвл.**

**БЕЛЯК Іосл і Цыпа, Бэйля, Соцка, Двойра.**

**БЕЛЯК Мэір-Іосіп і Бацья, Лейзер.**

**БЕЛЯК Натан і Геня-Рыва, Тэўе, Ліва, Шэйна, Сара-Гіта.**

**БЕЛЯК Соня, Хаім-Мэір** і двое дзяцей.

**БЕЛЯК Кэля-Малка, Натан, Гіта, Хаім-Лейб, Хана-Фейга.**

**БЕЛЯК Сімха.**

**БЕЛЯК Шымон і Лея, Велвл, Іта.**

**БЕЛЯК Шнэер,** жонка, двое дзяцей.

**БЕЛЯК Шыфра, Якаў.**

**БЕРГАЗІН Шымон, Цыля, Фаня, Куба.**

**БЕРМАН Лейб.**

**БЕРМАН Мошэ і Бацья.**

**БІМБАТ Лейб і Двойра,** дзве дачкі.

**БІЧУН Ідэль і Бацья, Сэндэр.**

**БІЧУН Хаім-Іцхак і Хана-Рахель, Хясе-Лея, Міхал, Мошэ-Ханок.**

**БІЧУН Касрэ-Лейб,** жонка, двое дзяцей.

**БІЧУН Мошэ-Ханок,** жонка, двое дзяцей.

**БЛЯХЕР Хаім-Рувен і Муся-Лея, Шахна, Давід.**

**БЛЯХЕР Іцхак і Бацья, Блюма.**

**БЛЯХЕР Мошэ-Аківа і Злата,** трое дзяцей.

**БЫК Іосеф і Соня, Натан, Лейб** і яшчэ тры сыны.

**БЫК Рахміэл і Маня, Цыля, Перл.**

**БЫК Мошэ-Гігел.**

**БЫК Фейге.**

**БЫК Абраша.**

**ВАЙНШТЭЙН Іта.**

**ВАЙНШТЭЙН Гіта, Шмар'я.**

**ВАЙНШТЭЙН Гірш і Добра.**

**ВАЙНШТЭЙН Генох і Хая, Хаім-Эля.**

**ВАЙНШТЭЙН Іосіф і Геня,** трое дзяцей.

**ВАЙНШТЭЙН Якаў і Гнеся, Рувен** і яшчэ адзін сын.

**ВАЙНШТЭЙН Леві-Іцхак і Мерл, Шэел.**
**ВАЙНШТЭЙН Лейб і Гнеся**, два сыны.
**ВАЙНШТЭЙН Нахум і Хася, Злата, Люба, Хаім.**
**ВАЙНШТЭЙН Рыва-Дзіна.**
**ВАЙНШТЭЙН Рэйза-Мотля.**
**ВАЙНШТЭЙН Шмэрл.**
**ВАЙС Хая-Гітл** і хлопчык.
**ВЕЙФ Берл**, жонка, сын.
**ВЕЙФ Хася.**
**ВЕЙФ Матус і Хая-Цэя, Зорах, Бенцыон, Аба, Рыўка, Шылен, Мотля, Сара-мерл.**
**ВЕЙФ Фега, Мошэ.**
**ВІДРОВІЧ Шымон і Хана, Рыша, Гнеся.**
**ВІДРОВІЧ** — брат **Шымона**
**ВІНАКУР Хацкл.**
**ВІНАКУР Рашл.**
**ВІШКІН Туўя і Сара-Лея, Іосіф, Нехама, Хаім.**
**ВОДЗІН ЭТЛ, Гірш.**
**ВОЛІН Лейб і Двойра, Хана-Іта, Рыўка, Муля.**
**ВОЛІН Мардэхай**, жонка, дзеці.
**ВОЛІН Файвуш і Элька, Песах, Мошэ, Лейзер, Шэйнэ-Хая.**
**ВОЛІН Раві, Цві-Гірш і Сара-Гінда, Бцапел.**
? **Ісраэл**, брат **Ханы Відровіч.**
**ГАМАРОЎ Залман і Хася**, двое дзяцей.
**ГАМАРОЎ Фалэ і Іта, Залман** і яшчэ двое дзяцей.
**ГАМУШ Лейб, Песя.**
**ГАРДОН Бэр.**
**ГАРБЕР Якаў** і **Фейга, Нахама, Мотля.**
**ГАРБЕР Іцхак** і **Сара-Рыўка**, дзіця.
**ГАРБЕР Рэйза**, дзеці.
**ГАРБЕР Шэеп і Сара-Рыўка**, двое дзяцей.
**ГЕЛІШКОЎСКІ Эма, Абрам, Ета.**
**ГЕНДЛЕР Шымон** і **Сара-Рахель, Матус.**
**ГІНДЛІН Гершон** і **Сара-Песя, Шмуэль, Лея, Лелька.**
**ГІНДЛІН Іцхак**, жонка, **Борух-Іона, Моша, Цыпа, Лейб, Бунька.**
**ГІНЗБУРГ Зорах**, жонка, **Рая.**
**ГІНЗБУРГ Тув'е, Зельда**, трое дзяцей.
**ГЛАС Лейзер і Фейла, Якаў, Бэйніш, Фрэйда.**
**ГЛЕЗЕР Якаў** і **Маша, Абрам-Іцэ, Вэлвл.**
**ГОЛЬДЗІН Абрам-Іосл** і **Рыва-Дзіна.**
**ГОЛЬДЗІН Блюма.**
**ГОЛЬДЗІН Хона**, жонка і трое дзяцей.
**ГОЛЬДЗІН Лейбі і Блюма, Берл, Міхля, Натан, Уры, Залман-Эля.**
**ГОЛЬДЗІН Лейб** і **Хая-Іта, Двойра.**
**ГОЛЬДЗІН Мошi** і **Сара, Іда, Мэір, Лейб** і яшчэ дзіця.
**ГОЛЬДМАН Гірш**, жонка, **Абрам** і яшчэ дзіця.
**ГОЛЬДМАН Мотл**, жонка, **Абрам** і яшчэ дзіця.
**ГОЛЬДЭНЕКІ Шымон і Сіма, Ілья, Давід.**
**ГОЛЦ Перец і Гіта, Ціўя, Голда, Рая, Лея.**
**ГРАВІЦ Давід і Тайба.**
**ГРЫНБОЙМ Гершл, Мінка**, хлопчык.
**ГРЫНШТЭЙН Нахум**, жонка, **Ілья, Хана.**
**ГРЫНШТЭЙН Шалом**, жонка, двое дзяцей.
**ГРЫНШПАН Вэлвл**, жонка, **Якаў, Тув'я** і яшчэ двое дзяцей.
**ГУРЭВІЧ Іцл-Мэір.**
**ГУРЭВІЧ Хая.**
**ГУРЭВІЧ Якаў і Хая, Мэір**, яшчэ двое дзяцей.
**ГУРЭВІЧ Нахман-Хаім і Зісля, Мэндл, Мэір, Хана, Ліба.**
**ГУТКІН Хаім і Рахель-Лея, Рэйза, Гіта, Якаў.**
**ГЭБЕЛЬМАН Шалом**, жонка, **Нехама, Вэлвл.**
**ГЭБЕЛЬМАН** — бацька **Шалома.**
**ГЭНС Абрам, Эстэр-Ліба, Сара** і яшчэ дзве дачкі.
**ГЭНС Бенцыон і Хая**, двое дзяцей.
**ГЭНС Злата.**
**ГЭНС Хонаі і Фрума**, двое дзяцей.
**ГЭНС Хаім і Райхка**, дачка.
**ГЭНС Мошэ і Цыпа**, чацвёра дзяцей.
**ГЭНС Шлома-Залман і Хана.**
**ГЭНС Сара**, чацвёра дзяцей.
**ДАВІДОВІЧ Шнеер і Рахель, Віта.**
**ДАГОВІЧ Абрам і Нехама-Рэйзл, Лейб, Шымон, Эстэр.**
**ДОБКІН**, жонка, дзіця.
**ДОБКІН Хая, Хана.**
**ДРАГОВІЧ Бцалэль-Якаў і Рахель, Доба, Хона-Зіса**, яшчэ дзіця.
**ДРАГОВІЧ Дзіна.**
**ДРАГОВІЧ Мошэ і Іда, Монік, Давід.**
**ДРАГОВІЧ Мошэ-Эле**, жонка, **Гірш** і яшчэ дзіця.
**ДРАГОВІЧ Шмуэль і Цыўя, Бац'я.**
**ДРАГОВІЧ Шмерл**, жонка.
**ДЫМАНШТЭЙН Аба і Бацья, Мерка, Муля.**
**ДЭЙЧ Аба і Хая, Шіпел.**
**ДЭЙЧ Абрам-Іцэ** і жонка, **Фоле.**
**ДЭЙЧ Аншэл, Гірш.**
**ДЭЙЧ Бела**, трое дзяцей.
**ДЭЙЧ Гірша**, жонка, дзіця.
**ДЭЙЧ Велвл і Міра, Брайна, Мендл, Мілка, Сара.**
**ДЭЙЧ Велвл** і жонка, двое дзяцей.
**ДЭЙЧ Зіса і Фрадл, Бат-Шэва, Хая-Брайна.**
**ДЭЙЧ Хона.**
**ДЭЙЧ Хаім-Касрэ і Мір'ям, Фрэйда** і яшчэ дзіця.

**ДЭЙЧ Хлойна і Тайба**, дзеці.
**ДЭЙЧ Іосіф-Мендл і Гінда, Рыўка, Матус, Залман, Голда, Перл.**
**ДЭЙЧ Яакаў і Гута**, двое дзяцей.
**ДЭЙЧ Рахміел.**
**ДЭЙЧ Ісраел-Шабтай і Сара-Хая-Эстэр, Рэўвен.**
**ДЭЙЧ Касрыэл** і жонка, **Хона.**
**ДЭЙЧ Леві і Гута**, двое дзяцей.
**ДЭЙЧ Мотл і Соня, Зелда, Хана, Ісраэл-Бер.**
**ДЭЙЧ Малка-Рэйза, Зорах.**
**ДЭЙЧ Мендл і Фаня, Давід, Гірш.**
**ДЭЙЧ Слава.**
**ДЭЙЧ Фрадл, Бейля.**
**ДЭЙЧ Шая** і жонка.
**ДЭЙЧ Шымон** і жонка, **Зелда** і яшчэ дзіця.
**ЖАРЖЭЎСКІ Аўрам-Жэір і Раша, Давід** і яшчэ двое дзяцей.
**ЖАРЖЭЎСКІ Эфраім і Рахель**, трое дзяцей.
**ЖАРЖЭЎСКІ Іосіф і Рахель, Мошэ.**
**ЗАГОР'Е рабі Абрам-Аба, Якаў і Рахель.**
**ЗАГОР'Е Лейзер-Іцэ.**
**ЗАГОР'Е Мендл.**
**ЗЕЙФ Арон і Мера.**
**ЗЕЙФ Бер.**
**ЗЕЙФ Залман-Эле**, дзве дачкі.
**ЗЕЙФ Хаім-Аба і Хася, Нафталі.**
**ЗЕЙФ Хаім-Ісраел**, жонка і дзеці.
**ЗЕЙФ Іосл і Рыва, Мендр** і яшчэ двое дзяцей.
**ЗЕЙФ Ісраэл і Цырл.**
**ЗЕЙФ Лейб і Роза, Іця, Соня Іехіл** і яшчэ сын.
**ЗЕЙФ Мошэ-Аншэл і Ліфша, Залман, Фейга, Соня.**
**ЗІЛЬБЕР Іцэ-Якаў і Доба, Мошэ-Лейб, Хая-Эла** і яшчэ трое дзяцей.
**ЗІЛЬБЕР Борух** і жонка.
**ЗІЛЬБЕР**, сын **Боруха**, жонка і дзеці.
**ЗАХАРАЎ Шлема і Міна, Гута, Меір.**
**ЗАК Велвл і Шэйна, Эфраім, Бася, Фая.**
**ЗАКС Цыля, Аўром-Залман, Песя-Двойра, Лейб, Эстэр.**
**ЗЕЛІКМАН Рыўка** і хлопчык.
**ЗІЛЬБЕР Залма і Хая-Двома.**
**ЗІЛЬБЕР Іошуа і Геня**, двое дзяцей.
**ЗІЛЬБЕР Іосіф.**
**ЗІЛЬБЕР Ірмягу і Элька-Міра, Міна, Бер, Мошэ, Генох, Шмерл.**
**ЗІЛЬБЕР Меір**, двое дзяцей.
**ЗІЛЬБЕР Рувен і Егудзіт, Люба, Мошэ, Давід.**
**ЗІЛЬБЕР Шоймэ** (рэзчык), **Сара-Лея, Люба, Блюма, Гірш.**
**ЗІЛЬБЕРМАН Борух і Хая.**
**ЗІЛЬБЕРМАН Нісан і Элька, Герош.**
**ЗЛАТАКРЫЛ Меір і Фрума, Герц, Якаў, Соня.**
**ЗУБОВІЧ Іцхак і Фрыда**, двое дзяцей.
**ЗУБОВІЧ Нахман і Соня**, двое дзяцей.
**ЮФЕ Велвл.**
**КАГАН Ісраэль, Залман-Іцхок.**
**КАГАН Цыля, Хася** і яшчэ дзіця.
**КАНТОР Давід і Сара-Элка, Якаў, Перл.**
**КАНТОР Рахель.**
**КАНЕЎСКІ Рувен і Рыўка**, дзіця.
**КАНФЕР Екусіэль і Сара, Муля, Абраша** і яшчэ дзіця.
**КАПЛАН Гірш** і **Лея, Абраша.**
**КАПЛАН Велвл.**
**КАПЛАН Велвл і Ліба.**
**КАПЛАН Ірма і Ліба**, двое дзяцей.
**КАПЛАН Эзра і Перл**, двое дзяцей.
**КАРАСЬ Барыс і Хая-Сара, Цыпа, Эстэр, Якаў.**
**КАРАСІН Даніэль.**
**КАСТРЭЛЬ Якаў і Зісла, Маша, Зеліг, Лея**, і яшчэ дзіця.
**КАСТРЭЛЬ Леві-Іцхак і Сара-Лея.**
**КАЦ Аба**, жонка, дзеці.
**КАЦ Эстэр.**
**КАЦ ЗАЛМАН.**
**КАЦ Якаў** і жонка.
**КАЦ Мендл і Рыва.**
**КАЦ Сара-Лея.**
**КОБЛЕНЕЦ Іоўша.**
**КОБЛЕНЕЦ Лейб і Люба**, дзіця.
**КОРБЕЛЬ Мошэ і Хася, Якаў, Гірш.**
**КОРТ Злата** і муж, **Шалом-Сендэр** і яшчэ чацвёра дзяцей.
**КОРТ Іцхак і Малка, Рафаэл, Хаім.**
**КОРТ Ісраель і Матля.**
**КОРТ Меіль і Фаня**, дзіця.
**КОРТ Міна** і муж, **Рута** і яшчэ дзіця.
**КОРТ Шнэер і Хана, Мотл** і яшчэ дзіця.
**КОЎНАТ Залман і Рахель, Мошэ, Хаім-Эле.**
**КОЎНАТ Мэндэль і Гіта, Дзіна, Сіма.**
**КОЦІН Хаім-Іцхак і Шэйна, Вэлвл.**
**КРАЎТ Лейб і Шуля**, дзіця.
**КРАВЕЦ Хлойна, Муля** і яшчэ дзіця.
**КРАВЕЦ Лейзел і Браха, Юдзіт** і яшчэ дзіця.
**КУНІН Хая-Гітл.**
**КУНІН Пінхас** і жонка, **Абраша, Лея.**
**КУНІН Рахніэл-Іцэ, Мэры, Фрэйда.**
**КУФКІН Эліскім і Малка**, трое дзяцей.
**КУФКІН Шымон і Люба**, дзіця.
**ЛЕВІН Влюжа.**
**ЛЕВІН Гірш і Рыўка, Лейб Доба-Злата.**
**ЛЕВІН Велвл і Лея**, двое дзяцей.
**ЛЕВІН** бацька **Велвла.**

**ЛЕВІН Велвл і Рейза.**
**ЛЕВІН Хая-Шэйна, Цыпа.**
**ЛЕВІН Хая-Сара.**
**ЛЕВІН Хаім і Бацья, Цыўя** і яшчэ дзіця.
**ЛЕВІН іошуа і Іска, Малка.**
**ЛЕВІН Ісраел і Хася, Сіма.**
**ЛЕВІН Мешэ** і жонка.
**ЛЕВІН Мешэ-Ліпа і Сіма-Ента, Іюда, Рахель, Фейга, Мінка, Ліпа.**
**ЛЕВІН Перац і Нета, Лейб.**
**ЛЕВІН Рахел-Дзіта, Інрухам.**
**ЛЕЎРАТАЎ Лева і Клара, Ізя, Вова.**
**ЛІН Мошэ-Хона.**
**ЛІН Рувен і Тайба, Соня.**
**ЛІФ ЗАЛМАН.**
**ЛІФ Якаў-Гірш і Гінда, Хаім, Мошэ, Міна-Рашэ, Бенця.**
**ЛІФ Шалом-Рувен і Тамар, Фея, Хаім-Фейвуш,** двое дзяцей.
**ЛОЦ Герц і Злата, Муля, Сіма.**
**ЛОЦ Іцхак і Слава, Рэйзе.**
**ЛЮБОВІЧ Авром і Хая.**
**ЛЮБОВІЧ Мошэ (сын Ханы і Зусмана).**
**МАГАТ Іосіф і Лена, Ната** і яшчэ дзіця.
**МАГАТ Іцхак**, жонка і дзеці.
**МАЗО Эліэзер і Люба**, дзіця.
**МАЛЕР Лейб і Злата-Хава.**
**МАЛЕР Фрэйда, Лена, Песя.**
**МАЛЕР Калман.**
**МАРГОЛІС Хая-Ента, Хана.**
**МАРОН Беле-Эстер.**
**МАРОН Гірш і Бацья, Сара.**
**МАРОН Зуся і Рахель, Голда** і яшчэ дзіця.
**МАРОН Хаім і Брайнэ-Малка, Соня, Люсік, Абраша, Мешэ, Рахель, Эця.**
**МАРОН Хаім-Айзік і Соф'я, Муля.**
**МАРОН Іосіф-Іцхак і Соня.**
**МАРОН Якаў.**
**МАРОН Якаў і Хана.**
**МАРОН Ісраель і Сара,** трое дзяцей.
**МАРОН Лейб і Хана,** двое дзяцей.
**МАРОН Шэйна.**
**МЕНСЕНГІСЕР Велвл.**
**МЕНСЕНГІСЕР Пескх.**
**МІЛЮЦІНА Эця, Сара.**
**МІЛЮЦІН Бер-Лейб і Соня, Хацкл, Міна-Раша.**
**МІЛЮЦІН Ісраэл.**
**МІЛЮЦІНА Серл, Сіма.**
**МІЛЮЦІНА Рыва, Хаім, Арке, Рахель, Абраша.**
**МІЛАШЭВІЧ Этл.**
**МІНДЭЛЬ Іцхак** і жонка, трое дзяцей.
**МІРМАН Эле-Ноен і Дзіта, Ханс, Хая-Мера.**
**МІРМАН Велвл, Іця, Хана.**
**МОДЛІН Давід і Соня, Хана, Муля.**
**МУЦІН Эле-Арон і Цыўя, Соня, Іехіэль, Шмуэль-Загман, Ісэр, Фейга.**
**МУНІЦ Эфраім і Муся, Абраша, Аба, Хая, Муля.**
**МУНІЦ Барух.**
**МУНІЦ Герц і Геся, Абраша.**
**МУНІЦ Велвл і Бейла, Касрыел-Хонэ, Цыпа.**
**МУНІЦ Велвл** і жонка, сын.
**МУНІЦ Залман і Года, Рувен.**
**МУНІЦ Хая, Дора.**
**МУНІЦ Хаім і Ася, Рафаіл.**
**МУНІЦ Хана.**
**МУНІЦ Іекусіель і Хана, Міра, Авром.**
**МУНІК Лейві-Іцхак і Рахель, Эця, Фейга, Шэйна.**
**МУНІЦ Лейб.**
**МУНІЦ Матус і Лея,** двое дзяцей.
**МУНІЦ Міхвел-Якаў і Рыва-Дзіна.**
**МУНІЦ Сіма-Хая.**
**МУНІЦ Шмуэл-Якаў і Эйдл, Хана, Эліягу, Бацця, Хаім-Ноях.**
**МУНІЦ Якаў.**
**НЕДВЯЛОВІЧ рабі Элізер-Егуда і Брайна,** дзеці.
**ПРЭСМАН Люба**; муж, дзеці.
**ПЭР Велвл**, жонка, дзеці.
**ПЭР Хоне-Давід** і жонка, **Мошэ-Лейб.**
**ПЭР Хацкл, Дзіна.**
**ПЭР Якаў і Рыўка**, чацвёра дзяцей.
**ПЭР Фрадл.** двое дзяцей.
**ПЯРЛОЎ Доба, Рувен.**
**РАБІНОВІЧ Залман: і Хета**, дзіця.
**РАБІНОВІЧ Леві-Іцхак і Роза, Соня, Фейга.**
**РАБІНОВІЧ Шлемо і Гіта.**
**РАБІНОВІЧ Шэпсель і Двойра, Алтэр, Соня, Сіма, Маша, Тайба.**
**РАЙХЕЛЬ Гіта.**
**РАЙХЕЛЬ Гершон і Х'ена.**
**РАЙХЕЛЬ Хаім-Ісраель і Бацья, Сара, Нахман, Велвл, Залк, Фейга, Блюма, Мошэ, Іошуа.**
**РАЙХЕЛЬ Іосіф.**
**РАЙХЕЛЬ Якаў і Бацья, Двойра, Эстэр, Міна.**
**РАЙХЕЛЬ Меір і Фейга, Хаім-Давід.**
**РАЙХЕЛЬ Мендэл, Бэр.**
**РАЙХЕЛЬ Шнэер і Хася**, дзіця.
**РАПАПОРТ Хона-Наах**, жонка, дзеці.
**РУКШЫН Фішэл і Хая.**
**РУСОНІК Нехама, Ідэл, Іта.**
**РЫБАШ Залман**, сын.
**РЫЦ Ісраел і Бацья, Мера, Ідл, Мацья**, і яшчэ двое дзяцей.
**САЛАВЕЙЧЫК Хаім і Кейля, Мошэ** і яшчэ двое дзяцей.
**САФРАН-ФУКЕ рабі Алтэр з Даўгаўпілса.**
**СЕГАЛЬ Рувен і Сара, Люся.**

**СІНГАЛОЎСКІ Арон-Зеліг і Эстір, Гута, Бені, Шлома, Якаў.**

**СКАПЕЦ Герц і Іда, Роза, Гірш, Хайка.**

**СКАПЕЦ Фейга** і муж.

**СКУЦЕЛЬСКІ Рувен і Хана.**

**СЛАВІН Іосеф і Гіта, Рэйза, Песя.**

**СМУШКОВІЧ Аба і Эстэр.**

**СМУШКОВІЧ Іегуда-Мошэ.**

**СМУШКОВІЧ Іошуа і Эстэр, Шэйна.**

**СМУШКОВІЧ Шымон**, жонка, двое дзяцей.

**СТАЎСКІ Хая, Ўстэр, Мошэ, Рэлька.**

**СТОЛ Сімхе-Герц і Таня, Гірш, Рахель, Соня, Люба.**

**СТОЛ Шымон** і жонка.

**ТВАРЭЦКІ Аба-Фішл** і жонка, **Ліба, Іцхак, Лютка.**

**ТВАРЭЦКІ Лейб і Песя-Рахель, Бэр, Муля, Даніэль, Фейта, Хана.**

**ТВАРЭЦКАЯ** (маці).

**ТОДЭР Меір і Серл**, чацвёра дзяцей.

**ТОДРЭС Хаім і Сара-Рыўка, Шлома, Хана.**

**ТОС Хона і Ўстэр, Іцхак** і яшчэ трое дзяцей.

**УЛЬМАН Абраша і Ліба**, дзіця.

**УЛЬМАН Элі-Гершон і Матля.**

**УЛЬМАН Эліягу і Матля.**

**УЛЬМАН Двойра-Мерл**, дачка **Муся.**

**УЛЬМАН Зеліг і Лея, Хася.**

**УЛЬМАН Залман і Этл, Давід, Іцхак, Тайба.**

**УЛЬМАН Іосіф**, жонка, двое дзяцей.

**УЛЬМАН Лёва.**

**УЛЬМАН Лейб і Люба.**

**УЛЬМАН Муся.**

**УЛЬМАН Мошэ-Аншэл.**

**УЛЬМАН Фрэйда.**

**УЛЬМАН Рыўка.**

**УЛЬМАН Роза, Абрам, Рувен, Давід.**

**УЛЬМАН Шмерл**, жонка, дзеці **Нісан-Бэр, Лейб** і яшчэ сын.

**УСЦЕЎ Шлома і Лея, Давід, Міна** і яшчэ дзіця.

**УСЦЕР Танхум і Соня**, дзіця.

**ФЕЙГІН Бейніш і Эстэр, Мотл, Мошэ, Сіма-Гіта.**

**ФЕЛЬДМАН Даніэль і Сара-Лея.**

**ФЕЛЬДМАН Іошуа і Бацья.**

**ФЕЛЬДМАН Якаў і Фаня**, дзіця.

**ФЕЛЬДМАН Мошэ.**

**ФЕЛЬДМАН Нахум і Нехама, Уры** і яшчэ дзіця.

**ФЕЛЬДМАН Шымон, Элі-Хаім.**

**ФІШЭР Абраша і Тайба**, трое дзяцей.

**ФІШЭР Абрам-Лейб і Песя.**

**ФІШЭР Аерон і Гільда, Давід, Соня.**

**ФІШЭР Іта**, муж, дзеці.

**ФІШЭР Эйда-Кася** (дачушка **Ханы і Тув'і**).

**ФІШЭР Ісер і Сара-Фейга, Ісраел, Рыўка.**

**ФІШЭР Борух і Бела-Зельдэ, Залман-Вольф, Абрам, Гута, Рыўка, Злата.**

**ФІШЭР Берл і Берта, Колька.**

**ФІШЭР Гілел і Черна.**

**ФІШЭР Велвл і Хая, Іцхак.**

**ФІШЭР Велвл і Ліза-Лея, Фрума, Іцхак.**

**ФІШЭР Залман-Янкель, Нафталі.**

**ФІШЭР Хона і Соня, Беря, Аврэмл.**

**ФІШЭР Хая-Шэйна, Фейга-Цыпа, Тэвье, Герман.**

**ФІШЭР Хаім-Бер і Фейга**, двое дзяцей.

**ФІШЕР Іегуда і Цыля, Зеліг, Лейб-Элі.**

**ФІШЭР Іошуа і Этл, Шая, Мэір, Ісраел** і яшчэ трое дзяцей.

**ФІШЭР Іошуа і Геня, Хася, Хацкл, Нафталі, Міра, Рахель.**

**ФІШЭР Іехезкель і Лея, Хайка, Гута, Берл, Люба.**

**ФІШЭР Якаў.**

**ФІШЭР Ісраель і Хая, Дора, Хаім.**

**ФІШЭР Ісраель-Лейб.**

**ФІШЭР Лея, Гута, Хая.**

**ФІШЭР Люба, Соня, Рахель.**

**ФІШЭР Лейзер і Эйдл**, дзіця.

**ФІШЭР Лана.**

**ФІШЭР Меір і Двойра**, двое дзяцей.

**ФІШЭР Мошэ і Люба, Колька.**

**ФІШЭР Нахам і Хая**, двое дзяцей.

**ФІШЭР Файвуш і Хая, Нафталі, Хаім-Гірш, Гутман, Гута.**

**ФІШЭР Рафаэль і Фаня; Якаў, Нафталі, Рыўка, Эстэр, Хася.**

**ФІШЭР Сара-Гіта.**

**ФЛЕЙШМАН Шымон і Шэна-Мірл**, двое дзяцей.

**ФЛЕЙШМАН Шымон**, жонка, двое дзяцей.

**ФРУМІН Гдалья і Лутка, Бацья** і яшчэ дзеці.

**ФРУМІН Хаім**, жонка, трое дзяцей.

**ФРУМІН Ісраел**, жонка, двое дзяцей.

**ФРУМІН Лейзер і Блюма, Мошэ** і яшчэ дзіця.

**ФРУМІН Мендл і Хася.**

**ФРУМІН Нахман і Цыля, Велвл.**

**ФРУМІНА Бейла**, муж, дзеці.

**ФРУМІНА Тося**, муж, дзеці.

**ФРУМІНА Слава** , муж, дзеці.

**ФРЫДМАН Гірш і Гінда.**

**ФРЫДМАН Нюта.**

**ХАРАТ Авром-Борух і Іска, Мошэ, Ісроел.**

**ХАРАТ Іцэ-Копл.**

**ХАРАТ Якаў і Соня-Лея**, двое дзяцей.

**ХАРАТ Лейб і Маша, Мір'ям, Руэвен, Соня, Бер.**

**ХАРАТ Фрэйда-Рахель.**

**ХІДКЕЛЬ Хаім-Айзік і Вольга.**

**ЦАПЯЛЕВІЧ Лібер, Гірш.**

ЦЫНМАН Ісроел і Бацья, Хава.
ЦЫНМАН Райна, дзіця.
ЦЫПІН Папціел.
ЦЫПУК Гітл, Рахель-Бацья, Лея, Голда.
ЦЫПУК Шлома і Эстэр.
ЦЫТРОН Рахель (дачка Іосіфа Разіна-Рагачэўскага).
ШАЙБЕЛЬ Песя.
ШАПІРА Хона.
ШАПІРА Шмуэль і Соня, Сіма.
ШАПІРА Эстэр, Хава, Матля.
ШКОЛЬНІК Велвл і Голда, дзіця.
ШКОЛЬНІК Матус і Рыўка.
ШКОЛЬНІК Пейсах і Гута, двое дзяцей.
ШКОЛЬНІК Пейсах і Матля, Люба, Іосіф.
ШЛЕСБЕРГ Нілель іж жонка, Аба-Зуся і яшчэ трое дзяцей.
ШМІДТ Роза, Хая-Фейга, Соня.
ШНАЙДЭР Гірш і Хая-Мерл.
ШНАЙДЭР Маша, два сыны.
ШНАЙДЭР Рувен і Фрыда, Соня, Іосіф, Худва, Муля.
ШНЭЕР Іосіф.
ШПЕРЛІНГ Міхл-Лейб і Фрума, Моска, Фейга, Двойра, Пінхах, Гіта, Рахель.
ШТЭЙН Аарон і Фаня.
ШТЭЙН Мелах і Рахель, Ханок-Іцак.
ШТЭЙН рабі Мошi і Бейля, дзеці.
ШТЭЙНМАН Эмма, Шая.
Штэйнман Шлома і Лея, Эця і яшчэ двое дзяцей.
ШТЭЙНМАН Шнэер і Рахель-Лея, двое дзяцей.
ШУТАФ Хана.
ШЭНКМАН Малка, Берта.
ШЭЙНЕР Ісеф, Неця, сын.
ШЭЙНЕР Лейб і Фрэйда, Абраша, Ізя.
ШЭРМА Аба і жонка, Ісхіэль, Якаў, Люба.
ШЭРМАН Хайкл.
ШЭРМА Іерахміель і жонка.
ШЭРМА Лейб і Рыўка, Муля, Нехем'я, Зевл.
ШЭРМА Лейб і Рыўка, Шлома, Міхл.
ШЭРМАН Рахель.
ШЭРМАН Рэйза.
ШЭРМАН Сара.
ЭЙДЕЛЬСОН Арон і Нюта, дзіця.
ЭЙДЕЛЬСОН Іцхак і Соня, двое дзяцей.
ЭЙДЭЛЬСОН Касрыел.
ЭЙДЭЛЬСОН Лея.
ЭЙДЕЛЬСОН Лейб, жонка, дзеці Зайдэль, Іошуа.
ЭЙДЕЛЬСОН Лейзер і Соня, Лейб і яшчэ дзіця.
ЭЙДЕЛЬСОН Мендл і Соня.
ЭЙДЕЛЬСОН Эйзер і Софа, Махля, Шэйна, Хаім.
ЭЙДЭЛЬСОН Шауль.
ЭЙДЭЛЬСОН Шлома-Іцхак, Міра, Эстэр, Бацья.
ЭЙНГОРН Аншэл і Дзіна, Іосіф і трое дзяцей.
ЭЙНГОРН Хлойна і Хана.
ЭЙНГОРН Гершон і Хана-Фахель і двое дзяцей.
ЭЙНГОРН Рахміель і Хая.
ЭЙНГОРН Лейб і жонка.
ЭПШТЭЙН жонка, Іцхак, Мэра і яшчэ дзіця.
ЭСТРАЙХ Хаім, і Гута, Зелда, Пэся.
ЭФРОН Шымон і Хана, Хаім, Гірш, Завл.
ЭЦІН Бат-Шэвел, Эйзер.
ЭЦІН Мешэ-Арон і Хана.
ЯКАБСОН Гершон і Дора, Нюся.
ЯНКЕЛЕВІЧ Велвл-Гершон і жонка, дзеці.

## ВЁСКА ЗАМОШША

ГАМАРОЎ Хаім і Шэйна.
ДЭЙЧ Гірш і Эстэр.
ЗАХАРАЎ Лейб і Лідзія, двое дзяцей.
ЗАХАРАЎ Менахем-Мендл, Бат-Шэва і Іосеф.
ПІНЦОВА Эстэр (дачка Соні і Хлойны).
ПІНЦОВА Люба.
ПІНЦОВА Цыўя.
РУКШЫН Голда, Хава.
ШАПІРА Бацья, дзеці, Фейга, Гершон, Ліба, Ента.
ШАПІРА Мэры.
ШАПІРА Цыпа і дзіця.

## ВЁСКА ПЛЮСЫ

БАРКАН Геня, сын Алік.
БАРКАН Гілель і Дзіна, Міна.
БАРКАН Хая.
БАРКАН Мар'яша.
ВІШКІН Лейб і Фейга, Авром-Хона.
ЛЕВІНА Лея, Хая-Сара.
МАРОН Юдэл і Міна, Эстэр.
МІЛЮНЧЫК Генох і Хая-Рыўка, Рохл-Лея, Шмуэл, Шлома, Рэйза, Іошуа, і яшчэ пяцёра дзяцей.
МІЛЮНЧЫК Файвіш і Хана, дзіця.
МОДЛІН Юсеф-Лейб і Шыфра, Абрам, Сара-Рыўка.
ШЛОСБЕРГ Генох і Фрада, чацвёра дзяцей.
ШЛОСБЕРГ Рахел, Маня, Залман, Ноах, Лея, Тайба, Ісроел і яшчэ двое дзяцей.
ЭЙДЭЛЬМАН Іцхак і Лея, Голда, Залман, Рэйза.
ЭСТЭР — дачка Эфраіма.

## ВЁСКА ДУБІНА

АЗБАНД Іосеф і Рахель-Дзіна.
БЛЯХЕР Велвл і Голда, Янкель.
БЛЯХЕР Юдл і Хана-Лея.

**БЛЯХЕР** Ліба, **Рыўка-Мотля.**

**БЛЯХЕР** Люба, дзеці **Сара-Райхка, Гіта, Рахель, Броха.**

**ВАЙНЕР Іосеф і Ліба,** трое дзяцей.

**ВАЙРОН Абрам і Рыўка.**

**ВЫШКІН Эйдэль,** дзеці **Мэндэль, Гдалья, Бацья, Шэйна, Геся.**

**ВЫШКІН Гершон і Муся-Мера.**

**ВЫШКІН Давід і Дзіна, Эфраім, Хаім-Лейб, Райна, Бейла-Маша.**

**ВЫШКІН Вейвл і Лея, Сара, Хана, Лейб.**

**ВЫШКІН Хаім і Хая-Бацья,** чацвёра дзяцей.

**ВЫШКІН Юдл.** трое дзяцей.

**ВЫШКІН Лейб і Фейга, Абрам-Хона.**

**ВЫШКІН Рувен і Рахель, Бацья, Муля** і яшчэ дзіця.

**ВЫШКІН Сара,** дзеці **Міра-Зелда, Нехама, Мошэ, Песя-Рохл, Абрам-Іцэ.**

**ГОЛЬДЗІН Генох і Рахель, Шэйна-Этка, Мнуха, Янкель** і яшчэ дзіця.

**ГОРАН Песя, Злата.**

**ГУРЭВІЧ Захар'я і Машэль, Рэйза, Мардухай** і яшчэ дачка.

**ГУРЭВІЧ Малка.**

**ГУРЭВІЧ Цыпа-Хана, Сара, Копка, Янкель, Рахель.**

**ДЭЙЧ Абрам і Басель, Манчык, Гірш, Меір.**

**ДЭЙЧ Абрам і Зелда, Лейзер-Мошэ, Лея, Рэйза, Эця.**

**ДЭЙЧ Абрам і Расель, Шлома-Іцэ, Шымон, Міхаль.**

**ДЭЙЧ Бер і Зелда, Сара, Іосеф.**

**ДЭЙЧ Гілель і Сара, Хава.**

**ДЭЙЧ Велвл і Тайба, Лея, Ліба, Хава, Перац.**

**ДЭЙЧ Хая-Рахель, Ліба-Гінда, Гірш, Лейзер, Элька.**

**ДЭЙЧ Хаім-Айзік і Дзіна, Келя-Рыўка, Іта, Сірка, Давід-Шлома, Песя, Фейга, Шая, Мушка.**

**ДЭЙЧ Іосеф і Эстэр, Гірш, Рэйза, Борух.**

**ДЭЙЧ Іцхак і Ліба-Рахель, Сіма, Калман-Іосель, Лейбл.**

**ДЭЙЧ Ісраел-Эля і Рахель,** двое дзяцей.

**ДЭЙЧ Перац і Хана, Міхель, Мэндэль, Велвл, Душа-Рахель.**

**ДЭЙЧ Рыўка, Міндл.**

**ДЭЙЧ Райна.**

**ДЭЙЧ Шмуэл-Аба.**

**ЗАК Абрам-Іцэ і Міна-Элька,** трое дзяцей.

**ЗІЛЬБЕР Аба і Міра.**

**ЛЕВІН Мотл і Сцірл, Бер, Хая-Сара, Давід, Хаім-Эля, Аброам, Шаел.**

**ЛЕВІН Шлома і Сара-Дзітл, Шэйна-Рыўка, Хая.**

**ЛОЦ Герц і Злата, Сіма, Шмуэль, Абрам.**

**МАРОН Абрам, Метка, Хася, Шмуэль-Касра.**

**МАРОН Бейніш і Алта, Тайба, Эді-Бер, Азрыэл, Брайна, Цыпа.**

**МАРОН Бецалел, Шлома, Чэрна, Метка, Гірш, Рахель.**

**МАРОН Гершон і Сара,** трое дзяцей.

**ГІТА** (маці **Сары Марон**).

**МАРОН Захар'я і Цыўя.**

**МАРОН Хаім і Сіма-Фейга,** двое дзяцей.

**МАРОН Егушуа і Цыпа, Ісраель, Фейга-Мера.**

**МАРОН Меір і Хая, Ісраел.**

**МАРОН Нахум і Сара,** двое дзяцей.

**МАРОН Натан і Хана, Абрам-Гірш, Давід, Шмуэль, Файвіш, Янкель.**

**МУНІЦ Лея, Мендл, Хаім-Іцэ, Хая-Рыўка, Бенця.**

**МУШКАТ** Танхум і **Сара-Х'ена.**

**НОТА** (нямы) і яго сястра **Сара.**

**РАБІНОВІЧ** Ента-Лея.

**РАПАПОРТ** Абрам-Янкель і Соня, Аншэл.

**РУКШЫН** Хая-Ґінда, Шымон.

**РАПАПОРТ Хонэ-Ноах і Хана, Хаім-Давід, Гершон-Іцэ, Сара-Рыўка, Х'ена, Кейле-Двора.**

**СКАПЕЦ** Гірш і Эстэр.

**СКАПЕЦ Гірш і Фрума-Браха, Міна-Гіта, Гдалья, Ліба-Рыва, Манчык.**

**СКАПЕЦ Велвл, і Эід,** яшчэ дзіця.

**СКАПЕЦ Ісраел і Злата, Ліпа, Шэйна, Хава.**

**СКАПЕЦ Лейб і Доба, Ісер-Бер,** яшчэ дзіця.

**СКАПЕЦ Мошэ-Нісан і Гута,** дзіця.

**ТОДЭР Хана-Муся, Мошэ.**

**ТОДЭР Нахум і Сара, Фрыда, Ліба, Цыўя, Мошэ.**

**ТОДЭР Сара, Доба.**

**ЦУКАР'Я Айзік і Эстір-Геня,** дзеці.

**ФЕЙГІН Ісраел-Іцха, Ошэр-Бэр, Рувен, Файва, Шэйна-Хая.**

**ФЕЙГІН Лейб і Шэйна-Песя,** дзіця.

**ФЕЙГІН Шлома-Іцэ і Рыўка, Фрэйда, Сіма, Геся, Муля, Гіта, Мендл.**

**ФЕЙГІН Шмуэль і Чэрна** (равін).

**ШНАЙДЭР Абрам-Янкель і Сцірл, Ханок-Ісэр.**

**ШНАЙДЭР Давід і Рохл-Лея, Сара-Зелда.**

**ШНАЙДЭР Геня.**

**ШНАЙДЭР Іосеф.**

**ШТЭЙН Гірш і Хана-Хая, Манчык, Іцэ, Міна.**

**ШТЭЙН Ноах і Хана,** двое дзяцей.

**ХАЦЬЯНАЎ Ісраель і Хана, Шэйна, Лейб, Рэйза, Нохка, Давід.**

**ЭЙДЭЛЬМАН Малка.**

**БЕЙЛА** (жонка каваля), дачка **Эстэр.**

## ВЁСКА КІСЛАЎШЧЫНА

**АБРАМ-ІОСЛ** (настаўнік).

**БАНД Якаў,** жонка, двое дзяцей.

## Спіс яўрэяў вёскі Кіслаўшчына, знішчаных фашыстамі

БАНД Ірахміель і Іта.
БАНД Песах і Неха, Мардухай, Эстэр.
БУР Зелда, ліба, Нахум.
ГУЛЬДМАН Алтэр і Муся, Фрэйда, Рыўка.
ДЭЙЧ Мошэ-Меір і Сара, Сіма.
КАПЛАН Абрам і Ліба, Шлома, Фейга, Мошэ, Ента.
КАПЛАН Егуда-Лейб і Рэйза, Янкель, Ента, Шлома.
МЕХАНІК Барух.
МЕХАНІК Хаім.
МЕХАНІК Шлома-Ашэр і Хана, Абрам, Шымон, Шмуэль.
МУНІЦ Рэувен, Іероел, Бат-Шэва, Лейб.
РУКШЫН Ента, Ліба, Бер-Мардухай.
РУКШЫН Абрам-Аба і Сара-Лея, Алтэр.
РУКШЫН Бер і Геня, Этка, Іцхак.
РУКШЫН Гешл і Зелда, Залман, Сара.
РУКШЫН Янкель і Сара, Фрэйда, Мошэ-Барух, Міхля.
РУКШЫНА Тайба, Міхля, Эля, Бецья, Сіма.
РУКШЫНА Голда, Хава.
РУКШЫНА Слава.
РУКШЫНА Фейга.
РУКШЫНА Цыўя, Эця, Двора, Бенцыон, Рахель, Шымон.
РУКШЫНА Рыва-Дзіна.
САЛАВЕЙ Брайна, Лейб.
ШМУШКОВІЧ Іерахміэль і Гіта, Хаім.
ШМУШКОВІЧ Шмуэль-Грунем і Эстэр, Блюма, Іцхак, Мардухай.
ШТЭЙН Давід-Шлома і Груня, Сіма.

### ВЁСКА ОПСА

АБАЛЕВІЧ Лейб і Цыпора, Мошэ-Бер, Егудзіт, Хаім, Малка.
АБАЛЕВІЧ Цві-Гірш і Эстэр, Лейб, Герцл, Касрыел, Бацья, Ханох.
БАМ Эліягу (равін), Аарон.
БАНд Нехем'я і жонка, Ханох, Мошэ-Іцхак, Хася.
БАРХАРАЎ Хаім-Ісраел і Рохл-Лея, дзеці.
БАШКІН Абрам і Рохл.
БІРМАН Бер і жонка Мошэ, Зісман, Абрам.
БЫКАЎ Айзік і Бэла.
БЫКАЎ Хаім-Бер, жонка, Мошэ, Хава, Бэла-Раша, Роза, Гершэн.
БЫКАЎ Лейб і Хая.
ДРЫСВЯЦКІ Меір і Міна, Эліягу, Гершон, Абрам.
ДУНДА Мошэ-Аарон і Хана, Іосеф.
ЗІЛЬБЕР Якаў-Лейб і Рыўка, Хана, Рохл-Лея.
ЗІЛЬБЕР Аарон і Сара, Цыпора.
КАЯЦКІ Залман і жонка, Гірш, Мендл, Рэйзл.
ЛЕВІН Велвл і Мар'яша, Геня, Рыўка, Рохл-Лея.
ЛЕВІН Хаім-Аба, Рэйзл, Хая, Іошуа.
ЛЕВІН Лейб і Шэйна, Хая, Хана, Блюма.
ЛЕВІН Нахум і жонка, Давід, Аарон, Ліба-Сара, Гіта, Двора.
ЛІБЕРЗОН (Муніц) Эстэр-Голда, Фейга, Лютка, Ханох.
ЛІБЕРЗОН Мошэ-Бер і жонка, Мардухай, Абрам, Рохл, Кейля, Гендл.
ЛІПІНСКІ Грышы і Рэйзл, Данід, Міна.
МАРДЗУКІС Борух-Іцхок і Рахель, Цыпа, Хава.
МУНІЦ Велвл і Рахел-Лея, Гнеся, Сара-Рыўка.
МУНІЦ Велвл і Шэйна, Арчык, Залман, Сара-Рыўка, Гінешка, Рохл-Лея.
МУНІЦ Захар'я і Фейга, Этка, Шмуэл-Ісер, Лейб, Пэся.
МУНІЦ Хоне і Этл, Лейб.
МУНІЦ Лейю і Хана, Іта, Сіма.
МУНІЦ Мейлах.
МУНІЦ Мошэ і Хая-Рыва, Кейля, Сара-Лея, Бацья, Шнэур, Ліпка.
МУНІЦ Шлома і Хая, Іцхак, Рахель, Рэувен, Хава.
МУНІЦ Шмуэл-Гірш і Хая.
ПЕРАЦ Бер і Ліпка.
РАЙХЕЛЬ Аба і Ента, Шмуэл, Лейб, Якаў.
РАЙХЕЛЬ Шмуэл і Геня, Мошэ, Сімха, Фейга, Сара.
РАПАПОРТ Шмуэл-Гірш і Егудзіт, Лейб.
РАПАПОРТ Хаім-Аба і Рохл.
РОЗЕНБЕРГ Лейб і Хая-Пэся, Гершон.
РЫЦ Катрыл і жонка, Абрам-Іцуак, Маціцягу, Танхум.
РЭЗНІК Лейзер і жонка, Таня, Хася.
ТОДРЭС Лейб і Хася.
ФІДЛЕР Сіма (Шымон), жонка, дзеці.
ФІШМАН Лейб і жонка, Маціц'ягу.
ШНАЙДЭР Бейла, Біньямін, Слава.
ШНАЙДЭР Герцл і Чэрна, Іосеф.
УЛЬМАН Мошэ і Рохл, Абрам, Шалом-Меір, Фейга, Гнеся, Ракша.
УЛЬМАН Файвіш і Фрыда, Элі-Гершон, Рохл, Егудзіт.

### ВЁСКА СЛАБОДКА

АМДУР Лейзер, жонка, дачка.
БЕЛЯК Соня і дзеці.
БЕРКМАН Шмуел-Гілел і Міра-Лея, Раша, Зісла, Лейб.

**БІМБАТ Іона і Хая-Дзіна**, дзіця.

**БЫК Давід і Хася, Хаім-Бэр** і яшчэ некалькі дзяцей.

**ВІНАКУР Хася, Міндл.**

**ГАМАРОЎ Залман і Хася, Іосеф.**

**ГЕНДЗЕЛЬС Давід і Хася**, дзеці.

**ГЕНС Бенцыон.**

**ГЕНС Сара** і дзеці.

**ГЕСКІН Гілдел і Сара, Шмуэль.**

**ДАГОВІЧ Хаім-Генох** і жонка, **Сара-Бася, Касрыел.**

**ДАГОВІЧ Мера** і муж.

**ДАГОВІЧ Нахум** і жонка, **Шлома** і яшчэ некалькі дзяцей.

**ДАГОВІЧ Сендзер і Хася**, дзіця.

**ДАГОВІЧ Шмуель і Шэйна-Мірл, Лейб, Сара, Фрума.**

**ДАГОВІЧ Шымон-Бер і Хая-Рыва.**

**ДЭЙЧ Іда** і муж.

**ДЭЙЧ Ісраел.**

**ЗАЛА** (мяснік) **і Ліба**, дзеці.

**ЗЕЛІКМАН Хава-Слава, Фаля, Янкель, Рыўка.**

**ЗЕЛІКМАН Рывы** і дачка.

**ЗЕЛІКМАН** (маці **Рывы**).

**КАНФЕР Зеліг**,жонка, дзеці.

**КАНФЕР Іегудба і Хася-Лея, Хаім-Іая, Рахель-Рэйза, Арон-Давід.**

**КАНФЕР Шлома і Нехама-Двойра.**

**ЛІФ Зорах**, жонка, дзеці.

**ЛІФ Фрыда, Абрам-Іцхак, Зелда, Шалом, Рахель, Мендл.**

**ЛІФ** муж, жонка, дзеці.

**РУСОНІК Янкель** і жонка.

**САМАВАР Абрам-Іосеф, Люба, Хая, Блюма, Хона.**

**САМАВАР**, сёстры **Абра-Іосефа.**

**СКОП Бер** і жонка.

**ХАЗАН Тайба** і муж, дзіця.

**ХАЗАН** (бацька **Тайбы**).

**ХАЗАН Мотл і Ліба**, дзеці.

**ХІДЭКЭЛЬ Абрам-Іцхак і Гінда.**

**ШВАРЦ Лейб** і жонка, **Шуламіт, Мера.**

**ШТЭЙНМАН Цыўя.**

**ЭЙДЭЛЬМАН Мотл і Лея**, дзіця.

**ЭНЦІН Барух і Шула, Мерл.**

## ВЁСКА ЯЙСЫ

**БЕРМАН Сара-Эстэр.**

**КАЦ Эстэр** і дзіця.

**КАЦ Велвл і Этэль, Меір**, і яшчэ чацвёра дзяцей.

**МУНІЦ Ісроэл-Герц і Нехама, Хая, Даніэль, Сара.**

**МУНІЦ Лейвік** і жонка, **Абрам Янкель** і дзве дачкі.

**МУНІЦ Мошэ і Гітл**, дачка і два сыны.

**МУНІЦ Рыўка.**

**ПАСТЭРНАК Меір і Рахель.**

**ПЭР Янкель і Рыўка**, трое дзяцей.

**РУКШЫН Ісер** (равін).

**РУКШЫН Беньямін** і жонка, **Мендл, Нехама** і яшчэ чацвёра дзяцей.

**РУКШЫНА Бацья** і муж, **Мендл, Нехама.**

**РУКШЫН Шая-Бейніш.**

**РУКШЫН Фішл.**

**ТАРЫШ Іда, Іцхак, Хана.**

**ТАРЫШ Хаім** (равін) і **Іта-Фейга, Мендл.**

**Айзік** (абутнік) і **Ліба**, сын і дачка.

**Бер і Сара**, двое дзяцей.

**Гіта** (жонка **Аврам-Янкеля**), дзеці **Эстэр, Хава** і яшчэ двое дзяцей.

**Ісраел-Іцхак, Хаім, Рыўвен.**

Каваль (прафесія) і **Блюма**, двое дзяцей.

**Сара** (удава), дзеці **Аврам і Муся.**

**Шаром** (сын **Эліягу**) і жонка, двое дзяцей.

**Янкель-Нахум і Фейга**, трое дзяцей.

**ХАНІН Лейб і Фейга**, трое дзяцей.

**ХАНІН Меір-Ліпа і Матля, Сара, Рахель** і яшчэ сын.

**ХАНІН Мошэ і Сара**, дзве дачкі і сын.

**ЦЫПІН Бер**, жонка і дзве дачкі.

**ЦЫПІН Лейб і Рахель-Лея, Рэйза, Блюма, Рыўка.**

**ЦЫПІН Файлка і Шэйна**, дачка.

**ЦЫПІН Палтшл і Гінда, Меір** і яшчэ трое дзяцей.

**ЦЫПІН Нахум і Рахель, Лея, Хана-Цыпа, Хаім-Шмерл, Эстэр, Шлома, Рафаэл, Лейб.**

**ЦЫПІН Нахум-Бер**, жонка, трое дзяцей.

**ЦЫПІН Шлома** і жонка.

**ЦЫПІНА Эстэр-Рахель.**

**ШАПІРА Бер і Фрада.**

**ШАПІРА Ісраел і Малка, Меір** і яшчэ чацвёра дзяцей.

*Спісы складзены зямляцтвам яўрэяў — выхадцаў з Браслаўшчыны ў Ізраілі.*

# ВЫЗВАЛЕННЕ БРАСЛАЎШЧЫНЫ

Вызваленне тэрыторыі Браслаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пачалося ў першыя дні ліпеня 1944 г. ў выніку правядзення Шаўляйскай наступальнай аперацыі. 5 ліпеня пачаўся другі этап Беларускай наступальнай аперацыі «Баграціён». Пасля вызвалення Полацка войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту імкліва рухаліся на захад і дзейнічалі на стыку двух моцных груповак нямецкіх армій «Поўнач» і «Цэнтр». Яны ізалявалі іх адна за адной і выключылі магчымыя ўдары групы армій «Поўнач» па флангах і тылу савецкіх войск.

У склад фронту ўваходзіла 6-я гвардзейская армія, часці якой непасрэдна вызвалялі Браслаўшчыну. У перыяд з 29 чэрвеня па 4 ліпеня галоўныя сілы 6 гвардзейскай арміі (гв. А) прасунуліся на 120—130 км і выйшлі на рубеж Мёры — паўднёвы бераг воз. Дрысвяты — м. Опса — паўночныя берагі азёр Богіна і Нарач. Перад войскамі арміі адкрылася магчымасць без аператыўнай паўзы і падрыхтоўкі працягваць наступленне. Ва ўлік не бралася расцягнутасць паласы наступлення, слабая разведанасць сіл праціўніка і матэрыяльнае забеспячэнне.


Фрагмент экспазіцыі музея ў Відзаўскім СПТВ.

Адной з мэт наступлення з'яўлялася хутчэйшае авалоданне важным стратэгічным пунктам Дзвінск (сучасны Даўгаўпілс). Планавалася нанесці імклівыя ўдары па некалькіх напрамках, абкружыць і разбіць магутны вузел абароны — Дзвінск. Накірункі ўдараў планаваліся наступным чынам: захапіць населеныя пункты Відзы і Дрысвяты і наступаць наперарэз чыгункі Дзвінск—вільня на Дукштас; другі ўдар скіраваць на прарыў Міжазёрнага дэфіле Дрысвяты—Рычы на н. п. Турмантас і Зарасай; яшчэ адзін удар накіраваць на разгром умацаванняў паміж азёрамі Бужа—Струста—Снуды з выхадам на рубеж Бароўка—Дзвінск. Рашучыя ўдары планаваліся нанесці па Друі і Краславе з мэтай кантролю абодвух берагоў р. Заходняя Дзвіна. Выкананне гэтых задач дазваляла імкліва падыйсці да Дзвінска з некалькіх бакоў.

Ужо 2—3 ліпеня на тэрыторыю края ўступілі авангардныя і разведвальныя групы Чырвонай Арміі, якія сустрэліся з дзейнічаючымі тут партызанскімі фарміраваннямі. Прыкладна да Браслаўшчыны ўстанавілася шырокая лінія фронту: в. Казяны — усходні бераг р. Дрысвяціцы — воз. Богіна — вёскі Богіна—Вайнюнцы—Купчэлі—Усяны — Казакова — м. Друя. Заняцце без баёў значнай часткі краю абумоўлена некалькімі прычынамі: папершае, паспяховае прасоўванне Чырвонай Арміі не дазваляла нямецкім войскам хутка стварыць новы абарончы рубеж і замацавацца на ім, па-другое, значная частка тэрыторыі раёна, па якому наступалі савецкія войскі, кантралявалася партызанамі.

Камандаванне фронту паставіла 6-й гв. А, якая павінна была прайсці праз Браслўшчыну, першачарговую задачу — хутка авалодаць важнымі стра-

тэгічнымі пунктамі — Браславам, Відзамі і Друяй. На Браслаў наступалі 166-я і 9-я гвардзейскія стралковыя дывізіі (сд) — 423-і і 735-ы стралковыя палкі 166-й сд з боку Злота—Ельня, а 9-я гв. сд з усходняга накірунку. 423-і полк пасля жорсткіх баёў прарваў умацаваныя пазіцыі ворага ля в. Краснасельцы, перарэзаў шасэйныя дарогі на Браслаў, Бароўку, Карасіна, чыгунку Опса—Друя і ўсутыч наблізіўся да Браслава.

44-я мотабрыгада, полк 9-й гв. сд і партызаны брыгады імя Г. К. Жукава сумеснымі дзеяннямі прадвырашылі зыход аперацыі. Нямецкім войскам у горадзе (каля 3—3,5 тысячы чалавек) паўстала пагроза акружэння і 6 ліпеня яны пачалі адыход. Вулічных баёў у райцэнтры не адбылося. 6 ліпеня Браслаў быў вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У гэты ж дзень гітлераўцы былі выбіты і з м. Друя. Гэта было вельмі важна для далейшага разгортвання наступлення савецкіх войск, таму што мястэчка і яго вызваленне значна аблягчала і паскарала прасоўванне савецкіх войск па тэрыторыі Браслаўшчыны. Нямецкае камандаванне разумела гэта і надавала належную



І. М.Чысцякоў,камандуючы 6-й гвардзейскай арміі.



Ф.Н. Уцянкоў,камандзір 323-га стралковага палка,ганаровы грамадзянін г. Браслава.

ўвагу абароне Друі. Тут была створана шматпалосная абарона.

На мяжы Урбанава—Тычкі наступаючым палкам 9-й гв., 29-й і 270-й стралковым дывізіям процістаялі значна мацнейшыя нямецкія злучэнні. 3—4 ліпеня на гэтым участку адбыліся жорсткія баі. 6 ліпеня савецкія часці атакавалі пазіцыі гітлераўцаў у Друі. У гэты дзень варожыя часці ў мястэчку, асабліва чыгуначная станцыя, падвергліся моцным ударам авіяцыі і артабстрэлу. Вораг быў разгублены. Гэта выкарысталі нашы наземныя войскі. Вось радкі з баявога данясення штаба 6 гв. А: «...Пераадольваючы моцнае супраціўленне праціўніка з напрамку м. Друя, пасля 30-хвіліннага рукапашнага бою, часці 270 сд у 11-30 авалодалі м. Друя... працягваючы агнявы бой».

Трэба адзначыць, што авалодаўшы мястэчкам, савецкія воіны не змаглі прарвацца да ракі. З 7 па 14 ліпеня 270-я сд вяла тут пазіцыйныя баі. Толькі з далейшым перамяшчэннем лініі фронту на захад немцы пакінулі гэты плацдарм.

Яшчэ адным моцным вузлом супраціўлення ворага ў першыя дні ліпеня стала наваколле Відзаў. Пакінутыя ў гэтым раёне 215-я пяхотная дывізія і курляндскі полк «Вікінг» з артылерыяй і танкамі абараняліся з адчаем смертнікаў. Хутчэйшае ж вызваленне мястэчка дазваляла перарэзаць чыгунку Вільня—Дзвінск і выйсці ў тыл дзвінскіх умацаванняў гітлераўцаў. Сюды, апроч авангарднай часці — 46-й гв. сд — былі накіраваны з франтавога рэзерва 89-я танкавая, 46-я механізаваная і 44-я мотастралковая брыгады. Гэта дало магчымасць пачаць нарэшце рашаючы штурм мястэчка. Яшчэ 4 ліпеня 46-я гв. сд раптоўным ударам авалодала Відзамі, але неўзабаве была выбіта ворагам, панёсшы значныя страты. На працягу двух наступных дзён вяліся бесперапынныя баі. Знач-

ны ўрон ворагу ля Відзаў нанеслі лётчыкі 3-й паветранай арміі. У ноч з 8 на 9 ліпеня 1124-ы полк ва ўзаемадзеянні з 46-й механізаванай брыгадай штурмам авалодалі мястэчкам.

Пасля вызвалення гэтых населеных пунктаў на Браслаўшчыне ўсталявання наступная лінія фронту (на 9.7.1944 г.): усх. бераг воз. Дрысвяты — в. Карасіна — воз. Бужа — в. Мар'янполле—зах. бераг воз. Струста — воз. Снуды — в. Слабодка — в.Друйск — м. Друя. Баі на Браслаўшчыне перамясціліся ў міжазёрную прастору. Прыродныя асаблівасці яе — перасечаная мясцовасць, лясістасць і забалочанасць, шмат азёр, у дадатак пабудаванай гітлераўцамі лініі абароны, з'явіліся моцнай перашкодай на шляху 6-й гв. А. Нямецкае камандаванне, улічыўшы гэтыя асаблівасці, спадзявалася затрымаць тут яе наступленне.

Для далейшых паспяховых дзеянняў патрабаваліся дадатковыя сілы. Камандаваннем арміі былі ўведзены ў бой 9-я га., 47-я, 51-я стралковыя дывізіі. З 9 па 14 ліпеня асноўныя падзеі адбываліся каля вёсак Карасіна і Слабодка, на мяжы азёр Бужа—Струста—Снуды. 51-я сд, спрабуючы выйсці да чыгуначнай станцыі Турмантас (Літва), наступала на Карасіна. За дзень 11 ліпеня былі вызвалены населеныя пункты Мяжаны, Рычаны, Едлінава, Станкавічы, Жвірыні і інш. Кровапралітныя баі тут працягваліся з пераменным поспехам.

Другой перашкодай на шляху савецкіх войск была в. Слабодка, якую гітлераўцы ператварылі ў сур'ёзны ачаг супраціўлення. 11 ліпеня 473-і полк 154-й сд пачаў штурм вёскі. 12 і 13 ліпеня тут ішлі баі. Уначы 13 ліпеня нямецкія войскі пачалі адыход у напрамку Быстрамаўцы—Абаб'е.

Пасля вызвалення в. Слабодка палкі 154-й сд пачалі праследаванне праціўніка і 14 ліпеня завязалі баі на лініі Абаб'е—Быстрамаўцы—азёры Барвінка—Берца—Дубра. Вораг люта супраціўляўся і дывізія без асаблівых поспехаў амаль тыдзень атакавала пазіцыі гітлераўцаў.

Найбольш складаныя — і па стратэгічных мэтах, і па канцэнтрацыі сіл — баявыя дзеянні адбываліся з 11 па 19 ліпеня ў міжазёрнай частцы Браслаўшчыны (лінія азёраў Сіта—Саванар—Бужа—Струста—Снуды — Плюсы). 11—12 ліпеня савецкія войскі паспяхова прасоўваліся наперад. Так, 47-я сд авалодала населенымі пунктамі Крукі, Мякяны, Плікішкі, Ушанішкі, 29-я сд прасунулася да Свілюкоў і берага воз. Снуды, 9-я гв. сд авалодала вёскамі Баруны, Дзерукі і інш.

13 ліпеня гітлераўцы прадпрынялі моцныя контратакі пяхоты, падтрыманыя артылерыйскім агнём, танкамі і ўдарамі авіяцыі. Савецкія часці вымушаны былі пакінуць раней занятыя вёскі і адыйсці на поўдзень на 3—8 км. Склалася крытычная сітуацыя. Камандаванне 6-й гв. А ў гэты напружаны момант, прааналізаваўшы склаўшуюся сітуацыю, палічыла неабходным увесці ў бой дадатковыя сілы з рэзерва — 90-ю і 71-ю гвардзейскія стралковыя дывізіі і 46-ю механізаваную брыгаду. Кругласутачныя баі на гэтым напрамку працягваліся да 19 ліпеня. Найбольш драматычна разгортваліся падзеі каля вёсак Іланцы, Урбаны, Дубіна, Жвірблі, дзе савецкія часці панеслі цяжкія страты. Вораг, стрымліваючы агульнае наступленне на дадзеным участку, ліхаманкава рыхтаваў наступны рубеж сваёй абароны. Толькі 19 ліпеня ў гэтым раёне наступіла аслабленне супраціўлення ворага пасля яго адыходу на лінію Тартакі—Бароўка (тэрыторыя Латвіі).

На 19—20 ліпеня, калі ўжо значная частка краю была вызвалена, лінія фронту праходзіла па рубяжу: в. Мял-

ка — в.Карасіна — воз. Сіта — воз. Бужа — в. Жвірблі — в. Баруны — в. Юраны. Нямецкае камандаванне ўжо не надавала той увагі ўтрымліванню некаторых населеных пунктаў і ўчасткаў, як у пачатку ліпеня, а праводзіла перагрупоўку сваіх сіл, спрабавала навязаць зацяжныя баі (пад вёскамі Карасіна і Плюсы). Мэта заставалася ранейшай — утрымаць г. Дзвінск, не даць Чырвонай Арміі акружыць сябе. Паспяховыя баі 47-й, 154-й, 29-й стралковых дывізій ля азёр Рычы і Бужа, у раёне Абаб'я далі магчымасць 20 ліпеня 29-й сд выйсці да вёсак Ажэлішкі, Дзерукі, 22—23 ліпеня разам з суседнімі часцямі вызваліць вёскі Дубіна, Дундары, Данькі і з баямі выйсці на тэрыторыю Латвіі ў напрамку м. Каплава.

Заставаліся два ўмацаваныя пункты, дзе вораг не здаваў пазіцыі — наваколлі вёсак Плюсы і Карасіна. 21 ліпеня пачаліся рашучыя дзеянні ля Карасіна. Атакі пяхоты пры падтрымцы артылерыі ні 22, ні 23 поспехаў не мелі. Толькі штурм пазіцый вучэбнай ротай 270-й сд далі поспех. Коштам паловы асабовага саставу вёска была ўзята. Ля Плюс падзеі разгортваліся наступным чынам: да 24 ліпеня савецкія воіны ніяк не маглі адолець ворага. Рашуча паводзіў сябе 473-і полк 154-й сд, які да 12 гадзін здолеў зламаць супраціўленне ворага. 24 ліпеня — апошні дзень вызваленчых баёў на Браслаўшчыне.

На працягу ўсяго часу актыўных баявых дзеянняў часцей Чырвонай Арміі на тэрыторыі раёна актыўную дапамогу ім аказвала авіяцыя. У ходзе вызвалення Браслаўшчыны прымалі ўдзел злучэнні і часці 3-й паветранай арміі. Яны дыслацыраваліся на тылавых аэрадромах Кабыльнікі (каля воз. Нарач), Слабада (каля п. Ула), каля в. Германавічы (недалёка ад г. Шаркаўшчына), каля в. Рымуці.

У першыя дні ліпеня 334-я бамбардзіровачная дывізія (бад) зрабіла масіраваны налёт на станцыю Друя. Самалёты ТУ-2 разбурылі чыгуначны шлях, узнікла шмат пажараў. 8—10 ліпеня 1944 г. лётчыкі актыўна ўдзельнічалі ў баях ля м. Відзы, бамбілі пазіцыі ворага і знішчылі некалькі самалётаў. 7 ліпеня знішчальнікі 68-га авіяпалка ў ходзе паветранага бою збілі два самалёты ФВ-190, якія зваліліся ў воз. Дрысвяты. 14 ліпеня ў гэтым жа раёне 332-я штурмавая дывізія (шад) наносіла моцныя ўдары на камунікацыях ворага. За 15—16 ліпеня тут жа былі збіты 4 самалёты праціўніка. 16 ліпеня самалёты 72-га знішчальнага авіяпалка, якія падтрымлівалі свае войскі ў міжазёрнай прасторы ў раёне в. Жвірблі, сустрэлі чатыры ФВ-190 і ў ходзе бою два з іх збілі.

На працягу ўсяго перыяду вызваленчых баёў у краі лётчыкамі 3-й паветранай арміі нанесены значны ўрон праціўніку. Праведзеныя баявыя дзеянні авіяцыі дазволілі войскам 1-га Прыбалтыйскага фронту больш эфектыўна і хутка здзейсніць пастаўленую перад ёй задачу — выйсці да важнага стратэгічнага пункта Дзвінск, вызваліўшы пры гэтым шмат населеных пунктаў, у т. л. і на Браслаўшчыне.

## Яны вызначыліся пры вызваленні Браслаўшчыны

Аб мужнасці і гераізме салдат і афіцэраў у ходзе баёў на Браслаўшчыне сведчыць і такая акалічнасць. Шмат вайскоўцаў атрымалі за свае подзвігі ўзнагароды — ордэны і медалі, падзякі камандавання. Кулямётчык, старшы сяржант Куркін вызначыўся ў баі ля Браслава і атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга. Сяржанта Шаўрова ўзнагародзілі медалём «За баявыя заслугі». Радавы 423-га палка 166-й сд Васількоў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Праз Браслаўшчыну прайшлі шляхі вызваленцаў, будучых Герояў Савецкага Саюза радавога Р. Азімава, малодшага сяржанта І. П. Мядзведзева, старшыны А. І. Ісіпіна, разведчыкаў А. А. Аляксеева, В. А. Бабічава. За мужнасць, праяўленую ў баях на тэрыторыі Шумілінскага, Бешанковіцкага і Браслаўскага раёнаў ім было прысвоена гэта ганаровае званне. Розі Азімаў, стралок 1124-га палка ў складзе групы разведаў пазіцыі ворага ў раёне Відзаў. Разведчыкі з боем уварваліся ў мястэчка і сярод іх адным з першых быў Азімаў.

Лейтэнант Аляксееў 9 ліпеня з двума разведчыкамі, выявіўшы вялікую колькасць танкаў і пяхоты каля м. Відзы, скіравалі агонь дывізіёна і тым самым папярэдзілі падрыхтоўку моцнай контратакі ворага.

Памочнік камандзіра ўзвода Мядзведзеў 6 ліпеня ў пазіцыйным баі на ўскрайку м. Відзы кулямётным агнём прымусіў групу немцаў адыйсці з падрыхтаванай пазіцыі.

Старшына Ісіпін 6 ліпеня каля Відзаў імкліва ўварваўся на пазіцыі немцаў, выбіўшы іх адтуль. Дзякуючы рашучасці Ісіпіна, знішчыўшага варожы заслон, наступаючыя маглі без перашкод рухацца наперад.

Маёру Жданаву А. М., капітану Валчкову І. М., сяржанту Зайцаву В. Л. за здзяйсненыя подзвігі на зямлі Браслаўшчыны было прысвоена ганаровае званне Герояў Савецкага Саюза.

*А. Панцялейка*

## Дакументы сведчаць

### З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 46-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

...3.7.1944 г. Праціўнік аказваў супраціўленне і працягвае адыход на Дзвінск. Ягоная авіяцыя (Ю-87) праводзіць бамбардзіроўку міжазёрнай прасторы. Дывізія дзейнічала ў партызанскім краі. У 10-00 яна, пасля вызвалення тэрыторыі Шаркаўшчынскага раёна, пачала наступленне на н. п. Опса з мэтай выхаду на рубеж Опса—Казяны, каб перарэзаць чыгунку Друя—Дукшты. 141-ы полк наступаў у напрамку Замошша—Опса і да 14-00 перадавым атрадам авалодаў в. Опса. 135-ы гв. сп да 18-00 замацаваўся на мяжы Мілюнцы—Вайнюнцы...

...4.7.1944 г. 141-ы полк авалодаў м. Дрысвяты... 135-ы полк да 16-00 авалодаў г. Відзы... Дывізія на працягу сутак вызваліла 80 населеных пунктаў, знішчыла да 20 гітлераўцаў...

...5.7.1944 г. 46-я гв. сд абараняецца на фронце Майшулі—Опса—Мурмішкі—Стаўрова. Праціўнік пры падтрымцы 10 танкаў, артмінамётных батарэй, самаходных гармат перайшоў у контратаку з раёна Мялка—Рычаны і пасля жорсткага бою авалодаў н. п. Станкавічы, Дрысвяты, Уладзіслававa... Батальён 139-га палка на працягу ночы адбіваў атакі, утрымліваючы Відзы. Праціўнік 2 батальёнамі з 18 танкамі заняў г. Відзы, страціўшы пры гэтым 7 танкаў і да 200 салдат. Камандзір дывізіі вырашыў трывала ўтрымліваць рубеж, выматаць і абяскровіць праціўніка...

...6.7.1944 г. Камандзір вырашыў абараняць свае пазіцыі і дзеяннямі перадавых атрадаў авалодаць Дрысвятамі і Відзамі. Страты з 4 па 7 ліпеня: забіта і паранена 292 чалавекі...

...8.7.1944 г. 141-ы і 139-ы палкі ў 13 гадзін фарсіравалі р. Дрысвяціцу на ўчастку Дэгутыня—Мацэляны. Актыўна дзейнічаюць снайперы праціўніка. Захоплены ў палон лётчык. Праціўнік працягвае ўтрымліваць заходні бераг р. Дрысвяціца да р. Апіварца. Камандуючы арміяй генерал-палкоўнік Чысцякоў за прарыў абароны праціўніка на р. Дрысвяціца па старой літоўскай граніцы ўзнагародзіў камандзіра 135-га палка ордэнам Чырвонага Сцяга, а камандзіра 139-га палка ордэнам Айчыннай вайны II ступені...

9.7.1944 г. Авіяцыя праціўніка бамбіла пазіцыі дывізіі... З баямі дывізія авалодала населенымі пунктамі Грытуны, Гірэйшы, Вазгелянцы. Часці дывізіі прарвалі абарону праціўніка па беразе р. Дрысвяціца і выйшлі на тэрыторыю Літвы.

*ЦАМА РФ, ф. 1151, воп. 1, спр. 56, арк. 17—20.*

## З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 166-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ШТАБУ КОРПУСА АД 4.7.1944 г. 8-00

Часці дывізіі, выконваючы загад камандзіра корпуса, на працягу ночы на 4.7.1944 г. вялі разведку праціўніка і пасля перадыслакацыі пачалі наступленне ў напрамку Браслава... 423-і полк, праводзячы разведку і рухаючыся ў напрамку Пузыры, сустрэў праціўніка на рубяжы Краснасельцы—Ельня. Імклівым ударам з паўднёвага захаду, дзейнічаючы двума батальёнамі, да 6-00 полк поўнасцю разбіў праціўніка і авалодаў Краснасельцамі, узяў пад кантроль шасэйныя дарогі на Браслаў, на Бароўку, Карасіна і перарэзаў чыгунку Опса—Друя. У гэтым баі захоплены дзве 150-мм гарматы, чатыры 81-мм мінамёты, 8 кулямётаў і знішчана значная колькасць салдат і афіцэраў праціўніка. З 7-00 да 8-00 адбіты дзве контратакі праціўніка... 735-ы полк, выконваючы задачу, вёў разведку і да 6-00 4.7.1944 г. выйшаў і заняў абарону: 1-ы батальён — Усяны, кантралюючы шашу, 2-і батальён — Злота... 3-і батальён — Ахрэмаўцы...

*ЦАМА РФ, ф. 1406, воп. 1, спр. 12, арк. 12—13.*



Воіны 166-й стралковай дывізіі ў наступленні.



Група каманднага складу 166-й стралковай дывізіі.

## З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 6-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ АРМІІ КАМАНДУЮЧАМУ ВОЙСКАМІ І-га ПРЫБАЛТЫЙСКАГА ФРОНТУ АД 6.7.1944 г. 21-00

...Вораг на левым фланзе арміі з раёнаў Жвірблі, на захад ад воз. Струста, Станкавічы, на поўнач ад м. Дрысвяты, Бурцішкі, на паўночны захад ад м. Відзы да 3-00 сіламі да 2 батальёнаў пяхоты з 10—15 танкамі бесперапынна атакаваў злучэнні 2-га гв. ск. У выніку атак праціўнік адкінуў нашы падраздзяленні з раёнаў Зазоны, м. Дрысвяты, м. Відзы. Далейшы рух быў прыпынены...

2-і гв. ск да 3-00 вёў бой з атакуючай пяхотай і танкамі ў раёне Зазоны, лес за 2 км на паўднёвы захад ад м. Дрысвяты, м. Відзы. Зранку сіламі двух палкоў 9-я гв. сд, працягваючы наступленне, авалодала рубяжом Азяраўка, Латышкі. Сутароўшчына, адзін полк у раёне Ахрэмаўцы рыхтуецца да баявых дзеянняў. 166-я сд двумя палкамі абараняла рубеж Краснасельцы, Усяны, Пузыры, сіламі перадавога атрада вяла баі за Зазоны, Браслаў. У выніку бою авалодала гаем на паўночны захад ад Браслава... Па няпоўных дадзеных за суткі бою знішчана да 900 салдат і афіцэраў, 4 гарматы, 10 аўтамашын, падбіта 7 танкаў.

*ЦАМА РФ, ф. 335, воп. 5113, спр. 354, арк. 233—234.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 29-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ЗА ЛІПЕНЬ 1944 г.

...6.7.1944 г. Праціўнік аказвае моцнае супраціўленне наступаючым часцям дывізіі агнём мінамётаў і артылерыі.

302-і сп у 11-20 штурмам авалодаў м. Друя. Неабходна адзначыць храбрасць, адвагу і ўмельства выходзіць з крытычных сітуацый камандзіра палка палкоўніка Арабца, які сам падняў сваіх салдат у атаку і павёў на штурм м. Друя. Смелымі і адважнымі дзеяннямі ўсяго палка, натхнёнага палкоўнікам Арабцом, горад быў узяты з найменшымі стратамі...

106-ы сп да 17-00, збіваючы замацаваўшагася ворага з высот, адбіваючы шматлікія контратакі пяхоты і танкаў, выйшаў на ўсходні бераг р. Друйка і пачаў рыхтавацца да яе фарсіравання.

*ЦАМА РФ. ф. 29 сд, воп. 1, спр. 5, арк. 27—28.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 5-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ ЗНІШЧАЛЬНАЙ АВІЯЦЫЙНАЙ ДЫВІЗІІ

...7.7.1944 г. 68-ы знішчальны авіяполк (зап) вылецеў на прыкрыццё ў раён Відзаў (4 «кобры»*, вядучы капітан Мілаеў). У ходзе боя збілі два ФВ-190, якія ўпалі ў раёне в. Дрысвяты.

...8.7.1944 г. 4 «кобры» 28-га зап вылецелі на прыкрыццё ў раён Відзаў. Малодшы лейтэнант Баранаў выкінуўся на парашуце з падаючага самалёта, бо пры выкананні задання ў раёне в. Опса ў самалёце адказаў рухавік.

...16.7.1944 г. 8 «кобраў» 68-га зап у раёне г. Браслава сустрэлі чатыры ФВ-190. Капітан Волкаў збіў самалёт ФВ-190, але і яго самалёт быў падпалены. Лётчык выкінуўся з парашутам і пазней прыбыў у часць.

6 «кобраў» 72-га зап (вядучы капітан Жыценеў) вылецелі ў раён в. Жвірблі на прыкрыццё сваіх войскаў. Сустрэлі чатыры самалёты праціўніка і завязалі бой. Збіта два ФВ-190.

*ЦАМА РФ, ф. 20032, воп. 1, спр. 13, арк. 20, 27, 28,*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 89-й ТАНКАВАЙ БРЫГАДЫ ЗА ЛІПЕНЬ 1944 г.

...8.7.1944 г. 215-я пяхотная дывізія праціўніка пацясніла часці Чырвонай Арміі і авалодала м. Відзы... 89-я т. бр., працягваючы наступленне, зранку 8.7.1944 г. выйшла ў раён в. Юцішкі. Фарсіраваць р. Дрысвяціца з ходу не змагла, бо мост у раёне в. Падрукша быў разбураны. Пераправіўшыся праз раку ў брод да 11-00 брыгада падышла да в. Ярканцы, але сустрэўшы моцнае супраціўленне праціўніка, вымушана была спыніцца. Спроба 44-й мсбр і танкаў прасунуцца наперад поспеху не мелі. Вырашана было ў абход праціўніка ўдарам з усходу авалодаць м. Відзы...

...9.7.1944 г. танкі, натыкнуўшыся на ўпартае супраціўленне, абышлі гітлераўцаў і да 6-00 авалодалі ўсходнім ускрайкам м. Відзы... Да 7-00 танкі выйшлі на мяжу Ліпалаты.

*ЦАМА РФ, ф. 89 тбр, воп. 1, спр. 5, арк. 59—60.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЯННЯЎ 334-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

...6.7.1944 г. Дывізія на працягу дня двума палкамі праследвала праціўніка ў напрамку воз. Дзісна, а адным палком вяла наступленне на м. Відзы. 1124-ы сп меў задачу блакіраваць Відзы і абыходзячым манеўрам акружыць і знішчыць праціўніка. У 18-00 1124-ы сп пры падтрымцы 908-га артпалка атакаваў гарнізон праціўніка, але сустрэў жорсткае супраціўленне і вымушаны быў адысці...

...7.7.1944 г. Зранку дывізія перайшла да часовай абароны і заняла рубеж фальварак Відзы-Альбрэхтоўскія—Дацішкі—Трычуны...

...8.7.1944 г. На мяжы абароны 1124-га сп праціўнік удзень павёў наступленне сілай да роты пяхоты з 10 танкамі і да 20-00 авалодаў в. Ліпалаты....

...9.7.1944 г. 1124-ы сп разам з 46-й механізаванай брыгадай у выніку раптоўнага штурму ў 4-00 авалодаў м. Відзы...

*ЦАМА РФ, ф. 1648, воп. 1, спр. 177, арк. 3—5.*

---

*Маюцца на ўвазе знішчальнікі «Каралеўскія кобры», якія ЗША пастаўлялі Савецкаму Саюзу ў час Вялікай Айчыннай вайны.

## ВЫПІСКА СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ БАЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ І-га ТАНКАВАГА КОРПУСА

89-я танкавая брыгада. За час баявых дзеянняў з 7 па 16 ліпеня 1944 г. вызначыўся камандзір узвода 202-га танкавага палка мал. лейтэнант Белікаў. У раёне м. Відзы ён уварваўся на пазіцыі праціўніка і агнём з танка падбіў дзве 75-мм гарматы, цягач з боепрыпасамі і знішчыў гусеніцамі да 15 варожых салдат.

Камандзір узвода аўтаматчыкаў мал. лейтэнант Гушчын ў баі за м. Відзы асабіста знішчыў 6 нямецкіх салдат, малодшы сяржант Яркін, радавыя Патрылаў, Смагін, Калараў, Барадулін, Сівы знішчылі кожны больш за 5 гітлераўцаў.

*ЦАМА РФ, ф. 3398, воп. 1, спр. 129, арк. 16.*

## З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 90-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

12.7.1944 г. У 14-00 268-ы і 272-і палкі пры падтрымцы артылерыі перайшлі ў наступленне і да 20-00 авалодалі вёскамі Мікалаюнцы. Бейнары, Дальнарэчча і выйшлі на рубеж Бейнары — хмызняк за 200 м на ўсход ад Карасіна.

13.7.1944 г. 90-я гв. сд працягвала наступленне. Да 14-00 авалодала населенымі пунктамі Анісімавічы і Зафіеўка.

14.7.1944 г. Праціўнік працягвае адыход у напрамку Дзвінска, вядзе агонь з глыбіні сваіх пазіцый.

*ЦАМА РФ, ф. 1254, воп. 1, спр. 59, арк. 104—111.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 473-га СТРАЛКОВАГА ПАЛКА 154-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

...16.7.1944 г. У 6-00 пасля артпадрыхтоўкі 1-ы стралковы батальён пачаў наступленне на Быстрамаўцы... Праціўнік прапусціў атакуючых праз ручай і адкрыў моцны агонь (цяжкая артылерыя страляла з-за лесу ў раёне в. Каменка). Рота байцоў ўварвалася ў крайнія хаты в. Быстрамаўцы, але была выбіта пераўзыходзячымі сіламі праціўніка... Асабліва жорсткі бой, пераходзіўшы ў рукапашную, адбыўся на паўночны захад ад ручая. Пасля гадзіны бою праціўнік адышоў, страціўшы да 28 салдат.

*ЦАМА РФ, ф. 473 сп, воп. 140071, спр. 22, арк. 5–6.*

## З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 6-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ АРМІІ КАМАНДУЮЧАМУ ВОЙСКАМІ І-га ПРЫБАЛТЫЙСКАГА ФРОНТУ АД 16.7.1944 г. 21-00

...З другой паловы дня корпусы арміі вядуць наступальныя дзеянні... Пераадольваючы супраціўленне... злучэнні авалодалі населенымі пунктамі Марцінішкі, Ажэлішкі, Балюкішкі, Бяззубішкі, Клейпанішкі...

*ЦАМА РФ, ф. 335, воп. 5113, спр. 354, арк. 287—289.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 47-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ЗА ЛІПЕНЬ 1944 г.

...16.7.1944 г. Камандзіру роты 353-га сп Кузняцову была пастаўлена задача выбіць праціўніка з безыменнай вышыні і забяспечыць далейшы рух палка... Рота раптоўна атакавала праціўніка. Не чакаючы флангавага ўдару гітлераўцы пачалі адступаць, аднак кулямётчык Папоў зайшоў у тыл і адкрыў агонь са свайго кулямёта. У выніку праціўнік быў знішчаны і задача была выканана.

Камандзір аддзялення 5-й роты 353-га сп Шаўчэнка ў баях за адзін наеслены пункт першым уварваўся ў яго і знішчыў са сваім аддзяленнем 11 салдат. Калі камандзір роты выбыў з-за ранення, сяржант Шаўчэнка прыняў на сябе камандванне ротай і працягваў выкананне задачы.

Адвагу і рашучасць праявіў камандзір аддзялення сяржант Амаях. Ён са сваім

аддзяленнем знішчыў станковы кулямёт, які не даваў магчымасці нашай пяхоце рухацца наперад, а пад варожым агнём вынес з поля бою параненага камандзіра роты лейтэнанта Малаха, затым вярнуўся і прыняў камандаванне на сябе.

17.7.1944 г. Камандзір роты першага батальёна 353-га сп Кузняцоў у баях за н. п. Еланцы праявіў сваё ўменне і знаходлівасць. Яго роце была пастаўлена задача: нанесці ўдар з фронту, выбіць праціўніка і забяспечыць батальёну далейшае наступленне. Тав. Кузняцоў, падышоўшы да вёскі, натыкнуўся на шалёнае супраціўленне праціўніка і рота вымушана была залегчы. У сувязі з гэтым Кузняцоў вырашыў пакінуць адзін узвод для імітацыі наступлення, а два другіх уначы вывеў на левы фланг праціўніка і раптоўна атакаваў яго. Не чакаючы флангавага ўдара гітлераўцы адступілі, пакінуўшы ў вёсцы 15 забітых салдат.

*ЦАМА РФ, ф. 2279, воп. 1, спр. 44, арк. 90, 101.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 270-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

...23.7.1944 г. Дывізія пасля артпадрыхтоўкі атакавала праціўніка на рубяжы Карасіна—Мялка. Праціўнік аказваў моцнае супраціўленне. Дзеля развіцця поспеху ў бой была ўзведзена вучэбная рота, якая ў 19-00 штурмам авалодала в. Мялка...

...24.7.1944 г. Дывізія атакавала праціўніка, але сустрэўшы моцнае супраціўленне поспеху не мела...

*ЦАМА РФ, ф. 1502, воп. 1, спр. 37, арк. 22—23.*

## З БАЯВОГА ДАНЯСЕННЯ ШТАБА 6-й ГВАРДЗЕЙСКАЙ АРМІІ КАМАНДУЮЧАМУ 1-га ПРЫБАЛТЫЙСКАГА ФРОНТУ АД 23.7.1944 г. 21-00

...Ламаючы моцнае супраціўленне праціўніка, абыходзячы і знішчаючы асобныя яго ўмацаваныя пункты, войскі (арміі) вызвалілі мястэчкі Каплава, Плюсы, Дубіна, Баруны, Бароўка, Карасіна... і болей за 150 іншых населеных пунктаў, прасунуліся ад 2 да 15 км у заходнім і паўночным напрамках... За суткі баёў знішчана да 1000 гітлераўскіх салдат і афіцэраў, 43 кулямёты, 13 мінамётаў, 7 гармат, падбіта 4 танкі.

*ЦАМА РФ, ф. 335, воп. 5113, спр. 354, арк. 322—323.*

## З ЖУРНАЛА БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯЎ 473-га СТРАЛКОВАГА ПАЛКА 154-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

Да 12-00 24.7.1944 г. полк заняў Плюсы. Страты праціўніка — да 150 чалавек.

*ЦАМА РФ, ф. 473 сп, воп. 140071, спр. 22, арк. 9.*

## ЖДАНАЎ АЛЯКСЕЙ МІТРАФАНАВІЧ

Герой Савецкага Саюза. Маёр, камандзір 2-га стралковага батальёна 287-га стралковага палка 51-й Віцебскай Чырвонасцяжнай стралковай дывізіі.

Нарадзіўся 17 сакавіка 1917 г. у в. Круглае Аляксееўскага раёна Белгародскай вобласці. Скончыў педвучылішча (1937 г.), вучыўся ў Варонежскім педінстытуце, У Чырвонай Арміі з 1939 г. З 1941 г. — на Заходнім, з лютага 1942 — Паўночна-Заходнім франтах. З кастрычніка 1943 г. ваяваў у складзе I Прыбалтыйскага фронту. Быў паранены два разы (1941 г., 1943 г.), узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны 2 ст.



А. Жданаў.

Камандзір батальёна, маёр Жданаў 14 ліпеня 1944 г. ля в. Бейнары разам з падраздзяленнем трапіў у акружэнне. Заняўшы кругавую абарону, некалькі гадзін батальён адбіваў атакі ворага. За гэты час было падбіта 3 танкі і 2 гарматы, знішчана значная колькасць салдат праціўніка. Батальён са значнымі стратамі здолеў прарвацца. Групу прыкрыцця узначальваў Жданаў, які геройскі загінуў у гэтым баі.

Пахаваны ў брацкай магіле ў г. Браславе.

**З успамінаў ваенфельчара другога стралковага батальёна 287-га стралковага палка А. П. Храпач**

...Ад Полацка да Браслава дывізія ішла хутка. Вялікіх страт у батальёнах не было. І толькі на Браслаўшчыне...

Сітуацыя, якая здарылася пад Бейнарамі — гэта не адзіны эпізод, зарэгістраваны ў час вайны. Я называю гэта нашай ганьбай. Напярэдадні таго бою вечарам як раз прывезлі ў батальён кінафільм «Суvoраў» і патэфон. Пасля кіно танцавалі вальс пад грампласцінку. А на досвітку загад — наперад. Камбат А. М. Жданаў з маім мужам — старшым ад'ютантам батальёна спрабавалі даказаць, што рухацца далей небяспечна без разведкі. Але да іх голасу ніхто не прыслухаўся. Загад патрабавалі выконваць бясспрэчна... У выніку другі батальён трапіў у пастку, натыкнуўшыся на моцны заслон праціўніка, які здолеў ахапіць яго з бакоў. Бачачы, што прарвацца наперад нельга, камбат загадаў адыходзіць назад. Ён не хацеў дарэмных ахвяр і сам з некалькімі кулямётчыкамі прыняў агонь на сябе... Было шмат параненых. Мы спешна адпраўлялі іх у медсанбат. У гэтым баі геройскай смерцю загінуў камбат. Яго цела удалося вынесці. На дапамогу падаспелі дзве роты з іншых радраздзяленняў. Немцаў адагналі.

З усімі ўшанаваннямі мы пахавалі свайго любімага камандзіра...

*«Браслаўская звязда». 1989. 1 ліпеня.*



Месца апошняга бою Героя Савецкага Саюза А. Жданава.

**ІВАН МІКІТАВІЧ ВАЛЧКОЎ**

Герой Савецкага Саюза. Капітан, камандзір роты 22-га стралковага палка 9-й сд. Нарадзіўся 30 жніўня 1910 г. ў в. Нічаева Тамбоўскай вобласці. Адукацыя пачатковая, працаваў пажарнікам, міліцыянерам. У 1932—1935 гг. служыў у Чырвонай Арміі. З 25 кастрычніка 1941 г. на Калінінскім фронце. З лютага 1944 г. у складзе 1-га Прыбалтыйскага фронту. Чатыры разы быў паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені.



І. Валчкоў.



Родныя І. Валчкова ля бюста героя.




Алея Славы І. Валчкова.

14 ліпеня 1944 г. рота, якой камандаваў капітан Валчкоў, на вышыні ля в. Плюсы, мужна адбіваючы шматлікія атакі нямецкай пяхоты і танкаў, знішчыла звыш за сто гітлераўцаў. Камандзір роты быў паранены, але поля бою не пакінуў. Застаўшыся з невялікай группай байцоў, ён падняў іх у апошнюю атаку. Уся група на чале з камандзірам загінула. І. М. Валчкову пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пахаваны ў брацкай магіле ў г. Браславе.

### ВЕНЬЯМІН ЛЕАНІДАВІЧ ЗАЙЦАЎ

Герой Савецкага Саюза. Гвардыі сяржант, разведчык 52-й асобнай разведроты 51-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Нарадзіўся 24 красавіка 1923 г. ў в. Дабрышчава Іванаўскай вобласці. Скончыў 7 класаў, працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з кастрычніка 1941 г. Паранены (1942 г.), узнагароджаны ордэнам Славы III ступені 20 ліпеня 1944 г. пры вяртанні з тыла ворага Зайцаў разам з групай разведчыкаў ля воз. Дрысвяты натыкнуўся на праціўніка. Прыкрываючы адход сваіх баявых сяброў, Зайцаў знішчыў 5 гітлераўцаў, быў паранены. Калі гітлераўцы акружылі яго, апошняй гранатай падарваў сябе і акружыўшых яго немцаў. За гэты подзвіг яму пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пахаваны ў брацкай магіле п. Турмантас Літоўскай Рэспублікі.

# Вызваляючы наш раён

У ходзе вызвалення Браслаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх войск часці Чырвонай Арміі панеслі значныя людскія страты. Выяўлена 2714 прозвішчаў загінуўшых салдат і афіцэраў. Пераглядаючы хроніку падзей можна вылучыць найбольш жорсткія баі з вялікімі стратамі з боку Чырвонай Арміі. Пацвярджэнне таму — штодзённыя баявыя данясенні і зводкі, а таксама спісы беззваротных страт асабістага складу. Такія спісы вяліся ў кожным падраздзяленні — роце, батальёне, палку, дывізіі, арміі, медыцынскай установе — медыка-санітарных батальёнах і палявых шпіталях.



Г. Шакураў.




Медальён помніка У. Кірыкаву.

З усіх падраздзяленняў Чырвонай Арміі, вызваляўшых наш край, найбольшыя людскія страты панесла 9-я гв. сд (460 салдат і 55 афіцэраў).

Шмат воінаў загінула ў 154-й (248 салдат і 19 афіцэраў), 29-й (264 салдаты і 21 афіцэр), 47-й (215 салдат і 30 афіцэраў), 51-й (154 салдаты і 30 афіцэраў), а таксама ў падраздзяленнях 166-й і 46-й гвардзейскай стралковых дывізій.

Вялікая колькасць савецкіх салдат і афіцэраў загінула ў наваколлях Відзаў, Карасіна, Браслава, Друі, Быстрамаўцаў, баруноў, Плюсаў. Так, 9-я гв. сд панесла значныя страты 6 ліпеня ў баі каля в. Шакуры пры наступленні на Браслаў. У гэтым баі загінула каля 50 чалавек. Некалькі соцен салдат і афіцэраў страціла 9-я гв. сд у баях каля вёсак Пустошка і Плюсы. За адзін толькі дзень баёў 7 ліпеня каля в. Яя на пераправе праз р. Друйка 473-і полк 154-й сд недалічыўся 65 салдат і афіцэраў. У выніку баявых дзеянняў на падыходзе да г. Браслава ў часцях 166-й сд загінула да 100 чалавек.



Пахаванне загінуўшых пры вызваленні Браслава.

Палкі 47-й сд з 11 па 18 ліпеня вялі жорсткія баі і панеслі цяжкія страты каля вёсак Ганжышкі, Крукі, Павялішкі, Ілга. Такія ж страты былі і ў 29-й, 270-й, 90-й гв. і іншых стралковых дывізіях. Журнал баявых дзеянняў 51-й сд на 13.7.1944 г. паказвае, што каля в. Карасіна ў гэты дзень загінулі 38 і былі паранены 141 воін дывізіі.

Акрамя непасрэдна баявых страт, шэраг салдат і афіцэраў памерлі ад атрыманых ран ў медыцынскіх установах. Медыка-санітарныя батальёны існавалі пры кожнай дывізіі. Звычайна яны размяшчаліся на адлегласці 5—7 км ад лініі фронту ў вёсках. Палявыя шпіталі разгортваліся ў глыбіні вызваленай тэрыторыі. У іх дастаўляліся цяжка параненыя воіны перад адпраўкай у тылавыя шпіталі. На Браслаўшчыне найбольш буйныя шпіталі размяшчаліся: 2227-ы хірургічны паля-

эвакуацыйны — в. Азяраўцы (15.7.—12.8.1944 г.), у в. Замошша (6—10.7.1944 г.), у в. Опса (14—20, 25—30.7.1944 г.), у в. Ахрэмаўцы (15—20.7.1944 г.), у в. Бердзякшне (20.7—1.8.1944 г.), у вёсках Альгердава, Пузевічы і Самавольцы. Пры шпіталях, на жаль, як прывіла мелі месца вайсковыя могілкі.

Для правядзення пахавання і ўшанавання памяці загінуўшых салдат у штаце кожнай дывізіі мелася пахавальная каманда, якая пасля баёў праводзіла пахаванне загінуўшых воінаў у адзіночных альбо брацкіх магілах. Найчасцей хавалі вайскоўцаў на месцах, прыдатных для тапаграфічнай прывязкі — раскрыжаваннях дарог, адзіночных выспах, берагах рэк і г. д. На магіле ставілася піраміда з зоркай і надпісам са звесткамі аб пахаваным. Існавалі выпадкі пахаванняў на грамадзянскіх могілках, як, напрыклад, у Браславе, вёскі Коханішкі, Лушнева, Струнеўшчына. Аднак далёка не ўсе загінуўшыя ў баях былі належным чынам пахаваныя, не ўсюды былі пастаўлены помнікі, што вельмі замінала пры перазахаванні праху ў брацкія магілы ў пасляваенныя гады. Радкі з загаду часцям 154-й сд ад 6.7.1944 г. таму пацвярджэнне: «Улік страт 510-га і 473-га палкоў нездавальняючы, кнігі пахаванняў маюцца, але запісы ў іх робяцца ад выпадку да выпадку... Пахавальныя каманды бяздзейнічаюць. У 510-м сп пахаванні робяцца не на палкавых могілках. Усё гэта кажа пра тое, што камандзіры палкоў не ўлічылі урокаў у раёне в. Яя, дзе засталося непахаванымі больш за 30 чалавек».

У канцы 40-х гадоў паўсюдна на Беларусі ў цэнтрах гарадоў і пасёлкаў былі аформлены адзіныя комплексы — брацкія магілы з устанаўленнем помнікаў. На жаль, на Браслаўшчыне справу гэтую правялі дрэнна і ўвогуле не скончылі. Фармальны, не адпавядаючы інструкцыям і здароваму сэнсу падыход зрабіў сваю справу — не ўсе магілы былі перанесены, не былі складзены спісы перапахаваных. Зараз вядома каля 3000 загінуўшых, а на плітах помнікаў высечана толькі 1358 прозвішчаў. Паўстае пытанне, як быць з астатнімі? Чаму, ведаючы месца першапачатковага пахавання, немагчыма знайсці прозвішчы на ўстаноўленых абелісках?

У выніку пошукаў у розныя часы было выяўлена некалькі адзіночных і групавых пахаванняў у вёсках Струнеўшчына, Какоўшчына, Азяраўцы, Заеленцы. Таму выраз — вайна не скончылася да той пары, пакуль не выяўлены і не пахаваны апошні салдат — актуальны і ў нашы дні.

*А. Панцялейка.*



Ветэраны вайны ўскладаюць кветкі да помніка вызваліцелям у Браславе.

### З НАГРАДНОГА ЛІСТА Я. М. ВАСІЛЬКОВА, КУЛЯМЁТЧЫКА 423-га СТРАЛКОВАГА ПАЛКА 166-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

У час аперацыі ў раёне г. Браслаў Вілейскай вобласці 5 ліпеня 1944 года кулямётчык Васількоў, застаўшыся адзін ля кулямёта, будучы параненым, ахвяруючы жыццём, падпусціў контратакуючую групу немцаў — да 150 чалавек на невялікую адлегласць і трапным агнём знішчыў болей за 100 чалавек. У выніку геройскага подзвіга тав. Васількова батальён адным з першых уварваўся ў Браслаў, што дазволіла палку выканаць баявую задачу па авалоданню горадам як важным апорным пунктам на Дзвінскім напрамку. Тав. Васількоў варты ўрадавай узнагароды ордэна Леніна*.

21.7.1944 г.

Камандзір 423-га палка палкоўнік **Уцянкоў.**

*ЦАМА РФ, ф. 33, воп. 686046, спр. 25, арк. 128.*

### З АПІСАННЯ ПОДЗВІГА СТАРШЫНЫ ВІКТАРА АЛЯКСЕЕВІЧА БАБІЧАВА КАЛЯ ЧЫГУНАЧНАГА ПЕРАЕЗДА ТЫЧКІ НЕПАДАЛЁКУ АД ДРУІ

... — Агонь! — Тугой хваляй паветра ўдарыла ў вушы. Лязгнуў затвор, выкінуўшы дыміўшуюся гільзу. І амаль у той момант Бабічаў зноў даў каманду:

— Агонь!..

У твар дыхнула жарам пораху. Спрытна падхапіўшы наступны снарад, Масолаў накіраваў яго ў казённік. Калі пыл развеяўся, Бабічаў убачыў палаючы, знявечаны снарадам грузавік. Навокал ляжала некалькі трупаў у брудна-зялёных мундзірах... Бабічаў адкінуў у бок непатрэбны ўжо кулямёт. Схапіў сапёрную рыдлёўку.

— За мной, у атаку, наперад! — што ёсць моцы выкрыкнуў Бабічаў і выскачыў са сховішча насустрач афіцэру. Разлік змагаўся мужна: артылерысты шпурлялі ў немцаў гранаты, кідаліся ў рукапашную, касілі ворага ва ўпор трапнымі чэргамі аўтаматаў... Сутычка скончылася раптоўна, як і пачалася...

*Друкуецца са скарачэннямі па кн. В созвездии славы. Волгоград. 1976. С. 13–14.*

Пераклад з рускай мовы.

### З успамінаў У. А. Озерава — былога ўдзельніка баёў на Браслаўшчыне

...12 ліпеня адбыўся крывапралітны бой. 1970-ы іптап падтрымліваў часці 51-й сд. Першая, пятая і шостая батарэі высунуліся на прамую наводку. Трэцяя і чацвёртая вялі стральбу з закрытых пазіцый. Па загаду маёра Шахаўцова гармату ст. сяржанта Собалева выкацілі на прамую наводку паўночна-усходней в. Станкавічы.

Танк праціўніка быў падбіты першым стрэлам. Немцы скіравалі агонь артылерыі і мінамётаў па гармаце. Тады разлік змяніў пазіцыю. Пры гэтым былі забіты наводчыкі сяржант Цюракоў і мал. сяржант Кірылаў.

Цяжкія баі завязаліся і на ўчастку 6-й батарэі... Пры разведцы ў рукапашным баі загінуў камандзір 6-й батарэі ст. лейтэнант Борнеў. Гіне на мінным полі самы малады камандзір узвода лейтэнант Рыжкоў. У час бою падарваўся, яму адарвала ногі. Смелы камандзір змагаўся пры штурме Полацка, з пісталета забіў некалькі фашыстаў. Забіты сувязіст мал. сержант Катуноў — застрэлены пры спробе прабіцца да асноўных сіл. Са свайго ППШ знішчыў некалькі аўтаматчыкаў...

...Чарговы разрыў кабеля... Моцны агонь уздоўж кабельнага дрота прыціснуў мяне да зямлі. Я адпоўз у бок... заўважыў кабель. Падключыў апарат і аказалася, што гэта варожая сувязь. Пасля гэтага хутка паправіў разрывы свайго кабеля і паведаміў камандзіру ўзвода лейтэнанту

*Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 г. Я. М. Васількоў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

Чуракову пра нямецкі кабель. Камандзір загадаў чакаць разведчыкаў з 29 сд. Праз некалькі хвілін яны прыбылі і я ім паказаў кабель. Вярнуўся назад. Пасля мне камандзір выказаў падзяку. Разведчыкі па кабелю ўстанавілі месцазнаходжанне варожага назіральнага пункта і знішчылі яго, ўзяўшы ў палон некалькі «языкоў»...

...Бесперапынныя баі. Не змаўкаюць стрэлы кулямётаў, гармат, мінамётаў. Перыядычна налятае варожая авіяцыя. У гэтых выпадках цела дрыжыць ад вою і выбухаў бомбаў. Акоп абвальваецца. Так ужо больш 20 дзён.

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

**З артыкула Т. Пашкевіч «Ён вызваляў Браслаўшчыну»**

«Мой брат старшы сяржант Канстанцін Іванавіч Мартынюк загінуў пры вызваленні Браслаўшчыны летам 1944 года. У пахаронцы, якую атрымала сям'я, паведамляецца, што пахаваны ён на ўскрайку г. п. Відзы. Нам хочацца ведаць, ці захавалася магіла. Я абавязкова прыеду, каб пакланіцца брату і тым, хто цаной свайго жыцця адстаяў свабоду нашай Радзімы».

*Г. Шаўчук.*

Гэта пісьмо Ганны Іванаўны Шаўчук прыйшло з Прыморскага краю. Выканаць просьбу жанчыны было не цяжка. На абеліску, што ўзвышаецца на брацкай магіле загінуўшых воінаў і партызан у г. п. Відзы высечана прозвішча К. І. Мартынюка... Вядома, нам хацелася больш падрабязна даведацца аб жыцці героя, які загінуў пры вызваленні нашага краю. Таму і папрасілі Ганну Іванаўну расказаць пра брата. І вось новае пісьмо.

«...Косця быў першанцам у сям'і... У цяжкі час рос хлопчык. Косця, як старэйшы з дзяцей, вымушаны быў дапамагаць бацькам паставіць на ногі трох меньшых братоў і сясцёр. Ён скончыў школу і пайшоў працаваць на лесазавод у горадзе Лесазаводск, у які пераехала жыць сям'я Мартынюкоў. Косця быў добрым работнікам... і яго прызначылі майстрам будаўніцтва...».

На службу ў армію К. Мартынюка прызвалі ў канцы мая 1941 года. А праз месяц пачалася Вялікая Айчынная вайна. Маладога салдата накіроўваюць на курсы малодшых камандзіраў, скончыўшы якія ён пападае на фронт...

Тры гады прыходзілі дадому пісьмы ад Косці Мартынюка, у якіх баец расказваў аб тым, як разам з таварышамі б'е фашыстаў. А ў ліпені 1944 года прыйшоў ліст, падпісаны незнаёмым почыркам. Таварыш нашага Косці Інакенцій Маркушын паведаміў, што брат загінуў 8 ліпеня пры вызваленні далёкага беларускага пасёлка Відзы, што яго пахавалі на ўскрайку населенага пункта.

*«Браслаўская звязда», 1984.*

**З артыкула М. Ходарава «Па слядах герояў»**

...Не спыняецца пошук загінуўшых у жорсткай бітве дабра са злом. Кожны год на абелісках паяўляюцца новыя імёны байцоў. Толькі ў нашым раёне за апошнія 15 гадоў устаноўлены 74 прозвішчы загінуўшых, да гэтуль невядомых салдат, знойдзены месцы іх захавання... Так, у мінулым годзе вучні Дрысвяцкай школы адшукалі на тэрыторыі сельсавета месца гібелі разведчыка Героя Савецкага Саюза В.Л. Зайцава і ўстанавілі, што ён пахаваны ў Турмантасе.

Пераважна ініцыятыва на пошук зыходзіць ад родных і блізкіх загінуўшых. Яны, як правіла, маюць «пахаронкі», у якіх азначаны раён гібелі воіна. Туды і звяртаюцца з просьбай аб адшуканні месца пахавання іх блізкага... З Масквы

да нас прыехалі адпачываць муж і жонка Баракаевы. Маці Баракаевай калісьці атрымала паведамленне, што яе муж гвардыі малодшы сяржант Гарэлаў Іван Мікалаевіч загінуў у разведцы 8 ліпеня 1944 года ў в. Зазоны Браслаўскага раёна... Дачка загінуўшага Рэната Іванаўна Баракаева пабывала ў названай вёсачцы, сустрэлася з яе жыхарамі. І трэба было такому здарыцца, што жыхар Зазон Храпан быў сведкам тых падзей. Непадалёку ад яго хаты напярэдадні вызвалення нашага раёна фашысты расстралялі нашага разведчыка. Калі Храпан натыкнуўся на цела забітага, у разведчыка былі звязаныя назад рукі і ён ляжаў тварам уніз. Храпан тут жа выкапаў магілу і пахаваў салдата.

Храпан паказаў магілу. Адбылося ўрачыстае перазахаванне загінуўшага ў Зарачча.

*2 ліпеня 1988 г. «Браслаўская звязда».*

## Кропка не пастаўлена

Ёсць ля в. Струнеўшчына могілкі, дзе спрадвеку мясцовыя жыхары хавалі блізкіх. У час вайны тут з'явіліся магілы вайскоўцаў. Стаіць сціплы помнік, на камяні якога высечана «Эфрон Георгій Сяргеевіч, загінуў у ліпені 1944 г.». Колькі клопатаў і пошукаў звязана з імем гэтага чалавека, колькі газетных і часопісных публікацый напісана аб ім! З'явілася новая падстава яшчэ раз звярнуцца да ваеннага лёсу сына Марыны Цвятаевай Георгія Эфрона...



Магіла Г. Эфрона.

Справа ў тым, што не ўсё з напісанага раней адпавядае сапраўднасці. Пасля таго, як трагічна абарвала сваё жыццё маці, Эфрон апынуўся ў Ташкенце. Здарылася гэта ў канцы 1941 г. У гэты час армія вяла цяжкія баі з праціўнікам. Быць карысным Радзіме, вядома, хацелася і юнаку. Але ўзрост не дазваляў яму папасці на фронт. Да 1944 г. Георгій вучыцца і толькі ў лютым гэтага года яго прызываюць у 84-ы запасны стралковы полк, у якім юнак і спасцігаў вайсковую навуку тры з лішнім месяцы. Нарэшце прыйшоў дзень 28 мая, калі Георгія з чарговым папаўненнем залічылі ў 7-ю роту 3-га батальёна 437-га стралковага палка, які ўваходзіў у склад 154-й стралковай дывізіі.

6 ліпеня з баямі 154-я сд выйшла на тэрыторыю Браслаўскага раёна. Рухалася яна шырокім фронтам — ад Друі да Слабодкі. 437-ы полк займаў пазіцыі ля вёсак Какоўшчына, Бернатоўшчына, па беразе р. Друйкі. Праціўнік замацаваўся на высотцы каля в. Друйка. Са світанкам пачаўся бой. Адным з байцоў, што ўзняліся ў атаку, быў Эфрон. Георгій быў паранены. У кнізе ўліку страт з'явіўся кароткі апошні запіс аб ім: «Чырвонаармеец Г.С. Эфрон адбыў у медсанбат па раненню». І дата — 7.7.1944 г. На гэтым Эфрон знік назаўсёды. Аб ім ёсць дакладны запіс: выбыў у 183-і медсанбат. 2 і 8 ліпеня ён размяшчаўся ў в. Шнуркі, а 9 ліпеня ў в. Кажэнікі Мёрскага раёна. Гэта 7—8 км ад

перадавой. Аднак імя Георгія ў дакументах медсанбата не значыцца.

Што магло здарыцца, чаму Эфрон не трапіў у медсанбат? Адказу на гэта пытанне няма, можна выказаць толькі меркаванні. Абоз маглі разбамбіць па дарозе і г.д. У архіўных справаздачах трапіўся цікавы дакумент, з якога вынікае, што ў 437-м палку 8 чалавек невядома куды падзеліся. Іх няма сярод загінуўшых. Чаму і нам не задаць пытанне: а можа Эфрон у ліку тых васьмі?

Падсумоўваючы дакументы можна сказаць, што радавы Георгій Эфрон пайшоў у свой апошні бой каля в. Друйка, быў паранены і адбыў на лячэнне. Што здарылася потым — невядома. І гэта невядомасць ставіць новае пытанне: хто ж пахаваны на ўскрайку могілак в. Струнеўшчына?

*А. Панцялейка*

## ДАТЫ ВЫЗВАЛЕННЯ АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БРАСЛАЎШЧЫНЫ

Інава — 3.7.1944 г.
Рудава — 3.7.1944 г.
Гірдзюшы — 3.7.1944 г.
Зарачча-млын — 4.7.1944 г.
Вайнюнцы — 4.7.1944 г.
Дрысвяты — (4.7)*, (5.7), 10.7.1944 г.
Опса — (2.7)*, 4.7.1944 г.
Богіна — 4.7.1944 г.
Казяны — 4.7.1944 г.
Зазоны — (4.7)*, 6.7.1944 г.
Усяны — 4.7.1944 г.
Відзы — (4.7)*, 9.7.1944 г.
Азяраўцы — 5.7.1944 г.
Пагошча — 5.7.1944 г.
Друя — 6.7.1944 г.
Друйск — (7.7)*, 12.7.1944 г.
Друйка — 7.7.1944 г.
Яя — 7.7.1944 г.
Браслаў — 6.7.1944 г.
Братняя Гара — 8.7.1944 г.
Даўблі — 8.7.1944 г.
Дварышча — 9.7.1944 г.
Каханішкі — 9.7.1944 г.
Гірэйшы — 10.7.1944 г.
Струста — 10.7.1944 г.
Баруны — (10.7)*, 20.7.1944 г.
Крукі — 11.7.1944 г.
Карасіна — (11.7)*, (13.7), 23.7.1944 г.
Мялка — (11.7)*, 23.7.1944 г.
Плюсы — (11.7)*, 24.7.1944 г.
Дубіна — (11.7)*, 23.7.1944 г.
Мяжаны — 11.7.1944 г.
Мікалаюнцы — (12.7)*, 23.7.1944 г.
Бейнары — (12.7)*, 23.7.1944 г.
Дальнарэчча — (12.7)*, 23.7.1944 г.
Анісімавічы — (13.7)*, 23.7.1944 г.
Юраны — (13.7)*, 22.7.1944 г.
Слабодка — 13.7.1944 г.
Гаўрылаўцы — 13.7.1944 г.
Луні — 13.7.1944 г.
Быстрамаўцы — (13.7), (15.7)*, 22.7.1944 г.
Мурмішкі — 14.7.1944 г.
Абаб'е — (15.7)*, 22.7.1944 г.
Марцінішкі — 16.7.1944 г.
Урбаны — 18.7.1944 г.
Дзерукі — (18.7)*, 20.7.1944 г.
Дундары — 22.7.1944 г.
Данькі — 22.7.1944 г.
Краснагорка — 22.7.1944 г.

* населеныя пункты, якія пераходзілі некалькі разоў з рук у рукі (даты пазначаны ў дужках)

### АБ'ЯДНАННІ І ЗЛУЧЭННІ І-га ПРЫБАЛТЫЙСКАГА ФРОНТУ, ЯКІЯ ВЫЗВАЛЯЛІ БРАСЛАЎШЧЫНУ

6-я гвардзейская армія (камандуючы генерал-палкоўнік **І.М. Чысцякоў**):

2-гі гвардзейскі стралковы корпус (камандзір генерал-лейтэнант **А.С. Ксенафонтаў**) у складзе:

9-я гвардзейская стралковая дывізія (камандзір палкоўнік **Я.Я. Вербаў**);

46-я гвардзейская стралковая дывізія (камандзір палкоўнік **К.А. Васільеў**);

166-я стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр **А.І. Светлякоў**).

22-гі гвардзейскі стралковы корпус (камандзір генерал-маёр **А.І. Ручкін**) у складзе:

47-я стралковая Невельская, ордэнаў Леніна і Суворова дывізія (камандзір палкоўнік **П.В. Чарнавус**);

51-я стралковая Віцебская Чырвонасцяжная дывізія (камандзір генерал-маёр **А.Я. Хвастоў**);

90-я гвардзейская стралковая Віцебская Чырванасцяжная дывізія (камандзір генерал-маёр **В.Е. Уласаў**).

23-і гвардзейскі стралковы корпус (камандзір генерал-лейтэнант **А.Н. Ермакоў**) у складзе:

71-я гвардзейская стралковая Віцебская ордэна Леніна дывізія (камандзір генерал-маёр **І.П. Сівакоў**).

103-і стралковы корпус (камандзір генерал-маёр **Л.Ф. Фядзюнкін**) у складзе:

29-я стралковая Полацкая ордэна Суворава дывізія (камандзір палкоўнік **А.К. Макар'еў**);

270-я стралковая Дзямідаўская Чырвонасцяжная дывізія (камандзір генерал-маёр **Ш.П. Бяляеў**).

43-я армія (кмандуючы генерал-лейтэнант **А.П. Белабарадаў**): 334-я стралковая Віцебская дывізія (камандзір палкоўнік **У.Т. Гнедзін**).

1-ы танкавы корпус франтавога падпарадкавання (камандзір генерал-лейтэнант **В.В. Буткоў**) у складзе:

89-я танкавая брыгада (камандзір падпалкоўнік **А.Н. Ермакоў**); 44-я мотастралковая брыгада (камандзір падпалкоўнік **А.І. Халаеў**);

46-я асобная механізаваная брыгада (камандзір генерал-маёр **Н.Л. Манжурын**).

154-я стралковая дывізія франтавога падпарадкавання (камандзір палкоўнік **П.Т. Сачылаў**, з 12.7.1944 г. палкоўнік **У.І. Саўчук**).

## Доўгімі вёрстамі вайны

Пасля вызвалення тэрыторыі Браслаўшчыны ад нямецка-фашысцскіх захопнікаў у канцы ліпеня 1944 г., многія жыхары краю папоўнілі рады Чырвонай Арміі. Вайна для гэтых людзей працягвалася. Наперадзе быў амаль год цяжкіх баёў у краінах Прыбалтыкі, Усходняй Еўропы, іншых рэгіёнаў, вайна з мілітарыскай Японіяй.

Дакладную колькасць салдат-ураджэнцаў Браслаўшчыны,якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне ўстанавіць амаль немагчыма. Па дадзеных захаваўшыхся кніг прызыву за 1944 г. Браслаўскага і Відзаўскага райваенкаматаў вынікае, што гэта лічба перавышае 3 тысячы.

Аднак, не толькі з сярэдзіны 1944 г. ваявалі салдаты-браслаўчане з захопнікамі. Першымі ўступалі ў бой з фашызмам нашыя землякі ў 1939 г. у складзе Польскіх узброеных сіл, калі Браслаўшчына ўваходзіла ў склад Заходняй Беларусі і юнакоў прызывалі ў Войска Польскае. Сярод кадравых афіцэраў Чырвонай Арміі, для якіх вайна пачалася 22 чэрвеня 1941 г., былі і ўраджэнцы Браслаўшчыны.

У першыя дні вайны, да фашысцкай акупацыі, Браслаўскім і Відзаўскім ваенкаматамі была праведзена частковая мабілізацыя насельніцтва ў Чырвоную Армію. Прызывалі ў асноўным партыйных і савецкіх работнікаў, актывістаў, кіраўнікоў роз-

нага ўзроўню. Аднак, у параўнанні з усходнімі раёнамі Беларусі, дзе ў першы месяц вайны ў армію былі прызваны амаль усе ваеннаабавязаныя, лік ураджэнцаў Браслаўшчыны сярод іх быў нязначным. Галоўная прычына — хуткае занятце краю ворагам. Немалаважнымі прычынамі былі і пытанні палітычна-адміністрацыйнага характару. У выніку, большая частка мужчын прызыўнога ўзросту Браслаўшчыны аказаліся ва ўмовах акупацыі.

Найбольшая колькасць браслаўчан была мабілізавана ў Чырвоную Армію пасля вызвалення краю. Са жніўня па кастрычнік 1944 г. звыш 3 тысяч жыхароў раёна папоўнілі часці савецкіх войск. У першую чаргу пайшлі на фронт партызаны расфарміраваных брыгад імя Г.К. Жукава, «Спартак», «За Радзіму», якія дзейнічалі на тэрыторыі Браслаўскага і сумежных з ім раёнаў, а затым і ўсе ваеннаабавязаныя.

Спачатку мабілізацыю праводзілі палявыя ваенкаматы. Іх пакідалі ў Браславе вайсковыя часці, якія з баямі прайшлі праз Браслаўшчыну. Паступова іх функцыі перайшлі да адноўленых у Браславе і Відзах раённых ваенных камісарыятаў.

Баявыя шляхі ўраджэнцаў Браслаўшчыны — салдат Чырвонай Арміі і Войска Польскага, пралягалі праз Прыбалтыку, Усходнюю Прусію, Польшчу, Аўстрыю, Венгрыю, Германію.

Жураўскі І.А. удзельнічаў у штурме крэпасці Кеніксберг, Маслякоў Р.Е. вызваляў Будапешт і Вену, Альхімовіч М.А., Мінчанкаў Ц.Ц., Дубіна М.М. — Варшаву і Берлін. Многія Браслаўчане вялі апошнія баі ля рэйхстага ў Берліне: Хахлоў Г.Д., Кірылаў І.Т., Леановіч К.А. і інш.

Пётр Іванавіч з вёскі Стаўрова трапіў на фронт у 44-ым, пасля вызвалення Беларусі і прайшоў у складзе 270-й сд 1-га Беларускага фронту шлях ад Варшавы да Берліна. Не раз глядзеў смерці ў вочы.

У памяць урэзаўся дзень 22 красавіка 1945 года. Вялі страшэнны бой ужо ў Берліне. Свішчуць кулі, бясконцая страляніна... Тады яго і паранілі. За гэты бой ён атрымаў медаль «За адвагу».

А свята перамогі сустракаў у шпіталі, што быў у 25 кіламетрах ад Берліна.

Васіль Яфімавіч Самахвалаў з вёскі Тарапоўка на фронт трапіў у 1944-ым, пасля вызвалення нашага раёна... Яму асабліва запаў у памяці бой пад Кёнігсбергам. Мабыць таму, што многіх сяброў не далічыліся пасля таго бою. Наша рота атрымала заданне авалодаць назіральным пунктам праціўніка. У атаку нас паднялося 76. У жывых засталіся 24. Падцікаваў і мяне снайпер. Але пашчасціла, куля трапіла ў левае плячо. Памятаю, іду на перавязку, а нашы параненыя просяць: «Салдат, дабі, пазбаў ад мук»...

За адвагу, праяўленую ў тым баі, В.Я. Самахвалаў атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

...У Еўропу прыйшоў мір, а на Далёкім Усходзе ўсё яшчэ грымела вайна. 25 мая часць, у якой служыў В.Я. Самахвалаў, пагрузілі ў эшэлоны і адправілі на ўсход. Прайшоў салдат з баямі праз Маньчжурыю да Харбіна, праз пустыню Гобі да Мугдэна. Але і пасля капітуляцыі Японіі Васіль Яфімавіч да красавіка 1947 года служыў у Савецкай арміі. І толькі 27 мая вярнуўся ў родную вёску.

Сярод землякоў і людзей для якіх Браслаўшчына стала другой радзімай ёсць тыя хто прайшоў ваеннымі дарогамі амаль 4 гады: М.І. Любчанка, А.М. Суліменка, Я.А. Быкаў, А.А. Міхайлава ўдзельнічала ў баях на Поўначы, Ф.І. Грыбоўскі ваяваў на Каўказе, Р.А. Гашкоў абараняў Кіеў, а І.Я. Шырокаму, С.М. Ваяводаву,

М.А. Насыру, А.К. Васільеву, К.А. Сімановічу давялося змагацца з японцамі на Усходзе.

Ваявалі нашы землякі не толькі на франтах Вялікай Айчыннай, але і ў тылу — аднаўлялі гаспадарчыя аб'екты, чыгунку, праводзілі размініраванне.

За ратныя подзвігі ў барацьбе з ворагам многія ўраджэнцы Браслаўшчыны атрымалі ўзнагароды. Галоўнай адзнакай салдацкай доблесці — ордэнам Славы былі ўзнагароджаны Д.І. Іваноў з в. Дубіна, Я.М. Кавалькоў з в. Булавішкі, М.Ф. Болундзь з г. Браслава, Г.М. Веліканаў і У.В. Папоў з п. Відзы, А.К. Тайц з п. Друя. Сярод узнагароджаных трэба адзначыць М.Ф. Сірату, які атрымаў ордэн Славы III ст., ордэн Айчыннай вайны I ст., медалі «За адвагу» і «За ўзяцце Вены», Шымана М.А. — кавалера ордэнаў Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ст., Нароўскага А.Х., узнагароджанага двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. За свае подзвігі В.Ф. Губар узнагароджаны ордэнамі Славы II ст., «Чырвонай Зоркі», медалем «За ўзяцце Кенігсберга», К.Н. Чалкін удастоіўся ордэна Чырвонага Сцяга, Самовіч У.В. — ордэна Славы III ст., медалёў «За адвагу», «За вызваленне Прагі».

Ёсць сярод браслаўчан і тыя, хто атрымаў польскія баявыя ўзнагароды. Ордэнам «Грунвальд—Берлін» узнагароджаны П.А. Раманцэвіч, Б.А. Віткоўскі, медалем «За Нісу, Одэр і Балтыку» К.І. Баркоўскі, П.Я. Грыгор'еў, М.У. Карніцкі.

Не ўсім пашасціла вярнуцца да хаты. Вядомы 1383 прозвішчы браслаўчан, якія палеглі на палях вайны. Значная колькасць нашых землякоў загінула пры вызваленні Літвы і Латвіі, а таксама Калінінградскай вобласці, шмат загінула на тэрыторыі Германіі.

Адкрытым пытаннем застаецца такая акалічнасць: 60-70 % загінуўшых ураджэнцаў Браслаўшчыны лічацца без вестак прапаўшымі. За гэтым халодным казенным вызначэннем адно няўмольнае пытанне родных салдата — калі загінуў і дзе пахаваны блізкі чалавек? Без сур'ёзнага даследавання праблемы вельмі цяжка адказаць на гэтыя пытанні, і наўрад ці будзе на іх адказ.

*А. Панцялейка*

**З успамінаў удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Р. Памялова**

Май 1945 года стаў сапраўды незабыўным месяцам, асабліва яго дзевяты дзень.

У канцы красавіка 1945 года наша 76-я гвардзейская Ельнінска-Варшаўская Чырвонасцяжная, ордэна Суворава стралковая дывізія фарсіравала Одэр, дзе ішла вялікая бітва. Гітлераўцы адчаянна супраціўляліся. Савецкія воіны зрабілі ўсё для таго, каб зламаць упартасць ворага, бо для нас гэта быў апошні і рашаючы ўдар па бярлозе фашыстаў — Берліну. Наперадзе нас чакала перамога.

Нашай асобнай 36-й мотаразведроце разам з ротай аўтаматчыкаў і артылерыйскім дывізіёнам давялося захопліваць плацдарм на заходнім беразе Одэра. Бой быў цяжкім. Загінула шмат баявых сяброў — камандзір роты, старшына Павел Іваноў, камандзір узвода і іншыя. Але гэта не стрымала націску нашых войск. За адну ноч дывізія поўнасцю пераправілася праз раку. Узламаўшы варожую абарону, мы пайшлі на Берлін і ўжо 30 красавіка і 1 мая, пасля авалодання горадам Шпандау, вялі баі ў Патсдаме і ў наваколлі германскай сталіцы.

Якая была радасць калі 2 мая капітуляваў Берлін. Але для нас вайна на гэтым не скончылася. Працягвала аказ-

ваць супраціўленне групоўка фашысцскіх войск колькасцю каля 30 тысяч чалавек. Немцы адступілі да Эльбы. Наша камандаванне рашыла пакончыць з групоўкай, а потым ісці на злучэнне з войскамі саюзнікаў. Нямецкаму камандаванню была прапанавана безагаворачная капітуляцыя, бо мы лічылі бяссэнсоўным знішчэнне салдат праціўніка, але фашысцкае камандаванне адхіліла наш ультыматум.

У складзе групы парламенцёраў, якую ўзначальваў начальнік дывізіённай разведкі маёр Навумаў, мне двойчы давялося хадзіць да праціўніка. І толькі пасля таго, як разведчыкі ўстанавілі месцазнаходжанне сакрэтнага аэрадрома з дваццаццю нямецкімі самалётамі, які наша авіяцыя знішчыла, і ўзялі ў палон генерала, начальніка шпіталю нямецкай групоўкі, большасць нямецкіх афіцэраў і салдат рашылі капітуляваць.

Я бачыў радасныя ўсмешкі на тварах нямецкіх салдат, якія былі асуджаны на немінучую смерць. Але яны засталіся жывымі дзякуючы нашай вытрымцы. Многія па-руску казалі: «Дзякуй, дзякуй».

7 мая раніцай я з групай байцоў вярнуўся з начной разведкі. Мы павінны былі разведаць мост на Эльбе і пераправу праціўніка на бок саюзных войск. Далажыўшы камандванню аб выніках Разведкі, я прылёг адпачыць. Але спаць доўга не давялося. Сабраліся нашы разведчыкі і пачалі дзяліцца ўражаннямі аб апошніх падзеях, аб тым, што мы перамаглі. Пасля доўгіх ваенных і цяжкіх год у гэта нават не верылася. Як цяпер памятаю словы нашай пераводчыцы Раі:

— Грыша, няўжо ты не верыш, што хутка канец вайны, няўжо ты не пераканаНы у гэтым? Я думаю, што сёння была твая апошняя начная разведка...

Быццам у падцвярджэнне яе слоў, мяне выклікаў камандзір дывізіі і загадаў у складзе матаразведроты, батальёна аўтаматчыкаў і батальёна танкаў ісці ў апошні бой. Да Эльбы заставалася 12 кіламетраў. Гэты бой быў апошнім, хуткім, рашаючым і нечаканым для ворага.

І вось у чатыры гадзіны раніцы мы пачулі па радыё, што прадстаўнікі нямецкіх узброеных сіл падпісалі акт аб безагаворачнай капітуляцыі. Фашызм разгромлен, наш народ, Савецкая Армія атрымалі перамогу над злейшым ворагам чалавецтва!..

Мы стаялі і не верылі, ад радасці плакалі, абдымаліся...

*«Браслаўская звязда». 1969. 9 мая.*

## Шмат разоў глядзеў у вочы смерці

Уладзіміра Уладзіміравіча Акулу вайна напаткала нечакана, як і многіх мільёнаў савецкіх людзей. Па накіраванню Браслаўскага райкома камсамола ён паехаў у Валожынскі раён на курсы шафёраў. Але мара стаць поўнаўладным гаспадаром машыны развеялася, як дым, на другім месяцы вучобы.

З трывогай і смуткам Уладзімір вярнуўся дамоў. Аднойчы юнак пазнаёміўся з Анціпенкам. І з тае пары ён ужо добра ведаў, чым займацца, што рабіць. Спачатку збіраў для партызан розныя звесткі, а неўзабаве яго забралі ў атрад. Разам са сваімі баявымі сябрамі хадзіў на заданні, у разведку, граміў варожыя гарнізоны. А калі партызанская брыгада імя Жукава сустрэлася з часцямі Чырвонай Арміі, многія народныя мсціўцы пайшлі на фронт. У іх ліку быў і Уладзімір Акула. Залічылі яго ў 975 полк 270-й Чырвонасцяжнай дывізіі Першага Прыбалтыйскага фронту. І пайшоў салдат са сваімі новымі сябрамі вызваляць ад ворага савецкую зямлю.

Кожная прафесія на вайне небяспечная, але прафесія разведчыка — утрая. Нездарма іх так паважалі на фронце. Уладзіміра пасля ўступлення ў рэгулярную часць па ўласнаму жаданню залічылі ў

палкавую разведку. Колькі разоў яму давялося хадзіць у «госці» да ворага — не злічыць. Па яго ўласнаму прызнанню, за адну ноч нярэдка даводзілася двойчы адпраўляцца за лінію фронта, каб дастаць «языка». І кожны раз у любы момант яго падпільноўвала смяртэльная небяспека. Аб гэтым сведчаць тры раненні, адно з якіх цяжкае.

Уладзімір Уладзіміравіч расказаў некалькі эпізодаў са сваёй баявой біяграфіі, больш памятныя.

— Неяк мы атрымалі загад захапіць палоннага. Калі добра сцямнела, група разведчыкаў бясшумна накіравалася ў бок немцаў. Усюды цішыня, зрэдку толькі пастрэльваюць дзяжурыўшыя ў траншэі фрыцы. Вось аднаго з іх і рашылі браць. Група прыкрыцця засталася ззаду, а я з таварышамі папаўзлі далей. Дабраліся да бруствера. Выбраўшы зручны момант, таварыш начакана схапіў фашыста за каўнер, а другой рукой за кулямёт. Я ж ускочыў у траншэю і кінуўся на спіну ворага. Ды толькі немец трапіўся здаравенны, моцны. Злаўчыўшыся, ён схапіў мяне рукой і падмяў пад сябе. Але ад нас дваіх вырвацца не мог. Падпоўзшы трэці разведчык дапамог узяць «языка». ...Пад Шаўляем аднойчы пайшлі ў разведку боем днём. Задача — выклікаць агонь на сябе і выявіць варожыя агнявыя кропкі. У гарачцы боя мы ўчатырох нарваліся на зенітны бункер. Сталі стукаць у дзверы, крычаць «Хэндэ хох». І неўзабаве з бункера выйшлі з паднятымі рукамі 14 немцаў, сярод іх адзін афіцэр. Яны бачна, не ведалі колькі нас. Палажыўшы іх на зямлю, усёй групай папаўзлі да сваіх. Нас сустрэў камандзір палка. Ён падыйшоў да афіцэра і... выцягнуў з кабуры пісталет! Ох і давялося выслухаць у свой адрас, як старшаму, непрыемных слоў ад камандзіра! А потым за гэту аперацыю атрымаў ордэн Славы III ступені. Другой ступені «Славу» атрымаў за станцыю «Вайноды», што ў Літве.

Шмат разоў глядзеў у вочы смерці адважны разведчык. Абыйшла яна яго і ў апошняй аперацыі, аднак застаўся на ўсё жыццё інвалідам. Кінутая яму насустрач граната, трапіла ў дыск аўтамата і ўзарвалася, параніўшы цела не адным дзесяткам асколкаў. Гэта здарылася перад самай Перамогай, 14 красавіка 1945 года...

*Н. Цярэнцьеў*

*«Браслаўская звязда». 1974. 9 мая.*

# У радах Польскай арміі

Доўгі час нашых землякоў, удзельнікаў другой сусветнай вайны, што ваявалі ў Польскай арміі, улады ўпарта не заўважалі. Іх абыходзілі і з юбілейнымі ўзнагародамі, пасведчанні ды розныя льготы яны атрымлівалі апошнімі. Вайна ж была на ўсіх адна, і смерць забірала на ёй свае ахвяры, не пытаючыся ні нацыянальнасці, ні веравызнання.

Віктару Станіслававічу Букею з вёскі Турчылава ваяваць давялося ў 1-й Польскай арміі. Ён асвоіў прафесію сапёра. Удзельнічаў у аперацыях па фарсіраванні Віслы і Нісы, затым штурмаваў умацаванні Паморскага вала, на Эльбе сустрэў войскі саюзнікаў, а пасля вайны яшчэ два гады штодзень глядзеў смерці ў твар — іх падраздзяленне ачышчала ад мін і снарадаў тэрыторыю Польшчы.

Баявы шлях жыхара вёскі Рэпеншчына Антона Аляксандравіча Савіцкага пачаўся пад Беластокам, дзе фарміравалася 2-я Польская армія, трапіў у самае пекла — пад Браслаў. Адтуль іх часць перакінулі на фарсіраванне Нісы. Дзве спробы пераадолець водны рубеж так і не ўвянчаліся поспехам, і толькі за трэцім разам пасля доўгай артпадрыхтоўкі польскія салдаты змаглі выканаць пастаўленную задачу.

Дух перамогі ўжо вітаў у паветры, падраздзяленні Польскай арміі наступалі на Дрэздэн. Там Антон Аляксандравіч быў

паранены. Больш пяці месяцаў правёў у шпіталях. Дамоў вярнуўся інвалідам.

Цяпер абодва ветэрана жывуць у сваіх вёсках. Хоць і праз многа гадоў, аднак змаглі атрымаць заслужаныя ўзнагароды, у правах іх прыраўнавалі да тых, хто змагаўся ў часцях Чырвонай Арміі і партызанах.

*А. Усовіч*

*«Браслаўская звязда». 1994. 9 мая.*

## Бяроза на могілках

Невялічкія вясковыя могілкі ў в. Жаймяны Слабодкаўскага сельсавету... Тут пахаваныя мае продкі.

Тут нядаўна знайшоў супакой мой бацька. Калі прыходжу, то заўсёды датыкаюся да бярозы, якая расце ля магілы маёй бабулі Ганны Крумін. Пасадзілі гэтую бярозу мае родныя дзядзькі Іосіф і Адольф звыш паўстагоддзя таму назад. Абодва яны загінулі на вайне і бяроза — адзіны напамін аб іх жыцці тут.

Яны былі добрыя гаспадары, шмат працавалі на роднай зямлі. Толькі калгас сплюндраваў гэтую зямлю, не засталося нават падмурку ад іх хаты. Толькі бяроза жыве...

І калі я дакранаюся да шчурпатай кары, мне заўсёды ў думках прамільгвае расказ аб смерці дзядзькі Адольфа пакінуты яго сябрам.

18 красавіка 1945 г. у Германіі пад горадам Рэтэнбургам адбыўся жорсткі бой. Шмат салдат загінула, яшчэ больш было паранена. Параненыя засталіся ляжаць на полі бою і галасна клікалі на дапамогу. Але ніхто не адважваўся ўзняцца з траншэй. Шчыльны агонь варожых кулямётаў не даваў такой магчымасці. Мой дзядзька не змог вытрымаць гэтых крыкаў і пагарджаючы смерцю папоўз на дапамогу. Яму ўдалося выцягнуць некалькі параненых, але ўрэшце куля назаўсёды спыніла яго рух.

За некалькі дзён да канца вайны загінуў і другі мой дзядзька Іосіф.

Не вядомы іх магілы, вось толькі бяроза на вясковых могілках далучае нас да іх жыцця і будзіць маю памяць.

*В. Ермаленак.*

## Браслаўшчына вызвалена — вайна працягвалася

Пакуты, якія выпалі на долю мірнага насельніцтва Браслаўшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны, яшчэ доўга будуць незагоеннай ранай у людской памяці, настолькі велізарныя памеры трагедыі, закрануўшай амаль кожную сям'ю. Існуюць розныя афіцыйныя дадзеныя аб колькасці загінуўшых у час акупацыі жыхароў раёна. Называюцца лічбы 9 600, 10 254, 11 903 чалавекі, якія былі знішчаны гітлераўцамі. На жаль не ўдалося прасачыць, як складваліся гэтыя лічбы, высветліць, якая з іх найбольш адпавядае рэчаіснасці. Невядома таксама, ці ўлічваліся ў гэтых лічбах ахвяры вайны, якія загінулі ў час артабстрэлаў, бамбёжак, баявых дзеянняў да акупацыі і пры вызваленні раёна, тыя, хто падарваўся на партызанскіх мінах ці ў час іншых аперацый, хто быў расстраляны па падазрэнню ў садзейнічанні польскаму супраціўленню, хто не вярнуўся з прымусовых прац у Германіі і г.д. Здаецца дзіўным і недарэчным, што адразу пасля вайны, па гарачых слядах не быў зроблены паймённы пералік усіх ахвяр вайны сярод мірнага насельніцтва, запіс абставін іх гібелі, апытанні відавочцаў злачынстваў гітлераўцаў у час акупацыі. Можна толькі ўявіць, якую гістарычную каштоўнасць меў бы гэты матэрыял цяпер. Больш таго, дзесяцігоддзямі свядома замоўчваліся цэлыя старонкі

трагедыі мірнага насельніцтва акупіраваных гітлераўцамі раёнаў краіны. Найбольш яскравым прыкладам з'яўлялася імкненне выкрэсліць з памяці пасляваенных пакаленняў трагедыю яўрэйскага насельніцтва. На Браслаўшчыне, як і ў іншых месцах Беларусі, яўрэі былі амаль поўнасцю знішчаны фашыстамі. Лік ахвяр значна перавысіў лічбу 5 тысяч. Аднак да пачатку 90-х гадоў аб гэтым нідзе не пісалася і не гаварылася. Месца масавага растрэлу яўрэяў Браслаўскага гета — буйнейшая магіла мірных жыхароў Браслаўшчыны, дзе пахавана звыш 4,5 тысячы чалавек, добраўпарадкавана і даглядаецца толькі намаганнямі зусім малакольканай пасля вайны яўрэйскай абшчынай. Магіла нават не ўключана ў спіс помнікаў гісторыі.

Першыя спісы ахвяр вайны сярод мірнага насельніцтва сталі складацца па сельсаветах Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіяй па выяўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР. У 1944 г. у 70-ыя гады пры падрыхтоўцы да святкавання чарговай даты перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне гэта работа была прадоўжана, але яна рабілася на скорую руку і спісы аказаліся далёка няпоўныя. У гэты час атрымаць больш-менш поўныя звесткі ўжо было і немагчыма.

Да таго, шмат дзе праца праводзілася фармальна, непрафесійна, зусім не запісваліся звесткі аб абставінах гібелі людзей. На жаль мясцовыя Саветы не скарысталі магчымасці падворнага абходу пры падрыхтоўцы да выдання кнігі «Памяць». Менавіта таму ставіць апошнюю кропку ў асвятленні гэтай трагічнай старонкі Вялікай Айчыннай вайны яшчэ рана.

**З АБАГУЛЕНЫХ ЗВЕСТАК ПОЛАЦКАЙ АБЛАСНОЙ КАМІСІІ ПА РАЗГЛЯДУ ЗЛАЧЫНСТВАЎ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ЧАС АКУПАЦЫІ 1941-1944 гг. ПА БРАСЛАЎСКАМУ І ВІДЗАЎСКАМУ РАЁНАХ**

| | Браслаўскі раён | Відзаўскі раён |
|---|---|---|
| Расстраляна ўсяго: | 5326 | 2708 |
| у т.л. | | |
| жанчын | 312 | 315 |
| дзяцей | 326 | 35 |
| Спалена ўсяго: | 130 | - |
| у т.л. | | |
| жанчын | 72 | - |
| дзяцей | 58 | - |
| Адпраўлена на работу ў Германію | | |
| жанчын | 719 | 1209 |
| мужчын | 812 | 999 |
| Усяго расстраляна, павешана, спалена, адпраўлена ў Германію: | 6987 | 4916 |

Старшыня Полацкай абласной камісіі па разгляду злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў **Жылянін**

Сакратар камісіі **Драздоў**

*Філіял дзяржархіва Віцебскай вобласці у г. Полацку. Ф. 687, воп. I, спр. 2, л. 1*.*

* Тут і далей дакументы з архіваў перакладзены з рускай мовы.

## З РАШЭННЯ БРАСЛАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА № 111 АД 5 ЧЭРВЕНЯ 1969 ГОДА АБ СТРАТАХ, НАНЕСЕНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ У ЧАС АКУПАЦЫІ 1941-1944 гг.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны нямецкімі карнікамі на тэрыторыі Браслаўскага раёна было знішчана 97 населеных пунктаў, 2339 двароў, расстраляна насельніцтва 10254 чалавекі, адпраўлена на прымусовыя работы ў Германію 3160 чалавек, загінула на франтах Вялікай Айчыннай вайны 920 чалавек, загінула ў партызанскіх атрадах і падполлі 272 чалавекі.

*Філіял дзяржархіва Віцебскай вобласці у г. Глыбокае. Ф. 722, воп. 1, спр. 566, л. 6.*

## З АКТА ВІДЗАЎСКАГА РАЙВЫКАНКАМА АБ СТРАТАХ, НАНЕСЕНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ Ў ЧАС АКУПАЦЫІ 1941—1944 гг.

18 красавіка 1945 г.

Камісія ў складзе старшыні Ігнацьева М.Н., членаў Мікулёнак М.І., Струк А.Д., Аксёнава А.Ф., Ходнева Р.Я. склалі акт аб нанесеных стратах і злачынствах нямецка-фашысцкімі захопнікамі і іх памагатымі ў час акупацыі Відзаўскага раёна Полацкай вобласці.

Па дадзеных наргасуліка даваеннае насельніцтва Відзаўскага раёна складала 26650 чалавек, якое жыло ў 456 населеных пунктах, пераважна на хутарах. У раёне існавала 5 калгасаў, дастатковае развіццё атрымала жывёлагадоўля, было 6208 коней, буйной рагатай жывёлы — 10678, свіней — 8967, хатняй птушкі - 21890. Мелася: машына-трактарная станцыя, дзе было 10 трактараў, 4 плугі, столькі ж сеялак і складаных малацілак і 2 аўтамашыны.

Прамысловасць раёна складалася з наступных прадпрыемстваў: тры млыны, воўначоска, вапнавы завод, маслазавод, цагельня, фабрыкі кардонная і ватная.

У раёне было 45 школ з колькасцю навучэнцаў — 4846. Добра працавала сетка медыцынскіх устаноў (бальніца на 25 месц, 4 ФАПы (фельдшарска-акушэрскія пункты), 2 аптэкі) і гандлёвых кропак (73 крамы, сталовыя; 5 нарыхтоўчых цэнтраў).

У перыяд часовай акупацыі нямецкімі захопнікамі эканоміцы раёна нанесены значныя страты і ўчынены нечуваныя злачынствы над савецкімі грамадзянамі. Значна зменшылася колькасць насельніцтва: было расстраляна, спалена і павешана 4154 чалавекі. Метадам апытання сведак устаноўлена, што 25 лістапада 1942 года ў в. Баравыя Казянскага сельсавета немцы спалілі жывымі 33 чалавекі. У гэты ж дзень у в. Пруднікі спалена 152 чалавекі, у ліку спаленых — дзеці, старыя, жанчыны. У снежні 1942 года ў в. Казяны немцы праводзілі масавыя расстрэлы савецкіх грамадзян, было забіта каля 700 чалавек яўрэйскага насельніцтва. У перыяд акупацыі ў райцэнтры м. Відзы немцы праводзілі масавыя расстрэлы мужчын, актывістаў, яўрэяў. За час гэтых аперацый у м. Відзы расстраляна 2708 чалавекл. У чэрвені 1941 г. немцы ў раёне Відзаўскага возера расстралялі каля 50 яўрэяў. Перад расстрэлам іх зверскі катавалі — збівалі, а пасля ўсіх загналі ў ваду, дзе частка тапілася, у астатніх стралялі. Назвы і найменні вайсковых часцей і карных атрадаў, а таксама прозвішчы выканаўцаў, удзельнічаўшых у знішчэнні людзей, не высветлены. Акрамя гэтага з тэрыторыі Відзаўскага раёна на катаржныя работы ў Германію адпраўлена 2208 чалавек. Парадак прымусовага адбору ў Германію быў наступным: узброеныя карныя атрады акружалі населены пункт, лавілі людзей групамі і адпраўлялі пад аховай на зборныя пункты і цягнікамі ў Германію. Восенню 1943 г. карныя атрады нямецкіх войск СС і СД акружылі вёскі Азярава, Ваўкі, Грыгалоўшчына, м. Казяны, забралі жыхароў і пад канвоем прывезлі ў в. Васевічы. Трымалі ў памяшканні касцёла, а потым праз чыгуначную станцыю Дукшты адправілі ў Германію. У выніку масавага знішчэння і адпраўкі на работы ў раёне засталася 18224 чалавекі. Немцы разбурылі ўсю сетку дзяржаўна-кааператыўнага гандлю, знішчылі калгасы, разбурылі ўсе гаспадаркі.

**Звесткі аб насельніцтве, знішчаным у гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкімі захопнікамі па Відзаўскаму раёну**

| | |
|---|---|
| 1. Расстраляна | 3693 чалавекі |
| 2. Павешана | 1 чалавек |
| 3. Спалена жывымі | 382 чалавекі |
| 4. Забіта ў час бамбёжкі | 77 чалавек |
| 5. Загінула ваенапалонных | 1 чалавек |
| Усяго: | 4154 чалавекі |
| Адпраўлена ў Германію | 2208 чалавек |

*Філіял дзяржархіва Віцебскай вобласці ў г. Глыбокае. Ф. 1072, воп. 1, спр. 5, л. 8.*

## Дакументы сведчаць

### БОЛЬШ ХЛЕБА ФРОНТУ І РАДЗІМЕ

Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі перадавых у раёне сельсаветаў сустракаюць XXVII гадавіну Вялікага Кастрычніка датэрміновым выкананнем сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Датэрмінова разлічыўшыся па ўсіх відах абавязковых паставак, перадавыя сяляне нашага раёна прадаўжаюць здачу хлеба звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі.

Першымі ў раёне закончылі абавязковыя пастаўкі хлеба Муражскі, Літоўшчынскі, Слабодскі сельсаветы. Цяпер тут праходзіць здача хлеба звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі. Па прыкладу перадавых здача хлеба звыш плана праходзіць па ўсяму раёну. На 27 кастрычніка здадзена звыш плана па раёну 2625 пудоў хлеба.

Толькі за адзін дзень — 23 кастрычніка, сяляне Дубінаўскага сельсавета арганізавана прывезлі на склады заготзярно 250 пудоў хлеба. Звыш плана, 284 пуды хлеба здалі сяляне Залескага сельсавета, 240 пудоў паступіла з Зарачанскага сельсавета, 377 пудоў з Купчэльскага.

Аднак, такія сельсаветы, як Спрындаўскі, Друйскі, Цяцерскі і цяпер працягваюць яшчэ ганебна адставаць з выкананнем абавязковых хлебапаставак. На 27 кастрычніка план хлебапаставак па раёну выканан на 83 працэнты.

Рыхтуючыся да XXVII гадавіны Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі мы павінны ліквідаваць адставанне — поўнасцю выканаць свае абавязацельствы перад сацыялістычнай радзімай, даць фронту і краіне як мага больш хлеба і другіх сельскагаспадарчых прадуктаў.

### СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ ЗАХОПНІКАМ!

Грамадзянцы вёскі Янулі Браслаўскага раёна
Полацкай вобласці Беларускай ССР.
**ГІБОЎСКАЙ ПАЎЛІНЕ.**

*Дарагі таварыш!*

Вы па ўласнай ініцыятыве добраахвотна звыш выкананага Вамі плану здалі ў фонд Чырвонай Арміі 8,5 пудоў хлеба.

Здаючы хлеб звыш плану ў фонд Чырвонай Арміі Вы і Ваша сям'я ўносіце сваю долю ў справу мацавання абароназдольнасці нашай Радзімы і набліжэння часу канчатковага разгрому і знішчэння лютага ворагу — нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Вы зрабілі як і належыць савецкаму патрыёту, які ўсведамляе што перамога сама па сабе не прыдзе, што яе трэба заваяваць у суровых баях на фронце, самаадданай працай у тыле. Радзіма не забудзе Вашага патрыятычнага ўчынку.

Няхай жыве наша родная Чырвоная Армія!
Няхай жыве наша Вялікая Савецкая Радзіма!
Няхай жыве наш родны Сталін!

| | |
|---|---|
| Раённы Савет дэпутатаў працоўных. | Раённы камітэт КБ(б) Беларусі |

*Фонды Браслаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.*

## ЗВОДКА
## ХОДА ВЫКАНАННЯ ХЛЕБАНАРЫХТОВАК ПА РАЁНУ НА 27 КАСТРЫЧНІКА

| *Назва сельсавета* | *% выканання* |
|---|---|
| МУРАЖСКІ | 133 |
| БРАСЛАЎСКІ | 120 |
| ЗАМОШСКІ | 119 |
| ЛІТОЎШЧЫНСКІ | 100 |
| УРБАНСКІ | 104 |
| СЛАБОДСКІ | 104 |
| ПЛЮСКІ | 98 |
| БЫСТРАМАЎСКІ | 96 |
| АХРЭМАЎСКІ | 95 |
| ДУБІНАЎСКІ | 89 |
| КАРАСІНСКІ | 84 |
| МЯЖАНСКІ | 84 |
| ІКАЗНЕНСКІ | 84 |
| КУПЧЭЛЬСКІ | 82 |
| ЗАРАЧАНСКІ | 80 |
| ЗАЛЕСКІ | 80 |
| ОПСАЎСКІ | 80 |
| СПРЫНДАЎСКІ | 78 |
| ДРУЙСКІ | 64 |
| ЦЯЦЕРСКІ | 56 |
| Па раёну | 83 |

*«Звязда». 1944. 29 кастрычніка.*

## ПЕРШЫ ВАСКРЭСНІК

Працоўныя вызваленых раёнаў з энтузіязмам узяліся за аднаўленне народнай гаспадаркі. Вялікая работа цяпер праводзіцца па аднаўленню і адбудаванню гарадоў і вёсак разбураных і спаленых нямецкімі варварамі. Актыўны ўдзел у гэтым прымае ўсё насельніцтва.

Звыш 300 рабочых, служачых і хатніх гаспадынь горада Браслава 22 кастрычніка выйшлі на першы васкрэснік па ачыстцы і ўпарадачэнню горада. Рабочыя і служачыя прыйшлі на работу арганізавана на чале з кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў. Былі тут і вучні старэйшых класаў.

Першы дзень работы паказаў добрыя вынікі. За 6 гадзін работы ачышчана і складзена ў штабелі 7000 цэглаў, разабрана і звезена 4 разбураныя дамы, адчышчана ад шчэбня і мусара 7 фундаментаў. Некалькі двароў і вуліц ачышчаны ад хлама і мускра.

*Звязда, 29 кастрычніка 1944 г.*

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам,
У чорныя дні фашысцкай навалы
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра Вас у нас заўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю!

# Воины Красной Армии, погибшие при освобождении Браславского района и похороненные на его территории

## АХРЕМОВЕЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ СОВЕТ

### ЗАХОРОНЕНИЕ В Д. ОЗЕРАВЦЫ

**АРТУПЬЯН Арминан Саркисович**, р. в 1925, ряд. 1304-го лап, умер от ран 28.7.1944 у д. Озеравцы.

**БАЙЖИГИТОВ Казарбай**, ряд. 353-го сп, умер от ран 15.8.1944 у д. Озеравцы.

**БАЛАБЕКОВ Дадень**, р. в 1923, в Темирском р-не Актюбинской обл., мл. лейт. 268-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**БАТУРИН Евгений Семёнович**, р. в Свердловской обл., ряд. 9-й гв. сд, умер от ран 28.7.1944 у д. Озеравцы.

**БОЛДАЕВ Василий Романович**, р. в 1918 в п. Макшинов Молдавии, старш. 106-го сп, умер от ран 7.8.1944 у д. Озеравцы.

**БОЧКАРЕВ Александр Калинович**, р. в 1924 в Усть-Каксинском р-не Алтайского края, серж. 135-го гв. сп, умер от ран 5.8.1944 у д. Озеравцы.

**ВАСИЛЬЕВ Андрей Михайлович**, лейт., умер от ран 26.7.1944 у д. Озеравцы.

**ВОЛКОВ Алексей Владимирович**, р. в 1918 в г. Москва, лейт. 272-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 16.7.1944 у д. Озеравцы.

**ВОРОШНЫ Михаил Константинович**, р. в д. Кулча Алтайского края, ряд. 128-го сп, умер от ран 6.8.1944 у д. Озеравцы.

**ГАВРИЛОВ Григорий Васильевич**, р. в Уланском р-не Восточно-Казахстанской обл., ряд. 116-й ад, умер от ран 26.7.1944 у д. Озеравцы.

**ГИРКОВ Василий Алексеевич**, р. в 1914 в Рязанской обл., ст. лейт. 46-й омехбр, умер от ран 16.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЖАРИКОВ Иван Спиридонович**, р. в 1926 в Топчихинском р-не Алтайского края, ряд. 31-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 2.8.1944 у д. Озеравцы.

**ЗАЙЦЕВ Андрей Дмитриевич**, р. в 1910 в г. Ветлуга Горьковской обл., лейт. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 19.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЗАКАРЬЯНОВ Габриян**, ряд. 51-й сд, умер от ран 21.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЗАКИРОВ Санакул**, р. в 1901 в Самаркандской обл., ряд. 975-го сп, умер от ран 30.7.1944 у д. Озеравцы.

**ИЩЕНКО Пётр Денисович**, р. в 1914 в Восточно-Казахстанской обл., ряд. 74-го сп, умер от ран 7.8.1944 у д. Озеравцы.

**КАЗАНЦЕВ Егор Степанович**, мл. серж. 196-го гв. сп, умер от ран 18.8.1944 у д. Озеравцы.

**КАМЕНСКИЙ Анатолий Иванович**, р. в 1922 в г. Томск, мл. лейт. 353-го сп 47-й сд, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**КВАРИАНИ Вахтанг Васильевич**, р. в 1917 в г. Кутаиси, лейт. 46-й омехбр, умер от ран 17.7.1944 у д. Озеравцы.

**КИРИКОВ Владимир Павлович**, р. в 1924 в д. Полевая Бабушкинского р-на Вологодской обл., лейт. 353-го сп 47-й сд, умер от ран 27.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОВАЛЕВ Александр Петрович**, р. в 1924 в с. Рыбушка Саратовской обл., лейт. 46-й омехбр, умер от ран 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОЗЛОВ Василий Дмитриевич**, ряд. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОЗЛОВ Пётр Васильевич**, ряд. 158-го гв. сп, умер от ран 20.8.1944 у д. Озеравцы.




Помнік на брацкай магіле воінаў Чырвонай Арміі ў в. Азяраўцы.

**КОКСИН Трофим Анисович**, р. в 1915 в Пензенской обл., лейт. 125-й оптр, умер от ран 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОЛБАСЮК Иван Павлович**, ряд. 334-го сп, умер от ран 22.8.1944 у д. Озеравцы.

**КОНАШКОВ Сергей Григорьевич**, р. в 1921 в г. Ленинград, ряд. 973-го сп, умер от ран 14.8.1944 у д. Озеравцы.

**КОПТЕВ Павел Владимирович**, р. в 1924 в Алтайском крае, ряд. 18-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран в июле 1944 у д. Озеравцы.

**ЛАСКЕВИЧ Иван Алексеевич**, ряд. 244-го сп, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЛЕСКИН Павел Степанович**, р. в Омской обл., ряд. 77-го сп, умер от ран 26.7.1944 у д. Озеравцы.

**МАРТЫНЕНКО Николай Митрофанович**, ряд. 201-го сп, умер от ран 21.8.1944 у д. Озеравцы.

**МЕТЧЕНКО Григорий Никитович**, р. в 1903, в Корзанском р-не Курской обл., ряд. 473-го сп, умер от ран 8.8.1944 у д. Озеравцы.

**МЕШКОВ Иван Иванович**, р. в 1914 в с. Похвестово Самарской обл., ст. лейт. 334-го сп 47-й сд, умер от ран 30.7.1944 у д. Озеравцы.

**МОЛОТКОВ Адам Павлович**, р. в 1919 в с. Новинка Славгородского р-на Могилевской обл., лейт. 279-го сп 341-й сд, умер от ран 17.7.1944 у д. Озеравцы.

**МУЛИНОВ Комбар**, ряд. 128-го ап 23-й сд, умер от ран 21.8.1944 у д. Озеравцы.

**НАВЕЕВ Гадир**, р. в 1896 в Чимкентской обл., ряд. 973-го сп. 270-й сд, умер от ран 4.8.1944 у д. Озеравцы.

**НАУМОВ Иван Иванович**, р. в 1921 в Ивановской обл., серж. 46-й гв. сд, умер от ран 4.8.1944 у д. Озеравцы.

**НИКАШЕВ Егор Иванович**, ряд. 18-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 9.8.1944 у д. Озеравцы.

**НИКИФОРОВ Иван Егорович**, р. в 1904 в Ивановской обл., ряд. 274-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 26.7.1944 у д. Озеравцы.

**НОВОХАТЬКО Пётр Маркович**, ряд. 146-го сп, умер от ран 27.7.1944 у д. Озеравцы.

**НИКАШКИН Пётр Панкратьевич**, р. в 1925 в д. Парахино Курловского р-на Ивановской обл., мл. серж. 18-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 9.8.1944 у д. Озеравцы.

**ОНИКУЛИН Яков Михайлович**, ряд. 272-го гв. сп, умер от ран 18.8.1944 у д. Озеравцы.

**ОРЁЛ Филипп Макарович**, р. в 1924 в д. Сухинино Киевской обл., мл. лейт. 46-й омехбр, умер от ран 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**ПИНЧУРИН Савелий Назарович**, р. в 1922 в Камельском р-не Пензенской обл., серж. 46-й мбр, умер от ран 9.8.1944 у д. Озеравцы.

**ПЛЯСОВ Александр Николаевич**, ряд. 46-й мбр, умер от ран 28.7.1944 у д. Озеравцы.

**РАТЬКИН Михаил Платонович**, р. в 1901 в г. Москва, мл. лейт. 128-го сп 29-й сд, умер от ран 2.8.1944 у д. Озеравцы.

**РЫБЧЕНКОВ Александр Абрамович**, старш. 348-го сп 51-й сд, умер от ран 11.7.1944 у д. Озеравцы.

**СНЕСАЛЬ Фёдор**, р. в 1910 в Новосибирской обл., ряд. 97-го гв. сп, умер от ран 1.8.1944 у д. Озеравцы.

**СПИРИДОНОВ Александр Афанасьевич**, р. в 1914 в г. Троицк Челябинской обл., ряд. 510-го сп 154-й сд, погиб 18.7.1944 у д. Майшули.

**СТРОГОВ Пётр Макеевич**, р. в г. Тула, ряд. 510-го сп 154-й сд, умер от ран 28.7.1944 у д. Озеравцы.

**СУПОНИН Фёдор Иванович**, р. в 1913 в Красноярском крае, ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 31.7.1944 у д. Озеравцы..

**ТРУБИНОВ Александр Иванович**, р. в Пермской обл., ряд. 106-го сп, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**УТЕМРАТОВ Урал Тембратович**, р. в 1925 в Казахстане, ряд. 274-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**ФИЛИН Алексей Николаевич**, ряд. 302-го сп, умер от ран 19.8.1944 у д. Озеравцы.

**ХАБАРОВ Никифор Федотович**, р. в Алтайском крае, ряд. 302-го сп, умер от ран 27.7.1944 у д. Озеравцы.

**ХРАМОВ Тихон Павлович**, ряд. 18-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 6.8.1944 у д. Озеравцы.

**ЮДИН Пётр Сергеевич**, ряд. 50 осб, умер от ран 26.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЮЛДАШЕВ Фадилджам**, р. в Ферганской обл., ряд. 975-го сп, умер от ран 30.7.1944 у д. Озеравцы.

## ЗАХОРОНЕНИЕ В Д. АХРЕМОВЦЫ

**АБАКАНОВ Кумар**, р. в 1925 в Чарском р-не Семипалатинской обл., мл. серж. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**АДЫШЕВ Андрей Николаевич**, р. в 1925 в с. Алексеевка Клявинского р-на Самарской обл., мл. серж. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**АЛЕКСЕЕВ Александр Иванович**, лейт., погиб 19.7.1944 у д. Самовольцы.

**АНЕНКОВ Александр Егорович**, р. в 1918 в с. Липовка Курской обл., ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 7.7.1944 у д. Шакуры.

**АНИКУЛИН Я.М.**, ряд.

**АНЦИФЕРОВ Афанасий Петрович**, ряд., погиб 19.7.1944 у д. Самовольцы.

**АСТЯРОВ Илябард**, р. в Хорезмской обл., ряд., погиб 6.7.1944 у д. Бельмонты.

**БАБАНОВ Михаил Васильевич**, лейт., погиб 22.7.1944 у д. Самовольцы.

**БАЛАКИРЕВ Андрей Дмитриевич**, р. в 1912 в Ивановской обл., ряд. 22-го гв. сп, умер от ран 2.8.1944 у д. Озеравцы.

**БАХТИН Николай Филиппович**, р. в 1909 в д. Салигоредцево Санчурского р-на Кировской обл., мл. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**БЕЛИКОВ Константин Андреевич**, р. в 1918 в Брянском р-не Орловской обл., ряд. 90-й гв. сд, умер от ран 16.7.1944 у д. Ахремовцы.

**БЛЫКИН Григорий Фёдорович**, р. в д. Меки Шумилинского р-на Витебской обл., ряд. 201-й сд, умер от ран 7.8.1944 у д. Озеравцы.

**БОБКОВ Василий Ильич**, р. в 1916 в д. Верещагино Ивановской обл., мл. лейт. 44-й мбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**БОЛОНТАЕВ А.А.**, ряд..

**БУЖИНСКИЙ Иван Игнатьевич**, р. в 1902 в д. Федьково Шумилинского р-на Витебской обл., ряд. 154-го гв. сп, умер от ран 2.8.1944 у д. Озеравцы.

**БУРЛИЦКИЙ Виталий Васильевич**, р. в 1925 на ст. Кагальницкая Ростовской обл., мл. лейт. 148-го сп 47-й сд, умер от ран 16.7.1944 у д. Самовольцы.



Помнік на брацкай магіле воінаў Чырвонай Арміі ў в. Ахрэмаўцы.

**БУРЦЕВ Иван Фёдорович**, р. в 1924 в Никольском р-не Орловской обл., ряд. 31-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 3.8.1944 в д. Озеравцы.

**БУТОВ Герман Иванович**, ряд., умер от ран 28.7.1944 у д. Самовольцы.

**БЫКОВ С.В.**, ряд..

**ВАКИРОВ А.М.**, ряд..

**ВАРОЛОСОВ В.Г.**

**ВОЛКОВ Пётр Васильевич**, ряд., погиб 20.7.1944 у д. Озеравцы.

**ВОРОБЕЙ Степан Иванович**, р. в 1904 в с. Шадруха Угловского р-на Алтайского края, ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ВОРОБЬЁВ Александр Григорьевич**, р. в 1924 в с. Абаскур Мордовии ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ВОРОБЬЁВ Степан Иванович**, ефр., погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ВОРОБЬЁВ Тимофей Ильич**, р. в 1924 в с. Абаскур Мордовии, ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ВОРОНОВ Тимофей Ильич**, р. в 1897 в Смоленском р-не Смоленской обл., ст. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ГАЙВОРОНСКИЙ Александр Митрофанович**, р. в 1924 в с. Лотошное Алтайского края, ряд. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**ГАФЯТУЛИН Галим Саджиевич**, р. в 1924 в д. Верхняя Распуча Татарии, ряд. 22-го.гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ГВОЗДЕВ Владимир Тимофеевич**, ряд., погиб 22.7.1944 у д. Озеравцы.

**ГОРОВ А.С.**, ряд..

**ГРИГОРЬЕВ Георгий Григорьевич**, р. в 1922 в д. Щибирина Тверской обл., ст. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ГРОМОВ Стефан Кузьмич**, ряд. 46-й мбр, умер от ран 28.7.1944 у д. Озеравцы.

**ГРУПЕС П.С.**, ряд..

**ГУЗОВАТЫЙ Прокопий Васильевич**, ряд., погиб 27.7.1944 у д. Озеравцы.

**ДЖУМАНЬЯЗОВ Сафар**, р. в 1915 в Узбекистане, ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ДУБКОВ Иван Петрович**, р. в 1925, ряд., погиб 22.7.1944 у д. Самовольцы.

**ДУДАРКИН Владимир Ефимович**, р. в 1925, ряд., погиб 24.7.1944 у д. Самовольцы.

**ДЮКИН Г.Н.**, ряд..

**ЕГОВКИН А.С.**, ряд..

**ЖИДЕНКО Иван Ильич**, ряд., погиб 25.7.1944 у д. Самовольцы.

**ЗАГРЕБОВ Иван Павлович**, р. в 1920, ряд., погиб 9.8.1944 у д. Озеравцы.

**ЗАТКИН**, ряд..

**ЗАХАРОВ Николай Николаевич**, р. в 1922 в с. Лансы Ленинградской обл., ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 7.7.1944 у д. Шакуры.

**ЗИНОВЬЕВ В.Е.**, ст. лейт..

**ЗЫКОВ Д.И.**, ст. серж..

**ИВАНОВ Василий Ильич**, р. в 1918 в Осетии, ряд. 196-го гв. сп, умер от ран 31.7.1944 у д. Озеравцы.

**ИВАНОВ Василий Петрович**, р. в 1921 в д. Михалкино Солецкого р-на Новгородской обл., мл. лейт. 156-го сп 16-й сд, умер от ран 4.7.1944 у д. Самовальцы.

**ИЛЬЮЧЕНОК А.Б.**, ряд..

**КАВЫЧАЛО С.**, ряд..

**КАЛМЫКОВ Фёдор Семёнович**, р. в 1913 в г. Москва, ст. лейт. 73-го ап, умер от ран 19.7.1944 у д. Самовольцы.

**КАМСЕЕВ В.М.**, ряд..

**КАНДАУРОВ Василий Кириллович**, р. в 1911 в с. Карасево Новосибирской обл., ст. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 7.7.1944 у д. Бельмонты.

**КИКА Иван Степанович**, р. в 1912 в с. Кричильск Ровенской обл., ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 7.7.1944 у д. Шакуры.

**КОБЦЕВ Михаил Николаевич**, ряд., умер от ран 24.7.1944 у д. Самовольцы.

**КОЗЛОВ Владимир Васильевич**, р. в 1920 в г. Москва, ряд. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОЗЛОВ Илларион Дмитриевич**, ряд. 353-го сп 47-й сд, умер от ран 22.7.1944 у д. Самовольцы.

**КОЛЕНКОВ Иван Фёдорович**, р. в 1901 в д. Заево Нижегородской обл., ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**КОЛОХАНОВ А.И.**, ряд..

**КОЛЮЖИН Егор Арсентьевич**, р. в 1922 в с. Солянова Ключевского р-на Алтайского края, лейт. 133-го гв. сп 44-й гв. сд, погиб 12.7.1944 у д. Самовольцы.

**КОМАЕВ Василий Михайлович**, р. в 1899 в д. Шулурово Большеберезняковского р-на Мордовии, ряд. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОМОСЬКО Арсен Григорьевич**, ряд., умер от ран 19.7.1944 у д. Озеравцы.

**КОНОНЕНКО Андрей Емельянович**, ряд., умер от ран 15.7.1944 у д. Самовольцы.

**КОТИН В.С.**, серж..

**КРЕШИН П.**, ряд..

**КРИВОШЕНОК Ф.Р.**, ряд..

**КРОТОВ Алексей Петрович**, ряд., умер от ран 30.7.1944 в д. Озеравцы.

**КРЮЧКОВ Валентин Иванович**, р. в 1922, серж., умер от ран 27.7.1944 в д. Самовольцы.

**КУВШИНОВ Михаил Акимович**, ряд., умер от ран 4.8.1944 у д. Озеравцы.

**КУДРЯВЦЕВ Алексей Александрович**, р. в 1925 в Московской обл., серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**КУЗИКОВ**, ряд..

**КУРУШЕВ Василий Павлович**, р. в 1905 в Лухском р-не Ивановской обл., ефр. 517-го сп 166-й сд, погиб 7.7.1944 у д. Ольгердово.

**КУЦЕКОНЬ Леонтий Адамович**, р. в 1907 в Киевской обл., ст. лейт. 559-го ап 47-й сд, умер от ран 3.8.1944 у д. Озеравцы.

**КУЦЕНКО Андрей Фёдорович**, ряд., погиб 13.7.1944 у д. Замошье.

**ЛАГРИЕВ А.Н.**, ст. лейт..

**ЛОБАЧЁВ Фёдор Кириллович**, р. в 1913, ряд., умер от ран 27.7.1944 у д. Самовольцы.

**ЛЫЧАК Александр Михайлович**, р. в 1921, мл. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**МАЛУНИН Александр Никандрович**, ряд., погиб 20.7.1944 у д. Озеравцы.

**МАТВЕЕВ Александр Иванович**, р. в 1925 в д. Дюкино Торопецкого р-на Калининской обл., мл. серж. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**МАШУСТИН Фёдор Григорьевич**, р. в 1924, ряд., погиб 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**МЕРЕЖКО Иван Трофимович**, р. в 1909 в Харьковской обл., ряд. 18-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 29.7.1944 у д. Озеравцы

**МИНИНГУЛОВ В.М.**, ряд..

**МИНЮЛЕВ Е.И.**, ряд..

**МИРОЧНИЧЕНКО А.Ф.**, ряд..

**МИТТАЛЕВ Ефим Семёнович**, ряд., погиб 16.7.1944 у д. Самовольцы.

**МИТУСТАН Ф.Г.**, ряд..

**МИШАРИН Василий Иванович**, р. в 1914 в с. Ванскурья Коми, лейт. 517-го сп 166-й сд, погиб 6.7.1944 у д. Ольгердово.

**МОБИШЕВ Ф.И.**, ряд..

**МОИСЕЕВ Фёдор Иванович**, ряд., погиб 16.7.1944 у д. Самовольцы.

**МОРОЗОВ Иосиф Фёдорович**, р. в 1915 в с. Боровск Рязанской обл., ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**МУРЗАБАЕВ М.**

**МУХА Егор Николаевич**, ряд., погиб 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**МУХАМЕТДИЕВ Хаджи**, р. в 1923 в д. Нижнее Мактомо Татарии, серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**МУХИН Михаил Михайлович**, ряд., погиб 27.7.1944 у д. Озеравцы.

**НАСОНОВ Андрей Александрович**, р. в 1906 в д. Сокольское Татарии, мл. серж. 22-го гв. спп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**НЕДБАЛЬСКИХ Василий Иванович**, р. в 1905, ряд., погиб 27.7.1944 у д. Самовольцы.

**НЕСТЕРОВ Иннокентий Михайлович**, р. в 1915 в с. Кайтун Иркутской обл., ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**НОВИКОВ Амос Иванович**, р. в 1901 в Шумилинском р-не Витебской обл., ряд. 201-го гв. сп, умер от ран 3.8.1944 у д. Озеравцы.

**ОЛЬШАЛОВ Ф.Н.**, мл. лейт..

**ОСТУДЕНКОВ Константин Фёдорович**, р. в 1902, ряд., погиб 22.7.1944 у д. Самовольцы.

**ПАКЛОДИНОВ Т.С.**, ряд..

**ПАШЕНКО Андрей Иванович**, р. в 1905 в Курской обл., ряд. 198-го сп, умер от ран 25.7.1944 у д. Озеравцы.

**ПЕРЕВЕРТУН М.И.**, ряд..

**ПИВЧЕНКО Тимофей Андреевич**, ряд., погиб 15.7.1944.

**ПОВОЛЯЕВ С.Н.**, ряд..

**ПОЛЕНИЦА Алексей Степанович**, ряд., погиб 20.7.1944 у д. Самовольцы.

**ПОЛОВ В.С.**

**ПОНОМАРЁВ Михаил Михайлович**, ряд., погиб 29.7.1944 в д. Самовольцы.

**ПОПКОВ Михаил Дмитриевич**, р. в 1914 в Лиозненском р-не Витебской обл., ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ПОСЕЛЯТОВ**, ряд..

**ПУПКОВ Филипп Гаврилович**, р. в 1925 в с. Верхняя Нарга Гайского р-на Оренбургской обл., ст. серж. 517-го сп 166-й сд, погиб 6.7.1944 у д. Ольгердово.

**ПУШНЯКОВ Иосиф Моисеевич**, р. в 1914 в д. Вербели Шумилинского р-на Витебской обл., ряд. 213-го гв. сп, умер от ран 2.8.1944 у д. Озеравцы.

**РЕУТОВ Д.И.**

**РОЗЕНБЛЮМГ Самуил Исакович**, ряд., умер от ран 22.7.1944 в д. Озеравцы.

**РОМАНЕНКОВ Иван Архипович**, ряд., погиб 31.7.1944 у д. Самовольцы.

**РОМАНТОВ А.Д.**, ряд..

**РОМАЧЕВ И.А.**, ст. серж.

**РОМАЩЕНКО Юрий Фёдорович**, умер от ран 13.7.1944 у д. Самовольцы.

**РОСЕНКОВ М.С.**, ряд..

**РУДЕНКО Александр Михайлович**, р. в 1925 на ст. Бузовка Днепропетровской обл., серж. 274-го сп, умер от ран 9.8.1944 в д. Озеравцы.

**РУЗЕВАТЫЙ Б.П.**, ряд..

**РУМЯНЦЕВ Зиновий Мелентьевич**, р. в 1925, ряд., умер от ран в 15.7.1944 в д. Самовольцы.

**РЫБАЛКИН И.М.**, ряд..

**САЛИЕВ Томен**, р. в 1900 в Таджикистане, ряд., умер от ран 16.7.1944 в д. Ахремовцы.

**САРАЕВ Иван Андреевич**, р. в 1920, ряд., погиб 16.7.1944 у д. Озеравцы.

**САФОНОВ Пётр Петрович**, р. в 1916, ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**СВИРИДОНОВ Иван Гаврилович**, серж., погиб 18.7.1944 у д. Озеравцы.

**СИКЛИЦКИЙ Илларион Иосифович**, ряд., погиб 19.7.1944 у д. Самовольцы.

**СИНИЦЫН Георгий Сергеевич**, р. в 1919 в д. Ванюхово Марийской АССР серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**СИТНИКОВ Егор Кузьмич**, р. в 1926 в с. Афонино Кемеровской обл., ефр. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**СМЫШЛЯЕВ Фёдор Корсакович**, р. в 1918 в с. Михайловка Павлоградского р-на Днепропетровской обл., мл. лейт. 268-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 14.7.1944 у д. Самовольцы.

**СОБАНОВ Михаил Васильевич**, р. в 1921 в Шуйском р-не Ивановской обл., ст. лейт. 272-го гв. сп 90-й гв. сд, умер от ран 19.7.1944 у д. Самовольцы.

**СОРОЖНЕВ С.П.**, серж..

**СПЕСИВЦЕВ А.Д.**, серж..

**СУРИКОВ В.А.**, ст. лейт..

**СУХОВ Андрей Иванович**, р. в 1923, серж., погиб 15.7.1944 у д. Озеравцы.

**ТАРАСЕНКО Георгий Осипович**, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ТАРАСЕНКО Георгий Степанович**, р. в 1907 в с. Кирово Казахстана, ст. серж. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ТЕМАЧЕНИН Б.**, ряд..

**ТИТКОВ Владимир Кузьмич**, р. в 1925 в с. Алексеевка Алексеевского р-на Самарской обл., мл. серж. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**ТРУСОВ Анатолий Алексеевич**, р. в 1914 в г. Ленинград, ряд. 437-го сп 154-й сд, умер от ран 20.7.1944 в д. Ахремовцы.

**ФЕДИН Константин Никитович**, р. в 1908 в Дмитровском р-не Курской обл., ряд. 975-го сп, умер от ран 10.8.1944 у д. Озеравцы.

**ФИЛИППОВ Д.Ф.**, серж..

**ФРОЛЕНКО Матвей Никитич**, р. в 1923 в д. Подноск Орловской обл., ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ХАЙРУЛИН Аглям Набинцилович**, р. в 1926 в с. Альметьево Татарии, ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ХАЛЫПА Иван Иванович**, р. в 1910 в Федоровском р-не Кустанайской обл., мл. серж., погиб 6.7.1944 у д. Бельмонты.

**ЦЫГАНКОВ М.П.**, ряд..

**ЧЕНЦОВ Василий Семёнович**, р. в 1905 в с. Роговатое Воронежской обл., ряд. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, погиб 6.7.1944 у д. Шакуры.

**ЧЕРНОПАТОВ А.К.**, ряд..

**ЧЕРНЫХ Захар Андреевич**, р. в 1919 в Скопинском р-не Рязанской обл., ряд. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**ЧЕТВЕРОВ А.Н.**, ряд..

**ЧУБУКОВ Владимир Тимофеевич**, р. в 1920 в г. Москва, мл. серж. 44-й мсбр, погиб 5.7.1944 у д. Озеравцы.

**ШАВЛОПЛЯС А.Н.**, ст. серж..

**ШИРШОВ Иван Александрович**, р. в 1923 в с. Салолей Нижкегородской обл., мл. лейт. 22-го гв. сп 9-й гв. сд, умер от ран 30.7.1944 у д. Самовольцы.

**ШИТОВ Иван Алексеевич**, ряд., погиб 30.7.1944 у д. Самовольцы.

**ШИШОВ Даниил Герасимович**, ряд., погиб 18.7.1944 у д. Бельмонты.

**ШМАТКО Владимир Николаевич**, р. в 1925, погиб 12.7.1944 у д. Яново.

**ШУРАЕВ А.И.**, ряд..

**ЮНИСОВ Юрий Ибрисович**, ст. серж., погиб 24.7.1944 у д. Озеравцы.

